Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый

Кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
____________В.А.Касап
___ ____________2017 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
______________М.А.Яцэвіч
_______________2017 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

**БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА. РАЗДЗЕЛ 1. ТЭОРЫЯ**
для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)

Складальнікі: Т.В. Кузьмініч, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.
В.І. Саітава, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

Разгледжана і рэкамендавана на пасяджэнні Савета ўніверсітэта
**_23 мая 2017_ г.**
пратакол № **_9_**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнікі**

*Т. В. Кузьмініч,* намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

*В. І. Саітава,* прафесар кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін дзяржаўнай установы адукацыі «Інстытут культуры Беларусі»;

С. В. Зыгмантовіч, загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Разгледжан і рэкамендаван да зацвярджэння:**

*кафедрай* тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 2017 № );

*Саветам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый* установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 2017 № )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗМЕСТ**

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 5
Тэксты лекцый па дысцыпліне (спасылка да БД “Труды преподавателей сотрудников, аспирантов, магистрантов и студентов БГУКИ” 5

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 231
3.1 Тэматыка семінарскіх і практычных заняткаў 231
3.2 Метадычныя парады да семінарскіх і практычных заняткаў 232

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 233
4.1 Пералік пытанняў па тэмах семінарскіх і практычных заняткаў 233
4.2 Метадычныя рэкамендацыі па выкананню кантрольнай работы (для студэнтаў ФЗН) 249
4.3 Тэставыя заданні 251
4.4 Графік самастойнай работы студэнтаў па дысцыпліне 253
4.5 Метадычныя парады да самастойнай работы 254
4.6 Пытанні да экзамену для студэнтаў ФІДК і ФЗН 271
4.7 Метадычныя парады да выканання курсавой работы 273
4.8 Тэмы курсавых і дыпломных работ 274
4.9 Пералік сродкаў дыягностыкі і крытэрыі ацэнкі ведаў студэнтаў…… 275
4.10 Крытэрыі ацэнкі ведаў студэнтаў 275
4.11 Рэйтынгавы рэгламент па дысцыпліне “Бібліяграфазнаўства. Тэорыя” 277

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 279
5.1 Вучэбная праграма 278
5.2 Вучэбна-метадычныя карты вучэбнай дысцыпліны 286
5.3Электронныя адукацыйныя рэсурсы 288
5.4 Асноўная літаратура 289
5.5 Дадатковая літаратура 290

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Электронны вучэбна-метадычны комплекс (ЭВМК) дысцыпліны “Бібліяграфазнаўства. Раздзел 1. Тэорыя” прызначаны для суправаджэння адукацыйнай дзейнасці студэнта 2-га курса пры вывучэнні адпаведнай дысцыпліны. Яго структура і напаўненне адпавядаюць “Палажэнню аб вучэбна-метадычным комплексе па вучэбнай дысцыпліне” (БДУКМ).

У адпаведнасці з Палажэннем ЭВМК уключае: тлумачальную запіску, тэарэтычны раздзел, у які ўключаны вучэбны дапаможнік Т.В. Кузьмініч “Бібліяграфазнаўства. Тэорыя” (2012), практычны раздзел, дзе прыводзяцца метадычныя рэкамендацыі па выкананні практычных работ і падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў; раздзел кантроля ведаў, у якім прыводзяцца рэкамендацыі і заданні да кіруемай самастойнай работы студэнтаў, метадычныя рэкамендацыі да кантрольнай работы студэнтаў-завочнікаў, тэставыя заданні, а таксама пытанні да іспыту.

Апошні раздзел ЭВМК уключае тэкст тыпавой вучэбнай праграмы (прадстаўленай у РІВШ), вучэбна-метадычную карту дысцыпліны, спісы асноўнай і дадатковай літаратуры, інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы.

Дадаткова да гэтага ў 5 раздзеле размяшчаюцца электронныя прэзентацыі, якія суправаджаюць лекцыі і садзейнічаюць нагляднаму засваенню тэарэтычнага матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 ВУЧЭБНЫ ДАПАМОЖНІК

***Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь***
***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры мастацтваў***

Т.В.КУЗЬМІНІЧ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА.ТЭОРЫЯ

*Рэкамендавана ВМА па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў вышэйшых навучальных установ па спецыяльнасці*
*1–23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)*

Мінск 2011

УДК 01(075.8)

ББК 78.5я73

К 893

**Рэцэнзенты**

*А.Е.Далгаполава*, першы намеснік дырэктара па абслугоўванню карыстальнікаў і ідэалогіі дзяржаўнай установы “Нацыянальная бібліятэка Беларусі”, кандыдат педагагічных навук;

*С.В.Зыгмантовіч*, загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Кузьмініч, Т.В.**

К 893 Бібліяграфазнаўства. Тэорыя: вуч. дапам. / Т.В.Кузьмініч. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – 222 с.

*Разгледжаны тэарэтычныя аспекты бібліяграфіі як грамадскай з’явы, вызначаны асноўныя катэгорыі і паняцці, паказана ўзаемасувязь розных сучасных з’яў бібліяграфічнай практыкі. Праналізаваны функцыянальная, відавая структуры бібліяграфіі, яе асноўныя кампаненты і іх спецыфіка. Вызначаны кірункі равіцця бібліяграфазнаўства, паказана яго роля ў дачыненні да бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.*

*Прызначана ў якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 1–23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках).*

ISBN

УДК 01(075.8)

ББК 78.5я73

© Кузьмініч Т.В., 2011

ISBN

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗМЕСТ**

**Уводзіны**………………………………………………………………… 4
**РАЗДЗЕЛ 1. Асновы тэорыі бібліяграфіі** 12
1.1. Бібліяграфія як грамадская з’ява……………………………………. 12
1.2. Бібліяграфічная інфармацыя, бібліяграфічныя веды як асноўныя паняцці тэорыі бібліяграфіі………………………………………………………. 29
1.3. Функцыянальная структура бібліяграфіі ……………………………... 42
1.4. Формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічных ведаў)……. 53
1.5. Віды бібліяграфічных дапаможнікаў………………………………… 73
**РАЗДЗЕЛ 2. Бібліяграфічная дзейнасць** 91
2.1. Бібліяграфія як галіна дзейнасці……………………………………. 91
2.2. Бібліяграфічная практычная дзейнасць: паняцце і структура………………... 110
2.3. Кампанентная структура бібліяграфічнай практычнай дзейнасці…………… 117
2.4. Відавая структура (класіфікацыя) бібліяграфіі як галіны дзейнасці…………. 146
**РАЗДЗЕЛ 3. Бібліяграфазнаўства – навука аб бібліяграфіі** 168
3.1. Бібліяграфазнаўства як сістэма навуковых ведаў…………………………….. 168
3.2. Развіццё бібліяграфазнаўства на сучасным этапе……………………………. 178
**Літаратура**………………………………………………………………… 192
**Слоўнік асноўных тэрмінаў**…………………………………………………….. 196
**Дадаткі**…………………………………………………………………... 210

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

Бібліяграфазнаўства – навуковае асэнсаванне старажытнай грамадскай з’явы – бібліяграфіі, элементы якой узніклі разам са з’яўленнем фіксаваных тэкстаў (дакументаў), як сродак іх наймення, ідэнтыфікацыі канкрэтнага матэрыяльнага аб’екта, распазнавання ў сукупнасці іншых, падобных на яго. Развіццё бібліяграфіі адбывалася ў цеснай сувязі з навукай, культурай і тэхналогіямі. Прычым не толькі названыя кірункі грамадскага жыцця ўплывалі на яе. Вельмі значнае ўздзеянне аказала бібліяграфія на фарміраванне навуковых ведаў, развіццё сістэмы дакументных камунікацый у цэлым і асобных грамадскіх інстытутаў у прыватнасці. Яна набыла выразны інфраструктурны характар. Укараненне камп’ютарных тэхналогій паўплывала на інтэнсіўнасць стварэння пошукавых сістэм, іх якасць, уніфікаванасць прадстаўлення інфармацыі, магчымасці камбінавання яе розных відаў. Адпаведна ўскладніліся задачы па тэарэтычным асэнсаванні бібліяграфіі як грамадскай з’явы.

Бібліяграфазнаўства – адносна маладая галіна навуковых ведаў. Яе актыўнае развіццё назіраецца ў апошняе дваццацігоддзе. З’явілася шэраг дысертацый, манаграфій. Гэта працы А.П.Коршунава, М.Г.Вохрышавай, Н.А.Слядневай, В.А.Факеева, Л.В.Астахавай, Н.Коставай і інш. Закладзены асновы культуралагічнай (кагнітыўна-культуралагічнай, ноо-культуралагічнай ці ноосфернакультуралагічнай парадыгмы[1]). У яе межах у бібліяграфазнаўстве існуе некалькі альтэрнатыўных канцэпцый. Гэта цікавыя арыгінальныя сістэмы поглядаў на бібліяграфію (бібліяграфічную дзейнасць), яе ролю для грамадства ў межах яго сацыякультурнага, навуковага і інтэлектуальнага развіцця.

У мэтах павышэння прафесійнай кампетэнтнасці спецыялістаў у вучэбныя планы ВНУ культуры і мастацтва краін постсавецкай прасторы

---

[1] *Фокеев, В.А.* Библиография: теоретико-методологические основания: учеб. пособие для системы дополнительного библиотечно-информационного образования / В. А. Фокеев. – СПб.: Профессия, 2006. – С. 55.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўведзена вывучэнне прадмета “Бібліяграфазнаўства. Тэорыя” (“Тэорыя бібліяграфіі”). З’явіліся спецыяльна падрыхтаваныя вучэбныя дапаможнікі і падручнікі. Сярод іх працы вядомых расійскіх і украінскіх навукоўцаў: А.П.Коршунава, М.Г.Вохрышавай, І.Маргенштэрна, А.А.Грачыхіна, В.А.Факеева і інш.

У Беларусі былі падрыхтаваны перакладны[2] і тэрміналагічны[3] слоўнікі, у якіх шырока адлюстраваны паняційны апарат бібліяграфіі. Распрацоўваліся таксама асобныя кірункі бібліяграфазнаўства, але буйных прац абагульняючага характару па тэорыі бібліяграфіі за апошнія дзесяцігоддзі не было створаны. Першы і адзіны на сёння беларускі вучэбны дапаможнік быў падрыхтаваны М.Ц.Талкачовым[4] у 1963 г.

У сучасных умовах неабходна абнаўленне вучэбна-метадычнага забеспячэння бібліяграфазнаўчых дысцыплін, вывучэнне якіх абавязкова для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў. Супрацоўнікамі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў створаны тыпавыя праграмы і праграмна-метадычныя комплексы па тэорыі і гісторыі бібліяграфіі, арганізацыі і тэхналогіі бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках і інш.; падручнік па гісторыі беларускай бібліяграфіі[5], вучэбныя дапаможнікі па гісторыі замежнай бібліяграфіі[6], арганізацыі і тэхналогіі бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках[7]. Патрэбнасць у вучэбнай літаратуры па тэорыі бібліяграфіі з’яўляецца высокай. У той жа час адсутнічае вучэбны

---

[2] Леончиков, В.Е. Русско-белорусский словарь библиотечных и библиографических тэрминов / В.Е.Леончиков, Л.А.Демешко. – Мінск : Вышэйшая школа. — 131, [2] с.

[3] *Лявончыкаў, В.Е.* Тлумачальны слоўнік бібліятэчных бібліяграфічных тэрмінаў / В.Е.Лявончыкаў, Л.А.Дзямешка, Р.І.Саматыя. – 2-е выд. – Мінск : Вышэйшая школа, 2003. – 230 с.

[4] Толкачев, Н. Т. Краткие основы библиографии : пособие для студентов высш. учеб. заведений / Н.Т.Толкачев. – Минск : Изд-во М-ва высш., сред. спец. и проф. образования Белорус. ССР, 1963. — 212, [2] с.

[5] Лявончыкаў, В.Е. Беларуская бібліяграфія : Агул. курс : Падруч. для студэнтаў ін-таў культуры па спецыяльнасці 05.26 "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія" / В.Е.Лявончыкаў. – Мінск : Выш. шк., 1991. – 258 с.

[6] Саітава, В. І.Сусветная гісторыя бібліяграфіі (да сярэдзіны ХХ ст.) : вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мінск : Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2005. — 129, [1] с.

[7] Зыгмантовіч, С.В. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці : вучэбны дапаможнік / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2006. — 323, [1] с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапаможнік, падрыхтаваны айчыннымі навукоўцамі, у якім магчыма адлюстраванне сучаснага стану развіцця тэорыі і суаднясенне тэарэтычных поглядаў з бібліяграфічнай практыкай ў Беларусі канца XX – пачатку XXI ст. Гэта і вызначыла імкненне аўтара падрыхтаваць вучэбны дапаможнік па названай дысцыпліне. Пры яго напісанні не ставіліся задачы стварыць якасна новую канцэпцыю развіцця бібліяграфіі як грамадскай з'явы і падаць яе ў якасці вучэбнага матэрыялу. І разам з тым немэтазгодна, на наш погляд, было абмяжоўваць разгляд тэарэтычных аспектаў такой складанай сферы практыкі, як бібліяграфія, адным падыходам, асабліва з улікам таго, што, па-першае, некаторыя кірункі, з'явы практычнай дзейнасці немачыма ўпісаць у межы пэўнай канцэпцыі, па-другое, нельга звужаць уяўленне студэнтаў аб бібліяграфіі, складаючых яе кампанентах і магчымасцях разгляду іх з розных пазіцый. Мы імкнуліся шматпланава прадставіць сучасныя бібліяграфічныя з'явы і паказаць як іх магчыма асэнсаваць з прымяненнем розных канцэпцый. Пераважна гэта дакументаграфічная канцэпцыя як самая распаўсюджаная і ўсталяваная ў бібліяграфазнаўстве, когнітаграфічная як адна з самых перспектыўных для далейшай распрацоўкі, ідэадакументаграфічная як адна з самых арыгінальных і ў межах якой рэалізаваны найбольш шырокі погляд на бібліяграфію як грамадскую з'яву. Практычна па ўсіх пытаннях даецца параўнальны аналіз поглядаў і выказаны аўтарскія меркаванні і падыходы да разгляду сутнасці элементаў бібліяграфічнай практыкі. На наш погляд, гэта правільны падыход, які будзе спрыяць усведамленню студэнтамі ўсіх спецыялізацый факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм і факультэта завочнага навучання (аддзяленне "бібліятэказнаўства і бібліяграфіі"). фундаментальнасці тэарэтыка-бібліяграфічных ведаў, фарміраванню здольнасцей аналізаваць і абагульняць розныя бібліяграфічныя з'явы, выпрацоўцы уменняў прагназаваць як бібліяграфічную дзейнасць у цэлым, так і асобныя яе кірункі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мэтай дысцыпліны “Бібліяграфазнаўства. Тэорыя” з’яўляецца вывучэнне студэнтамі тэарэтычных асноў бібліяграфіі як сістэмы відаў дзейнасці, якія забяспечваюць функцыянаванне бібліяграфічнай інфармацыі ў грамадстве.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае кола задач, рэалізацыя якіх забяспечыць фарміраванне неабходных для спецыялістаў ведаў, уменняў і навыкаў.

У выніку вывучэння курса “Бібліяграфазнаўства. Тэорыя” студэнты павінны мець уяўленне аб:

– бібліяграфіі як грамадскай з’яве;

– унутраных і знешніх фактарах, якія ўздзейнічаюць на развіццё бібліяграфічнай інфармацыі і бібліяграфічнай дзейнасці;

– інфармацыйных патрэбнасцях грамадства ў цэлым, асобных яго сацыяльных груп і індывідаў;

– інфармацыйных бар’ерах у сістэме дакументных камунікацый і ролі бібліяграфіі як сродка іх пераадолення.

У выніку засваення курса студэнты павінны ведаць і умець карыстацца:

– асноўнымі паняццямі бібліяграфазнаўства;

– асноўнымі тэарэтычнымі палажэннямі бібліяграфазнаўства;

– кампанентнай структурай бібліяграфічнай практычнай дзейнасці;

– відавой структурай бібліяграфіі і бібліяграфічнай прадукцыі;

– законамі і прынцыпамі функцыянавання бібліяграфіі;

– функцыямі бібліяграфіі як грамадскай з’явы;

– аспектнай і аб’ектнай структурамі бібліяграфазнаўства;

– накопленымі ў бібліяграфазнаўстве ведамі і вопытам для аптымізацыі сваёй навуковай і прафесійнай дзейнасці.

Вывучэнне курса “Бібліяграфазнаўства. Тэорыя” будзе спрыяць фарміраванню ў студэнтаў навыкаў:

– выкарыстання ведаў аб бібліяграфіі як грамадскай з’яве ў прафесійнай дзейнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вядзення дзелавых, асабовых і міжасабовых зносін на прафесійнай мове;

– стварэння і ўспрымання разнастайных бібліяграфічных паведамленняў.

У прадстаўленым выданні аўтар працягвае і развівае метадалагічныя асновы айчынная тэорыі бібліяграфіі, абапіраецца на фундаментальныя пазіцыі ў асноўны савецкай, сучаснай расійскай і беларускай навуковых школ, выкарыстоўвае распрацаваны тэрміналагічны апарат. У той жа час у прапанаваным вучэбным матэрыяле ўлічваюцца сучасныя працэсы грамадскага жыцця і рэаліі бібліграфічнай дзейнасці: трансфармацыя савецкага грамадства і стварэнне незалежнай Беларусі, фарміраванне нацыянальных пошукавых бібліяграфічных сістэм, інфарматызацыя грамадства, глабалізацыя бібліяграфічных працэсаў, якасна новыя формы бібліяграфічнага абслугоўвання, развіццё айчыннай тэорыі і практыкі бібліятэчнай дзейнасці. Паўстала пытанне аб неабходнасці падрыхтоўкі ў сістэме вышэйшай адукацыі канкурэнтаздольнага спецыяліста, які творча мысліць, здольны да інавацыйнай дзейнасці ў сучасных умовах. Для гэтага патрабуецца змена стратэгіі адукацыі, забеспячэнне вучэбнага працэсу сучасным вучэбным матэрыялам.

У дапаможніку пераважна прадстаўлены тэарэтычны матэрыял. У той жа час выданне мае і практычную скіраванасць, арыентавана на забеспячэнне сувязі тэорыі і практыкі, актыўнае навучанне, выкарыстанне сучасных педагагічных тэхналогій у навучанні – дыялогавых, дыскусійных, праблемных, асобасна-арыентаваных, праектных, мультымедыйных і інш.

Вучэбны дапаможнік пабудаваны з улікам надрукаваных крыніц і асабістага навуковага патэнцыялу аўтара, у тым ліку матэрыялаў лекцыйнага курса па тэорыі бібліяграфіі, якія праводзіліся ў Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце культуры і мастацтваў, Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце, Беларускім інстытуце праблем культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прапануемы дапаможнік складаецца з 3 раздзелаў, якія даюць уяўленне аб сутнасці бібліяграфіі ў цэлым і асобных бібліяграфічных з’яў, аб бібліяграфічнай дзейнасці як сучаснай інфраструктуры і бібліяграфазнаўстве як сістэме навуковых ведаў і асноўных кірунках яго развіцця.

Вучэбны дапаможнік разлічаны на актыўнае выкарыстанне ў вучэбна-выхаваўчым працэсе як студэнтамі, так і выкладчыкамі. Таму лічым неабходным выказаць некаторыя метадычныя меркаванні наконт зместу і структуры вучэбнага выдання, тых дыдактычных палажэнняў, якімі мы кіраваліся пры напісанні дапаможніка.

У змесце дапаможніка адлюстраваны пытанні, прадугледжаныя вучэбнай праграмай для ВНУ па спецыяльнасці 1-23 01 11 “Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)”. Змест выдання таксама адпавядае вучэбнай праграме па структуры – па пераліку раздзелаў, тэм і параграфаў. Паслядоўнасць раскрыцця базавых паняццяў, асобных пытанняў і раздзелаў у вучэбным выданні адбываецца ў паслядоўнасці, вызначанай вучэбнай праграмай.

Мы імкнуліся да аптымальнай інфармацыйнай насычанасці дапаможніка. Аб гэтым сведчыць паўната разгледжаных у адпаведнасці з вучэбнай праграмай тэарэтычных і практычных пытанняў. На наш погляд, прадстаўлены ў дапаможніку матэрыял садзейнічае развіццю інтарэса студэнтаў да прадмета, да пошуку новых ведаў, да працэсу навучання і прафесійнай самаадукацыі. Навуковы характар вылажэння матэрыялу мы спрабавалі спалучыць з гістарычнымі звесткамі навукова-папулярнага характару, каб забяспечыць адпаведную вучэбную матывацыю студэнтаў. З другога боку, ведаючы ўзровень развіцця пазнавальных здольнасцей студэнтаў, арыентуючыся на неабходнасць актывізацыі іх эмацыянальнай сферы і развіццё інтэлектуальных здольнасцей, выкладанне навуковых ведаў мае практыкаарыентаваны характар.

Змест дапаможніка фарміраваўся так, каб студэнт быў здольны самастойна засвоіць вучэбны матэрыял. Для гэтага ў выданне ўключаны спіс асноўных і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дадатковых прац, на якія аўтар абапіраецца і рэкамендуе для больш глыбокага самастойнага вывучэння тэарэтычных аспектаў бібліяграфіі. Да работы створаны таксама слоўнік асноўных тэрмінаў, якія тычацца бібліяграфазнаўства і ўжываюцца ў асноўным тэксце. Дадаецца і іншы дапаможны для засваення матэрыял: табліцы, схемы, прыклады. Ён дазваляе больш выразна паказаць сувязі тэарэтычных абагульнення і дадзеных практычнай дзейнасці. Тым самым выданне рэалізуе функцыю замацавання і прафесійнай самаадукацыі.

На наш погляд, змест вучэбнага дапаможніка будзе садзейнічаць не толькі фарміраванню прафесійнай, але і агульнай культуры студэнтаў, бо вывучэнне шэрагу тэм мае вялікі выхаваўчы патэнцыял, звязаны з фарміраваннем у студэнтаў маральных якасцей, гуманістычных ідэалаў, каштоўнасцей нацыянальнай культуры.

У аснову зместу вучэбнага выдання мы свядома паклалі рэалізацыю прынцыпа навуковасці: змест дапаможніка адлюстроўвае ўзровень сучаснага развіцця бібліяграфічнай навукі і культуры, намі выкарыстоўваецца агульнапрынятая ў бібліяграфіі навуковая тэрміналогія, мы імкнуліся максімальна забяспечыць даставернасць пры выкладжэнні тэарэтычных палажэнняў, заканамернасцей, прынцыпаў і асобных фактаў, па магчымасці зберагаючы баланс тэарэтычных палажэнняў і фактычнага матэрыялу.

Разумеючы месца і ролю дадзенага прадмета ў змесце прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, у тэкст свядома ўводзяцца прамыя спасылкі на раней вывучаны матэрыял і вучэбны матэрыял з іншых вучэбных прадметаў; раскрываюцца ўзаемасувязі з іншымі прадметнымі ведамі; у тэксце выкарыстоўваюцца прынятыя ў сферы бібліяграфічнай дзейнасці агульнанавуковыя паняцці, якія выкарыстоўваюцца і ў адукацыйнай практыцы – “з’ява”, “закон”, “працэс”, “тэорыя” і інш. Тым самым мы мэтанакіравана рэалізоўвалі ўнутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі. Пры гэтым імкнуліся да таго, каб выкладжэнне вучэбнага матэрыялу адпавядала прынцыпам паслядоўнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і сістэматычнасці: у выданні прадстаўлена цэласная паняційная тэрмінасістэма, якая характарызуецца паслядоўным характарам засваення навуковых паняццяў.

У тэорыі бібліяграфіі назапашаны вялікі аб'ём навуковага і фактычнага матэрыялу. Але ў дадзеным выпадку мы імкнуліся знайсці аптымальна дастатковы аб'ём дапаможніка, забяспечыць максімальна лаканічнае і дакладнае вылажэнне вызначэнняў паняццяў, законаў, тэорый, лагічнасць і дакладнасць пры апісанні пэўных з'яў. Саблюдзенне прычынна-выніковых сувязей пры вылажэнні вучэбнага матэрыялу спалучалася з імкненнем пазбягаць магчымага дубліравання матэрыялу. На наш погляд, вучэбны матэрыял дапаможніка ўлічвае ўзроставыя пазнавальныя магчымасці студэнтаў, узровень іх папярэдняй адукацыйнай падрыхтоўкі ў школе (бібліятэчным тэхнікуме) і на першым курсе ўніверсітэта.

Улічваючы пэўныя складанасці ва ўспрыняцці студэнтамі тэарэтычнага матэрыялу, пры выкладанні вучэбнага матэрыялу мы выкарыстоўвалі нормы сучаснай літаратурнай мовы (прастата і правільнасць будовы сказаў, адсутнасць дыялектызмаў, прафесійных жарганізмаў, двухсэнсоўнасці), каб забяспечыць яе яснасць, зразумеласць, адназначнасць трактоўкі тэрмінаў.

Аўтар выказвае ўдзячнасць рэцэнзентам і калегам па вучэбнай і практычнай бібліяграфічнай дзейнасці за шэраг заўваг і каштоўных парад, прадастаўленыя прыклады бібліяграфічных запісаў і вытрымкі з метадычных матэрыялаў, якія былі зроблены пры падрыхтоўцы гэтага дапаможніка да публікацыі, і дазволілі значна палепшыць яго змест.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Р А З Д З Е Л 1

# АСНОВЫ ТЭОРЫІ БІБЛІЯГРАФІІ

## 1.1. Бібліяграфія як грамадская з’ява

### *Паняцце “бібліяграфія”, яго ўзнікненне і развіццё*

“Бібліяграфія” – т эрмін, які з’явіўся ў V ст. да н. э. у Старажытнай Грэцыі і абазначаў кнігапісанне (biblio – кніга, grafo – пішу). З цягам часу змяніліся падыходы да азначэння тэрміна, з’яў, якія ён апісвае. А.А.Грачыхін выдзяляе чатыры асноўныя перыяды ў станаўленні паняцця “бібліяграфія” і бібліяграфічных з’яў.

1. Узнікненне бібліяграфіі як *кнігапісання* і працы бібліёграфа як кнігапісца (Старажытная Грэцыя, V ст. да н.э.). Асноўным значэннем гэтага слова было кнігапісанне – напісанне ці перапісванне ўжо створаных кніг.

2. Узнікненне бібліяграфіі як *абагульняючай навукі аб кнізе і адметнага літаратурнага жанра* (Францыя, XVII–XVIII ст.). Гэты перыяд быў звязаны з фарміраваннем у Еўропе сістэмы навуковых ведаў. Тэрмін “бібліяграфія” побач з тэрмінамі “бібліялогія”, “бібліясофія”, “бібліяномія”, “бібліягнозія” стаў азначаць навуку аб кнізе. К.Р.Сімон лічыць, што слова “бібліяграфія” магло быць прыдумана занава па ўзоры аналагічных назваў навук (геаграфія) ці запазычана са старажытнасці.

3. Асэнсаванне спецыфічнай ролі *бібліяграфіі як дзейнасці ў больш шырокай сістэме “кніжнай справы”, а бібліяграфіі як навукі ў сістэме кнігазнаўства* (Расія, заходнееўрапейскія краіны, ЗША, канец XIX – пачатак XX ст.).

4. Асэнсаванне бібліяграфіі як асобнай галіны інфармацыйнай дзейнасці са сваёй навуковай дысцыплінай – бібліяграфазнаўствам, якая звязана са стварэннем і давядзеннем да карыстальніка (спажыўца, чытача) інфармацыі аб дакументах (творах друку, кнігах, публікацыях і да т.п.) і іх фрагментах[8].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[8] *Гречихин, А.А* Общая библиография: учебник для студентов высш. учеб. заведений, обуч. по направлению книговедение/ А.А.Гречихин. – М.: Изд-во МГУП, 2000. – С. 20–22.

На сёння існуюць пяць найбольш устойлівых значэнняў тэрміна *“бібліяграфія”*:

– бібліяграфія як асобная бібліяграфічная праца (бібліяграфічны дапаможнік) – “Бібліяграфія прац … “, спіс літаратуры да асобнага тэксту;

– бібліяграфія як сукупнасць бібліяграфічных прац, вызначаных па пэўнай прымеце (бібліяграфія перыядычнага друку, бібліяграфія Беларусі, бібліяграфія Азіі і да т.п.);

– бібліяграфія як навука або дапаможная навуковая дысцыпліна;

– бібліяграфія як галіна навукова-практычнай дзейнасці па стварэнні і давядзенні да карыстальніка бібліяграфічнай інфармацыі (БІ);

– бібліяграфія як найбольш шырокае паняцце, у аб'ём якога ўваходзяць вышэйпералічаныя і любыя іншыя бібліяграфічныя з'явы.

Ужыванне слова “бібліяграфія” ў двух першых аб’ёмах можна лічыць састарэлым, але ў межах непрафесійных зносін яно даволі распаўсюджана. Напрыклад, А.Мень у прадмове да сваёй кнігі “Сын чалавечы” піша: “Спасылкі на літаратуру прыведзены толькі ў самых неабходных выпадках. Жадаючыя паглыбіць свае веды ў гэтай галіне могуць звярнуцца да прац, указанных у ***бібліяграфіі***”[9]. У такім жа аб’ёме тэрмін “бібліяграфія” выкарыстоўваецца ў бібліяграфічных апісаннях для ўказання на наяўнасць бібліяграфічных спісаў, падрадковых і паслятэкставых спасылак, якія з’яўляюцца неад’емнай часткай дакумента.

Такія ж вузкія падыходы да аб’ёму паняцця ці нават недакладныя можна знайсці ў энцыклапедыях і даведніках універсальнага характару. Напрыклад, у “Беларускай энцыклапедыі”: “бібліяграфія – галіна навукова-практычнай дзейнасці па падрыхтоўцы і апісанні інфармацыі пра творы друку і пісьменства, а таксама па распрацоўцы прынцыпаў і метадаў выкарыстання гэтай інфармацыі; апрацаваны збор бібліяграфічных апісанняў дакументаў,

---

[9] Сын чалавечы / Аляксандр Мень ; Пер. з рус. Г.Вішнеўскай. – Гродно : Гродзен. рым.-каталіц. дыяцэзія, 2000. — 317, [2] с. – С.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падабраных па пэўных пытаннях"[10]. У "Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы": "бібліяграфія – навуковае, сістэматызавапнае апісанне кніг і іншых выданняў, зробленае па якой-небудзь прымеце", а таксама "спіс кніг і артыкулаў па якім-небудзь пытанні"[11].

Менавіта шматзначнасць ужывання на практыцы тэрміна "бібліяграфія" паўплавала на тое, што ў дзяржаўным стандарце 7.0.84 "Библиографическая деятельность. Термины и определения" яго азначэнне наогул не давалася. Пазней, у стандарты 7.0.99 "Информационно-библиотечная деятельность. Библиография" і 7.0.2003 "Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць. Бібліяграфія" было ўведзена гэтае паняцце і трактавалася наступным чынам: "бібліяграфія – інфармацыйная інфраструктура, якая забяспечвае падрыхтоўку, распаўсюджванне і выкарыстанне бібліяграфічнай інфармацыі"[12]. Аб'ём паняцця, па сутнасці, роўны азначэнню бібліяграфіі як галіны навукова-практычнай дзейнасці па стварэнні і давядзенні да карыстальніка бібліяграфічнай інфармацыі. Такі падыход замацаваны ў большасці сучасных тэрміналагічных слоўнікаў і энцыклапедый.

У слоўніках "Библиотечное дело" (М., 1997), "Терминологический с словарь по библиотечному делу и смежным отраслям знания" (М., 1995) бібліяграфія трактуецца, па-першае, як частка (інфраструктура) сістэмы сацыяльных камунікацый, якая забяспечвае падрыхтоўку, распаўсюджванне і выкарыстанне інфармацыі аб дакументах, а па-другое, як сукупнасць бібліяграфічнай інфармацыі па пэўнай прадметнай галіне[13]. У "Библиотечной энциклопедии" (М., 2007) даецца азначэнне з апошняга тэрміналагічнага стандарту "бібліяграфія – інфармацыйная інфраструктура, якая забяспечвае

---

[10] Беларуская энцыклапедыя: у 18-ці тт. Т. 2. – Мінск: БелЭн, 1996. – С.141.

[11] *Тлумачальны* слоўнік беларускай літаратурнай мовы. – 3-е выд. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 88.

[12] *ГОСТ 7.0-99.* СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография: Термины и определения. – *(СТБ ГОСТ 7.0-2004.* СИБИД. Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія: тэрміны і азначэнні)

[13] Библиотечное дело : Терминол. слов. / [Рос. гос. б-ка ; Сост.: Т.А.Бахтурина и др.]. – [3-е изд., знач. перераб. и доп.]. – Москва : РГБ, 1997. — 167 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтоўку, распаўсюджванне і выкарыстанне бібліяграфічнай інфармацыі”[14]. Гэта азначэнне бачыцца найбольш удалым: бліжэйшым радавым паняццем вызначана інфармацыйная інфраструктура – сукупнасць інфармацыйных цэнтраў, баз і банкаў даных, сістэм сувязей і тэхналогій, якая забяспечвае доступ карыстальнікаў да інфармацыйных рэсурсаў; указваецца на тры асноўныя бібліяграфічныя працэсы: падрыхтоўка (стварэнне бібліяграфічнай інфармацыі), распаўсюджванне (давядзенне бібліяграфічнай інфармацыі да карыстальніка) і выкарыстанне (ўжыванне бібліяграфічнай інфармацыі ў навуковай, адукацыйнай, вытворчай і іншых відах дзейнасці). Але ў ім адлюстраваны толькі практыкаарыентаваны ракурс бібліяграфічнай дзейнасці, па-за межамі застаюцца навуковая і адукацыйная віды бібліяграфічнай дзейнасці, якія можна аднесці да бібліяграфіі як грамадскай з’явы.

***Бібліяграфія ў інфармацыйнай інфраструктуры грамадства***

Бібліяграфічныя з’явы ўзніклі разам з узнікненнем фіксаваных формаў інфармацыі (дакументамі) як іх неад’емная частка, сродак іх наймення, распазнавання і пошуку. Кожнаму дакументу давалася назва, магчыма прысвойвалася імя аўтара і ўказвалася дата стварэння; у дакуменце маглі ўпамінацца іншыя крыніцы фіксацыі інфармацыі, да якіх звяртаўся аўтар пры падрыхтоўцы тэксту, і ўказанне, на якія адпаведна, змяшчалася ў тэксце, па-за тэкстам. Гэта і былі першапачатковыя формы праяўлення бібліяграфіі – *афінная і латэнтная*. Афінная бібліяграфія – дзейнасць па стварэнні ідэнтыфікацыйных элементаў дакумента, што існуюць як яго неад’емная частка і на аснове якіх ствараецца амаль уся адасобленая ад дакумента (дыягенетычная ці сустракаецца тэрмін постэдзіцыйная) бібліяграфічная прадукцыя. Латэнтная бібліяграфія – дзейнасць па стварэнні ўнутрытэкставых формаў бібліяграфічнай інфармацыі: спасылак, спісаў, падрадковых заўваг і да т.п., якія існуюць як неад’емная частка першаснага тэксту[15]. На аснове латэнтных разнавіднасцей

[14] *Библиотечная* энциклопедия / Рос. гос. б-ка. –М.: Пашков дом, 2007. – С. 110.

[15] На аснове латэнтных разнавіднасцей бібліяграфіі можа таксама стварацца дыягенетычная бібліяграфічная прадукцыя: паказальнікі цытаванай літаратуры, індэксы цытавання.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфіі ствараецца дыягенетычная бібліяграфічная прадукцыя: паказальнікі цытаванай літаратуры, індэксы цытавання, што дазваляюць выявіць выкарыстаныя (цытуемыя) аўтарам (аўтарамі па галіне, галінах навукі) дакументы пры падрыхтоўцы тэксту і раскрыць такім чынам унутраныя сувязі ў сістэме навуковых камунікацый.

З павелічэннем колькасці дакументаў узнікалі праблемы арыентацыі ў накопленых масівах, уліку кнігі як матэрыяльнай каштоўнасці, пазней – яе эфектыўнага продажу і рэкламы. Бібліяграфія як грамадская з’ява стала праяўляцца не толькі праз першасны дакумент, але і адасоблена ад яго і выконваць у масівах дакументаў ролю навігатара. З’явіліся дыягенетычныя (адасобленыя ад першаснага тэксту) разнавіднасці бібліяграфічнай прадукцыі. Прычым, чым больш і складаней дакументныя масівы, тым складаней і разнастайней станавіліся бібліяграфічныя з’явы. Бібліятэкары Шумерскага царства (III тыс. да н.э.) дакументы (гліняныя таблічкі з клінапіснымі тэкстамі) захоўвалі ў скрынях, да якіх рабіліся шыльды з пералікам таго, што ляжыць у скрыні. Па сутнасці гэта быў своеасаблівы каталог, у якім адлюстроўваўся пэўны камплект дакументаў.

Каталогі ствараліся ва ўсіх буйных бібліятэках. У VI ст. да н.э. да адной з самых буйных бібліятэк таго часу ў Асірыйскім г. Ніневія быў створаны каталог, які ўключаў інфармацыю аб дакументах (дзесяткі тысяч гліняных таблічак з клінапіснымі знакамі) па розных галінах ведаў – граматыцы, гісторыі, прыродазнаўстве, паэтыцы, матэматыцы і інш.)[16]. У г. Эфу (старажытны Егіпет) фонд бібліятэкі (Дом папірусу) быў адлюстраваны ў каменным каталогу – пералік дакументаў бібліятэкі быў высечаны на адной з каменных сцен.

Пазней сталі ствараецца не толькі бібліяграфічныя матэрыялы, звязаныя з месцам захавання дакументаў, але і адасобленыя ад яго. Адной з першых бібліяграфічных прац такога роду былі “Дыдаскаліі” Арыстоцеля (IV ст. да

---

[16] Была знойдзена ў другой палове XIX ст. Большая частка зараз захоўваецца ў Брытанскім музеі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

н.э.). Яны змяшчалі пералік твораў, прадстаўленых на драматычных спаборніцтвах у Афінах, незалежна ад таго, прысутнічалі яны ці не ў фондзе бібліятэкі.

З паходу Аляксандра Вялікага на старажытную зямлю Траады пачаўся новы перыяд у гісторыі сусветнай цывілізацыі – элінізм. Ён доўжыўся менш трох стагоддзяў. Было заснавана шмат гарадоў, створана шмат культурных каштоўнасцей, у тым ліку і Мусейнон з яго бібліятэкай. Многія збудаванні таго часу зніклі, але на некаторыя з іх засталіся падрабязныя апісанні, па якіх можна меркаваць аб значымасці для ўсяго элінскага свету. Мусейнон – храм муз у Александрыі (храмы муз ствараліся і раней, але дынастыя Пталемееў упершыню надала падобнай ўстанове дзяржаўную ўвагу). Для вучоных, якіх запрашалі ў Александрыю, пабудавалі недалёка ад царскага палаца вялікі будынак. Там працавалі каля ста вучоных у розных галінах ведаў: стваральнік геаметрыі Еўклід, географ і матэматык Эрастафен, батанік Тэафраст. Гэтая ўстанова спалучала ў сабе рысы сучаснай Акадэміі навук і ўніверсітэта. У Мусейноне была бібліятэка (заснавана ў III ст. да н.э., частка яе згарэла ў 47 г. да н.э., частка – у 391 г. н.э., астатняя – у VII– VIII ст.). Роля яе была вельмі значнай. Яе захавальнік быў роўным па становішчы царскім родным і па традыцыі лічыўся выхавальнікам наследніка прастола. Гэтую пасаду займалі Дземетрый Фалерскі, паэты Калімах і Апалон Радоскі (аўтар эпічнай паэмы “Арганаўтыка”). У I ст. да н.э. ў бібліятэцы налічвалася каля 700 000 скруткаў. Калімахам (каля 310 – каля 240 г. да н.э.) быў складзены 120-томны каталог, які меў назву “Каталог пісьменнікаў, якія прасіялі ва ўсіх галінах адукаванасці, і прац, якія яны стварылі” (сустракаецца іншая назва “Табліцы тых, хто праславіўся ва ўсіх галінах ведаў, і таго, што яны напісалі”). Праца гэтая не захавалася, але па даных іншых крыніц, яна ўяўляла сабой, з аднаго боку, каталог Александрыйскай бібліятэкі, а з другога – уключала апісанні ўсёй вядомай Калімаху грэчаскай літаратуры, незалежна ад месца яе захавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Былі нават спробы ўлічыць усю сусветную літаратуру. У сярэдзіне XVI ст. швейцарскі вучоны Конрад Геснер стварыў вялікую бібліяграфічную працу “Усеагульная бібліятэка”, у межах якой ён імкнуўся ўлічыць усе рукапісныя і друкаваныя кнігі на лацінскай, грэчаскай, старажытнаяўрэйскай мовах.

Доўгія часы бібліятэкі бібліяграфічная інфармацыя стваралася пераважна ў бібліятэках. У асноўным гэта былі вопісы, рэестры, “бібліятэкі”, якія ўлічвалі дакументы з фондаў розных кнігазбораў, у тым ліку прыватных. У XVI ст. стаў актыўна развівацца кніжны гандаль. І адпаведна сталі з’яўляцца кнігагандлёвыя каталогі. Напрыклад, у 1564 г. на восеньскай ярмарцы ў Франкфурце-на-Майне ўпершыню з’явіўся каталог кніг, выстаўленых на продаж. У XIX ст. бібліяграфія становіцца важным сродкам інфармацыйнага забеспячэння навукі і адукацыі, навукова-тэхнічнага прагрэсу. Патрэбнасці гэтых грамадскіх сфер выклікалі хуткае развіццё галіновай і тэматычнай бібліяграфіі, з’яўленне новых жанраў бібліяграфічнай прадукцыі (рэфератыўныя часопісы). У другой палове XIX ст. ярка выявіўся ўплыў бібліяграфіі на чытанне людзей з агульнакультурнымі, самаадукацыйнымі мэтамі. Бібліятэкары пачалі актыўна выкарыстоўваць бібліяграфічныя сродкі ў рэкамендацыі чытачам найбольш каштоўнай, заслугоўваючай увагі літаратуры. Адзначыўшы дачыненне бібліяграфіі да шэрагу найважнейшых сфер грамадства, трэба ўлічваць, што з цягам часу роля бібліяграфіі ў іх функцыянаванні няўхільна ўзрастае, ад стварэння асобных бібліяграфічных прац назіраецца пераход да арганізаванага, сістэматычнага бібліяграфічнага забеспячэння. Выраслі патрабаванні да бібліяграфічных кадраў, няўхільна ўдасканальваецца методыка і тэхналогія бібліяграфічнай працы. Такім чынам, з развіццём грамадства памнажаліся і ўскладняліся бібліяграфічныя з’явы і сёння бібліяграфія стала інфраструктурным відам дзейнасці, які распаўсюджаны ў розных сферах чалавечага жыцця, звязаных з вытворчасцю навуковых ведаў, адукацыяй, самаадукацыяй, папулярызацыяй ведаў і інш.

***Метасістэма існавання бібліяграфіі як грамадскай з’явы***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сістэмны падыход да вывучэння з'яў рэчаіснасці, які зараз распаўсюджаны ў навуковай сферы, прадугледжвае чляненне яе на асобныя сістэмы, даследаванне гэтых сістэм як арганічнага цэлага, выяўленне ўсіх характэрных для іх структурных адзінак і ўнутраных сувязей, узаемадзеяння з іншымі сістэмамі. Апошнія могуць існаваць як незалежныя ўтварэнні, часткова ўзаемадзейнічаць з вывучаемай сістэмай, падпарадкоўвацца ёй (з'яўляцца яе падсістэмамі), паглынаць яе (з'яўляцца метасістэмамі). У апошнія дзесяцігоддзі ў бібліяграфазнаўстве таксама прымяняецца сістэмны падыход да вывучэння бібліяграфіі як грамадскай з'явы і асобных яе структурных элементаў.

Бібліяграфіі ўласцівы, як любой іншай сістэме, цэласнасць, складаная ўнутраная структура, разнастайныя сувязі са знешнім асяроддзем. Яна ўключае шэраг падсістэм і ўваходзіць у больш шырокую сістэму, якая з'яўляецца для яе метасістэмай.

Адзінства падыходаў пры вырашэнні праблемы да якой метасістэмы адносіцца бібліяграфія не існуе. Навукоўцы па-рознаму вызначаюць метасістэму, у якой існуе бібліяграфія. У якасці метасістэм вызначаюць – сістэму дакументальных камунікацый, універсум чалавечай дзейнасці, культуру, тэкставыя кумунікацыі, культура і іншыя. Ад сутнасці і шырыні метасістэмы ўключэння бібліяграфіі залежаць падыходы да яе функцыянальнага прызначэння, наяўнасць асобных кампанентаў і апісанне сувязей са знешнім асяроддзем. Гэта можна праілюстраваць на прыкладзе найбольш распрацаванай і шырока прымяняемай у бібліяграфазнаўстве (расійскім, беларускім і іншых краін былога СССР) – сістэме дакументальных камунікацый (аўтар А.П.Коршунаў), найбольш арыгінальных – універсум чалавечай дзейнасці (аўтар Н.А.Сляднева) і свет тэкставых камунікацый (аўтар В.А.Факееў), якія дазваляюць вельмі шырока паказаць пранікненне бібліяграфіі ў розныя сферы чалавечай дзейнасці.

*Сістэма дакументальных камунікацый як метасістэма існавання бібліяграфіі як грамадскай з'явы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сістэма дакументальных камунікацый (СДК) як метасістэма існавання бібліяграфіі абгрунтавана ў працах вядомага савецкага і расійскага бібліяграфазнаўцы А.П.Коршунава, аўтара дакументаграфічнай канцэпцыі як грамадскай з'явы, і вельмі актыўна рэалізуецца ў большай колькасці навуковых работ, прысвечаных асобным бібліяграфічным з'явам і створаных за апошнія трыццаць гадоў. Яна дазваляе даволі шырока прадставіць поле дзейнасці бібліяграфіі, пашыраць аб'екты знешняга ўзаемадзеяння да дакументаў (сукупнасці іх ці часткі) і спажыўцоў дакументаванай інфармацыі.

На думку А.П.Коршунава, сістэма дакументальных камунікацый ці сістэма "дакумент – спажывец" (СДК = Д–С) уключае наступныя элементы: дакументы, дакументальныя камунікацыі, спажыўцы дакументаванай інфармацыі і адносіны паміж імі. У апошняй рэдакцыі вучэбнага дапаможніка[17] вызначана, што структуру сістэмнай цэласнасці сістэмы дакументальных камунікацый утвараюць чатыры асноўныя паняційныя элементы: камунікацыя, інфармацыя, спажывец інфармацыі, дакумент.

*Камунікацыі* – сувязь паміж аб'ектамі, якая здзяйсняецца сродкімі руху, любыя акты зносін, сувязі, спосабы (перадачы) інфармацыі ў грамадстве.

Надзвычай шырокае філасофскае азначэнне паняцця "інфармацыя" абмежавана разглядам толькі сацыяльнай інфармацыі, якое разумеецца як перадаваемыя і/ці ўспрымаемыя веды.

*Дакумент* як пэўная фіксаваная сацыяльная інфармацыя, замацаваная чалавекам на матэрыяльным носьбітам у мэтах яе захавання, распаўсюджвання і выкарыстання і як матэрыяльны аб'ект (носьбіт), на якім зафіксавана (замацавана) сацыяльная інфармацыя у мэтах яе захавання, распаўсюджвання і выкарыстання.

*Спажывец* – асобны чалавек ці калектываў, якія звяртаюцца да розных крыніц інфармацыі з любымі мэтамі (навуковымі, вытворчымі, творчымі, вучэбнымі і інш.).

---

[17] *Коршунов, О.П.* Библиографоведение : основы теории и методологии : учебник / О. П. Коршунов, Т. Ф. Лиховид, Т. А. Новоженова. – М., 2009. – С.41.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І.Я.Барэнбаум адзначаў, што «ўся гісторыя цывілізацыі (homo sapiens) – гэта гісторыя “пісьмовай”, “кніжнай” цывілізацыі. З’явіліся і энергічна ўкараняюцца новыя сродкі інфармацыі і камунікацыі – тэлебачанне, радыё, кіно, відэамагнітафоны, камп’ютары. Але ў аснове ўсіх гэтых сродкаў ці на іх выхадзе ляжыць пісьмо, фіксаваны тэкст[18].

СДК пастаянна змяняецца і ўскладняецца. Гэта абумоўлена:

– удасканаленнем носьбітаў інфармацыі: камяні, гліняныя таблічкі, папірус, бяроста, папера, магнітныя стужкі, дыскі, мікрафішы, электронныя носьбіты і да т.п.

– павелічэннем аб’ёму інфармацыйных рэсурсаў: у XV ст. выдадзена 30 800 назваў (інкунабулы) друкаваных выданняў, у XVI ст. – 285 800, у XVII ст. – 972 000, у XVIII ст. – 1 637 200, у XIX ст. – 6 100 500, пачатку XX ст. – 10 378 500, у канцы XX ст. – каля 100 млн.

– ускладненнем і павышэннем інфармацыйных патрэбнасцей спажыўцоў.

Сучасная сістэма дакументных камунікацый – надзвычай складанае ўтварэнне, якое забяспечвае функцыянаванне дакументаў у грамадстве. Яна прадстаўлена дзейнасцю фактычна ўсіх значных кірункаў чалавечай дзейнасці: навукі, адукацыі, дзяржаўнай і любой іншай упраўленчай дзейнасці, сродках масавай інфармацыі і інш. Але ў найбольш значным і канцэнтраваным выглядзе – дзейнасцю спецыяльна створаных сацыяльных інстытутаў: рэдакцыйна-выдавецкая справа, кніжны гандаль, бібліятэчная справа, архіўная справа, навукова-інфармацыйная справа, бібліяграфія. У іх межах ствараюцца, кумулююцца, распаўсюджваюцца дакументы. Бібліяграфія (бібліяграфічная дзейнасць) займае спецыфічнае месца ў СДК. Без яе не здольны абыйсціся ні адзін з названых сацыяльных інстытутаў сістэмы дакументальных камунікацый. Таму што з накапленнем дакументаў узнікае неабходнасць іх апісання, уліку, упарадкавання, пошуку і выкарыстання. Гэта магчыма толькі

[18] Баренбаум И.Я. Книга и исторический процесс // Книга: исследования и материалы. Сб. 59. – С. 29–40.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сродкамі бібліяграфіі, якая адпаведна прадстаўлена ва ўсіх пералічаных сацыяльных інстытутах (гл. дадатак 1). Фарміраванне сацыяльных інстытутаў СДК адбывалася паступова. Бібліяграфічная складаючая іх дзейнасці была заўсёды. Без яе немагчымы ўлік, упарадкаванне інфармацыі, арыентацыя ў любых дакументных патоках і масівах.

У СДК здзяйсняецца рэалізацыя ўзаемасувязей і адпаведнасцей паміж “дакументамі” і “ спажыўцамі”. Калі б рэалізацыя адпаведнасцей была поўная і аптымальна хуткая, то спажывец меў бы магчымасць атрымаць любы неабходны яму дакумент імгненна. Аднак у рэчаіснасці так не адбываецца. Дакументы, як матэрыяльныя аб’екты, у працэсе распаўсюджвання рассейваюцца і канцэнтруюцца ў розных месцах, ствараюцца на розных мовах, часам незразумелых спажыўцам, іх змест неаднародны па ўзроўню выкладання матэрыялу і можа быць недаступны для ўспрымання і да т.п. Іншымі словамі, у сістэме дакументных камунікацый існуюць інфармацыйныя бар’еры, якія перашкаджаюць аптымальна аператыўнаму атрыманню карыстальнікам інфармацыі[19].

Інфармацыйныя бар’еры можна падзяліць на тры асноўныя групы (гл. табл. 1.)

Бібліяграфія ў большай ці меншай ступені садзейнічае пераадоленню названых бар’ераў. Напрыклад, з улікам таго, што спажыўцу можа быць невядома месца знаходжання дакумента (прасторавыя бар’еры), у крыніцах бібліяграфічнай інфармацыі (зводныя каталогі) указваюцца спасылкі на ўстановы, у фондах якіх захоўваюцца тыя ці іншыя дакументы. З мэтай частковага пераадолення моўных бар’ераў і спрашчэння адбору дакументаў, створаных на розных мовах, але па змесце неабходных карыстальніку, бібліяграфічныя запісы могуць рабіцца на вядомай мове карыстальніку з

[19] Паняцце «інфармацыйня бар'еры ўведзена ў бібліяграфазнаўства Г.Г.Вараб'ёвым у 60-я гг XX ст. – натуральныя і штучныя перашкоды, якія перашкаджаюць інфармацыйнай сувязі паміж крыніцай інфармацыі і яе спажыўцамі і вядуць да парушэннях гэтых сувязей, інфармацыйнымі патрэбнасцямі і магчымасцямі спажыўца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

указаннем мовы існавання дакумента ці ствараюцца рэфераты-пераклады (адзін з элементаў такога бібліяграфічнага жанра як экспрэс-інфармацыя) і інш.

Сістэма дакументальных камунікацый уваходзіць у больш шырокую сістэму "інфармацыйныя камунікацыі", яна абслугоўвае ўсе сферы чалавечай дзейнасці і забяспечвае функцыянаванне дакументаў у грамадстве. Бібліяграфія займае пасрэдніцкае становішча ў сістэме дакументальных камунікацый, таму што яна ўзята з дакумента, дае звесткі аб дакументах ці іх частках, упарадкуе звесткі аб дакументах, адлюстроўвае (мадэліруе) любую сукупнасць дакументаў, ствараецца для спажыўца з улікам яго інфармацыйных патрэб.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 1. Інфармацыйныя бар’еры ў сістэме “дакумент – спажывец“*

| **Групы інфармацыйныя бар’еры ў сістэме “дакумент – спажывец“** | | |
|---|---|---|
| *I аб’ектыўныя (незалежныя ні ад дакументаў, ні ад спажыўцоў)* | *II суб’ектыўныя (залежныя ад карыстальнікаў інфармацыі) – рэцэвійныя (рецевионные) – за кошт спажыўца* | *III трансмісійныя (ствараемыя стваральнікамі і крыніцамі інфармацыі), перэнтныя (ствараемыя пасрэднікамі ў СДК)* |
| 1 | 2 | 3 |
| Прасторавыя (спажыўцу можа быць невядома месца знаходжання дакумента) | Моўныя (спажывец можа не ведаць мову, на якой створаны дакумент)*[20] | Ведамасныя, звязаныя са структурай ведамстваў, якая перашкаджае руху дакументаў да карыстальнікаў (фірменная і прыватная ўласнасць на інфармацыю) |
| Геаграфічныя бар’еры (адлеглasць паміж дакументамі і спажыўцамі, геаграфічная ізаляцыя, умовы транспарціроўкі і да т.п. | Псіхалагічныя (спажывец можа меркаваць, што па пэўнай тэме немагчыма знайсці інфармацыю ці адмоўна адносіцца да пэўных жанраў, аўтараў, новых тэм, у яго могуць адсутнічаць мастацкі густ, навыкі сістэматычнага чытання, настрой і інш.) | Рэжымныя, што ўводзяцца з мэтай захавання сакрэтнасці ў межах пэўных дзяржаўных, грамадскіх ці прыватных структур |
| Колькасныя (спажывец фізічна не можа засвоіць усе дакументы, адпаведныя яго інфармацыйным патрэбнасцям)* | Стратэгічна-пошукавыя (спажывец часам не ўмее стварыць правільны алгарытм пошуку інфармацыі) | Рэдакцыйна-выдавецкія (затрымка выхаду ў свет публікацый, іх нізкая якасць, парушэнне стандартаў на публікацыі і да т.п.) |
| Змястоўныя (сэнсавыя), абумоўленыя недаступнасцю выкладання матэрыялу, незразумелай тэрміналогіяй)* | Часавыя бар’еры (навуковец не можа затрачваць на пошук інфармацыі больш 20–25% свайго рабочага часу) | Бібліятэчна-бібліяграфічныя, якія звязаны з несвоечасовым і няякасным бібліятэчным і бібліяграфічным абслугоўваннем |
| Якасныя, звязаныя з неабходнасцю параўнання, ацэнкі і выбару найбольш якасных дакументаў з мноства іншых крыніц | Эканамічныя (недахоп сродкаў для набыцця крыніц інфармацыі, аплаты адпаведных паслуг) | |

[20] Гэтыя інфармацыйныя бар’еры можна адносіць і да першай, і да другой груп.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| інфармацыі* | | |

***Універсум чалавечай дзейнасці як метасістэма існавання бібліяграфіі як грамадскай з'явы***

Н.А.Сляднева з'яўляецца аўтарам ідэаграфічнай канцэпцыі бібліяграфіі як грамадскай з'явы. Яна лічыць, што ў СДК (сістэме дакумент–спажывец) немагчыма ў поўнай меры вызначыць спецыфіку бібліяграфіі як грамадскай з'явы. Існаванне бібліяграфіі трэба разглядаць у метасістэме Універсум чалавечай дзейнасці (УЧД). Універсум чалавечай дзейнасці – гэта складана арганізаваная дынамічная сукупнасць галін (відаў) дзейнасці, якія забяспечваюць жыццядзейнасць грамадства. Універсумам чалавечай дзейнасці ствараюцца інфармацыйныя і дакументныя патокі, якія патрабуюць бібліяграфічнага суправаджэння. УЧД з'яўляецца знешнім асяродкам, метасістэмай, якая нараджае і вызначае функцыянаванне бібліяграфіі. Прычынамі з'яўлення бібліяграфіі, на думку Н.А.Слядневай, з'яўляюцца антрапалагічныя фактары, неабходнасць пераадолення біясацыяльных працэсаў старажытнага грамадства, "супярэчлівасці паміж неабмежаванай сацыяльнай практыкай чалавецтва і патрабуемымі ведамі, з аднаго боку, і абмежаванымі антрапалагічнымі параметрамі індывідуальнай свядомасці, здольнасцямі чалавека ствараць, успрымаць, перапрацоўваць, запамінаць, засвойваць і да т.п. пэўныя аб'ёмы інфармацыі, з другой"[21]. Як толькі аб'ём і разнастайнасць інфааб'ектаў (сэнсаў, тэкстаў), накопленых чалавецтвам, стаў несуразмерным з параметрамі індывідуальнай свядомасці і спецыфікай старажытных камунікацый, узнікла неабходнасць эканоміі інтэлектуальных рэсурсаў свядомасці, памяці, аператыўнага мыслення, камунікатыўных намаганняў. Гэтыя патрэбнасці сфарміравалі прыёмы, метады ідэаграфіі, абазначэнне квантаў інфармацыі пры дапамозе пэўных ідэаграм, згортвання з іх выкарыстаннем сэнсаў, аперыравання гэтымі ідэаграмамі замест іх арыгіналаў

[21] *Сляднева Н.А.* Библиография в системе Универсума человеческой деятельности: опыт системно-деятельностного анализа: (моногр.) / Н.А.Сляднева. – М., 1993. – С.23–24.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(фрагментаў старажытных ведаў, пратэкстаў), а затым са з’яўленнем кнігі прывялі да ўзнікнення бібліяграфіі ў традыцыйным значэнні гэтага тэрміна. Бібліяграфія з'яўляецца спецыфічнай метадычнай ці інфраструктурнай галіной УЧД, роднаснай статыстыцы, матэматыцы, сацыялогіі. Н.А.Сляднева лічыць, што ў сістэме “дакумент – спажывец” няма месца інфармацыйным працэсам якаснага і колькаснага пераўтварэння ведаў. Усе гэтыя працэсы заменены толькі ростам колькасці дакументаў, іх рассейваннем і канцэнтрацыяй у прасторы і часе. Больш дакладна зараджэнне і існаванне бібліяграфіі можна прадэманстраваць, разглядаючы яе ў больш шырокай сістэме:




Пачатковым пунктам вытворчасці бібліяграфічнай інфармацыі як асноўнай з’явы бібліяграфіі з'яўляецца інтэлектуальная праца аўтара тэксту (твора). У яго свядомасці выпрацоўваецца пэўная ідэаграма (формула праблемы, задачы) – прагноз будучых ведаў. Гэтую ідэаграму Н.А.Сляднева называе прагнастычнай (прагнознай) БІ. У далейшым на яе аснове з'яўляюцца такія элементы бібліяграфічнага апісання, як загаловак тэксту, анатацыя, ключавыя словы. У стварэнні іх удзельнічае аўтар. Ён жа, рыхтуючы тэкст, уключае ў яго элементы іншых тэкстаў, робіць спасылкі, даведачны апарат, гэта значыць стварае вялікія пласты ўнутрытэкставай (латэнтнай) бібліяграфіі. Пасля завяршэння стварэння тэксту аўтар дае яму сваё імя (аўтарства), назву, вызначае жанр, тыпавідавую прыналежнасць – удзельнічае ў стварэнні афіннай БІ, якую дапаўняе выдавец. Ён фарміруе астатнія тытульныя элементы, стварае выдавецкую анатацыю, можа ствараць даведачны апарат выдання. Гэтыя віды БІ непарыўна звязаны з тэкстам: без іх тэкст не існуе і яны без тэксту бессэнсоўныя. Аднак БІ можа існаваць і незалежна ад тэксту. Гэта вельмі вялікі

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(асноўны) масіў другаснай інфармацыі, якую Н.А.Сляднева называе постэдзіцыйнай (адасобленай ад дакумента як непасрэднага яго ўладальніка). А.П.Коршунаў і шэраг іншых бібліяграфазнаўцаў разглядаюць у асноўным толькі гэтыя формы.

***Свет тэкставых камунікацый (свет тэкстаў – свет карыстальнікаў) як метасістэма існавання бібліяграфіі.***

Свет тэкставых камунікацый з'яўляецца важнейшым фрагментам рэальнага быцця, а веды аб ім (свеце) – часткай універсума чалавечых ведаў. Свет тэкставых камунікацый (свет тэкстаў – свет карыстальнікаў) нараджае бібліяграфію і адзін з яе структурных элементаў – бібліяграфічныя веды. Важнейшым фактарам узнікнення і развіцця бібліяграфіі з'яўляецца рух матэрыяльнага і ідэальнага ў соцыуме. Веды, неабходныя індывіду, грамадству структура рухомая (рух – неабходная ўмова іх жыццядзейнасці). Бібліяграфія распазнае веды, якія ёсць у тэксце, забяспечвае сваімі сродкамі ўзаемадзеянне паміж патокамі тэкстаў і патрэбнасцямі ў іх, устанаўлівае ўзаемаадносіны паміж гэтымі дынамічнымі кампанентамі і аказвае рэгулятыўнае ўздзеянне на працэсы іх зараджэння (ўзнаўлення), інтэнсіўнасць руху, функцыянавання. Сярод шматвобразных і шматякасных чалавечых адносін выдзяляюцца асноўныя адносіны, якія вызвалі да жыцця бібліяграфію – гэта пазнавальныя, камунікатыўныя і рэгулятыўныя. Гэтыя адносіны знайшлі свой выраз і ў адпаведных формах руху тэкстаў і ў відах патрэбнасцей – пазнавальныя, камунікатыўныя і рэгулятыўныя. На думку А.В.Сакалова, інфармацыйныя патрэбнасці – абагульняючае паняцце, якое азначае сукупнасць камунікатыўных, мнеманічных, рэгуляцыйных, эстэтычных патрэбнасцей, якія здольна задавальняць сацыяльная інфармацыя[22]. У сістэме "фіксаваны тэкст – чалавек" узнікаюць патрэбнасныя адносіны пазнання тэксту "самога па сабе" і ў пазнаннях аб свеце, заключаным у тэксце. Такія веды ўтрымлівае бібліяграфія. Яна не толькі пазнае тэкст і стварае спецыфічныя веды, але і

[22] Соколов А.В. Сущность и явления информационных потребностей // Универсальная научная библиотека в в регионе: перспективы развития / ГПБ им. С.-Щедрина. – Л., 1991. – С. 96.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

збірае іх, абагульняе, кумулюе, структурыруе, забяспечвае іх захаванне, рух у прасторы і часе. Правамерна гаварыць у сувязі з гэтым аб бібліяграфічнай памяці – здольнасці чалавека і грамадства захоўваць, актуалізаваць для далейшага выкарыстання ў працэсе жыццядзейнасці веды аб фіксаваных тэкстах, іх масівах і звязаных з імі асабістых і/ці грамадскіх з’явах. У метасістэме “свет тэкстаў – свет патрэбнасцей у іх карыстальнікаў” бібліяграфічныя веды з’яўляюцца важнейшым сродкам тэкставай камунікацыі, г.зн. узаемадзеяння людзей пры дапамозе бібліяграфічных ведаў, працэс абмена інфармацыяй аб тэкстах, іх уяўленне на метаінфармацыйным узроўні, давядзенне да карыстальнікаў звестак аб іх існаванні, складзе, структуры, змесце. Суб’ект бібліяграфічнага пазнання, камунікацыі (бібліёграф, карыстальнік і т.д.), пазнаючы свет тэкстаў, уступаючы ў шматбаковы дыялог на аснове твора (аўтар – выдавец – бібліёграф – карыстальнік), вызначае месца тэкстаў у адзінай сістэме духоўных каштоўнасцей, стварае аснову для магчымасцей выбара людзьмі таго ці іншага тэксту і забяспечвае шырыню і свабоду такога выбара.

Тэкст – гэта такая форма існавання ведаў, якая мае пэўнае самастойнае жыццё, дзякуючы свайму статусу інтэлектуальнай уласнасці і пастаяннаму ўдасканаленню спосабаў фіксавання. Карыстальнік віртуальных тэкстаў (поўнатэкставых баз даных, гіпертэкстаў) не адчувае матэрыяльнага носьбіта, мае справу з “чыстым тэкстам”, у ідэале “сусветным акеанам тэкстаў”. Ён працуе не з дакументам у рэальным яго разуменні, а менавіта з тэкстам (у тым ліку, які гучыць, намаляваны). Менавіта тэкст, а не яго розныя выданні, на думку Б.А.Семяноўкера, становяцца асноўным аб’ектам другаснай інфармацыі[23]. Тэкст (веды, квант ведаў, якія ён утрымлівае) з’яўляецца аб’ектам бібліяграфіі на працягу ўсяго яе развіцця. На сённяшні дзень вядомы тры носьбіты ведаў і адпаведна тры формы памяці: чалавечая свядомасць (жывая суб’ектыўная памяць), традыцыйныя дакументныя носьбіты інфармацыі

[23] *Кризис* или расцвет: (круглый стол “СБ” на тему “Современная библиографическая парадигма” // Сов. библиогр. – 1991. – №3. – С.54.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(аб’ектавізаваная, дакументаваная памяць) і электронныя носьбіты (памяць ЭВМ). Такія веды з’яўляюцца аб’ектам *когнітаграфіі.*

*Когнітаграфія* – веды аб ведах ў любой іх форме (чалавечай свядомасці, дакументах, памяці ЭВМ), а таксама дзейнасць па іх ідэнтыфікацыі ў мэтах вырашэння розных задач. Аб’ёмы паняццяў когнітаграфія і бібліяграфія перасякаюцца. У сферу ўвагі когнітаграфіі не ўваходзяць матэрыяльныя аспекты дакументаў, а талькі інтэллектуальныя. Бібліяграфія ў сваю чаргу разглядае дакументы ў адзінстве матэрыяльнага і ідэальнага.

**Вывады**

Бібліяграфія – старажытная грамадская з’ява. Яна прайшла доўгі час станаўлення. На сённяшні дзень гэта інфармацыйная інфраструктура, якая непарыўна звязана з развіццём асноўных сфер дзейнасці грамадства. Даследчыкі па-рознаму разглядаюць не толькі аб'ём паняцця бібліяграфія, але і метасітэму ў межах якой існуе гэтая грамадская з'ява. Некаторыя метасістэмы звужаюць аб'ём з'яў, якія адносяцца да бібліяграфіі (кніга (твор друку) – чытач), дакумент – спажывец), некаторыя пашыраюць да тых межаў, калі даволі цяжка правесці размежаванне паміж бібліяграфічнымі і небібліяграфічнымі з'явамі (метасістэма УЧД) і назваць першыя бібліяграфічныя працы. Прадумовамі ўзнікнення бібліяграфіі як грамадскай з'явы можна лічыць: 1) узнікненне фіксаванай інфармацыі як формы перадачы ведаў; 2) аўтара і карыстальніка інфармацыі – суб'ектаў інфармацыйнай дзейнасці, якім неабходна знайсці інфармацыю, ідэнтыфікаваць сваё ці чужое аўтарства, перадаць веды.

Развіццё і ўдасканаленне бібліяграфічных з'яў адбывалася ў рэчышчы развіцця навукі, культуры і тэхнікі грамадства.

## 1.2. Бібліяграфічная інфармацыя і бібліяграфічныя веды як асноўныя паняцці тэорыі бібліяграфіі

***Агульная характарыстыка паняцця “бібліяграфічная інфармацыя”***

Паняцце “бібліяграфічная інфармацыя” (БІ) з’яўляецца зыходным у сучасным бібліяграфазнаўстве. Яно выконвае ролю найбольш агульнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крытэрыя адмежавання бібліяграфічных з'яў ад небібліяграфічных. *Бібліяграфічная інфармацыя* – гэта пэўны набор характарыстык дакумента (тэксту), любой іх лагічна выдзеленай часткі ці аб'яднанай сукупнасці, неабходны для іх ідэнтыфікацыі і пошуку.

Галоўная асаблівасць бібліяграфічнай інфармацыі ў тым, што яна арганізуе рух да карыстальніка не інфармацыі і не ведаў, якія яму неабходны, не дакументаў (тэкстаў), у межах якіх зафіксавана гэта інфармацыя (веды), а толькі звестак пра дакументы (тэксты). Гэтыя звесткі (характарыстыкі) першапачаткова існуюць як неад'емная частка першаснага[24] дакумента (тэксту), могуць адчужацца ад іх і існаваць самастойна, уключацца ў іншыя першасныя тэксты ці прадастаўляцца ў якасці самастойна афармленых сацыяльна значымых рэсурсаў. Гэта разнавіднасць другаснай фактаграфічнай інфармацыі, якая ўяўляе сабой вынік пазнання першасных дакументаў (тэкстаў) як фактаў гісторыка-культурнага працэсу, а таксама іх змястоўных, фармальных і якасных характарыстык з мэтай забеспячэння інфармацыйных патрэбнасцей карыстальскаў.

Бібліяграфічная інфармацыя – старажытная грамадская з'ява. Яе элементы ўзніклі разам са з'яўленнем дакумента, як сродак яго наймення, распазнавання ў сукупнасці іншых. Пры дапамозе бібліяграфічнай інфармацыі здзяйсняецца ўпарадкаванне звестак аб масівах дакументаў (ствараецца мадэль масіву), прадстаўленне інфармацыі, заключанай у дакуменце, забяспечваецца магчымасць пошуку дакументаў, апавяшчэння шырокай грамадскасці аб іх існаванні і ацэнка дакумента з пункту гледжання яго карыснасці для пэўных карыстальнікаў.

### ***Эвалюцыя тэрміна “бібліяграфічная інфармацыя”***

Тэрмін БІ з'явіўся ў тэрмінасістэме бібліяграфазнаўства ў 20–30-я гг. XX ст., актыўна стаў ужывацца з 1950-х гг., уводзіцца ў слоўнікі, тэрміналагічныя і

[24] Першасныя дакументы – гэта дакументы, якія непасрэдна адлюстроўваюць вынікі пазнання рэчаіснасці. Другасныя – дакументы, якія адлюстроўваюць рэчаіснасць апасрэдавана праз змест першасных дакументаў, з'яўляюцца вынікам аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі першасных дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхналагічныя стандарты. Я.І.Шамурын[25] у слоўніку кнігазнаўчых тэрмінаў (1958) БІ трактаваў як 1) пісьмовае апавяшчэнне аб наяўнай ці паступаючай літаратуры па ўсіх ці асобнай галіне ведаў; 2) вуснае паведамленне аб новай выдадзенай літаратуры. Як бачна, аб'ём паняцця "бібліяграфічная інфармацыя" даваўся даволі звужана, пад яго падпадалі бібліяграфічныя з'явы, звязаныя толькі з фондам і пэўных формаў. У слоўніку К.Р.Сімона[26] праводзілася размежаванне паміж бібліяграфічнай інфармацыяй (інфармацыяй, якая дае звесткі аб літаратуры па таму ці іншаму пытанню) і "інфармацыяй па сутнасці гэтага ж пытання. Аб'ём паняцця ў параўнанні са слоўнікам Я.І. Шамурына пашыраўся за кошт таго, што знімалася абавязковая сувязь БІ з фондам і адначасова звужалася – пад яго падпадалі бібліяграфічныя з'явы, звязаныя толькі з пэўнай галіной ведаў.

У ГОСТ 16448-70 гэты тэрмін адсутнічаў, а ў ГОСТ 7.0.77 трактаваўся як «звесткі аб творах друку, неабходныя для іх ідэнтыфікацыі і выкарыстання (незалежна ад спосабу прадстаўлення гэтых звестак – вуснага, візуальнага ці машыначытаемага». Гэтае азначэнне значна пашырае паняцце БІ ў параўнанні з папярэднім. Аднак яно недастаткова дакладнае, таму што ў ім абмежаваны аб'ект бібліяграфавання толькі творамі друку (была замацавана кнігазнаўчая канцэпцыя бібліяграфіі як грамадскай з'явы).

У пачатку 1980-х гг. у сувязі з падрыхтоўкай новага стандарту ў спецыяльным друку распачалася дыскусія, у ходзе якой былі выказаны розныя меркаванні аб сутнасці БІ.

А.П.Коршунаў лічыў, што БІ займае пасрэдніцкае становішча ў СДК. Яна здзяйсняе ўпарадкаванне сувязей паміж дакументамі (мадэліруе дакументныя патокі і масівы), паміж дакументамі і інфармацыйнымі патрэбнасцямі спажыўцоў. БІ існуе на другасна-дакументальным узроўні, мае дапаможны характар, з'яўляецца асобай разнавіднасцю сацыяльнай інфармацыі. Асноўнай

---

[25] *Шамурин* Е.И. Словарь книговедческих терминов: для библиотекарей, библиографов, работников печати и книжной торговли. – М.,1958. – С. 25.

[26] *Симон К.Р.* Библиография: основные понятия и термины. – М., 1968. – С. 18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рысай яе з’яўляецца тое, што яна арганізуе рух да спажыўцоў не саміх дакументаў, фактаў, а звестак аб дакументах. Імі можна карыстацца незалежна ад саміх дакументаў. Бі накіравана на задавальненне і фарміраванне інфармацыйных патрэбнасцей грамадства.

Коршунаў, такім чынам, БІ разглядаў толькі адчужаную ад першаснага дакумента інфармацыю, дапускаў апрыорнае існаванне звестак аб дакументах і не паказваў прыроду гэтай інфармацыі ў цэлым і асобных яе элементаў.

У межах дыскусіі на старонках часопіса “Советская библиография” у пачатку 1980-х гг. Ю.М.Лаўфер выказаў меркаванне аб неабходнасці разгляду БІ на другасна-дакументальным узроўні, але правядзенні размежавання паміж другаснай навуковай і другаснай бібліяграфічнай інфармацыяй[27]. Ён адзначаў, што сучасная другасная навуковая інфармацыя (фактаграфічная) пазбаўляе спажыўца ад аналізу першасных дакументаў, здольна эфектыўна згортваць інфармацыю. Перапрацоўка першаснай інфармацыі ў другасную навуковую – гэта такое пераўтварэнне, у выніку якога выяўляюцца і адначасова могуць ствараюцца і сістэматызавацца новыя веды. Змест такой другаснай інфармацыі можа ў сваю чаргу логіка-семантычна і аналітыка-сінтэтычна перапрацоўвацца. БІ, на думку Ю.М.Лаўфера, не нясе нічога новага, чаго б не было ў першасным дакуменце. Яна ўяўляе сабой канчатковы пункт згортвання інфармацыі і ў ёй адсутнічаюць новыя адзінкі ведаў.

Такі падыход спрашчае з’явы, якія падпадаюць пад аб’ём паняцця бібліяграфічная інфармацыя, і прыніжаюць ролю, якую бібліяграфія як грамадская з’ява ў дачыненні да розных галін ведаў, сфер чалавечай практыкі. БІ, мадэліруючы ДП, ДМ, тэкст асобнага дакумента якраз можа ствараць новыя веды пра іх, прычым такія веды, якія не стварае ні адна іншая сфера грамадскай практыкі.

[27] Першасныя дакументы– гэта дакументы, якія непасрэдна адлюстроўваюць вынікі пазнання рэчаіснасці. Другасныя – дакументы, якія адлюстроўваюць рэчаіснасць апасрэдавана праз змест першасных дакументаў, з'яўляюцца вынікам аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі першасных дакументаў.

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У той жа час А.В.Сакалоў, В.П.Леонаў, В.А.Факееў таксама не адмаўлялі другаснасці БІ, але спрабавалі суаднесці другаснасць БІ з уласцівай ёй першаснасцю, са здольнасцю несці новыя веды, перадаваць змест бібліяграфіруемых дакументаў. А.В.Сакалоў лічыў, што дакумент неабходна разглядаць як факт гісторыка-культурнага працэсу і адпаведна інфармацыю аб дакуменце як лагічныя, пэўным чынам упарадкаваныя звесткі аб частцы рэчаіснасці. Таму нельга супрацьпастаўляць бібліяграфічную і фактаграфічную інфармацыю. БІ мае фактаграфічную прыроду і з'яўляецца разнавіднасцю фактаграфічнай інфармацыі. А.В.Сакалоў даў наступнае азначэнне тэрміна бібліяграфічная інфармацыя*: другасная фактаграфічная інфармацыя (з факультатыўна ўключаемымі канцэптаграфічнымі адзнакамі аб змесце і форме дакументаў), прадстаўленая ў выглядзе стандартных бібліяграфічных звестак на натуральнай ці інфармацыйна-пошукавай мовах.* Гэта поўнацэнныя эмпірычныя веды, якія складваюцца з фактаграфічнай часткі (звесткі аб асобных дакументах, дакументных патоках, дакументных масівах) і канцэптаграфічнай часткі (агульныя і прыватныя методыкі, прынцыпы, правілы).

Як бачна, у 1980-я гг. выказваліся самыя розныя, часам палярныя, погляды на сутнасць БІ. У тэрміналагічным стандарце таго часу (ГОСТ 7.0.84 «Библиографическая деятельность. Термины и определения») давалася наступнае азначэнне БІ: *інфармацыя аб дакументах, ствараемая ў мэтах апавяшчэння аб дакументах, іх пошуку, рэкамендацыі і прапаганды.* Такая трактоўка найбольш блізка падыходзіла да пазіцыі А.П.Коршунава.

Н.А.Сляднева лічыць бібліяграфію інфраструктурным відам дзейнасці і разглядае яе існаванне ў метасістэме Універсум чалавечай дзейнасці (УЧД). Яна лічыць бібліяграфію спецыфічнай метадычнай ці інфраструктурнай галіной УЧД, роднаснай статыстыцы, матэматыцы, сацыялогіі. БІ з'яўляецца універсальным сродкам аперыравання суверэннымі[28] інфааб'ектамі.

[28] суверэннасць – незалежнасць ад іншых.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфааб’екты – гэта сэнсы, тэксты дакументы, аўтары. БІ забяспечвае іх ідэнтэфікацыю і пошук. Вытворчасць БІ Н.А.Сляднева разглядае на этапах узаемадзеяння аўтара, выдаўца, карыстальніка, дакумента (гл. папярэдняя тэма). Пачатковым пунктам вытворчасці БІ з'яўляецца інтэлектуальная праца аўтара тэксту (твора). У яго свядомасці выпрацоўваецца пэўная ідэаграма (формула праблемы, задачы), г.з. прагноз будучых ведаў. Гэтую ідэаграму Н.А.Сляднева называе прагнастычнай (прагнознай) БІ. У далейшым на яе аснове з'яўляюцца такія элементы бібліяграфічнага апісання, як загаловак тэксту, анатацыя, ключавыя словы. У стварэнні іх удзельнічае аўтар. Ён жа пры падрыхтоўцы тэксту ўключае ў яго элементы іншых тэкстаў, робіць спасылкі, даведачны апарат– г.зн. стварае вялікія пласты ўнутрытэкставой (латэнтнай) БІ. Пасля завяршэння стварэння тэксту аўтар дае яму сваё імя (аўтарства), назву, вызначае жанр, тыпа-відавую прыналежнасць – удзельнічае ў стварэнні афіннай БІ, якую дапаўняе выдавец. Ён фарміруе астатнія тытульныя элементы, стварае выдавецкую анатацыю, можа ствараць даведачны апарат выдання. Гэтыя віды БІ непарыўна звязаны з тэкстам: без іх тэкст не існуе і яны без тэксту безсэнсоўны. Аднак БІ можа існаваць і адасоблена ад тэксту. Гэта вельмі вялікі масіў другаснай інфармацыі, якую Н.А.Сляднева называе постэдзіцыйнай (адасобленай ад дакумента як непасрэднага яго ўладальніка)[29] дыгенетычнай (В.А.Факееў).

Цікавасць да сутнасці паняцця БІ не згасала і ў канцы ХХ – пачатку ХХІ ст. і да сённяшняга дня не дасягнута адзінства яго разумення і азначэння.

### *Суадносіны паняццяў “бібліяграфічная інфармацыя” і бібліяграфічныя веды*

В.А.Факееў (аўтар когнітаграфічнай канцэпцыі) аперыруе паняццямі БІ і бібліяграфічныя веды (БВ). Ведамі лічыцца тое, што 1) праверана грамадска-палітычнай практыкай, 2) засведчана логікай, 3) з’яўляецца вынікам пазнання рэчаіснасці, 4) адэкватна адлюстроўвае ў свядомасці чалавека аб’ектыўную

[29] А.П.Коршунаў разглядае толькі постэдзіцыйную БІ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэчаіснасць. БІ як раз утрымлівае гэтыя кампаненты: яна праверана бібліяграфічнай практыкай, лагічна прадстаўлена, з'яўляецца вынікам пазнання дакументальных тэкстаў і патрэбнасцей карыстальнікаў і адэкватна адлюстроўвае іх у свядомасці чалавека ў выглядзе ўяўленняў, кагнітыўных вобразаў. Усё гэта і дазваляе назваць падобную інфармацыю бібліяграфічнымі ведамі. БВ – *гэта веды, неабходныя і дастатковыя для ідэнтыфікацыі дакументаў, дакументных масіваў у мэтах аптымальнага задавальнення ў аб'ёме дакументаў сацыяльных ведаў як саміх дакументаў, так і рэпрэзентатыўных (характэрных) звестак пра іх*. Бібліяграфічныя веды разглядаюцца як прырашчэнне ведаў у дакументах і новых ведаў аб дакументах. Яны маюць сваім аб'ектам фіксаваныя кванты любых ведаў, выдзяляюць і ідэнтыфікуюць іх, забяспечваюць інтэлектуальны доступ да іх з мэтай выкарыстання ў розных відах дзейнасці. БВ – адзін з кампанентаў сацыяльных кагнітыўных структур і ўсёй духоўнай дзейнасці чалавека, частка свядомасці. Аб пэўным навукоўцы мы найчасцей ведаем даты жыцця, ідэі, асноўныя працы – па сутнасці кангламерат бытавых, навуковых і бібліяграфічных ведаў.

Бібліяграфічныя веды з'яўляюцца сродкам пазнання, камунікацыі, каштоўнаснай арыентацыі, рэгулявання і кіравання. Можна выдзеліць аб'ектную і суб'ектную, фармальную і змястоўную, прасторавую і часавую, колькасную і якасную структуры бібліяграфічных ведаў.

### ***Уласцівасці бібліяграфічнай інфармацыі***

Спецыфіка БІ праяўляецца праз уласцівыя ёй якасныя характарыстыкі. Іх сукупнасць дазваляе апісаць бібліяграфічную інфармацыю як разнавіднасць інфармацыі, якая ствараецца, распаўсюджваецца і выкарыстоўваецца ў соцыуме. Аб уласцівасцях (якасцях) БІ пісалі А.С.Аўгусцінайціс, Ю.С.Зубаў, Ю.М.Лаўфер, В.П.Леонаў, А.В.Сакалоў, В.А.Факееў, С.А.Трубнікаў, Ю.М.Тугаў, Н.А.Сляднева і інш. Падагульняючы прапановы, выказаныя гэтымі аўтарамі, і разглядаючы БІ ў непарыўнай сувязі з дакументам (тэкстам) і адасоблена ад яго можна вызначыць наступныя ўласцівасці БІ: *другаснасць* і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адначасова асобныя рысы *першаснасці* БІ; *ідэнтыфікацыя* дакумента (тэксту), іх фрагментаў ці любой арганізаванай пэўным чынам сукупнасці; *інтэгратыўнасць ці мадэліраванне* дакументных патокаў і масіваў, асобных дакументаў; *комплекснасць інфармацыйнага зместу,* дваіснасць, а *шматвектарнасць (транзітыўнасць)* устанаўлення сувязей са стваральнікамі дакументаў (тэкстаў), дакументамі (тэкстамі), любымі іх фрагментамі ці спалучэннямі, карыстальнікамі; *стандартнасць*.

А.П.Коршунаў лічыць, што БІ ўласціва другаснасць ў асобым бібліяграфічным сэнсе. Яна праяўляецца як у адносінах да дакумента, так і адпаведна адносін паміж дакументам і спажыўцом. Другаснасць БІ праяўляецца галоўным чынам у тым, што БІ неабходна спажыўцу не сама па сабе, а як сродак пошуку першасных дакументаў, сродак папярэдняй арыентацыі ў іх змесце і форме, колькасці і якасці.

Але БІ можа адлюстроўваць дакументы як факты рэчаіснасці, гісторыка-культурнага працэсу, г.зн. ствараць першасную па сутнасці сваёй інфармацыю. І ў гэтым сэнсе БІ ўласціва не толькі другаснасць, а і першаснасць. Так, А.В.Сакалоў падкрэсліваў фактаграфічную сутнасць БІ. В.А.Факееў, у адрозненне ад А.П.Коршунава, сутнасць БІ і бібліяграфічных ведаў разглядае толькі ў камунікатыўным асяроддзі, але і ў пазнавальным, каштоўнасна-арыенціровачным. Бібліяграфічныя веды – веды фактуальныя, г.зн. веды аб аб’ектыўных фактах (асобна ўзятых прадметах, з’явах, якасцях, сувязях), якія можна непасрэдна назіраць і адносна поўна апісваць. Факты як асобая форма адлюстравання з’яў, выступаюць у якасці квантаў інфармацыі аб аб’ектыўным існаванні рэчаў, якасцей, адносін, падзей і ўяўляюць сабой пэўныя адзінкі ведаў, якія ўяўляюць сабой некаторы “інварыянт” інфармацыі аднатыпных падзей і з’яў, зафіксаваных у шэрагу назіранняў. Бібліяграфічны факт – гэта такое апісанне сукупнасці аб’ектыўных з’яў, якое атрымана ў выніку тэарэтычнага тлумачэння эмпірычных даных (аб дакуменце, частцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакумента), рацыянальна-пошукавай дзейнасці. Для бібліяграфічнага факта характэрна:

– лакалізацыя (дакладнасць існавання ў часе і прасторы);
– устойлівасць (захаванасць у часе);
– індывідуальнасць (непаўторнасць, распазнавальнасць, “ведаю ў твар”);
– лагічнасць (адпаведнасць пэўным агульным прынцыпам);
– наяўнасць унутранай арганізацыі;
– развітыя знешнія сувязі.

Бібліяграфічным фактам уласціва прымета ісціннасці (праўдзівасці), у адпаведнасці з якой вызначаюцца наступныя групы фактаў:

1. абсалютна ісцінныя і надзейныя – факты, якія адпавядаюць аб’ектыўнай рэальнасці (пры дапамозе бібліяграфічных звестак можа быць дакладна ідэнтыфікаваны дакумент);
2. бібліяграфічныя факты, ступень надзейнасці якіх з часам павялічваецца (размова ідзе пра змест дакумента, напрыклад, “адраджэнне з пепла” бібліяграфічных фактаў 1920–30-х гг.);
3. бібліяграфічныя факты, ступень надзейнасці якіх з часам памяншаецца, што вядзе да страты статуса фактычных ведаў (напрыклад, бібліяграфічныя веды аб крыніцах, якім не ўласціва ўстойлівасць, захаванасць у часе – тэксты на папірусе, на дыскетах);
4. ілжывыя, несапраўдныя бібліяграфічныя факты (несапраўдныя бібліяграфічныя звесткі, каб скрыць інфармацыю, выпадковыя памылкі)[30].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

30 Напрыклад, пры камплектаванні Александрыйскай бібліятэкі навукоўцы выяўлялі шмат падробленых кніг. Пталемеі (дынасція, якой належыла бібліятэка) вельмі дорага плацілі за кнігі і, адпаведна, знаходзілася шмат асоб, якія «прыпісвалі» малавядомыя творы вядомым аўтарам, ці тым, хто наогул нічога не пісаў, часам паступалі розныя кнігі з аднолькавымі назвамі ці наогул без тытульных даных. Напрыклад, несапраўднасць пісем Фаларыса, тырана горада Агрыгент на Сіцыліі (VI ст. да н.э.), была даказана толькі ў XVII ст. англічанінам Рычардам Бентлі.

Асобнае бібліяграфічнае паведамленне забяспечвае *ідэнтыфікацыю* любой фіксаванай інфармацыі: дакумента (тэксту), іх фрагментаў, ці лагічна ўтвораных сукупнасцей незалежнатаго, дзе яны знаходзяцца. Такой якасцю валодае толькі БІ. У выпадку, калі з дакумента зніклі па той ці іншай прычыне элементы латэнтнай БІ, якія яго ідэнтыфікуюць (выдзяляюць з дакументных масіваў), то яны фармулююцца навукоўцамі, “прысвойваюцца” дакументу і здзяйсняюць яго найменне, распазнаванне ў любой сукупнасці дакументаў (напрыклад, “Хроніка Быхаўца”, “Баркулабаўскі летапіс”).

БІ уласцівы *комплексны інфармацыйны змест*. Яна можа ўключаць не толькі бібліяграфічную, але і публіцыстычную, мастацкую і іншыя віды інфармацыі. Гэта ўласцівасць робіць празрыстай мяжу паміж бібліяграфічнымі і гістарыяграфічнымі, літаратурна-крытычнымі, навукова-крытычнымі матэрыяламі. Такая ўласцівасць БІ дазваляе ёй забяспечваць сваімі бібліяграфічнымі сродкамі ацэнку фіксаванай інфармацыі і забяспечваць каштоўнасна-арыентацыйнае ўздзеянне на карыстальніка.

БІ, якая існуе ў выглядзе мэтаскіравана створанай бібліяграфічнай прадукцыі, валодае *інтэгральнай* (не ўласцівай асобнаму бібліяграфічнаму запісу) якасцю *мадэліравання (адлюстравання*) фармальнай, змястоўнай, каштоўнаснай структур любых дакументных патокаў і масіваў. Бібліяграфічная інфармацыя мадэліруе дакументальныя масівы, дакументальныя патокі і асобныя дакументы (фрагменты дакументаў). Мадэлі, якія яна здольна ствараць, вызначаюцца як разнастайнасцю адлюстравання фрагментаў рэчаіснасці, так і рознай структурай: ад самай простай, аднамернай упарадкаванасці да складанейшай іерархізацыі элементаў. Мінімальнай адзінкай любой бібліяграфічнай мадэлі з’яўляецца бібліяграфічны запіс. Гэта вынік канчатковага логіка-лінгвістычнага пераўтварэння тэкстаў (дакументаў). Ён “раскрывае форму і змест першасных дакументаў з той ступенню паўнаты і дэталёвасці, якая б дазволіла, з аднаго боку, дастаткова дакладна ідэнтыфікаваць дакумент у патоку, а з другога – патэнцыяльнаму спажыўцу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі прыняць рашэнне аб мэтазгоднасці звяртання да першаснага дакумента”[31].

Стварэнне бібліяграфічных мадэляў ДМ дазваляе актуалізаваць палеагенную інфармацыю, уводзіць яе ў навуковы абарот, устанаўліваць логіка-семантычныя сувязі паміж асобнымі элементамі масіву. Мадэліраванне ДП дазваляе прасачыць дынаміку сучаснага развіцця галіны ведаў, выяўляць кола навуковых інтарэсаў даследчыкаў, сачыць за праблематыкай распрацовак навуковых, вучэбных установаў і грамадскіх арганізацый. Гэтыя мадэлі існуюць, як правіла, адасоблена ад тэксту першаснага дакумента – “дакумента, які змяшчае арыгінальны твор, звод твораў, матэрыялы і вынікі даследаванняў і распрацовак: першасную статыстычную, фактаграфічную і нарматыўна-прававую інфармацыю, вучэбныя, інструктыўна-метадычныя, практычныя матэрыялы і дапаможнікі, а таксама літаратурна-мастацкія, выяўленчыя, музычныя і аўдыавізуальныя творы”[32]. Яны адлюстроўваюць дакумент як фрагмент рэчаіснасці, факт і ў гэтым сэнсе ўяўляюць сабой разнавіднасць фактаграфічнай інфармацыі і ім уласцівы прыметы першасных дакументаў.

Разам з тым, бібліяграфічнае мадэліраванне можа здзяйсняцца і ў межах аднаго, асобна ўзятага першаснага (не бібліяграфічнага[33]) дакумента. Прычым гэтыя мадэлі даволі разнастайныя і па-рознаму мадэліруюць інфармацыю. Унутрыкніжная (унутрычасопісная, унутрыгазетная) БІ існуе ў дакуменце як асобны раздзел, частка, будуецца як любы бібліяграфічны спіс, і мадэлюе адпаведна ДП (фрагмент ДМ), вызначаны па пэўных прыметах.

Прыкніжная (прыартыкульная) БІ, прадстаўленая ўнутры самаго першаснага тэксту, у падрадковых заўвагах і каментарыях, па-за тэкстам, мадэліруе веды аўтара аб дакументах сугучных па праблематыцы яго твору. Гэта мадэль запатрабаванага аўтарам фрагмента ДМ. Яна існуе ў непарыўнай

---

[31] *Блюменау* Д.С. Проблемы свёртывания научной информации. – Л., 1982. – С. 25.

[32] *Библиотечное* дело: Терминологический словарь / Российская государственная библиотека. – 3-е изд., перераб. и доп. - М., 1997. – С. 86.

[33] Крыніцам бібліяграфічнай інфармацыі таксама ўласцівы прыметы першаснасці: у іх межах здзяйсняецца пазнанне і адлюстроўванне дакументаў як фактаў рэчаіснаці, гісторыка-культурнага працэсу і ў гэтым сэнсе яны арганічна ўваходзяць у першасны ДП.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сувязі з тэкстам, і, адпаведна, асаблівасці мадэліравання ведаў у тэксце абумоўліваюць яе структуру. Аўтар тэксту мадэліруе “зыходзячы са зместу і жанру сваёй працы магчымыя аптымальныя варыянты чытання … і ў адпаведнасці з іх дыяпазонам пранізвае тэкст алгарытмамі варыянтаў, розных спосабаў яго будучага чытання. Аўтар прадугледжвае чляненне інфармацыі... і аб’ём метаінфармацыйных элементаў, рэзіміруючых і анансіруючых характар кожнага раздзела, сувымяраючы гэта з аб’ёмам чалавечага разумення, прадугледжвае розныя ўваходы ў тэкст і выхады за яго межы, да яго вытокаў, да яго інфармацыйнай прасторы праз латэнтную БІ”[34]. Аўтар карыстаецца шэрагам крыніц, спасылаецца на іх, дае крытычны аналіз і праз бібліяграфічныя спасылкі вызначае месца свайго твора ў сістэме навуковых сацыяльных ведаў. Фармальны аналіз сукупнасці такіх бібліяграфічных запісаў (паток цытуемых дакументаў) дазваляе ствараць “карты навукі” і праслежваць яе развіццё за вялікі адрэзак часу.

Да тэксту дакумента могуць ствараццца дапаможныя паказальнікі – упарадкаваныя (па алфавіце ці якой-небудзь іншай прымеце) “пуцевадзіцелі” па гэтым тэксце, якія ўяўляюць сабой пералік назваў або абазначэнняў інфармацыйных аб’ектаў на яго старонках[35]. Яны аперыруюць асобнымі кампанентамі тэксту, ствараюць мадэлі тэматычнай, аўтарскай і інш. структур першаснага дакумента, забяспечваюць шматаспектны і хуткі пошук неабходнай інфармацыі, робяць (пры неабходнасці) магчымым адмаўленне ад суцэльнага прагляду тэксту. Яны здольны шматаспектна раскрыць змест дакумента, ілюстраваць паняційны апарат і тэрміналагічныя асаблівасці і ў пэўнай ступені характарызаваць прыналежнасць аўтара да пэўнай навуковай плыні, гістарычнай школы. Недаацэнка гэтага значна збядняе інфармацыйныя магчымасці выданняў.

---

[34] *Сляднева* Н.А. Библиография в системе Универсума человеческой деятельности: Опыт систем.-деятельност. анализа: (Моногр.). - М.: Изд-во МГИК, 1993. – С. 176.

[35] Призмент Э.Л., Динерштейн Е.А. Вспомогательные указатели к книжным изданиям. – М., 1988. – С.11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такое значэнне бібліяграфічнай інфармацыі для дакумента, тэксту, а таксама ўлік таго, што існуюць афінныя формы БІ як яго абавязковыя ідэнтыфікуючыя элементы, ілюструе наступную вельмі важную ўласцівасць гэтай з’явы – шматвектарнасць сувязей з аўтарам, дакументам, тэкстам, ведамі, карыстальнікамі, якую можна абазначыць як транзітыўнасць БІ ў адносінах да названых элементаў бібліяграфічнага адлюстравання. Такі падыход прасочваецца ў працах В.А.Факеева, Н.А.Слядневай. А.П.Коршунаў абмяжоўвае гэтую ўласцівасць толькі *двaіснасцю* адносін у метасістэме “дакумент–спажывец інфармацыі”, якую можна паказаць праз схему 1.

Неабходна адзначыць, што шматвектарнасць ці транзітыўнасць сувязей БІ не адмаўляе прапанаванай вышэй дваіснасці. Яна ўключае яе як прыватны выпадак адносін, на якіх будуецца постэдзіцыйныя (дыагенетычныя) формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі.

Вельмі важнай, але не абавязковай уласцівасцю з’яўляецца яе ўнутраная арганізаванасць па пэўных правілах – **стандартнасць**.

*Схема 1. Бібліяграфічная інфармацыя ў сістэме “дакумент–спажывец”*

<table>
<tr><td rowspan="4">Дакументы</td><td>ўзята з дакумента</td><td rowspan="4">БІ</td><td>ствараецца для спажыўца</td><td rowspan="4">Спажывец</td></tr>
<tr><td>дае звесткі аб дакументах ці іх частках</td><td>спажывец з’яўляецца непасрэдным ці апасрэдаваным аб’ектам бібліяграфічнага ўздзеяння</td></tr>
<tr><td>ўпарадкуе звесткі аб дакументах</td><td rowspan="2">прагназуецца ствараецца і распаўсюджваецца з улікам яго інфармацыйных патрэб спажыўца</td></tr>
<tr><td>адлюстроўвае (мадэліруе) любую сукупнасць дакументаў</td></tr>
</table>

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэта адносіцца не толькі да бібліяграфічных запісаў, але і да спосабаў іх групоўкі ў бібліяграфічных дапаможніках, да анатавання і рэферыравання, да састаўлення дапаможных паказальнікаў. Стандартнасць забяспечвае яе эфектыўнае і аднастайнае выкарыстанне ў розных грамадскіх інстытутах. Інфармацыя можа быць бібліяграфічнай і ў выпадках, калі яна ўключае свабодны набор элементаў, іх адвольную паслядоўнасць, але адназначна ідэнтыфікуе дакумент (тэкст), іх лагічна выдзелены фрагмент ці сукупнасць.

**Вывады.**

Бібліяграфічная інфармацыя з'яўляецца асноўным і найбольш агульным паняццем бібліяграфіі, якое дазваляе адрозніваць бібліяграфічныя з'явы ад небібліяграфічных і аб'яднаць у сістэму ўсе разнастайныя праяўленні бібліяграфічнай дзейнасці. У апошнія гады разам з тэрмінам БІ стаў ужывацца тэрмін бібліяграфічныя веды, як веды аб свеце тэкстаў і патрэбнасцях у іх, неабходныя і дастатковыя для ідэнтыфікацыі тэкстаў, уключэння іх у сістэму сацыяльных камунікацый, забеспячэння інтэллектуальнага доступу да іх. БІ уласціва шэраг уласцівасцей, якія дазваляюць вызначыць яе спецыфіку і выдзяліць сярод іншых відаў інфармацыі. Сутнасць БІ раскрывае не адна асобна ўзятая ўласцівасць, а іх сукупнасць.

## 1.3. Функцыянальная структура бібліяграфіі

***Функцыянальная структура бібліяграфіі як навуковая праблема***

Функцыя – гэта знешняе праяўленне якасцей аб`екта. Праз функцыі праяўляецца сутнасць бібліяграфіі (бібліяграфічнай інфармацыі) як грамадскай з'явы.

Функцыянальная структура бібліяграфіі павінна адлюстроўваць разнапланавасць кірункаў яе рэалізацыі, разнастайнасць з'яў, якія яна ўключае, прычым кожная з іх выконвае свае задачы ў адносінах да грамадства ў цэлым ці асобных грамадскіх інстытутаў, сфер дзейнасці. Таму існуе такая разнастайнасць у поглядах на функцыянальную структуру бібліяграфіі як грамадскай з'явы і асобных яе структурных частак (бібліяграфічнай прадукцыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галіновых кірункаў і інш.). Асноўныя падыходы да абгрунтавання функцыянальнай структуры бібліяграфіі як грамадскай з’явы можна падзяліць на дзве асноўныя групы: канцэпцыі функцыянальнай “дапаможнасці” і канцэпцыі функцыянальнай “самастойнасці”.

У межах канцэпцый функцыянальнай “дапаможнасці” бібліяграфію разглядаюць як дапаможную сферу дзейнасці і адпаведна яе функцыянальная структура абумоўлена задачамі, якія яна выконвае ў адносінах да гэтых сфер дзейнасці. Такі пералік функцый у прынцыпе не можа быць абмежаваным (іх можа быць столькі, колькі сфер дзейнасці яна абслугоўвае і рэалізацыі якіх задач яна спрыяе).

Згодна падыходаў функцыянальнай самастойнасці трэба выдзяляць функцыі, якія яна *сама выконвае як грамадская з’ява*, для выканання якіх яна з’явілася і якія адрозніваюць яе ад іншых сфер чалавечай дзейнасці. У апошнія дзесяцігоддзі развіваюцца менавіта такія падыходы. Яны прадстаўлены ў дакументаграфічнай канцэпцыі, распрацаванай А.П.Коршунавым, інфармаграфічнай (ідэаграфічнай) Н.А.Слядневай, когніталагічнай (когнітаграфічнай) В.А.Факеева, культуралагічнай М.Р.Вохрышавай і інш.

Фукцыянальная структура бібліяграфіі абумоўлена асаблівасцямі метасістэмы, у межах якой яе разглядаюць, уключэннем у яе асобных элементаў і сувязей паміж імі. Ніжэй будуць прапанаваны тры найбольш цікавыя і навукова абгрунтаваныя падыходы да вызначэння ўнутраных функцый бібліяграфіі як грамадскай з’явы. Яны адрозніваюцца па структуры, па пераліку функцый, паслядоўнасці праяўленняў, часам па аб’ёме паняццяў, якія ўкладываюцца ў аднолькавыя найменні. Але кожны з гэтых падыходаў паказвае грамадскую значнасць бібліяграфіі, яе выключна важную ролю для соцыума, камунікацыйных і кагнітыўных працэсаў, якія яна суправаджае, у пэўным сэнсе арганізуе і ўпарадкуе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *А.П.Коршунаў аб функцыях бібліяграфічнай інфармацыі*[36]

Як ужо адзначалася, у сістэме дакументальных камунікацый (Д – С) бібліяграфічная інфармацыя займае пасрэдніцкае становішча (Д – БІ – С). З аднаго боку, яна звязана з дакументам: яна ўзята з дакумента, арганізуе і ўпарадкуе звесткі аб дакументах, адлюстроўвае (мадэліруе) любую сукупнасць дакументаў і можа рабіць гэта незалежна ад патрэб спажыўцоў. З другога боку, яна звернута да спажыўца, як непасрэднага ці патэнцыяльнага аб'екта бібліяграфічнага ўздзеяння, яна ствараецца для спажыўца з улікам яго інфармацыйных патрэб і для іх задавальнення. Іншымі словамі БІ уласціва дваіснасць, якая заснавана на дваіснасці адносін "дакумент – спажывец". Другая частка дваіснасці мае вырашальнае значэнне пры вызначэнні асноўных грамадскіх функцый БІ.

Інфармацыйныя патрэбнасці спажыўца – гэта асэнсаваныя ці неасэнсваныя ім патрэбы ў атрыманні пэўных звестак аб рэчаіснасці. Яны могуць быць задаволены без звяртання да дакумента (пад час прыватнай гутаркі, кансультацый па тэлефоне і інш.). Такая інфармацыйная дзейнасць выходзіць за межы сістэмы дакументальных камунікацый. Калі спажывец не можа задаволіць свае інфармацыйныя патрэбнасці без звяртання да дакумента, то ў яго ўзнікаюць інфармацыйна-дакументальныя (ці проста дакументальныя) патрэбнасці. Яны з'яўляюцца асновай для фарміравання бібліяграфічных патрэбнасцей – неабходнасці знайсці пэўныя звесткі аб дакументах, у якіх заключана патрэбная яму інфармацыя. Далёка не ўсякая дакументальная патрэбнасць становіцца бібліяграфічнай. У выпадку, калі паміж спажыўцамі і дакументамі не існуе інфармацыйных бар'ераў (дакумент можна атрымаць у адкрытым доступе ў бібліятэцы, у кніжнай краме, ва ўласным кнігазборы) бібліяграфічныя патрэбнасці не ўзнікаюць – спажывец задавальняе свае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

36 *Коршунов, О.П.* Библиографоведение : основы теории и методологии : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по специальности 071201 - Библиотечно-информационная деятельность / О. П. Коршунов, Т. Ф. Лиховид, Т. А. Новоженова. – М.: Фаир, 2009. — С. 86–99.

інфармацыйныя патрэбнасці на ўзроўні непасрэднага звяртання да дакумента. Бібліяграфічныя ж патрэбнасці ўзнікаюць пры ўмовах:

– наяўнасці ў спажыўца асэнсаваных інфармацыйных патрэбнасцей;

– немагчымасці задаволіць інфармацыйныя патрэбнасці без звяртання да дакумента;

– немагчымасці непасрэднага атрымання дакумента;

– ведання спажыўцом крыніц БІ, адпаведных бібліяграфічных служб, да якіх можна звярнуцца пры пошуку інфармацыі.

Бібліяграфічныя (дакументальна-бібліяграфічныя) патрэбнасці надзвычай разнастайныя ў сваіх канкрэтна-практычных праяўленнях. У адпаведнасці з філасофскімі катэгорыямі (агульнае, прыватнае і адзінкавае) можна выдзеліць тры ўзроўні праяўлення дакументальна-бібліяграфічных патрэбнасцей: асноўныя, групавыя і індывідуальныя.

*Асноўныя* дакументальна-бібліяграфічныя патрэбнасці – гэта найбольш агульныя і простыя патрэбнасці, уласцівыя свету спажыўцоў у цэлым і незалежныя ні ад якіх прафесійных ці асабістых характарыстык. Яны аднолькавыя для ўсіх спажыўцоў і будуць існаваць, пакуль існуе сістэма дакументальных камунікацый.

*Групавыя* дакументальна-бібліяграфічныя патрэбнасці – гэта патрэбнасці ў інфармацыі аб дакументах, уласцівыя асобным канкрэтна-гістарычным утварэнням (групам): дзяржава, нацыя, грамадскае аб’яднанне, партыя, прафесійна-вытворчая, узроставая і інш. любая сацыяльная групоўка. На гэтым узроўні асноўныя дакументальна-бібліяграфічныя патрэбнасці набываюць спецыфічныя, характэрныя толькі для пэўнай групы, змест і форму. Так, якасна адрозніваюцца дакументальна-бібліяграфічныя патрэбнасці навукоўцаў розных галін ведаў, кіраўнікоў вытворчасці, студэнтаў розных ВНУ і г.д.

*Індывідуальныя* дакументальна-бібліяграфічныя патрэбнасці – гэта патрэбнасці ў інфармацыі аб дакументах, уласцівыя асобным спажыўцам. На гэтым узроўні здзяйсняецца канкрэтызацыя асноўных і групавых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакументальна-бібліяграфічных патрэбнасцей у адпаведнасці з ведамі, здольсцямі, псіхічнымі асаблівасцямі кожнага асобна ўзятага спажыўца дакументаванай інфармацыі.

Вызначэнне асноўных грамадскіх функцый бібліяграфічнай інфармацыі магчыма і неабходна на ўзроўні *асноўных* дакументальна-бібліяграфічных патрэбнасцей (дакументальна-бібліяграфічных патрэбнасцей грамадства ў цэлым). Прычым іх мэтазгодна суадносіць з асноўнымі параметрамі дакумента: *форма, змест, прызначэнне (цэннасць)*. Адпаведна ва ўсёй разнастайнасці рэальна існуючых асноўных дакументальна-бібліяграфічных патрэбнасцей можна выдзеліць:

– патрэбнасць у пошуку дакументаў ужо вядомых спажыўцу;

– патрэбнасць у апавяшчэнні аб дакументах пэўнага зместу і/ці формы;

– патрэбнасць ў ацэнцы дакументаванай інфармацыі па розных якасных крытэрыях з улікам магчымасцей успрыняцця інфармацыі.

Як бачна, у сістэме Д – С узнікае тры тыпы адпаведнасцей паміж дакументальна-бібліяграфічнымі патрэбнасцямі спажыўцоў і дакументамі: *фармальныя, змястоўныя і цэннасныя*.

Пры рэалізацыі першай адпаведнасці (задавальненні патрэбнасці ў пошуку дакументаў) спажыўцу дастаткова ведаць і браць да ўвагі фармальныя характарыстыкі дакумента, якія дазваляюць здзейсніць яго бібліяграфічную ідэнтыфікацыю* (установіць бібліяграфічнае апісанне) і вызначыць месца знаходжання дакумента. Прычым БІ забяспечвае пошук не толькі асобна ўзятага дакумента, а і яго любой структурнай адзінкі: асобнага твора ў зводным выданні, глаў, раздзелаў, артыкулаў, асобных выказванняў. БІ такім чынам выконвае адну з асноўных сваіх функцый – *пошукавую*.

Пры рэалізацыі другой адпаведнасці (задавальненні патрэбнасці ў апавяшчэнні аб дакументах) здзяйсняецца інфарміраванне спажыўцоў аб дакументах, якія былі выпушчаны ў мінулым, выходзяць зараз ці рыхтуюцца да

* параўнанне пэўнага дакумента з сукупнасцю іншых і выдзяленне яго з гэтай сукупнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдання. БІ такім чынам выконвае *камунікатыўную* функцыю (функцыю апавяшчэння).

Рэалізацыя трэцяга тыпу адпаведнасцей (задавальненне патрэбнасцей у ацэнцы дакументаў) дасягаецца шляхам мэтанакіраванага адбору, характарыстыкі і рэкамендацыі дакументаў, адпаведных узроўню падрыхтаванасці спажыўцоў (груп спажыўцоў), асаблівасці іх інфармацыйных патрэбнасцей, мэтам інфармацыйнай дзейнасці (навукова-дапаможным, вучэбна-дапаможным, вытворча-дапаможным, выхаваўчым і інш.). БІ пры гэтым выконвае *ацэначную* функцыю.

Такім чынам, разнастайнасць дакументальна-бібліяграфічных патрэбнасцей спажыўцоў суадносіцца з асноўнымі характарыстыкамі дакументаў, утвараючы тры тыпы адпаведнасцей: фармальныя, змястоўныя, цэннасныя. Фармальныя вызначаюцца неабходнасцю ідэнтыфікацыі і пошуку дакумента. Яны фарміруюць пошукавую функцыю БІ. Змястоўныя звязаны з задачай давядзення інфармацыі да спажыўца, апавяшчэння аб наяўнасці неабходных дакументаў. Яны фарміруюць камунікатыўную функцыю БІ. Цэннасныя адносіны (адпаведнасці) вызначаюцца патрэбнасцямі ў ацэнцы дакументаў у працэсе іх выкарыстання. Яны фарміруюць ацэначную функцыю БІ.

На думку А.П.Коршунава[37], асноўныя грамадскія функцыі БІ праяўляюцца ў наступнай паслядоўнасці: пошукавая, камунікатыўная, ацэначная. Такая паслядоўнасць адлюстроўвае шлях ад простага да найбольш складанага. Пошукавая функцыя з'яўляецца генетычна зыходнай і валодае адноснай незалежнасцю і самастойнасцю. Яна можа рэалізоўвацца на базе канкрэтнага дакументальнага фонда спецыяльнымі сродкамі, якія маюць на мэце толькі пошукавыя мэты і не ўтрымліваюць камунікатыўных і ацэначных кампанентаў.

Наступная асноўная грамадская функцыя БІ ў генетычным функцыянальным радзе – камунікатыўная. Яна ўключае ў сябе магчымасці

[37] *Коршунов, О.П.* Библиографоведение. Общий курс: учеб. для вузов: В 2 ч / О.П.Коршунов. – М., 2001. – Ч. 1–2. – С. **

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пошукавай: розныя сродкі здзяйснення камунікатыўнай функцыі могуць быць выкарыстаны ў пошукавых мэтах. Рэалізацыя камунікатыўнай функцыі БІ не прадугледжвае абавязковай сувязі з пэўным фондам дакументаў, яна нават больш поўна рэалізуецца без абмежавання дакументальным фондам.

Сродкі рэалізацыі ацэначнай функцыі абавязкова ўключаюць камунікатыўныя і пошукавыя магчымасці БІ. Бібліяграфічны дапаможнік ацэначнага прызначэння абавязкова выконвае пошукавую і камунікатыўную функцыі, напрыклад, бібліяграфічныя запісы, уключаныя ў дапаможнік, забяспечваюць ідэнтэфікацыю дакументаў, а складанне алфавітнага дапаможнага паказальніка ўяўляе сабой фіксіраванне яго папярэдніх пошукавых магчымасцей.

Агульная заканамернасць функцыянальнай структуры БІ праяўляецца такім чынам**:** *кожная асноўная грамадская функцыя можа выяўляцца (обнаруживаться) без наступнай, але не можа не ўключаць у сябе магчымасцей папярэдней.*

*Мал. 1. Генетычная структура БІ (паводле А.П.Коршунава)*[38].




А. Пошукавая функцыя

В. Камунікатыўная функцыя

С. Ацэначная функцыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[38] *Коршунов, О.П.* Библиографоведение. Общий курс: учеб. для вузов: В 2 ч / О.П.Коршунов. – М., 2001. – Ч. 1–2. – С. **

Сродкі рэалізацыі пошукавай і камунікатыўнай функцый (крыніцы агульнай бібліяграфія) адлюстроўваюць фармальныя і змястоўныя прыметы дакумента без уліку спецыфічных груп тых ці іншых спажыўцоў інфармацыі. Сродкі рэалізацыі ацэначнай функцыі адлюстроўваюць цэннасныя прыметы дакумента, крыніцы БІ (крыніцы спецыяльнай бібліяграфіі) ствараюцца для пэўных груп, з улікам іх інфармацыйных патрэбнасцей.

Генетычная структура функцый БІ праслежваецца і ў эвалюцыі бібліяграфічнай прадукцыі: спачатку з'явіліся простыя пошукавыя сродкі (каталогі), потым рэгістрацыйныя формы бібліяграфічнай інфармацыі камунікатыўнага прызначэння (бібліяграфічныя дапаможнікі, якія ўлічвалі ўсю друкаваную прадукцыю, дакументы адной краіны, дакументы, якія паступілі ў продаж і г.д.), затым розныя сродкі рэалізацыі ацэначнай функцыі (навукова-дапаможныя, прафесійна-вытворчыя, самаадукацыйныя бібліяграфічныя дапаможнікі і інш.), якія вырашалі задачы мэтанакіраванага ўздзеяння на пэўныя групы карыстальнікаў).

Неабходна адзначыць, што асноўныя грамадскія функцыі выдзяляюцца абстрактна і спрошчана. Пошукавая звязана толькі з прасторавым рассейваннем дакументаў, іх ідэнтыфікацыяй і ўстанаўленнем месца знаходжання, камунікатыўная – з адлюстраваннем развіцця ў часе зместу і формы дакументаў, ацэначная – з мэтанакіраванай ацэнкай дакументаў па розных крытэрыях. Рэальна існуючыя крыніцы БІ, як правіла, выконваюць адначасова дзве-тры функцыі (гл. асноўную заканамернасць праяўлення асноўных грамадскіх функцый). Усе магчымыя лагічныя праяўленні асноўных грамадскіх функцый у бібліяграфічнай прадукцыі адлюстроўвае функцыянальна-лагічная структура БІ.

Паміж функцыямі магчыма два тыпы адносін: прэвалявання – адна функцыя дамініруе, другая спадарожнічае ёй (напрыклад, крыніцы дзяржаўнай бібліяграфіі выконваюць асноўную камунікатыўную функцыю, пошукавая неяўна выражана); раўназначнасці (эквівалентнасці) – розныя функцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадстаўлены прыкладна аднолькава (напрыклад, бібліяграфічны паказальнік “Кніга Беларусі: Зводны каталог” (Мінск, 1986) выконвае ў роўнай ступені пошукавую і камунікатыўную функцыі). Такія функцыі можна назваць камбінаванымі (камунікатыўна-пошукавая, пошукава-камунікатыўная і інш.)

Такім чынам, БІ існуе ў сістэме дакументальных камунікацый, займае ў ёй пасрэдніцкае становішча, забяспечвае ідэнтэфікацыю і пошук дакументаў, апавяшчэнне аб існаванні дакументаў пэўных зместу і формы, якасную ацэнку дакументаў па розных крытэрыях і выконвае тым самым *пошукавую, камунікатыўную і ацэначную* асноўныя грамадскія функцыі.

***Дыскусія 80-х гадоў XX ст. аб функцыях бібліяграфічнай інфармацыі***

Пасля абгрунтавання А.П. Коршунавым асноўных грамадскіх функцыі бібліяграфіі, якія яна выконвае на любым этапе развіцця грамадства, распачалася дыскусія (В.А.Факееў, А.В.Сакалоў і інш.). Быў падтрыманы падыход А.П. Коршунава аб мэтазгоднасці выдзялення асноўных (унутраных) функцый і ў цэлым іх пералік. Але было выказана меркаванне аб уласцівасці бібліяграфіі не толькі ўнутраных, але і знешніх гістарычна абумоўленых функцый. У якасці знешніх выдзеляліся ідэалагічная, арганізацыйна-кіруючая, гедыністычная, сацыялізуючая, культурна-асветніцкая і інш.

У канцэпцыях бібліяграфіі як грамадскай з’явы, распрацаваных у 90-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст. былі развіты падыходы функцыянальнай самастойнасці, якія найбольш яскрава праявіліся ў канцэпцыях Н.А.Слядневай, В.А. Факеева, М.Р.Вохрышавай і інш.

***В.А.Факееў аб функцыях бібліяграфіі***

У працах В.А. Факеева пачатку XXI ст. выказана меркаванне аб існаванні[39] трох узроўневай структуры функцый бібліяграфі. Першы ўзровень – агульная (сутнасная) функцыя, якая аб’ядноўвае патэнцыял бібліяграфіі – *бібліяграфічная*. Гэта функцыя аптымізацыі кагнітыўна-інфармацыйнага ўзаемадзеення і адпаведнасцей ў сістэме “свет тэкстаў – свет патрэбнасцей у тэкстах”, ці

[39] Фокеев В.А. Библиография: теоретико-методологические основания: учеб. Пособие. – СПб., 2006. – С.246–252.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

забеспячэння інтэллектуальнага (ідэальнага) доступу да фіксаваных тэкстаў, іх патокаў і масіваў.

Другі ўзровень прадстаўлены унутрысістэмнымі[40] функцыямі:

– *пазнавальная* (бібліяграфічнае пазнанне дакументаў, дакументных патокаў і масіваў, іх ідэнтыфікацыя);

– *інфармацыйна-камунікатыўная* (забеспячэнне сацыяльнай дакументнай камунікацыі на бібліяграфічным узроўні, аптымізацыя адпаведнасцей і ўзаемадзеяння ў сістэме “аўтар – тэкст – карыстальнік тэксту);

– *цэнасна-арыентацыйная, сацыякультурная* (бібліяграфічная ацэнка фіксаваных тэкстаў (дакументаў) па розных якасных крытэрыях, забеспячэнне арыентацыі ў свеце тэкстаў, магчымасці аперыравання і ўпраўлення іх патокамі і масівамі).

Унутрысістэмныя (агульныя, абстрактныя, фундаментальныя) функцыі ўласцівы бібліяграфіі як грамадскай з’яве незалежна ад выкарыстання яе ў канкрэтных грамадскіх мэтах. Сутыкаючыся з канкрэтнымі сферамі абслугоўвання ў ходзе гістарычнага развіцця, яны набываюць розныя канкрэтна-гістарычныя функцыянальныя “надбудовы” прыкладнога характару. Выключна поўна такія функцыі выявіць немагчыма. Можна гаварыць аб прыкладным пераліку іх у канкрэтны перыяд часу. Разам з тым іх выяўленне нельга недацэньваць. Яны даюць магчымасць вызначыць месца і ролю бібліяграфіі, дыферэнцыраваць яе прызначэнне, кіраваць ёю і весці пошук рэзерваў для яе развіцця. На сучасным этапе развіцця грамадства, лічыць В.А.Факееў, можна выявіць наступныя прыкладныя функцыі бібліяграфіі:

– *сацыялізуючыя функцыі* (мадэфікацыя функцыянальнай бібліяграфічнай цэннаснай арыентацыі) – *педагагічная, папулярызатарская, прапедэўтычная, бібліятэрапеўтычная*;

– *ідэалагічная* функцыя (на сучасным этапе развіцця грамадства праяўляецца слаба, сугучна з *прапагандыскай* функцыяй);

---

[40] у розных публікацыях яны называюцца агульнымі, абстрактнымі, фундаментальнымі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– *мадэлюючыя і пазнавальныя* функцыі: *вымяральная, апісальная, падагульняючая, прагнастычная* і інш.

***Н.А.Сляднева аб функцыянальнай структуры бібліяграфіі*** Н.А.Сляднева разглядае існаванне бібліяграфіі ў метасістэме “універсум чалавечай дзейнасці” як з’яву інфраструктурнага характару і, адпаведна, імкнецца праілюстраваць гэта праз функцыянальную структуру.

Яна лічыць, што бібліяграфія выконвае сутнасную функцыю *ўніверсальнага метада аперыравання суверэннымі інфааб’ектамі.* Бібліяграфіі ўласціва ствараць метадычныя веды, якія маюць інфраструктурны характар і пранізваюць усе сферы дзейнасці грамадства. Гэтую функцыю бібліяграфія выконвае заўсёды.

Акрамя гэтага бібліяграфіі ўласцівы *агульнасістэмныя канкрэтна-гістарычныя* функцыі:

– намінатыўная блок-функцыя (магчымасць бібліяграфічнымі сродкамі называць любы інфааб’ект);

– упраўляючая блок-функцыя (магчымасць бібліяграфічнымі сродкамі мэтанакіравана ўздзейнічаць на ўзроўні пошука дакументаў, кіравання чытаннем і ведамі);

– гнасеалагічная блок-функцыя (адлюстроўвае навуковыя магчымасці бібліяграфіі, у тым ліку падагульненне навуковых ведаў на ўзроўні развіцця культуры ў цэлым, асобнай навукі).

Бібліяграфіі ўласцівы таксама галіновыя (радавыя) метасістэмныя функцыі (адлюстроўваюць ролю бібліяграфіі ў тых ці іншых сферах Універсума чалавечай дзейнасці):

– функцыі абслугоўвання (вызначаюцца назвай сфер дзейнасці – у дапамогу вытворчасці, адукацыі, будаўніцтву і т.д.);

– функцыі рэдуплікацыі (праяўляюцца ў межах сфер дзейнасці, з якімі бібліяграфія ўтварае сінтэтычныя сферы: літаратуразнаўства, кнігазнаўства, гісторыя, і, адпаведна, функцыі гісторыка-літаратурная, тэксталагічная,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратурна-крытычная; кнігазнаўча-тыпалагічная, гісторыка-кнігазнаўчая, кніжна-статыстычная; крыніцазнаўчая, гістарыяграфічная).

**Вывады.** Такім чынам, бібліяграфія – поліфункцыянальная з’ява. Сукунасць функцый, якія яна выконвае, забяспечвае рэалізацыю яе сацыяльнага прызначэння. У сучасных поглядах навукоўцаў на функцыянальную структуру бібліяграфіі прэвалюе выдзяленне некалькіх узроўняў, першы (сутнасны, агульны) вызначае яе прыроду, ролю як грамадскай з’явы, іншыя канкрэтызуюць гэты ўзровень і апісваюць галіновыя агульнасістэмныя ці канкрэтна гістарычныя праяўленні. Разам дазваляюць прааналізаваць месца і ролю бібліяграфіі, дыферэнцыраваць яе прызначэнне, кіраваць ёю і весці пошук рэзерваў для яе развіцця.

### 1.4. Формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі

***Бібліяграфічнае паведамленне як асноўная элементарная адзіка БІ***
Элементы бібліяграфічнай інфармацыі зарадзіліся разам з дакументам, з'яўляюцца сродкам яго наймення, распазнавання ў сукупнасці іншых, сродкам уліку і ўпарадкавання дакументных патокаў, папулярызацыі навуковых ведаў і інш.

Бібліяграфічная інфармацыя прайшла вялікі шлях у сваім развіцці. Разам з навукай, культурай і тэхнікай удасканальваліся яе формы, тыпы, віды, афармлялася жанравая разнастайнасць, змяняліся матэрыяльныя носьбіты яе фіксавання.

Іх склад мае канкрэтна-гістарычны характар, вельмі дынамічны і разнастайны. Аднак ва ўсёй гэтай разнастайнасці і непаўторнасці ёсць і агульныя рысы, якія дазваляюць паказаць што з’яўляецца зыходным для самых розных праяўленняў бібліяграфічнай інфармацыі. Для любога аб’екта ўвагі чалавека, на аснове якога можа ствараецца БІ (а гэта дакумент (тэкст), іх лагічна выдзеленая частка ці сукупнасць), выдзяляюцца пэўныя звесткі (даныя), якія яго характарызуюць і могуць спрыяць выдзяленню з сукупнасці іншых. Яны называюцца бібліяграфічнымі звесткамі. Найчасцей гэта імя аўтара, назва,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

месца выдання, выдавецтва, год выхаду дакумента ў свет, колькасць старонак і інш. Яны існуюць у дакуменце як сродак іх найменне і разнастайнай характарыстыкі. Аднак адасоблена ўзятыя бібліяграфічныя звесткі не даюць магчымасці ідэнтыфікаваць і знайсці пэўны дакументны аб’ект і адпаведна не даюць падставы разглядаць гэтыя даныя як праяўленні бібліяграфічнай інфармацыі. Неабходны набор бібліяграфічных звестак, якія дазволяць адназначна ахарактарызаваць і распазнаць дакумент (яго частку ці сукупнасць), выдзяліць яго з дакументных патокаў і масіваў. Такі набор ці сукупнасць называецца *бібліяграфічным паведамленнем* і яно з’яўляецца элементарнай адзінкай любой БІ. *Бібліяграфічнае паведамленне* – гэта сукупнасць бібліяграфічных звестак, цэласнае структурнае ўтварэнне (мінімальнае і недзялімае), якое забяспечвае ідэнтыфікацыю і пошук дакумента.

У слоўніку “Библиотечное дело: Терминологический словарь” (М., 1997) прыводзіцца два значэнні тэрміна “бібліяграфічнае паведамленне” – 1) элемент БІ, які ўтрымлівае арганізаваныя па пэўных правілах (стандартныя) звесткі аб дакуменце (яго частцы) ці групе дакументаў; 2) передача БІ[41]. У першым робяцца прынцыповыя памылкі: бібліяграфічнае паведамленне не абавязкова стандартызаванае, яно можа давацца і ў адвольнай форме; недакладна называецца самая галоўная ўмова адрознення бібліяграфічнага паведамлення і адпаведна БІ ад іншых разнавіднасцей паведамленняў (інфармацыі) – звесткі аб дакуменце (яго частцы) ці групе дакументаў, якія ў сукупнасці сваёй ідэнтыфікуюць іх. Апошняе надзвычай важна, таму што далёка не ўсякі набор бібліяграфічных звестак гэта здольны зрабіць і адпаведна ўяўляць сабой бібліяграфічнае паведамленне. Больш дакладна яно даецца ў “Тлумачальным слоўніку бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў” В.Е.Лявончыкава, Л.А.Дзямешкі, Р.І.Саматыя (Мінск, 2000). Бібліяграфічнае паведамленне – “элемент БІ, які ўтрымлівае арганізаваныя па вызначаных

[41] Библиотечное дело: Терминологический словарь / Рос. гос. б-ка. – 3-е изд., перераб. и доп. – М., 1997. – С.18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правілах (стандартныя) звесткі аб дакуменце (яго частцы ці групе дакументаў), неабходныя і дастатковыя для рэалізацыі асноўных функцыі БІ. Бібліяграфічнае паведамленне можа перадавацца ў дакументальна фіксаванай і вуснай формах"[42]. Але пад гэта азначэнне не падпадае шырокі спектр нестандартызаваных вусных і пісьмовых бібліяграфічных паведамленняў. У рэчаіснасці ж мы іх перадаем пастаянна, напрыклад, вусна ў час бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання, пісьмова у адвольнай паслядоўнасці і з розным наборам бібліяграфічных звестак. У ніжэй прыведзеным фрагменце пісьма даюцца нестандартызаваныя бібліяграфічныя паведамленні з вольным пералікам бібліяграфічных звестак, якія дазволілі ідэнтыфікаваць запрошаныя выданні.

*Андрэй Курбскі (1528-1583) – военачальнік, палітычны дзеяч, публіцыст. Баючыся рэпрэсій Івана Жахлівага, у 1564 г. збег у ВКЛ. Імкнуўся забраць сваю бібліятэку з Юр'ева. У пісьме да баярскіх сыноў Якаву Шаблікіну і Ігнацію Агібалаву пісаў:*

*"Здесь у нас, Яков, твой человек взят, а Игнатьева жена, да сын, да сноха; и будет тебе, Яков, человек надобен, и ты бы допытался книг княжь Андреевых Курбского, которые остались в Юрьеве. Книга одна в полдесьть, писана скорописью, а кожа наней не на всей, лишь на пяте (корешке), кожа клеена, а тетрадей в ней есть с шестьдесят и семьдесят… ". Далей прыводзіцца змест зборніка "Слово Иосифа Евреенина о Макковеях да Слово о Аврааме и о Милхиседеке и Оригене, да и иные многие словеса Максима Философа да и иных святых. А другая книга – мучение князя Михаила Черниговского да боярина его Фёдора, житие Августия Ипанискаго, да и иные словеса, а переведено из латинского языка, а переплетено ново, а кожи на ней ещё не положено. Да книга Апостол, а писан в десть, а письмо доброе, а переплетён по-немецки. А будет тебе, Яков, человек твой надобен, и ты бы книги приготовил да срок учинил, как книги будут готовы; а человека твоего*

[42] Лявончыкаў В.Е., Дзямешка Л.А., Саматыя Р.І.Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў. – Мінск, 2000. – С.33–34.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*приготовим, приведем из Вильны в Вольмар. А будет книг не допытаешься и не приготовишь их и мы человека твоего обесим (повесим)”.*

Бібліяграфічнае паведамленне можа існаваць у вуснай і фіксаванай формах. Вуснае бібліяграфічнае паведамленне ўключае, як правіла, мінімальны набор бібліяграфічных звестак, якія дазваляюць ідэнтыфікаваць дакумент (яго частку, сукупнасць), перадаецца вербальна і адпаведна не захоўваецца ў прасторы і часе.

Фіксаваная форма бібліяграфічнага паведамлення называецца *бібліяграфічным запісам*. Абавязковай і мінімальнай адзінкай бібліяграфічнага запісу з’яўляецца бібліяграфічнае апісанне дакумента (яго часткі ці сукупнасці), якое можа суправаджацца класіфікацыйнымі індэксамі, аўрарытэтнымі/нарматыўнымі запісамі, анатацыяй, рэфератам, адной ці некалькімі прадметнымі рубрыкамі, адной ці некалькімі ключавымі словамі, указаннямі на месца захоўвання (сігламі ўстановы, шыфрамі фондаў). У запісы могуць уключанцца выявы вокладак і некалькіх старонак тэксту, цытаты з тэкстаў, спасылкі на рэцэнзіі і інш. Гэта робіцца для больш глыбокай характарыстыкі дакумента, раскрыцця яго зместу, мэтавага і карыстальніцкага прызначэння, папулярызацыіі ведаў, рэкламы і да д.п.

Адпаведна наяўнасці гэтых дадатковых элементаў да асноўнага (бібліяграфічнага апісання) бібліяграфічныя запісы падзяляюцца на запісы простай і складанай структуры. Бібліяграфічныя запісы простай структуры ўключаюць толькі бібліяграфічныя апісанні. Бібліяграфічныя запісы складанай структуры ўключаюць акрамя бібліяграфічных апісанняў адзін ці некалькі дадатковых элементаў. Запісы адрозніваюцца не толькі па наборы элементаў, але і па фармаце іх прадстаўлення. Напрыклад, запіс на адзін і той жа дакумент можа выглядаць па-рознаму ў фарматах, якія выкарыстоўваюцца для электронных і картачных каталогаў (глядзі Дадатак да Тэмы 1.4). Бібліяграфічны запіс з’яўляецца бібліяграфічнай мадэллю асобнага дакумента

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(тэксту), іх сукупнасцей ці лагічна выдзеленых частак. На аснове гэтых мадэлей ствараецца ўвесь спектр бібліяграфічнай прадукцыіі.

### *Бібліяграфічны дапаможнік як асноўны спосаб існавання і сродак распаўсюджвання дакументаванай бібліяграфічнай інфармацыі*

На аснове бібліяграфічных запісаў ствараюцца розныя бібліяграфічныя прадукты. У сучаснай тэрмінасістэме ўжываюцца ў якасці аналагічных назваў – бібліяграфічныя дапаможнікі, бібліяграфічныя дакументы, крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі, часам (у вузкім сэнсе гэтага слова) – бібліяграфічныя рэсурсы. Іншымі словамі любую, незалежна ад аб’ёму, формы, структуры, зместу і іншых характарыстык, замацаваную на матэрыяльным носьбіце БІ можна назваць бібліяграфічным дапаможнікам, ці бібліяграфічным дакументам, ці бібліяграфічным прадуктам, ці бібліяграфічным рэсурсам ці крыніцай бібліяграфічнай інфармацыі. Азначэнні некалькі адрозніваюцца (гл. гласарый), але аб’ёмы паняццяў у цэлым супадаюць. І адпаведна бібліяграфічны запіс (просты і/ці складаны) з’яўляецца іх асноўнай уліковай адзінкай. Найбольш распаўсюджаны ў спецыяльнай літаратуры тэрмін бібліяграфічны дапаможнік.

Пад бібліяграфічным дапаможнікам разумеюць пэўным чынам упарадкаванае мноства бібліяграфічных запісаў, аб’яднаных адзінствам задумы, прызначэння, формы і/ці зместам уключаемай інфармацыі. *Бібліяграфічныя дапаможнікі* з’яўляюцца асноўным спосабам існавання і сродкам распаўсюджвання дакументаванай бібліяграфічнай інфармацыі. Гэта паняцце ахоплівае вельмі шырокі спектр з’яў. Вызначыліся, існуюць і актыўна развіваюцца розныя формы, тыпы і жанры бібліяграфічных дапаможнікаў. У сукупнасці сваёй яны ствараюць бібліяграфічныя рэсурсы (у вузкім разуменні гэтага слова) ці з’яляюцца часткай гэтых рэсурсаў (шырокім сэнсе).

Пад *бібліяграфічнымі рэсурсамі* ў шырокім сэнсе разумеецца *патэнцыял бібліятэк і іншых устаноў, якія здзяйсняюць бібліяграфічную дзейнасць: сістэма інфармацыйна-бібліяграфічных выданняў,* даведачна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічны аппарат*, бібліяграфічныя кадры, матэрыяльна-тэхнічная база, грашовыя сродкі і інш.* У вузкім – толькі *сукупнасць бібліяграфічнай прадукцыі (*бібліяграфічных дапаможнікаў). Бібліяграфічныя рэсурсы ўваходзяць ў больш шырокія метасістэмы – дакументныя і інфармацыйныя рэсурсы.

### ***Формы бібліяграфічных дапаможнікаў***

Бібліяграфічныя дапаможнікі адрозніваюцца па шэрагу фармальных прымет. Важнейшая з іх – матэрыяльная канструкцыя, згодна якой выдзяляюцца наступныя формы існавання бібліяграфічных дапаможнікаў:

– картачныя бібліяграфічныя дапаможнікі;

– бібліяграфічныя выданні і рукапісы;

– несамастойныя выдавецкія формы (унутры ці прытэкставыя);

– аўтаматызаваныя бібліяграфічна-пошукавыя сістэмы (электронныя ці лічбавыя).

Да картачных формаў бібліяграфічных дапаможнікаў адносяцца картачныя бібліяграфічныя каталогі і картатэкі[43]. *Картачныя бібліяграфічныя каталогі* – пэўным чынам арганізаваная сукупнасць бібліяграфічных запісаў дакументаў, якая раскрывае склад і/ці змест аднаго ці некалькіх дакументных фондаў і прадстаўлена ў картачнай форме. Такія каталогі атрымалі шырокае распаўсюджванне ў бібліятэках, архівах.

Элементарнай уліковай адзінкай картачнага каталога з’яўляецца бібліяграфічная картка, на якой у пэўнай, дакладна вызначанай паслядоўнасці размешчаны звесткі аб змесце, форме, месцы знаходжанні дакумента. Карткі існуюць адасоблена, звязаны паміж сабой толькі лагічнай ці фармальнай сувяззю прадстаўленай на іх інфармацыі. Гэта дазваляе пастаянна папаўняць картачныя каталогі, не парушаючы пры гэтым іх структурнае адзінства. Найбольш распаўсюджанымі ў бібліятэчнай практыцы з’яўляюцца алфавітныя,

[43] *Бібліяграфічныя каталогі* – бібліяграфічныя дапаможнікі, якія раскрываюць склад і/ці змест аднаго ці некалькіх фондаў бібліятэк, архіваў, кнігагандлёвых устаноў. Яны могуць існаваць не толькі ў карткавай форме, а і ў друкаванай, электроннай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сістэматычныя, прадметныя картачныя каталогі (па способе групоўкі матэрыялу).

Алфавітны каталог – бібліяграфічны дапаможнік, у якім бібліяграфічныя запісыпрадстаўлены ў картачнай форме і размеркаваны ў алфавіце імёнаў (прозвішчаў) аўтараў ці загалоўкаў дакументаў. Алфавітны каталог дае магчымасць удакладніць ці ёсць кнігі пэўнага аўтара (аўтараў, скаладальнікаў, рэдактараў) у фондзе бібліятэкі; ці ёсць кнігі з пэўнай назвай у фондзе бібліятэкі; устанавіць звесткі дастатковыя для заказу і пошуку кнігі ў фондзе бібліятэкі (элементы бібліяграфічнага апісання, індэксы класіфікацый, шыфры месцаў захавання кнігі); наяўнасць кніг, прысвечаных пэўнай асобе.

*Сістэматычны каталог* – бібліяграфічны дапаможнік, у якім бібліяграфічныя запісы прадстаўлены ў картачнай форме і размеркаваны па галінах ведаў у адпаведнасці з пэўнай бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыяй. У бібліятэчнай практыцы Беларусі ў асноўным выкарыстоўваюцца Універсальная дзесятковая класіфікацыя (УДК) і Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя (ББК). Усе раздзелы вызначаны ў лагічнай паслядоўнасці, у межах асобнага раздзела літаратура размеркавана ад агульнага да прыватнага.

*Прадметны каталог* – бібліяграфічны дапаможнік, у якім бібліяграфічныя запісы прадстаўлены ў картачнай форме і размеркаваны ў агульным алфавіце (незалежна ад галін ведаў) прадметных рубрык, за якімі канцэнтруюцца бібліяграфічныя запісы на дакументы адпаведнай тэматыкі.

*Бібліяграфічныя картатэкі* – бібліяграфічныя дапаможнікі, у якіх на картках у пэўнай паслядоўнасці (фармальнай ці змястоўнай) размяркоўваюцца бібліяграфічныя запісы на дакументы ці іх часткі, неабавязкова прадстаўленыя ў фондзе пэўнай бібліятэкі.

Па способе групоўкі матэрыялу картатэкі могуць быць алфавітныя, сістэматычныя, прадметныя, храналагічныя, персаналій, рэцэнзій і інш., па зместу адлюстроўваемых матэрыялаў – універсальныя, галіновыя, тэматычныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчыя, спецыяльныя. Картатэкі пастаянна папаўняюцца, але матэрыял у іх захоўваецца толькі да таго часу, пакуль ён актуальны.

Цэнтральнае месца сярод картатэк належыць сістэматычнай картатэцы артыкулаў (яна ствараецца ў многіх бібліятэках). Яна ўніверсальная па змесце. Структура яе падобна структуры сістэматычнага каталога. У адрозненні ад каталога сістэматычная картатэка адлюстроўвае не самастойныя выданні, а матэрыялы з часопісаў, газет, зборнікаў; яна аператыўна папаўняецца і абнаўляецца (тэрмін захавання запісаў па грамадскіх навуках – 3-4 гады, па мастацтве – больш за 7 год); мае больш дробныя рубрыкі.

Тэматычныя картатэкі змяшчаюць інфармацыю па пэўнай тэме (праблеме). Яны, як правіла, маюць часовы характар, ствараюцца па найбольш актуальных праблемах і існуюць да таго часу, пакуль яны цікавяць грамадства.

Да спецыяльных картатэк адносяцца: картатэка рэцэнзій, загалоўкаў твораў мастацкай літаратуры, ілюстрацый і інш. Яны адлюстроўваюць асобныя віды дакументаў, маюць фармальную (алфавітную) ці радзей змястоўную групоўку матэрыялу, пастаянна актуалізуюцца, папаўняюцца. Спецыяльныя картатэкі, як і тэматычныя, не дубліруюць, а дапаўняюць сістэматычную картатэку артыкулаў.

Краязнаўчыя картатэкі (часам сустракаецца назва краязнаўчыя каталогі) – бібліяграфічныя дапаможнікі, якія змяшчаюць матэрыялы (незалежна ад іх наяўнасці ў бібліятэцы) аб пэўным рэгіёне (раён, вобласць, горад, вёска) і рэалізаваны ў картачнай форме. Па зместу ўключаемых матэрыялаў гэтыя картатэкі маюць універсальны характар: адлюстроўваюць інфармацыю па ўсіх баках жыццядзейнасці края, у тым ліку па культуры і мастацтве. Пералік картатэк абумоўлены спецыфікай бібліятэкі, у межах якіх яны ствараюцца.

*Бібліяграфічныя выданні* (паказальнікі, спісы, друкаваныя каталогі) – гэта паліграфічна самастойна афармленыя выданні, якія ўтрымліваюць бібліяграфічную інфармацыю (інфармацыю аб дакументах) і прызначаны для яе распаўсюджвання ў грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліяграфічныя выданні, як любыя самастойныя выданні, адрозніваюцца па перыядычнасці выхаду ў свет і бываюць: неперыядычныя, перыядычныя, прадаўжальныя.

Неперыядычныя бібліяграфічныя выданні выходзяць аднаразова, паўтарэнне (чарговыя выданні) наперад не прадугледжаны.

Перыядычныя бібліяграфічныя выданні выходзяць рэгулярна, з пастаяннай для кожнага года колькасцю нумароў (выпускаў). Яны аднатыпна аформлены, розныя па зместу, нумараваныя і/ці дацірованыя, маюць аднолькавую назву.

Прадаўжальныя бібліяграфічныя выданні выходзяць праз недакладна вызначаныя прамежкі часу, па меры накаплення матэрыялу. Яны не паўтараюцца па зместу, аднатыпна аформлены, нумараваны і/ці дацiраваны выпускамі, маюць аднолькавую назву.

Надзвычай распаўсюджаны *несамастойныя выдавецкія формы* бібліяграфічных дапаможнікаў, бібліяграфічная інфармацыя размешчаная ў межах аднаго, асобна ўзятага дакумента. Да яе адносяцца: ўнутрыкніжныя, унутрычасопісныя, унутрыгазетныя, прыкніжныя, прыартыкульныя бібліяграфічныя спісы.

Унутрыкніжныя (унутрычасопісныя, унутрыгазетныя) бібліяграфічныя дапаможнікі – гэта пэўным чынам (часцей за ўсё ў алфавітным парадку, па асобных тэмах) арганізаваная сукупнасць бібліяграфічных запісаў, размешчаных у дакуменце (кнізе, часопісе, газеце) як асобны, самастойны раздзел, частка, артыкул, незалежны ад іншых матэрыялаў, уключаных у выданне.

Напрыклад, у бібліяграфічным бюлетэні (часопісе) “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку” (выдаецца з 1960 г.) змяшчаюцца ўнутрычасопісныя бібліяграфічныя спісы разнастайнай тэматыкі, якія маюць нават асобную пагінацыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыкніжныя (прыартыкульныя) бібліяграфічныя дапаможнікі – арганізаваная пэўным чынам (часцей за ўсё ў парадку цытавання, па алфавіце) сукупнасць бібліяграфічных запісаў, створаная да тэкстаў кніг (артыкулаў) і існуючыя з імі ў непарыўнай сувязі: у тэксце, у падрадковых заўвагах і каментарыях, па-за тэкстам (у спісе літаратуры да тэксту). Гэта пералік дакументаў (іх частак), якімі аўтар пэўнага тэксту карыстаўся пры падрыхтоўцы кнігі ці артыкула. Змест такой бібліяграфічнай інфармацыі абумоўлены тэматыкай першаснага тэксту і яна без тэксту безсэнсоўна.

Напрыклад, прыкніжнымі спісамі суправаджаюцца навуковыя выданні: Дадиомова О.В. Музыкальная культура городов Белоруссии в ХУIII веке. – Мінск, 1992. – 207 с.: ил. і інш. У некаторых выданнях прыкніжныя (прыартыкульныя) спісы літаратуры адсутнічаюць, а звесткі аб выкарыстаных аўтарам крыніцах змяшчаюцца ў падрадковых заўвагах: Беларусы: У 8 т. – Т. 1-3. – Мінск, 1995-1999; Культура беларускага замежжа. Кн. 1. – Мінск, 1993. – 192 с. і інш.

З апошняга дзесяцігоддзя ХХ ст. у дзейнасць бібліятэк, органаў навуковай інфармацыі, архіваў актыўна ўкараняюцца камп'ютарныя тэхналогіі. На электронных носьбітах ствараюцца першасныя дакументы і разнастайныя сродкі арыентацыі ў іх. Гэта спрыяе эканоміі рэсурсаў, плошчаў размяшчэння дакументаў, павышае тэрмін захавання дакумента, дазваляе прадстаўляць на адным носьбіце першасную і шырокі спектр другаснай інфармацыі, забяспечвае шматаспектны пошук інфармацыі і аператыўнасць яе атрымання, дае магчымасць інтэрактыўных інфармацыйных зносін на адлегласці і інш. У бібліятэках ствараюцца *электронныя каталогі, бібліяграфічныя базы даных*.

Электронны каталог (ужываюцца таксама тэрміны: машыначытаемы каталог, бібліяграфічны банк даных бібліятэкі) – сукупнасць бібліяграфічных і лексікаграфічных даных, якая ў сукупнасці з сістэмай упраўлення базамі даных і наборам прыкладных сістэм забяспечвае пошук інфармацыі аб дакументах пэўнага фонда ці фондаў у аўтыматызаваным рэжыме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Электронны каталог спалучае ў сабе магчымасці алфавітнага, сістэматычнага і прадметнага картачных каталогаў. Перавагамі ЭК у параўнанні з картачнымі можна лічыць:

– кампактнасць,

– магчымасць выкарыстання на адлегласці,

– магчымасці інтэграцыі ў агульныя сеткі бібліяграфічнай інфармацыі,

– аператыўнасць вядзення і выкарыстання ,

– шматфункцыянальнасць[44],

– рэалізацыя прынцыпа аднакратнасці апрацоўкі дакумента і шматкратнасці выкарыстання атрыманых вынікаў,

– магчымасці выкарыстання ўніфікаваных фарматаў прадстаўлення запісаў,

– магчымасці карпаратыўнага стварэння і выкарыстання ЭК.

У сучасных электронных каталогах прадстаўлены бібліяграфічныя звесткі аб дакуменце, вынікі яго сэнсавай апрацоўкі (індэксы, ключавыя словы і інш.), аўтарытэтныя /нарматыўныя запісы, звесткі аб адзінках захоўвання, звесткі аб стваральніках запісаў і аб чытачах. ЭК ствараюцца на пэўны фонд (фонды) дакументаў установы, якая захоўвае гэтыя дакументы. Папаўненне ЭК здзяйсняецца: на этапе каталагізацыі бягучага дакументнага патока, які паступае ў бібліятэку, рэкаталагізацыі дакументнага масіва, накопленага ў бібліятэцы, але не адлюстраванага ў ЭК, рэтраканверсіі (сканіраванні і распазнаванні картак з картачных каталогаў). Доступ да электронных каталогаў магчымы і ў межах установы-генератара, лакальных сетак, сусветнай інфармацыйнай сеткі Інтэрнэт; пры дапамозе любога камп'ютара, які падключаны да пэўных сістэм ці адпаведна абсталяваны (электронны каталог можа запісвацца на аптычны дыск).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[44] Цыт. па Жарикова Л.А. Электронный библиотечный каталог: конспект лекции для курса «Библиотечные каталоги» / Л.А.Жарикова, А.А.Макарова, Г.А.Скарук; ГПНТБ Сиб. отд. РАН. – Новосибирск, 2006. С. 19 (Шрейдер, Ю.А. Библиографическая традиция и автоматизация каталогов/ Ю. А.Шрейдер // Сов. библиогр. – 1986. – № 2.).

Напрыклад, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі электронны каталог з'яўляецца асноўным элементам інфармацыйна-пошукавага апарату бібліятэкі. Ён налічвае больш 4 млн бібліяграфічных запісаў, адлюстроўвае амаль увесь фонд бібліятэкі, забяспечвае магчымасць доступу да дыгіталізаваных тэкстаў (пры іх наяўнасці). У ім прадстаўлены бібліяграфічныя запісы з розным узроўнем паўнаты: поўныя (з аўтарытэтным кантролем), атрыманыя ў выніку каталагізацыі бягучага патоку пачынаючы са снежня 2007 г.; адносна поўныя (сканвертаваныя ў нацыянальны камунікатыўны фармат BELMARC з лакальнага фармату ЭК НББ, сфарміраванага на працягу 1993–2007 гг. на этапе бягучай каталагізацыі і рэкаталагізацыі рэтрамасіву нацыянальных дакументаў); кароткія (без аўтарытэтнага кантролю, сэнсавай апрацоўкі), сфарміраваныя ў выніку рэтраканверсіі картачных каталогаў НББ. Сэнсавы блок запісаў заснаваны на выкарыстанні класіфікацыйных сістэм УДК і ДРНТІ; дэскрыптарных інфармацыйна-пошукавых моў; даведнікаў кадзіраванных элементаў апісання дакументаў; нарміраваных (аўтарытэтных) найменняў асоб, калектываў, радавых імён, геаграфічных аб'ектаў, уніфікаваных загалоўкаў. Бібліяграфічныя і аўтарытэтныя запісы, якія ствараюцца, прадстаўлены не толькі ў лакальным ЭК НББ, але і з'яўляюцца асноўным масівам запісаў зводнага ЭК бібліятэк Беларусі і Нацыянальнай базы даных аўтарытэтных запісаў.

У бібліятэках, архівах, музеях Беларусі, акрамя электронных каталогаў, ствараюцца разнастайныя базы даных, у тым ліку бібліяграфічныя. База даных (БД) – сукупнасць структураваных даных, зафіксаваных на машыначытаемым носьбіце па агульных правілах апісання, захавання і выкарыстання. Па разнавіднаці ўключаемых даных БД бываюць:

– бібліяграфічныя (змяшчаюць бібліяграфічныя апісанні дакументаў),

– рэфератыўныя (бібліяграфічныя апісанні дакументаў і рэфераты на іх),

– поўнатэкставыя (запісы поўных тэкстаў ці частак дакументаў[45]),

– канцэптаграфічныя (бібліяграфічныя запісы і цытаты з дакументаў, асноўныя ідэі, палажэнні),

– фактаграфічныя (аб'ектаграфічныя як іх разнавіднасць) – (змяшчаюць канкрэтныя факты, прыметы, паказчыкі і інш.)[46],

– графічныя (чарцяжы, схемы, малюнкі, ілюстрацыі)[47],

---

[45] Бібліяграфічныя звесткі, якія ідэнтыфікуюць поўны тэкст ці яго фрагмент, абавязковы.
[46] Бібліяграфічныя звесткі неабавязковы, але магчымы ў выпадку адсылак да канкрэтных дакументаў.
[47] Бібліяграфічныя звесткі неабавязковы, але магчымы ў выпадку адсылак да канкрэтных дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– мультымедыйныя (тэкставыя, графічныя, відэа-, аудыяданыя)[48].

Таму бібліяграфічнымі па сутнасці сваёй можна лічыць бібліяграфічныя, рэфератыўныя, канцэптаграфічныя БД. Яны ўтрымліваюць элементы ідэнтыфікуючыя канкрэтны тэкст, фрагменты тэксту ці вынікі яго аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі. Поўнатэкставыя, фактаграфічныя, графічныя, мультымедыйныя БД бібліяграфічнымі не з‘яўляюцца. Яны маюць бібліяграфічнае аснашчэнне, якое дазваляе ідэнтыфікаваць канкрэтны тэкст, факт і інш., суаднесці іх з канкрэтным дакументам.

Яны могуць адлюстроўваць дакументы як па фармальнай (напрыклад, від дакумента), так і па змястоўнай (па пэўнай галіне, галінах ведаў, праблемах) прыметах.

Напрыклад, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі да 2006 г. (работа па стварэнні БД пачалася з 1993 г.) фарміравалася 25 баз даных, больш за палову з іх з’яўляліся часткамі ЭК («Кнігі», «Ноты», «Перыядычныя выданні», «Рэдкая кніга», «Аўтарэфераты дысертацый і дысертацыі» і інш.). Астатнія базы даных (у асноўным бібліяграфічныя) мелі тэматычную накіраванасць, ствараліся на аснове бягучых бібліяграфічных паказальнікаў, якія раней існавалі, «Гісторыя Беларусі», «Культура і мастацтва Беларусі», «Чарнобыль», «Грамадскія навукі», мелі свае фарматы запісаў, розныя падыходы да адбору дакументаў. З 2008 г. БД («Беларусь: ад мінулага да сучаснасці», «Культура і мастацтва»), тэматычныя і відавыя калекцыі («Крыніцы па гісторыі Беларусі: канец XVIII – пачатак XX стст.», «Перыядычныя выданні Беларусі дакастрычніцкага перыяду», інкунабулы і палеатыпы з фонду Нацыянальнай бібліятэкі і інш.) фарміруюцца на аснове запісаў ЭК. Яны маюць бібліяграфічны і паўнатэкставы ўзроўні (поўныя тэксты прадстаўлены часткова ў залежнасці ад наяўнасці лічбавай копіі).

Бібліяграфічная інфармацыя ў электронным асяроддзі існуе ў форме *электроннага рэсурса.* Пры яго стварэнні (імпартаванні, экспартаванні) вельмі важна стварэнне адзінага фармата запісу элементаў бібліяграфічнага запісу. Фармат – гэта набор элементаў для апісання аб’екта, схема іх размяшчэння і правілы прадстаўлення гэтых элементаў у схеме.

[48] Бібліяграфічныя звесткі неабавязковы, але магчымы ў выпадку адсылак да канкрэтных дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння ў Беларусі выкарыстоўваецца некалькі бібліяграфічных камунікатыўных фарматаў: BELMARC, створаны на аснове UNIMARC, і рэкамендаваны Міністэрствам культуры РБ у якасці адзінага абменнага (камунікатыўнага) фармата для ўсіх бібліятэк краіны; USMARC, распаўсюджваецца як асноўны фармат сістэм аўтаматызацыі MARC і іншыя лакальныя фарматы.

Адной з формаў існавання электронных тэкстаў з’яўляеца гіпертэкст, у якім здзяйсняюцца сувязі паміж асобнымі часткамі тэксту, хуткі пераход ад аднаго фрагмента да другога пры дапамозе спасылак. Гэта тэкст, у якім рэалізаваны магчымасці рознай паслядоўнасці чытання, спалучэнне сэнсавай структуры. Спецыфіка праграмнага забеспячэння як неад’емнай часткі гіпертэксту дазваляе пастаянна абнаўляць інфармацыю і дабаўляць тэкставыя файлы, аўдыавідэаэлементы, што робіць гіпертэкст рухомай структурай. У аснове стварэння і абнаўлення такіх тэкстаў ляжыць бібліяграфічны метад мадэліравання зместу дакументаў (тэкстаў), ідэнтыфікацыя пэўных тэкставых фрагментаў і забеспячэнне сувязей (спасылак) паміж імі.

Важнай часткай сучасных электронных каталогаў і бібліяграфічных БД з’яўляюцца аўтарытэтныя/нарматыўныя запісы (файлы), сукупнасць якіх стварае адпаведныя БД. Гэта надзвычай важная частка іх лінгвістычнага забеспячэння. Аўтарытэтныя запісы ствараюцца на падставе канкрэтнага дакумента да бібліяграфічных запісаў электроннага каталога і, зразумела, утрымліваюць лаканічныя, а часам і мінімальныя звесткі даведачнага характару. Масіў у цэлым знаходзіцца ў рэжыме пастаяннай карэкціроўкі. Ён змяшчае аўтарытэтныя запісы з (з папярэдняй і установленай формамі загалоўка) і прататыпы; аўтарытэтныя запісы поўныя і частковыя; даведачныя запісы і спасылачныя; асноўныя і варыянтныя формы загалоўкаў. Масіў такіх запісаў падобны на ўніверсальныя даведнікі. Але ёсць шэраг пераваг: вялікая і пастаянна папаўняемая крыніцазнаўчая база; сувязь з канкрэтным дакументам, па фармальных ці змястоўных характарыстыках якога ствараецца аўтарытэтны запіс; сувязь аб’екта з пэўным сегментам рэтраспектыўнага масіву, выдзяляемага па гэтым аб’екце; уключэнне дакладнага пераліку аб’ектаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адлюстравання; шматаб’ектнасць адлюстравання; установленыя сувязі паміж загалоўкамі, паняццямі розных узроўняў; падмацаванне фармулёвак інфармацыяй са слоўнікаў, даведнікаў, энцыклапедый і інш.; удакладненне аб’ектаў, якія яшчэ не адлюстраваны ў даведачных выданнях (новых навуковых тэрмінаў, асоб, калектываў і да т.п.); строга вытрыманая структура аднапарадкавых запісаў (адпаведна фармату і метадычным рэкамендацыям па яго прымяненні).

Фарміраванне аўтарытэтных/нарматыўных запісаў у нашай краіне (на базе НББ) пачалося ў 1998 г. на аснове раней створаных масіваў бібліяграфічных запісаў, канвертавання машынных слоўнікаў ключавых слоў у структуру аўтарытэтных файлаў. Створана спецыяльннае праграмнае забеспячэнне, распрацаваны фармат BELMARC/Authorities, якія дазваляюць на сусветным узроўні ствараць аўтарытэтныя запісы, абменьвацца імі з любой сучаснай інфармацыйнай сістэмай, а таксама іншая неабходная метадычная дакументацыя для рэалізацыі работ у бягучым рэжыме. Сфарміраваны і пастаянна папаўняецца масіў аўтарытэтных запісаў на імёны асоб, назвы калектываў, родавыя імёны, геаграфічныя назвы, тэматычны прадмет, уніфікаваную назву і іншыя тыпы (11 найменняў) аб’ектаў. Гэты масіў утварае нацыянальную БД даных аўтарытэтных запісаў, якая непарыўна звязана з запісамі электроннага каталога НББ і запісамі зводнага электроннага каталога. Агульная колькасць аўтарытэтных запісаў у БД (на 01.10.2010) складае больш за 220 000. Гэта фактаграфічны масіў, які дазваляе не толькі апісаць пэўныя аб’екты (з асаблівай увагай і глыбінёй нацыянальныя), але і ўстанавіць сувязі паміж дакументамі, у якіх яны адлюстраваны.

### *Тыпы і жанры бібліяграфічных дапаможнікаў*

Акрамя вышэйпералічаных формаў да сённяшняга часу сфарміраваліся і існуюць асноўныя тыпы і жанры бібліяграфічных дапаможнікаў. А.П.Коршунаў разглядае іх асобна. Неабходна адзначыць, што ў працах апошніх гадоў такія даследчыкі, як В.А.Факееў, І.Г.Моргенштэрн тыпы бібліяграфічных дапаможнікаў асобна не разглядаюць, а адносяць іх да жанраў. Гэта не бясспрэчна, таму што кожны з вызначаных жанраў павінен валодаць выразнымі характарыстыкамі і выключаць адзін аднаго, а не перасякацца ці паглынаць адзін аднаго. Згодна азначэнняў тэрмін “бібліяграфічныя паказальнікі” шырэйшы тэрміна “бібліяграфічныя манаграфіі”, перасякаецца з планамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чытання, рэфератыўнымі зборнікамі і інш. На наш погляд, мэтазгодна асобна выдзяляць тыпы, удакладняючы іх адносінамі да друкаванай (рукапіснай) формаў існавання бібліяграфічнай прадукцыі (дапаможнікаў).

А.П.Коршунаў да тыпаў бібліяграфічных дапаможнікаў адносіць: бібліяграфічны паказальнік, бібліяграфічны спіс, бібліяграфічны агляд, паказальнікі да выданняў і дапаможныя паказальнікі.

Бібліяграфічны паказальнік – бібліяграфічны дапаможнік, які аб’ядноўвае значную колькасць бібліяграфічных запісаў, мае складаную структуру, аснашчаны дапаможным апаратам.

Бібліяграфічны спіс – бібліяграфічны дапаможнік, які аб’ядноўвае невялікую колькасць бібліяграфічных запісаў, мае простую структуру, без дапаможнага апарата.

Бібліяграфічны агляд – бібліяграфічны дапаможнік (інфармацыйны твор), які ствараецца на аснове першасных дакументаў і ўяўляе сабой звязанае паведамленне аб разглядаемых у іх асноўных праблемах.

Дапаможныя паказальнікі (паказальнікі да выданняў у тым ліку) – бібліяграфічны пошукавы апарат, створаны да бібліяграфічных і любых іншых дакументаў, які раскрывае іх структуру і змест і забяспечвае хуткае знаходжанне змешчанай ў дакументах інфармацыі. А.П.Коршунаў бібліяграфічны пошукавы апарат, створаны да бібліяграфічных дапаможнікаў, называе дапаможнымі паказальнікамі, да крыніц першаснай інфармацыі – паказальнікамі да выданняў. Па прызначэнні, структуры запісаў, афармленні яны аднатыпны і таму іх можна аднесці да адной катэгорыі (тыпу) і назваць дапаможнымі паказальнікамі.

Да навуковых, даведачных, бібліяграфічных, і некаторых іншых відаў дакументаў ствараюцца, як правіла, разнастайныя дапаможныя паказальнікі. Яны мадэліруюць змешчаную ў дакументах інфармацыю, спрыяюць хуткаму пошуку неабходных фрагментаў дакумента і з’яўляюцца такім чынам сродкамі арыентацыі карыстальніка ў структуры і змесце дакумента. Да іх адносяцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

імянныя, геаграфічныя, прадметныя, тэматычныя, сістэматычныя, храналагічныя і інш., дапаможныя паказальнікі. Яны ўяўляюць сабой пуцевадзіцелі па тэксту дакумента, упарадкаваны (па алфавіту ці якой-небудзь іншай прымеце) пералік назваў або абазначэнняў на яго старонках і забяспечваюць шматаспектны і хуткі пошук неабходнай інфармацыі, робяць магчымым адмаўленне ад суцэльнага прагляду тэксту. Да кожнага з запісаў у дапаможных паказальніках даецца спасылка (лічба ці словы глядзі і глядзі таксама). Лічбы паказваюць старонку надрукавання звестак ці парадкавы нумар бібліяграфічнага запісу.

Імянныя дапаможныя паказальнікі (паказальнікі імёнаў) – дапаможныя паказальнікі, якія змяшчаюць алфавітны пералік прозвішчаў з ініцыяламі ці поўнымі імёнамі і іншымі абазначэннямі ўласных імёнаў (напрыклад, псеўданімамі) з адсылкамі да парадкавага нумару запісу ці старонкі надрукавання матэрыялу пэўнай асобы, аб пэўнай асобе.

Прадметныя (алфавітна-прадметныя) дапаможныя паказальнікі – дапаможныя паказальнікі, якія змяшчаюць алфавітны пералік назваў прадметаў, іх якасцей і адносін з ініцыяламі ці поўнымі імёнамі і іншымі абазначэннямі ўласных імёнаў (напрыклад, псеўданімамі) з адсылкамі да парадкавага нумару запісу ці старонкі надрукавання матэрыялу.

Геаграфічныя дапаможныя паказальнікі – дапаможныя паказальнікі, якія змяшчаюць алфавітны пералік геаграфічных назваў з адсылкамі да парадкавага нумару запісу ці старонкі надрукавання матэрыялу аб пэўным геаграфічным аб’екце.

Тэматычныя дапаможныя паказальнікі – дапаможныя паказальнікі, якія змяшчаюць алфавітны пералік прадметных рубрык, аб’яднаных у буйныя тэматычныя раздзелы з адсылкамі да парадкавага нумару запісу ці старонкі надрукавання матэрыялу аб пэўным аб’екце.

Сістэматычныя дапаможныя паказальнікі – дапаможныя паказальнікі, якія змяшчаюць сістэматызаваны (лагічна ўпарадкаваны) пералік прадметных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рубрык, аб’яднаных у буйныя тэматычныя раздзелы з адсылкамі да парадкавага нумару запісу ці старонкі надрукавання матэрыялу аб пэўным аб’екце.

Храналагічныя дапаможныя паказальнікі – дапаможныя паказальнікі, якія змяшчаюць матэрыял (перыяды часу: гады, вякі, эпохі) у часавай паслядоўнасці з адсылкамі старонкі надрукавання звестак.

Адзіныя (аб’яднаныя, камбінаваныя, Index, Register) дапаможныя паказальнікі – дапаможныя паказальнікі, якія змяшчаюць у адным алфавітным радзе пералік назваў прадметаў, іх якасцей і адносін, імёнаў уласных, геаграфічных аб’ектаў з адсылкамі да парадкавага нумару запісу ці старонкі надрукавання матэрыялу.

Да першасных дакументаў такія паказальнікі (пераважна імянныя, радзей геаграфічныя і прадметныя) ствараюцца не вельмі часта, хаця наяўнасць іх ў дакуменце сведчыць аб навуковым узроўні пэўнага выдання. Напрыклад, імянным і прадметна-геаграфічным дапаможнымі паказальнікамі аснашчана манаграфія: Кушнярэвіч А.М. Культавае дойлідства Беларусі XIII–XYI стст. – Мінск, 1993. – 150 с.

Да бібліяграфічных паказальнікаў дапаможныя паказальнікі (адзін ці некалькі) ствараюцца, як правіла, заўсёды.

Жанр – гэта гістарычна складзены род бібліяграфічнай прадукцыі, які абагульняе найбольш характэрныя рысы, уласцівыя значнай групе бібліяграфічных дакументаў. У якасці жанраў бібліяграфічных дапаможнікаў вызначаюцца бібліяграфічная манаграфія, путевадзіцель па літаратуры, біябібліяграфічны слоўнік, бібліяграфічная энцыклапедыя, план чытання, экспрэс-інфармацыя, рэфератыўны зборнік, рэфератыўны часопіс і інш.

Бібліяграфічная манаграфія – буйны бібліяграфічны дапаможнік навукова-дапаможнага прызначэння, які створаны на падставе паглыбленага вывучэння вялікага масіву дакументаў, разглядае праблему ўсебакова і змяшчае новыя ці ўдакладненыя звесткі аб бібліяграфіруемых дакументах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Путевадзіцель па літаратуры – бібліяграфічны дапаможнік, які змяшчае звесткі аб першасных дакументах, крыніцах бібліяграфічнай інфармацыі па тэме і метадычныя парады і рэкамендацыі па іх выкарыстанню.

Біябібліяграфічны слоўнік – бібліяграфічны дапаможнік, які змяшчае біяграфічныя звесткі аб пэўных асобах і бібліяграфічную інфармацыю аб іх творах і творах пра іх.

Бібліяграфічная энцыклапедыя - бібліяграфічны дапаможнік, у якім сабраны фактычныя звесткі і апісанні літаратуры па пэўнай галіне ведаў ці тэме і размеркаваны ў алфавітным, прадметна-тэматычным ці сістэматычным парадку.

План чытання - бібліяграфічны дапаможнік, у якім дакладна рэгламентуецца склад і паслядоўнасцьчытання па пэўнаму пытанню.

Экспрэс-інфармацыя - перыядычнае часопіснае ці ліставое інфармацыйнае выданне, якое змяшчае аб'ёмны рэферат (рэфераты) найбольш актуальных апублікаваных замежных крыніц ці неапублікаваных айчынных дакументаў па актуальных для пэўных катэгорый карыстальнікаў праблемах.

Дайжэст – кароткі пераказ (фрагменты – цытаты, вытрымкі, канспекты, рэфераты) тэкстаў шэрагу дакументаў, падабраныя па пэўнай змястоўнай ці фармальнай прыметах.

Праспект – даведачнае і/ці рэкламнае выданне, якое змяшчае сістэматызаваны пералік дакументаў (дакумента), прызначаных да выпуску, продажы ці экспаніраванню.

Рэфератыўны часопіс – часопіс, асноўны змест якога складаюць сістэматызаваныя бібліяграфічныя апісанні з індыкатыўнымі рэфератамі рэфератыўнымі анатацыямі.

Рэфератыўны зборнік – зборнік, асноўны змест якога складаюць сістэматызаваныя бібліяграфічныя апісанні з інфарматыўнымі рэфератамі.

Паказальнік цытуемай літаратуры – пералік упамянутых і/ці цытуемых дакументаў у тых ці іншых выданнях (публікацыях), які дапамагае выяўляць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстаныя аўтарамі дакументы і раскрывае ўнутраныя сувязі ў межах дакументных (тэкставых) камунікацый. Акрамя формаў , тыпаў і жанраў бібліяграфічных дапаможнікаў існуе вялікая колькасць відаў, вызначаных па розных прыметах (гэта будзе разгледжана ў наступных лекцыях).

Семінарый — факта-бібліяграфічны навукова- і вучэбна-дапаможны, навукова-метадычны дапаможнік прапедэўтычнага характару, які мае мэтай «увядзенне» ў навуку, азнаямленне з вядучымі праблемамі і асноўным масівам дакументаў пэўнага прадметнага комплекса.

Бібліяграфічны каталог — бібліяграфічны дапаможнік у картачнай, друкаванай ці электроннай форме, які адлюстроўвае дакументныя рэсурсы (калекцыі, фонды) бібліятэк, кнігавыдавецкіх, кнігагандлёвых, архіўных, музейных устаноў, прыватных збораў ці іх аб’яднанняў, карпарацый (зводныя каталогі).

Памятка чытачу — рэкамендацыйны (навукова-асветніцкі, вучэбна-дапаможны, прафесійна-вытворчы) бібліяграфічны дапаможнік з мінімальным пералікам дакументаў па цікавай для чытача тэме пытанню.

Бібліяграфічная лістоўка — рэкламнае выданне, рэкамендацыйны (папулярна-асветніцкі, вучэбна-дапаможны, прафесійна-вытворчы) бібліяграфічны дапаможнік ў форме лістоўкі, які змяшчае невялікі пералік бібліяграфічных запісаў (бібліяграм) пэўнага зместу ў адпаведнасці з яго мэтавым і чытацкім прызначэннем.

**Вывады.** Бібліяграфічная інфармацыя існуе ў вуснай і фіксаванай формах. Фіксаваная форма называецца бібліяграфічным запісам, які з’яўляецца асноўным элементам любога бібліяграфічнага дапаможніка. Бібліяграфічны дапаможнік (бібліяграфічны дакумент) – гэта асноўны спосаб існавання і сродак распаўсюджвання дакументаванай бібліяграфічнай інфармацыі. Бібліяграфічныя дапаможнікі разнастайны па сваёй, форме, тыпавых, жанравых і відавых характарыстыках. Іх удасканаленне, памнажэнне разнастайнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбываецца ў цеснай сувязі з развіццём інфармацыйных камунікацый, навукі, тэхнічных сродкаў.

## 1.5. Віды бібліяграфічных дапаможнікаў

### *Падставы для вызначэння відаў бібліяграфічных дапаможнікаў*

Бібліяграфічная прадукцыя надзвычай разнастайная па свайму складу, зместу, мэтаваму прызначэнню. Акрамя формаў, жанраў (тыпаў) бібліяграфічных дапаможнікаў існуе вялікая колькасць відаў, сукупнасць якіх можна ўпарадкаваць на падставе фасетнай класіфікацыі, у адпаведнасці з наступнымі прыметамі: грамадскае прызначэнне, змест дакументаў як аб'ектаў адлюстравання (змест бібліяграфіруемых дакументаў), функцыянальна-мэтавае прызначэнне, метады стварэння бібліяграфічнай прадукцыі (метады бібліяграфавання).

### *Віды бібліяграфічных дапаможнікаў па грамадскім прызначэнні*

Стварэнне бібліяграфічнай прадукцыі заўсёды сацыяльна абумоўлена і скіравана на задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей грамадства ў цэлым і з улікам патрэбнасцей пэўных сацыяльных груп ці асобных карыстальнікаў. У адпаведнасці з гэтым можна выдзеліць бібліяграфічныя дапаможнікі агульнага прызначэння і бібліяграфічныя дапаможнікі спецыяльнага прызначэння. Асноўнае адрозненне гэтых відаў бібліяграфічнай прадукцыі – канкрэтнае мэтавае і чытацкае (карыстальніцкае) прызначэнне. Крыніцы бібліяграфічнай інфармацыіі агульнага прызначэння (ці крыніцы агульнай бібліяграфіі) яго не маюць, яны ствараюцца для грамадства ў цэлым, з мэтай улічыць дакументы пэўнага фонда (фондаў); падсумаваць дакументы, створаныя на пэўнай тэрыторыі, мове, за пэўны перыяд часу; апавясціць грамадства аб існаванні дакументаў пэўнай формы і зместу.

Крыніцы бібліяграфічнай інфармацыіі спецыяльнага прызначэння (крыніцы спецыяльнай бібліяграфіі) заўсёды маюць канкрэтнае мэтавае і чытацкае прызначэнне, яны ствараюцца ў разліку на пэўную сферу абслугоўвання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да крыніц агульнай бібліяграфіі адносяцца **каталогі** (карткавыя, друкаваныя, электронныя), **дзяржаўныя** бібліяграфічныя дапаможнікі, **рэпертуарныя** бібліяграфічныя дапаможнікі, крыніцы **масавай** бібліяграфіі.

Каталогі ўлічваюць дакументы пэўнага фонда (фондаў) незалежнаад якасных характарыстык дакументаў, прызначаны для іх ідэнтыфікацыі, пошуку, а таксама для інфарміравання карыстальнікаў аб наяўнасці ў фондзе дакументаў пэўнай формы і зместу.

Дзяржаўныя бібліяграфічныя дапаможнікі – гэта бібліяграфічны дапаможнікі, якія інфарміруюць аб дакументнай прадукцыі пэўнай дзяржавы на аснове дзяржаўнай рэгістрацыі дакументаў. Яны ствараюцца на аснове ўліку фармальных прымет дакументаў (від дакумента: кніга, часопіс, ноты, рэцэнзіі, часопісныя артыкулы і т.д.; мова; хранналагічны адрэзак часу). Напрыклад, *Летапіс друку Беларусі: дзярж. бібліягр. паказ. / Нац. кн. палата. - Мінск, 1924.*

Гэта серыя ўніверсальных бягучых бібліяграфічных паказальнікаў, якія ствараюцца з 1924 года на аснове дзяржаўнай рэгістрацыі друкаванай прадукцыі, выдаваемай на тэрыторыі Беларусі ці суадноснай з ёй па зместу. Яна складаецца з асобных частак ("Кніжны летапіс", "Летапіс аўтарэфератаў дысертацый", "Летапіс нарматыўна-тэхнічных, тэхнічных дакументаў і выданняў вузкага прызначэння", "Летапіс нот", "Летапіс выяўленчага мастацтва", "Летапіс картаграфічных выданняў", "Летапіс рэцэнзій", "Летапіс часопісных артыкулаў", "Летапіс газетных артыкулаў", "Летапіс перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца"), якія адлюстроўваюць друкаваную частку нацыянальнага дакументнага патоку па сукупнасці фармальных прымет: від дакумента, тэрыторыя, адрэзак часу[49].

[49] У названую серыю ўваходзіць таксама выданне "Беларусь у сусветным друку". Ён ствараецца на аснове іншых прымет – змест, мова, аўтарскае прызначэнне і адлюстроўвае замежныя кнігі, брашуры, артыкулы з часопісаў і газет пра Беларусь і беларусаў, выданні, часткі выданняў на беларускай мове (незалежна ад зместу), выдадзеныя за межамі Беларусі, замежныя выданні беларускіх аўтараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падобная бібліяграфічная прадукцыя ствараецца ў большасці краін свету. Часам яе называюць крыніцы бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі, крыніцы бягучай нацыянальнай бібліяграфіі ці бягучыя нацыянальныя бібліяграфічныя дапаможнікі.

Напрыклад, бягучы бібліяграфічны ўлік друкаванай прадукцыі ў Расіі ўзнік у канцы ХУІІІ ст. Ён быў выбарачны (дакументальны паток адлюстроўваўся часткова). У І-й палове ХІХ ст. з'явіліся пастаянныя бібліяграфічныя раздзелы ў часопісах "Сын Отечества" (з 1814 г.), "Библиографические листы" (1825-26), "Московский телеграф" (1825-1834), "Современник", "Отечественные записки". Аднак гэта не быў дзяржаўны бібліяграфічны ўлік дакументаў. З 1837 на старонках "Журнала Министерства народного просвещения" пачалося агульнадзяржаўнае бібліяграфаванне ўсёй друкаванай прадукцыі Расіі ("Указатель вновь вышедших книг"). Яно вялося вельмі поўна і дакладна і працягвалася да 1855 г. Пасля яго скасавання ў 1856 годзе з'явілася шэраг прыватных выданняў, якія ў культурных, навуковых мэтах імкнуліся адлюстраваць усю друкаваную расійскую прадукцыю. Пазней бягучы бібліяграфічны ўлік працягваўся на старонках газеты "Правительственный вестник", з 1872 г. – ў выданні "Указатель по делам печати", з 1879 г. –- ў часопісе "Российская библиография".

У сярэдзіне 1907 г. пачаў выдавацца бягучы дзяржаўны бібліяграфічны паказальнік "Книжная летопись". Ён стваръўся на аснове абавязковага экзэмпляра ўсіх расійскіх твораў друку, якія паступалі ў Асобую бібліятэку пры Галоўным упраўленні па справах друку. Вясной 1917 г. па рашэнню Часовага ўрада было скасавана Галоўнае ўпраўленне па справах друку і створана Кніжная палата, у якую і стаў паступаць абавязковы экзэмпляр і на аснове яго пачаў здзяйсняцца пастаянны бягучы дзяржаўны ўлік друкаванай прадукцыі Расіі, потым СССР, пасля 1991 г. – Расійскай Федэрацыі.

Сучасная сістэма бягучых дзяржаўных бібліяграфічных паказальнікаў Расіі ўключае наступныя летапісы: "Книжная летопись", "Летопись газетных статей", "Летопись журнальных статей", "Летопись изоизданий", "Летопись рецензий", "Нотная летопись", "Летопись авторефератов диссертаций", "Библиография российской библиографии", "Картографическая летопись", "Летопись периодических и продолжающихся изданий", кумулятыўны паказальнік "Книги Российской Федерации". Яны ствараюцца на аснове фармальных прымет дакументаў, як аб'ектаў бібліяграфавання: тэрыторыя, від дакумента, храналагічны перыяд (ад тыдня да года).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Рэпертуарныя бібліяграфічныя дапаможнікі* – бібліяграфічныя дапаможнікі, у якіх па фармальных прыметах (від дакумента, мова, тэрыторыя, храналагічны перыяд) улічваецца ўся дакументная прадукцыя, створаная на тэрыторыі дзяржавы (на пэўнай мове) за пэўны ўліковы перыяд. Аналагамі тэрмінаў для наймення такой бібліяграфічнай прадукцыі з’яўляюцца: агульныя рэтраспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі, нацыянальныя рэтраспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі, крыніцы агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі, крыніцы рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі. Дакументаваная прадукцыя ў гэтых дапаможніках улічваецца як фрагмент рэчаіснасці, факт (адзінка) гісторыка-культурнага працэсу. Яны мадэліруюць дакументальны масіў, створаны пэўным народам, на тэрыторыі пэўнай дзяржавы, спрыяюць захаванню гістарычнай памяці грамадства, таму стварэнне іх вельмі важна для грамадства. Стварэнне рэпертуарных бібліяграфічных паказальнікаў на аснове фармальных прымет дакументаў як аб’ектаў бібліяграфавання невыпадкова, т.ш. іх задача ўлічыць ўсе дакументы, г.зн. адлюстраваць вычарпальна, а зрабіць гэта можна толькі па фармальных прыметах – улічыць дакументы на пэўнай мове (беларускай, рускай, нямецкай), выдадзеных на пэўнай тэрыторыі (Беларусі, Украіне, Германіі), адной матэрыяльнай канструкцыі (перыядычныя выданні, кнігі і інш.). Часцей за ўсё такія бібліяграфічныя дапаможнікі ствараюцца па сукупнасці фармальных прымет. Напрыклад, “Кніга Беларусі: Зводны каталог. 1517-1917” (Мінск, 1986) – від дакумента (кніга), тэрыторыя (Беларусь), храналагічны перыяд (1517-1917).

Стварэнне рэпертуарных бібліяграфічных дапаможнікаў пачало здзяйсняцца даўно і мае вельмі трывалыя традыцыі. У перыяд станаўлення дзяржаўнасці гэта спрыяла праслаўленню і самазацвярджэнню дзяржавы, яе нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі. Першай бібліяграфічнай працай рэпертуарнага характару можна лічыць “Каталог знакамітых мужоў” Іагана Трэццінгемскага (1495 г.), які ўлічваў толькі творы германскіх (нямецкамоўных) аўтараў. У ХУІ ст. нацыянальныя бібліяграфічныя працы ўзніклі ў Англіі, Італіі, у канцы ХУІ – Францыі, у ХУІІ ст. – Іспаніі, Польшчы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Улік беларускіх дакументаў і дакументаў аб Беларусі здзяйсняўся ў крыніцах польскай нацыянальнай бібліяграфіі, у прыватнасці ў 10-т. рукапіснай працы Юзэфа Залусскага “Вялікая польская ўсеагульная бібліятэка” (улічана літ. з 1454 да 1700 г.), дынасціі бібліяграфаў Эстрэйхераў “Bibliografia polska” (1872-1951). У 1847 г. была створана праца па апісанні друкаваных кніг, якія выйшлі на тэрыторыі Беларусі. Гэта зрабіў прафесар Віленскага ўніверсітэта М.Пелка-Палінскі. “Спіс кніг, што выйшлі ў Беларусі ад узнікнення кнігадрукавання да нашага часу” (работа засталася ў рукапісу).

У 1908 г. А.І.Мілавідавым быў зроблены бібліяграфічны ўліку старадрукаваных славянарускіх кніг, якія выйшлі на беларускіх тэрыторыях: “Описание славянорусских книг Виленской Публичной библиотеки (1491-1800)” Вільна, 1908; “Старопечатные славянорусские издания, вышедшие из западно-русских типографий ХУІ-ХУІІІвв.” (адбітак з часопіса “Чтения в Об-ве истории и древностей российских при Моск. ун-те. 1908. – N1). У гэтых працах улічаны старадрукаваныя выданні па прыметах – мова і тэрыторыя.

Р. Зямкевіч на падставе глыбокага вывучэння старажытнай беларускай літаратуры і літаратуры ХІХ ст. склаў рэтраспектыўны бібліяграфічны паказальнік “Беларуская бібліяграфія” (надрукаваны ў дадатку да газеты “Наша Ніва” – “Беларускі каляндар”), у які па моўнай прымеце было ўключана толькі 100 беларускіх кніг кірылаўскага друку за ХУІ-ХУІІІ ст.

Я.Ф.Карскі, вядомы беларускі мовазнаўца, у даследаванні “Беларусы” (1903–1922) здзейсніў найбольш поўны і шматаспектны бібліяграфічны ўлік кніг, якія выйшлі на беларускай мове і на тэрыторыі Беларусі з ХІІІ да першай чвэрці ХХ ст.

Да крыніц рэпертуарнай бібліяграфіі можна аднесці бібліяграфічную працу В.Ластоўскага “Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі”, створаную ў 1926 г. да 400-годдзя беларускага друку. Яна ўлічвае больш 1000 дакументаў (рукапісных кніг, грамат) ад канца Х ст. да ХІХ ст.

У другой палове ХХ стагоддзя ў Беларусі было створана шэраг рэпертуарных дапаможнікаў, прысвечаных уліку нацыянальных дакументаў: кніг (Кнігі Беларускай ССР: 1971-1975: звод. сістэм. паказ. / Дзярж. кн. палата БССР ; [Склад. Г.Б.Волкава ; Рэд. І.І.Фалькоўская]. – Мінск, 1981. і інш); газет (Газеты Беларусі, 1776-1975 : бібліягр. паказ. / Нац. кн. палата Беларусі ; [Склад.: Л.М.Няхайчык і інш. ; Навук. рэд. В.У.Скалабан]. – Мінск : НКП, 2003. — 316 с. І інш.); музычнай літаратуры (Музычная літаратура БССР. 1917-1961: (Ноты): бібліяграфія асобных выданняў / Дзярж. б-ка БССР, Кн. палата БССР; Склад. Ф.А.Мерына. – Мінск, 1963. – 196 с.; Музычная літаратура БССР. 1962-1970:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нотаграфічны паказальнік / Дзярж. б-ка БССР, Кн. палата БССР. – Мінск, 1977. – 248 с. і інш.).

***Крыніцы масавай бібліяграфіі*** ці масавыя бібліяграфічныя дапаможнікі – гэта разнастайныя спісы новай літаратуры, новых паступленняў, якія знаёмяць грамадства з найбольш сацыяльна значымай дакументаванай прадукцыяй. Яны ствараюцца, як правіла па фармальных прыметах (дакументы, паступіўшыя ў фонд бібліятэкі, сігнальныя экзэмпляры друкаванай прадукцыі, рэкламная бібліяграфічная прадукцыя, планы –праспекты дакументаў, якія рыхтуюцца да друку і інш.). Асноўным каналам распаўсюджвання такой БІ з'яўляецца перыядычны друк.

***Бібліяграфічныя дапаможнікі спецыяльнага прызначэння*** (ці крыніцы спецыяльнай бібліяграфіі) ствараюцца ў разліку на пэўную сферу абслугоўвання, заўсёды маюць канкрэтнае мэтавае і чытацкае прызначэнне. Іх сукупнасць значна разнастайней, чым сукупнасць бібліяграфічных дапаможнікаў агальнага прызначэння, т. ш. яны ствараюцца не для грамадства ў цэлым, г.з. аднаго аб'екта бібліяграфічнага ўздзеяння ўздзеяння, а для шэрагу сфер грамадскай практыкі, а іх столькі, колькі існуе сацыяльных груп карыстальнікаў і мэтаў спажывання фіксаванай інфармацыі.

Для бібліяграфічнага забеспячэння найбольш буйных сфер бібліяграфічнага абслугоўвання: навука, вытворчасць, адукацыя, самаадукацыя, выхаванне – ствараюцца навукова-дапаможныя, прафесійна-вытворчыя, вучэбна-дапаможныя, рэкамендацыйныя бібліяграфічныя дапаможнікі.

***Навукова-дапаможныя*** бібліяграфічныя дапаможнікі – гэта бібліяграфічная прадукцыя, прызначаная ў дапамогу навукоўцам і навукова-даследчай дзейнасці. Напрыклад, серыя паказальнікаў, прысвечаных II сусветнай вайне на тэрыторыі Беларусі:

*Беларуская ССР у гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1941-1945): бібліягр. паказ. літ. (1941-1971 гг.) / Дзярж. б-ка БССР ім. У.І.Леніна. Ін-т гісторыі АН БССР; склад.: Р.М.Чыгірова, Э.І.Ляўко. – Мн, 1980. – 299 с.;*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Беларуская ССР у гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1941-1945): бібліягр. паказ. літ. / Дзярж. б-ка БССР ім. У.І.Леніна. Ін-т гісторыі АН БССР; склад.: Э.І.Ляўко, С.А.Пугачова, З.А.Сядая; рэд.: Р.М.Чыгірова, А.В.Мураўёва, З.А.Сядая. – Мн, 1990. – 296 с.;*

*Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941-1945): (бібліягр. паказ.) / НБ Беларусі; склад.: З.А.Сядая, Р.С.Собаль; рэд.: Р.М.Чыгірова, А.В.Мураўёва, І.І.Кубатава. – Мінск, 1995. – 435 с.;*

*Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941-1945): (бібліягр. паказ.): дадатковы выпуск / НБ Беларусі; склад.: В.П.Паўлаў; рэд.: Р.М.Чыгірова, А.В.Мураўёва. – Мінск, 1996. – 108 с., а таксама электронны дыск на якім аб'яднаны вышэй названыя масівы:*

*Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941 - 1945) [Электронны рэсурс] / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнікі: С.А.Анохін [і інш] ; навуковы рэдактар Т.В.Кузьмініч. – Мінск : НББ, 2005. — 1 электронны аптычны дыск (CD-ROM) ; 12 см. – (60-годдзю Перамогі прысвячаецца).*

Гэтыя бібліяграфічныя дапаможнікі створаны НББ сумесна з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі. У іх сабраны звесткі кнігах, брашурах; артыкулах і раздзелах са зборнікаў, тэзісаў дакладаў, вучоных запісак рэцэнзіі; манаграфіях, аўтарэфератах дысертацый, мемуарнай і навукова-папулянай літаратуры, навуковых артыкулах і нарысах за 1945-1995 гг. Іх мэтавае і чытацкае прызначэнне: навуковыя работнікі, студэнты, бібліёграфы, кіраўнікі і члены краязнаўчых гурткоў і супрацоўнікаў мезеяў, шырокае кола чытачоў.

*Прафесійна-вытворчыя* бібліяграфічныя дапаможнікі – гэта дапаможнікі, створаныя для спецыялістаў розных сфер дзейнасці і прызначаныя для аказання дапамогі ў іх практычнай дзейнасці.

Напрыклад, *Дышиневич В.Н. Руководителям музыкальных коллективов: библиогр. указ. – Мінск, 1974. – 243 с.*

У гэтым дапаможніку сабрана інфармацыя аб дакументах, прысвечаных практычным пытанням работы з хорам і аркестрам рознага складу, выхаванню



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

голаса спевака, развіццю музычнага слыху, навучанню ігры на розных інструментах. Ён прызначаны ў дапамогу самадзейным кампазітарам, збіральнікам песеннага фальклору і кіраўнікам кружкоў музычнай граматы.

*Вучэбна-дапаможныя* бібліяграфічныя дапаможнікі – гэта дапаможнікі, прызначаныя ў дапамогу адукацыйнай, самаадукацыйнай дзейнасці. Напрыклад, бібліяграфічны дапаможнік: Гісторыя Беларусі савецкага перыяду ў перыядычным друку: бібліягр. паказ. арт. газет. і часоп. 1986 – 1991 г. / ГрДУ; склад.: Г.М.Таюрская, Э.С.Ярмусік. – Гродна, 1992. – 91 с.

У яго ўключаны навуковыя, навукова-папулярныя артыкулы з часопісаў і газет, справаздачы, успаміны сучаснікаў, мясцовыя карэспандэнцыі, выступленні палітычных дзеячоў, нарысы за 1986-1991 гг., на беларускай і рускай мовах. Ён прызначаны для выкладчыкаў, студэнтаў, настаўнікаў, вучняў стар. класаў, аматараў.

*Рэкамендацыйныя* бібліяграфічныя дапаможнікі – гэта дапаможнікі, якія адлюстроўваюць дакументы рэкамендаваныя пэўным катэгорыям карыстальнікаў і адабраныя па пэўных змястоўных і якасных крытэрыях.

Напрыклад: *Падарожжа ў гісторыю Беларусі: рэкамендацыйны паказальнік літаратуры / Дзярж. б-ка БССР ім. У.І. Леніна, навук.-бібліягр. аддзел; склад.: А.В.Мураўёва. – Мінск, 1974. – 86 с.*

У гэтым дапаможніку сабрана інфармацыя аб папулярных выданнях, артыкулы з часопісаў за 1962-1974 гады на беларускай і рускай мовах. Дапаможнік прызначаны настаўнікам, кіраўнікам гістарычных гурткоў, шырокаму колу карыстальнікаў.

Часам сустракаецца тэрмін папулярныя бібліяграфічныя дапаможнікі. Гэта дапаможнікі, якія створаны для папулярызацыі ведаў і змяшчаюць інфармацыю аб дакументах у даступнай для шырокіх колаў карыстальнікаў форме. Характарыстыкі папулярных бібліяграфічных дапаможнікаў і рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў вельмі падобныя і таму гэтыя тэрміны ў пэўным сэнсе могуць замяняць адзін аднаго.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як бачна з вышэй прыведзеных прыкладаў бібліяграфічных дапаможнікаў яны часцей за ўсё маюць поліспажывецкае прызначэнне. Найбольш выразна вызначыліся і атрымалі распаўсюджванне навукова-дапаможныя і рэкамендацыйныя бібліяграфічныя дапаможнікі. Вучэбна-дапаможныя і прафесійна-вытворчыя ствараюцца радзей, яны могуць валодаць рысамі навукова-дапаможных ці рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў.

Для навукова-дапаможных бібліяграфічнай прадукцыі характэрна:

– максімальна поўнае адлюстраванне дакументнага патока пэўнай тэматыкі навуковага прызначэння,

– групоўка матэрыялу набліжаная да структуры пэўных навуковых ведаў,

– ужыванне навуковай тэрміналогіі, наяўнасць дапаможных паказальнікаў, якія шматаспектна адлюстроўваюць структуру і змест уключаных дакументаў;

– у структуру бібліяграфічных запісаў уключаецца, як правіла, толькі бібліяграфічнае апісанне ці бібліяграфічнае апісанне і даведачная анатацыя;

– пры вызначэнні мэтавага і чытацкага прызначэння складальнікі на першае месца ставяць садзейнічанне навукова-даследчай дзейнасць і навукоўцаў.

Для рэкамендацыйнай бібліяграфічнай прадукцыі характэрна:

– абмежаванне адлюстроўваемага дакументальнага патока не толькі пэўнай тэматыкай, моўнымі і храналагічнымі межамі, а і якаснымі (ацэначнымі) характарыстыкамі дакументаў (напрыклад, навукова-папулярная і вучэбная літаратура);

– групоўка матэрыялу, як правіла, тэматычная, яна таксама не выходзіць за межы пэўных навуковых ведаў, але фармулёўка асобных раздзелаў эмацыянальная;

– ужыванне навуковай тэрміналогіі таксама магчыма, але абмежавана толькі паняцційным апаратам зразумелым шырокім колам карыстальнікаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– у структуру бібліяграфічных запісаў уключаецца, часцей за ўсё, бібліяграфічнае апісанне і рэкамендацыйная анатацыя, мэта якой зацікавіць у прачытанні таго ці іншага дакумента;

– пры вызначэнні мэтавага і чытацкага прызначэння складальнікі ўказваюць шэраг відаў дзейнасці і груп карыстальнікаў (за выключэннем навукова-даследчай дзейнасць і навукоўцаў).

***Віды бібліяграфічных дапаможнікаў па фунцыянальна-мэтавай ці храналагічнай прымеце***

Грамадства зацікаўлена ў атрыманні бібліяграфічнай інфармацыі рознай не толькі грамадскім прызначэнні, а і па глыбіні і аператыўнасці адлюстравання дакументнага патока. Карыстальнікам неабходна інфармацыя аб новых дакументах; дакументах, створаных у мінулыя гады, і плануемых да выпуску дакументах. Адпаведна ў бібліяграфічных дапаможніках могуць быць адлюстраваны розныя пласты дакументных патокаў і масіваў як па тэматыцы, так і па грамадскім прызначэнні. Ствараюцца бібліяграфічныя дапаможнікі, якія, па-першае, аператыўна адлюстроўваюць апошнюю, актуальную частку дакументнага патоку, па-другое, з пэўнай глыбінёй падсумоўваюць значную частку дакументных патокаў ці масіваў і па-трэцяе, адлюстроўваюць дакументы толькі падрыхтаваныя да выпуску. Гэта значыць храналагічная прымета можа быць пакладзена ў аснову выдзялення асобных відаў бібліяграфічнай прадукцыі. Згодна ёй выдзяляюцца бягучыя, рэтраспектыўныя і перспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі.

*Бягучыя бібліяграфічныя дапаможнікі* – дапаможнікі, якія рэгулярна і аператыўна адлюстроўваюць новыя дакументы (актуальную частку дакументных патокаў). Асноўнымі патрабаваннямі да іх з’яўляюцца рэгулярнасць выхаду ў свет (перыядычнасць), а таксама аператыўнасць адлюстравання дакументнага патоку (імкненне да максімальнага скарачэння інфармацыйнага інтэрвала паміж выхадам дакумента ў свет і яго з’яўленне ў крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Напрыклад:* *Новыя кнігі: па старонках беларускага друку / Нацыянальная бібліятэка Беларусі.* *– Мінск, 1960 – .*

Гэта бягучы бібліяграфічны дапаможнік, таму што ён, пачынаючы з 1960 г., выдаецца 1 раз у месяц, у межах года (некалькі гадоў) мае аднатыпнае афармленне і структуру, аператыўна і праз дакладна вызначаныя тэрміны часу адлюстроўвае новы дакументны паток.

*Рэтраспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі* – дапаможнікі, якія адлюстроўваюць масіў дакументаў за пэўны адрэзак часу ў мінулым.

Сярод патрабаванняў да крыніц рэтраспектыўнай бібліяграфічнай прадукцыі можна выдзеліць як найбольш важныя:

– абгрунтаванасць храналагічных, тэматычных, моўных і іншых абмежаванняў пры адлюстраванні дакументаў,

– навуковы падыход да адбору дакументаў і лагічнасць упарадкавання дакументнага масіву,

– адпаведнасць уключанай інфармацыі аб дакументах мэтаваму прызначэнню дапаможніка і скіраванасць яго на задавальненне пэўных карыстальніцкіх патрэбнасцей.

Прыведзеныя ніжэй прыклады ілюструюць розныя падыходы да глыбіні рэтраспектыўнага адлюстравання (ад 5 да 400 год) дакументнага патоку:

*Кніга Беларусі, 1517 - 1917 [Электронны рэсурс] : зводны каталог / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнікі: Г.У.Кірэева, А.А.Суша, К.В.Языковіч ; рэдактары: Г.У.Кірэева (адказны рэдактар) і інш. – Мінск : НББ, 2005. — 483 Мбайт ), 1 электронны аптычны дыск (CD-ROM) : цв. ; 12 см.*

*Бібліяграфічны даведнік навуковых работ супрацоўнікаў гістарычнага факультэта Белдзярж універсітэта (1921-1994 гг.) / Склад.:І.В.Аржахоўскі і інш. – Мінск, 1994. — 203 с.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Археалогія Беларусі : Паказ. літ … / Акад. навук Беларусі, Ін-т гіст орыі, Цэнт р. навук. б-ка імя Я.Коласа. – Мінск : ІГ АНБ, 1997.*

*… за 1976-1990 гг. : … за 1976-1990 гг. / [Склад. А.У.Ільюцік ; Навук. рэд. Т.М.Каробушкіна. – 611 с.*

*Перспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі* – дапаможнікі, якія адлюстроўваюць дакументы пакуль яшчэ не выдадзеныя, а толькі рыхтуюцца да друку. Гэта разнастайныя тэматычныя планы выдавецтваў, у якіх даецца пералік той друкаванай прадукцыі, якая будзе выпушчана ў наступным годзе. Бібліяграфічная інфармацыя, змешчаная ў такіх паказальніках і спісах, не гарантуе дакладнасці звестак (некаторыя з іх могуць мяняцца пры рэдакцыйна-выдавецкай апрацоўцы). Да таго ж некаторыя запланаваныя выданні могуць убачыць свет пазней заяўленага ў перспектыўным дапаможніку часу, са зменай некаторых бібліяграфічных звестак ці не выйсці наогул па эканамічных і іншых прычынах.

***Віды бібліяграфічных дапаможнікаў па змесце дакументаў як аб'ектаў адлюстравання***

Яшчэ адна надзвычай важная прымета стварэння бібліяграфічнай прадукцыі – змест дакументаў, якія адбіраюцца па адпаведных крытэрыях і запісы аб якіх у сукупнасці вызначаюць змястоўныя характарыстыкі дапаможнікаў. Па гэтай прымеце выдзяляюцца наступныя віды бібліяграфічных дапаможнікаў: ўніверсальныя, шматгаліновыя, галіновыя, тэматычныя, праблемна-комплексныя, персанальныя, краязнаўчыя, краіназнаўчыя.

*Універсальныя бібліяграфічныя дапаможнікі* – дапаможнікі, у якіх адлюстравана інфармацыя аб дакументах па ўсіх галінах ведаў. Яны ствараюцца па фармальных прыметах бібліяграфіруемых дакументаў (напрыклад, від выдання, месца выдання).

*Напрыклад: <u>Кнігі Беларусі:</u> Дзярж. бібліягр. паказ. / Нац. кн. палата . - Мінск, 1963 - .*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Гэты бібліяграфічны дапаможнік адлюстроўвае інфармацыю аб кнігах, брашурах, выдадзеных на тэрыторыі Беларусі за пэўны год па ўсіх галінах ведаў. Запісы згрупаваны ў сістэматычным парадку ў адпаведнасці з універсальнай дзесятковай класіфікацыяй.*

Наступныя прыклады дапаможнікаў створаны таксама па фармальных прыметах і адлюстроўваюць у азначаных межах увесь дакументны паток, таму ў незалежнасці ад колькасці прадстаўленых галін ведаў яны з'яўляюцца ўніверсальнымі.

*Поздеева, И. В. Кириллические издания, XVI в. - 1641 г. : Находки археогр. экспедиций 1971 - 1993 гг., поступившие в науч. б-ку Моск. ун-та / И.В.Поздеева, В.И.Ерофеева, Г.М.Шитова ; Археогр. лаб. каф. источниковедения ист. фак. и Науч. б-ка Моск. гос. ун-та им. М.В.Ломоносова. – Москва : Изд-во Моск. ун-та, 2000. — 404, [12] с.*

*Верещагин, В.А. Русские иллюсстрированные издания XVIII и XIX столетий, 1720 - 1870 : библиографический опыт / В. А. Верещагин. – Москва : Центрполиграф ; Санкт-Петербург : МиМ-Дельта, 2005. — 309 с.*

*Шматгаліновыя бібліяграфічныя дапаможнікі* – дапаможнікі, у якіх адлюстравана інфармацыя аб дакументах па дзвюх ці некалькіх галінах ведаў.

*Напрыклад: Беларуская мова, літаратура і мастацтва: Рэкаменд. бібліягр. дапаможнік / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 1972 -2005 .*

Гэты паказальнік выдаваўся 1 раз у год. Утрымліваў звесткі аб дакументах ці іх структурных адзінках па гісторыі і сучасным развіцці літаратуразнаўства, мовазнаўства, мастацтвазнаўства, развіцці тэатру, выяўленчага мастацтва і інш.

*Социальные и гуманитарные науки [Электрон. ресурс] = Social sciences and humanities : Библиогр. базы данных : История, археология и этнография : Поступления 1986-1999 гг. / Ин-т науч. информ. по обществ. наукам Рос. акад. наук. – Москва : ИНИОН РАН, 2000. — 1 элетрон. опт. диск. (CD) ; 12 см; В коробке 22x15 см + Рук. пользователя (40 с. : ил.; 21 см).Систем.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*требования: Для MS-DOS: IBM PC XT/AT; 640 K RAM; для Windows 95: IBM PC совместимый компьютер 486 и выше; 8 Mb RAM; CD-ROM 2X и выше. – Загл. с этикетки. – Текст рук. парал.: рус., англ.*

*Сводный каталог иностранных периодических изданий по медицине и смежным областям, 1800-1970 : В 2 вып. / М-во здравоохранения БССР, Респ. науч. мед. б-ка. – Мінск, 1972.*

*Галіновыя бібліяграфічныя дапаможнікі* – дапаможнікі, у якіх адлюстравана інфармацыя аб дакументах па пэўнай галіне ведаў.

*Бібліяграфія па гісторыі Беларусі. Феадалізм і капіталізм/ Ін-т гіст. АН БССР, Дзярж. Б-ка БССР ім. У.І.Леніна, Фунд. б-ка ім. Я.Коласа АН БССР; Склад.: М.Г.Крэканэ, А.А.Сакольчык. – Мінск, 1969. – 437 с.*

Названы бібліяграфічны дапаможнік адлюстроўвае летапісы, хронікі, зборнікі дакументаў, кнігі і артыкулы са зборнікаў, часопісаў на рускай, беларускай, украінскай мовах за 1803-1966 гг. па асобна ўзятай галіне ведаў – гісторыі Беларусі. Групоўка бібліяграфічных запісаў - тэматыка-храналагічная, у асобных гісторыка-храналагічных раздзелах вызначаны рубрыкі: Культура, Гісторыя, Асвета, Бібліятэкі, Клубы і інш.

*Тэматычныя бібліяграфічныя дапаможнікі* – дапаможнікі, у якіх адлюстравана інфармацыя аб дакументах па пэўнай тэме (у межах адной галіны ведаў).

*Напрыклад:*

*Профільнае навучанне ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі: (бібліяграфічны спіс) / складальнік Т. Г. Канавалава ; рэдактар К. Дз. Варанько // Новыя кнігі : Па старонках беларус. друку : Штомес. бібліягр. бюл. / Нац. б-ка Беларусі. — 2006. — № 4. — [9 с.]. – Дадатак.*

*Межов, В.И. Русская историческая библиография за 1865-1876 включительно / Сост. В. И. Межов. – СПб. : Тип. Имп. Акад. наук, 1885.*

*Т. 5 : История внутренней и внешней политики России; История дипломатических сношений; История внутренних смут и войн России с*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*внешними врагами; История искусств; Вспомогательные науки по русской истории: генеалогия, геральдика, хронология, археология, палеография, нумизматика и мифология. — IX, 378 с.*

*Язвенная болезнь : Список лит. / Респ. науч. мед. б-ка ; [Сост.: О.С.Гук, А.З.Горелова]. – Мінск, 1996. — 14 с.*

*Bialoruski ruch chrzescijanski XX wieku : slownik biograficzno-bibliograficzny / [redakcja naukowa]: Jerzy Garbinski, Jerzy Turonek ; Polska Akademia Nauk, Instytut Slawistyki. – Warszawa : Slawistyczny Osrodek Wydawniczy, 2003. — lxxx, 519 s.*

*Праблемна-комплексныя бібліяграфічныя дапаможнікі* – дапаможнікі, у якіх адлюстравана інфармацыя аб дакументах з шэрагу галін ведаў па асобнай праблеме. *Напрыклад: Чернобыльская катастрофа : библиогр. науч. лит. / Ин-т радиобиологии Акад. наук Беларуси ; [Сост. К.В.Фомиченко] ; Под ред. Е.Ф.Конопли, И.В.Ролевича. – Мінск : Право и экономика, 1996. — 262 с.*

*Персанальныя бібліяграфічныя дапаможнікі* (біябібліяграфічныя) – дапаможнікі, у якіх адлюстравана інфармацыя аб дакументах пэўнай асобы і/ці дакументы аб пэўнай асобе (асобах). Такая бібліяграфічная прадукцыя прысвячаецца, як правіла, найбольш відным дзеячам гісторыі, навукі, культуры.

Напрыклад: Биобиблиография научных трудов профессора, доктора сельскохозяйственных наук Н. Н. Семененко : (к 70-летию со дня рождения) / РУП ""НПЦ НАН Беларуси по земледелию, РУП "Институт мелиорации" ; [составитель А. И. Дмитрук]. – Минск : Институт мелиорации, 2008. — 28 с.

*Мікалай Мікалаевіч Улашчык: біябібліягр. паказ. / Нац. б-ка Беларусі, БелНДЦДААС. – Мінск, 2006.*

*Архівісты Беларусі : біябібліяграфічны даведнік / Камітэт па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы ; [складальнікі: С.У.Жумар, М.Ф.Шумейка]. – Мінск : БелНДІДАС, 2006. — 253 с.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*От ечест венные лексикографы, XVIII-XX вв. : биобиблиогр. очерки / Рос. акад. наук, Ин-т рус. яз. им. В.В.Виноградова, Лексикогр. семинар, Каб. "Славян. мир" ; Под ред. Г.А.Богат овой. – Москва : Наука, 2000. — 508 с.*

*Краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі* – дапаможнікі, у якіх адлюстравана інфармацыя аб дакументах, прысвечаных пэўнаму краю, рэгіёну, населеннаму пункту.

*Напрыклад: Літаратура аб Мінскай вобласці: бібліягр. паказ. / Мін. абл. б-ка, 1970 – Штокварт.;*

*Віцебская вобласць: Паказ. літ. за…/ Віцеб. абл. б-ка Беларусі. – Віцебск, 1970 – Штокварт. і інш.*

Гэтыя паказальнікі выдаюцца 4 разы на год. Адлюстроўваюць разнастайныя дакументы аб прыродзе, гісторыі, эканоміцы, культурным развіцці абласцей Беларусі незалежна ад месца і мовы выдання дакументаў.

*Города Вит ебщины : указ. лит . / Вит еб. обл. б-ка им. В.И.Ленина, От д. белорус. и краевед. лит . ; [Сост . О.А.Дорофеева]. – Вит ебск, 1988. – (Книги о родном крае).*

У навуковых працах, стандартах і даведніках даволі шырока распаўсюджана паняцце рэгіянальныя бібліяграфічныя дапаможнікі. Пад ім разумеецца бібліяграфічная прадукцыя, якая створана ў пэўным рэгіёне і/ці адлюстроўвае дакументы, якія звязаны з рэгіёнам па змесце і іншых прыметах. Названыя паняцці часткова супадаюць і могуць замяняцца адзін адным у выпадку, калі ідзе размова аб адлюстраванні дакументаў, звязаных па змесце з краем, рэгіёнам і магчыма адэкватная замена аб'ёмаў паняцця край (вобласць мясцовасць, што вылучаецца па якой-небудзь прымеце; буйная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка[50]) і рэгіён (вялікая вобласць, група суседніх краін або тэрыторыі, раёны, аб'яднаныя па якіх-небудзь агульных прыметах[51]).

[50] Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў. – 3-е выд. – Мінск, 2002. – С.299.

[51] Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў. – 3-е выд. – Мінск, 2002. – С.572.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Краіназнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі* – дапаможнікі, у якіх адлюстравана інфармацыя аб дакументах, прысвечаных пэўнай краіне.

*Напрыклад: Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии. 1768-1917: библиогр. указ. / Гос. б-ка БССР; Сост. А.А.Сокольчик. – Мінск, 1976. – 426с.*

Адлюстроўвае кнігі і артыкулы са зборнікаў, апублікаваныя на рускай мове ў 1768 – 1917 гг. аб Беларусі.

*Каталог коллекции "Russica" : произведения и документы на иностранных языках, имеющие отношение к России : [в 2 т.] / Императорская Публичная библиотека в Санкт-Петербурге. – [Репринтное изд.]. – Москва : Центрполиграф, 2004.*

*Заглавие оригинала: Catalogue de la section des Russica, ou Écrits sur la Russie en langues éntrangères. St.-Pétersbourg : De 1' Académie Impériale des sciences, 1873.*

Такім чынам, мы разгледзілі асноўныя віды бібліяграфічнай прадукцыі па храналагічнай прымеце, грамадскім прызначэнні, змесце бібліяграфіруемых дакументаў. У навуковай, вучэбнай і даведачнай літаратуры падаюцца і некаторыя іншыя віды. Напрыклад, па паўнаце адбору (выбарачныя і рэгістрацыйныя), па метадах бібліяграфавання (сігнальныя, рэфератыўныя, анатаваныя) і інш. Падрабязная класіфікацыя даецца ў працах А.П.Коршунава [9, 10], азначэнні большасці з іх у дзяржаўных стандартах [1] і слоўніках [2, 3, 4, 5, 6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Р А З Д З Е Л II.
# БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ
## 2.1. Бібліяграфія як галіна дзейнасці
### *Бібліяграфічная дзейнасць у сістэме відаў чалавечай дзейнасці*

Развіццё грамадства, яго гісторыя і культура ўяўляюць сабой працэс рэалізацыі дзейнатворчых адносін чалавека да навакольнага свету, стварэння і пераўтварэння аб’ектаў рэчаіснасці. Яна мае мэтаскіраваны характар. У межах яе можна выдзеліць шэраг тыпаў і формаў (вытворчая, матэрыяльная, пазнавальная, працоўная і т.д.), асобных галін дзейнасці. Адной з такіх галін з’яўляецца бібліяграфічная дзейнасць – практычныя і пазнавальныя дзеянні суб’екта (чалавека) па стварэнні і пераўтварэнні бібліяграфічнай інфармацыі. Яе элементы ўзніклі разам са стварэннем дакументаванай інфармацыі (фіксаваных тэкстаў) як абавязковыя дзеянні аўтара па стварэнні ідэнтыфікацыйных элементаў самаго тэксту і абазначэнні фрагментаў іншых тэкстаў. З развіццём сістэмы дакументных камунікацый (накапленнем аб’емаў фіксаванай інфармацыі, паскарэннем камунікатыўных працэсаў, ускладненнем інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў інфармацыі) адбывалася не толькі колькаснае павелічэнне элементаў бібліяграфічнай дзейнасці, але і іх якаснае пераўтварэнне. Бібліяграфічная дзейнасць стала абасабляцца ад іншых відаў дзейнасці і набыла рысы самастойнага віда дзейнасці па стварэнні БІ. Але спачатку яна мела непрафесійны характар. У ёй удзельнічалі бібліятэкары, вучоныя, выдаўцы, пісьменнікі, кнігагандляры, архівісты спадарожна са сваёй асноўнай дзейнасцю па ўпарадкаванні дакументных масіваў (фондаў), абслугоўванні карыстальнікаў, напісанні навуковых, мастацкіх, публіцыстычных твораў, выданні дакументаў і іх продажы. Ствараліся самастойныя “уласна бібліяграфічныя” працы, пры гэтым яны разглядаліся як неад’емная частка бібліятэчнай, архіўнай, кнігагадлёвай і іншых відаў дзейнасці. Але з цягам часу бібліяграфічная дзейнасць стала абасабляцца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

межах іншых сфер чалавечай практыкі, сталі выпрацоўвацца і прымяняцца спецыяльныя прыёмы і правілы па апісанні кніг і дакументаў справаводства, упарадкаванні іх сукупнасцей, стварэнні інфармацыйна-пошукавых сістэм і іншых уласнабібліяграфічных прадуктаў і паслуг. Адпаведна, бібліяграфічная дзейнасць стала набываць прафесійны характар, да яе сталі прад’яўляцца высокія патрабаванні. Наогул развіццё гэтага віда чалавечай практыкі абумоўлена шэрагам сацыяльна-эканамічных, культурных і палітычных фактараў. Але найбольшы ўплыў на фарміраванне прафесійнага характару бібліяграфічнай дзейнасці аказала фарміраванне навуковых ведаў, станаўленне асобных навуковых дысцыплін і развіццё адукацыі. Менавіта яны патрабавалі дакладнасці апісанняў і навуковага падыходу да упарадкавання дакументных масіваў, галіновай і храналагічнай дыферэнцыяцыі ствараемых бібліяграфічных прадуктаў.

З цягам часу ў межах бібліяграфічнай дзейнасці сталі абасабляцца асобныя бібліяграфічныя працэсы: бібліяграфаванне ці стварэнне разнастайных бібліяграфічных дапаможнікаў, пошук інфармацыі аб дакументах, а таксама бібліяграфічнае абслугоўванне ці давядзенне БІ да карыстальніка. Затым разам з гэтымі практычнымі намаганнямі чалавека, якія сталі ўжо даволі складанымі, патрабавалі метадычнага і навуковага суправаджэння і адначасова давалі падставу для яго, пачалі з’яўляцца элементы навукова-метадычнай, навуковай відаў дзейнасці. Гэта былі вынікі пазнання крыніц БІ, названых вышэй працэсаў і аб’ектаў рэчаіснасці, на пераўтварэнне якой яны скіраваны. На падставе іх з цягам часу аформілася навуковая бібліяграфічная дзейнасць. У яе межах здзяйснялася тэарэтычнае абагульненне бібліяграфічнай практыкі ў цэлым і асобных даных, яе прагназаванне, вывучэнне асноўных этапаў станаўлення бібліяграфіі як грамадскай з’явы, стварэнне, накапленне, захаванне і перадача новых навуковых ведаў.

Пашырэнне практычнай бібліяграфічнай дзейнасці ў розных грамадскіх інстытутах, павелічэнне колькасці ствараемай бібліяграфічнай прадукцыі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзвышэнне патрабаванняў да яе якасці, а таксама асэнсаванне важнасці бібліяграфіі як грамадскай з’явы прывяло да разумення неабходнасці яе спецыяльна падрыхтаванымі прафесіяналамі – бібліёграфамі. І адпаведна была распачата бібліяграфічная вучэбная (адукацыйная) дзейнасць.

На сучасным этапе развіцця грамадства бібліяграфічная дзейнасць уяўляе сабой даволі складанае ўтварэнне. Яна развіваецца як у прафесійным, так і непрафесійным асяроддзях, мае інфраструктурны характар (распаўсюджана ва ўсіх грамадскіх інстытутах, якія маюць справу з фіксаванымі формамі інфармацыі). Аснову яе складаюць бібліяграфічныя практычныя дзеянні суб’екта. У якасці вытворных выступаюць навуковая бібліяграфічная дзейнасць і вучэбная бібліяграфічная дзейнасць.

***Паняцце “бібліяграфічная дзейнасць” у тэрмінасістэме бібліяграфазнаўства. Суадносіны з паняццем “бібліяграфія”***

Паняцце «бібліяграфічная дзейнасць» як і паняцце “бібліяграфія” адносіцца да найбольш агульных паняццяў бібліяграфазнаўства. З канца 1960-х гг. паняцце “бібліяграфія” пачалі суадносіць з дзеяннямі чалавека па пераўтварэнні рэчаснасці, а не толькі з бібліяграфічнымі дапаможнікамі (прадуктамі гэта пераўтварэння). Быў пакладзены пачатак развіцця дзейнаснага, а пазней і сістэмна-дзейнаснага падыходу да разгляду бібліяграфіі як грамадскай з’явы, бібліяграфічнай дзейнасці як кірунка адпаведных практычных і пазнавальных дзеянняў чалавека. Гэта дазволіла, з аднаго боку, дэталёва паказаць сутнасць бібліяграфіі як грамадскай з’явы, вылучыць усе яе кампаненты, паказаць іх узаемасувязь і ўздзеянні са знешнім асяроддзем. з другога, прывяло да разыходжанняў у разуменні сутнасці тэрмінаў “бібліяграфія”, «бібліяграфічная дзейнасць». Некаторыя даследчыкі лічаць, што аб’ёмы гэтых паняццяў поўнасцю супадаюць, некаторыя ўключаюць іх у адзін сінанімічны рад і мяркуюць, што супадзенне магчыма толькі ў самым агульным сэнсе, калі даецца пазначэнне ўсяго бібліяграфічнага і не маюцца на ўвазе асобныя бібліяграфічныя з’явы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усю разнастайнасць поглядаў на аб'ём паняцця "бібліяграфічная дзейнасць", па назіраннях М.Р.Вохрышавай, можна аб'яднасць у два асноўныя падыходы: абмежавальны і пашыральны (пашыраны). Згодна першаму бібліяграфічная дзейнасць звужаецца да бібліяграфічнай практыкі (бібліяграфічнай практычнай дзейнасці). Згодна другому акрамя практыкі ўключае іншыя, вытворныя ад яе віды дзейнасці і адпавядае цэласнаму ўяўленню аб бібліяграфічнай дзейнасці як сістэме. Першы падыход дамінаваў доўгі час. Ён знайшоў адлюстраванне ў стандарце 7.0-77 "Библиография. Термины и определения", у межах якога ўраўноўваліся тэрміны "бібліяграфія" і "бібліяграфічная дзейнасць" ("бібліяграфія – гэта вобласць навукова-практычнай дзейнасці па падрыхтоўцы і давядзенні да спажыўцоў БІ у мэтах уздзеяння на выкарыстанне твораў друку ў грамадстве"). Трактоўка тэрміна "бібліяграфічная дзейнасць" не прыводзілася наогул. Усе ўжытыя ў стандарце тэрміны адносіліся толькі да практычнай дзейнасці. Аб'ект бібліяграфіі (адпаведна – бібліяграфічнай практычнай дзейнасці), як бачна з азначэння, зводзіўся да "твораў друку". Аднак у заўвазе гэта ўдакладнялася і заўвага па сутнасці абвяргала зыходнае паняцце "бібліяграфія". Такая тэрміналагічная недакладнасць не забяспечвала адназначнасць (на крайні выпадак уніфікацыю) ўжывання тэрміна бібліяграфія і спрыяла пашырэнню яго прымянення да розных бібліяграфічных аб'ектаў.

З наступнага тэрміналагічнага стандарту (ГОСТ 7.0-84 "Библиографическая деятельность. Термины и определения"), тэрмін "бібліяграфія" быў выключаны (аўтары палічылі яго рэгламентацыю немагчымай (заўчаснай)), ужываўся тэрмін "бібліяграфічная дзейнасць", аб'ём якога ўраўноўваўся з паняццем бібліяграфічная практыка (бібліяграфічная практычная дзейнасць).

У стандартах 7.0-99 "Информационно-библиотечная деятельность, библиография", СТБ ГОСТ 7.0-2004 "Інфармацыйна- бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія" даюцца азначэнні абодвух тэрмінаў "бібліяграфічная дзейнасць" і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“бібліяграфія”. Пад бібліяграфічнай дзейнасцю разумеецца “галіна дзейнасці па задавальненні патрэбнасцей у бібліяграфічнай інфармацыі”. Гэта значыць яна ўключае толькі практыку, за межамі застаюцца іншыя сферы бібліяграфічнай дзейнасці, напрыклад, даследчая, адукацыйная. Разам з тым, даецца азначэнне тэрміна “бібліяграфія” – “інфармацыйная інфраструктура, якая забяспечвае падрыхтоўку, распаўсюджванне і выкарыстанне бібліяграфічнай інфармацыі”. Азначэнні, на першы погляд, розныя (па-рознаму названы бліжэйшыя радавыя паняцці “галіна дзейнасці” і “інфармацыйная інфраструктура”), але пры дэталёвым разглядзе тлумачэнняў, якія іх раскрываюць бачна, што аб'ёмы амаль супадаюць і па сутнасці роўны азначэнню бібліяграфіі як галіны навукова-практычнай дзейнасці па стварэнні і давядзенні да карыстальніка бібліяграфічнай інфармацыі і яе выкарыстанні.

Як бачна, ў стандартах замацаваны абмежавальны падыход да разгляду аб’ёма паняцця “бібліяграфічная дзейнасць”.

В.А.Факееў разглядае бібліяграфічную дзейнасць як галіну кагнітыўна-інфармацыйнай, сацыяльна-арыентуючай і сацыякультурнай дзейнасці па збеспячэнні доступа да крыніц інфармацыя (ведаў) на ўзроўні іх ідэальных вобразаў (мадэляў), па задавальненні патрэбнасцей у фіксаваных тэкстах (дакументах) сродкамі бібліяграфічнай інфармацыі, па фарміраванні інфармацыйнай (кніжнай, бібліяграфічнай) культуры ў традыцыйных, электронных і іншых магчымых формах[52]. У гэтым азначэнні выражаны кагнітаграфічнае разуменне і бібліяграфіі як грамадскай з’явы, і бібліяграфічнай дзейнасці як яе неад’емнай практычнай часткі (згодна “чатырохвуглавой формулы” В.А.Факеева бібліяграфія – гэта бібліяграфічныя веды пэўнай прадметнай вобласці (інфармацыя), бібліяграфічная дзейнасць, бібліяграфічны сацыяльны інстытут і бібліяграфічная культура).

На наш погляд, бібліяграфічную дзейнасць на сучасным этапе яе развіцця немагчыма абмяжоўваць толькі практычнымі намаганнямі суб’ектаў дзейнасці і

---

[52] *Фокеев, В.А.* Библиографическая наука и практика : терминологический словарь / В. А. Фокеев. – СПб.: Профессия, 2008. – С..31.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вынікамі гэтых намаганняў. Яна ўяўляе сабой складаную многапланавую сістэму, часткамі якой (сферамі дзейнасці) з'яўляюцца практыка-арыентаваная, навуковая і адукацыйная віды мэтанакіраванай дзейнасці. Практычная бібліяграфічная дзейнасць як яе асноўная частка развіваецца на дастаткова высокім узроўні, яна мае навуковы характар і адпаведна навуковая частка дзейнасці суправаджае практычныя намаганні суб'екта. Але навуковая дзейнасць у галіне бібліяграфіі развіваецца не толькі ў межах практыкі, але і на іншых больш высокіх узроўнях, часам інтэгравана ў іншыя навуковыя комплексы. Склаліся таксама сталыя традыцыі па падрыхтоўцы бібліяграфічных кадраў для сферы практычнай дзейнасці розных сацыяльных інстытутаў, асноўная дзейнасць якіх звязана са стварэннем, захаваннем, апрацоўкай і распаўсюджваннем дакументаў. Гэтая дзейнасць арганічна звязана не толькі з практычнай бібліяграфічнай дзейнасцю, але і з навуковай. У яе межах здзяйсняецца рэпрадуцыраванне (адаптацыя і узнаўленне) навуковых ведаў. Таму магчымым і больш правільным бачыцца ўключэнне бібліяграфічнай навуковай і адукацыйнай (вучэбнай) відаў дзейнасці ў аб'ём паняцця бібліяграфічная дзейнасць як яе пазнавальных надбудоў. І адпаведна пад *бібліяграфічнай дзейнасцю можна разумець мэтанакіраванае адлюстраванне і пераўтварэнне фіксаванай сацыяльнай інфармацыі і інфармацыйных патрэнасцей карыстальнікаў, фарміраванне адпаведных навуковых ведаў і іх рэпрадуцыраванне.*

Такі пашыраны падыход прадстаўлены таксама ў поглядах А.П.Коршунава, М.Г.Вохрышавай і некаторых іншых навукоўцаў.

***А.П.Коршунаў аб аб'ёме паняцця "бібліяграфічная дзейнасць"*** А.П.Коршунаў разглядае бібліяграфічную дзейнасць як заканамерны этап фарміравання сістэмы дакументных камунікацый. Яе развіццё звязвае са станаўленнем і ўдасканаленнем названай сістэмы. Бібліяграфічная дзейнасць на сучасным этапе з'яўляецца складаным утварэннем, у межах якога арганічна спалучаюцца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– бібліяграфічная практычная дзейнасць,

– тэарэтычнае абагульненне фактаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, прагназаванне і вывучэнне асноўных этапаў станаўлення бібліяграфіі як грамадскай з’явы (навуковая бібліяграфічная дзейнасць),

– дзейнасць па падрыхтоўцы кадраў (вучэбная бібліяграфічная дзейнасць),

– дзейнасць па кіраванні асобнымі бібліяграфічнымі ўстановамі, службамі, структурнымі падраздзяленнямі (арганізацыйна-упраўленчая бібліяграфічная дзейнасць).

А.П.Коршунаў ураўноўвае паняцці «бібліяграфія» і «бібліяграфічная дзейнасць” і дае наступнае азначэнне. Бібліяграфія – сістэма відаў дзейнасці (практычнай, навуковай, вучэбнай, арганізацыйна-упраўленчай), якая забяспечвае функцыянаванне бібліяграфічнай інфармацыі ў грамадстве.

***Вохрышава аб аб’ёме паняцця “бібліяграфічная дзейнасць”***

М.Р.Вохрышава лічыць, што ў паняцці дзейнасць абагульнена адзінства навукі і практыкі, пазнання і пераўтварэння. Да разгляду бібліяграфічнай дзейнасці правільна прымяняць інтэграцыйны падыход, пры якім пазнавальная сфера ўключаецца ў яе побач з практычнай. Бібліяграфічная дзейнасць пры гэтым накіравана на ўпарадкаванне функцыянуючай у грамадстве інфармацыі спецыфічнымі сродкамі і вывучэнне гэтага працэса. Пры гэтым маецца на ўвазе стварэнне спецыяльных сродкаў работы з інфармацыяй, а таксама працэсы навуковага пошуку і падрыхтоўкі кадраў.

Паняцці «бібліяграфія» і «бібліяграфічная дзейнасць» – найбольш агульныя па аб’ёме і змесце. Яны супадаюць у тым выпадку, калі бібліяграфічная дзейнасць прадстаўляецца на самым высокім узроўні абагульнення, пры якім адрозненні розных бібліяграфічных праяўленняў не фіксуюцца, яны здымаюцца прыналежносцю да бібліяграфічнага наогул.

Паняцце «бібліяграфія» выражае сукупнасць усіх бібліяграфічных з’яў у цэлым, выконвае функцыю абагульненай характарыстыкі, адрознення гэтай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльнай з’явы ад іншых. Яго канкрэтызацыя звязана з выдзяленнем іншых вытворных паняццяў. Канкрэтызацыя паняцця «бібліяграфія» на самым высокім узроўні рэалізуецца ў паняцці «бібліяграфічная дзейнасць», у якім акцэнтуецца ўвага на функцыянальны, працэсуальны аспекты, указваецца на актыўнасць чалавека. Але такой канкрэтызацыі недастаткова. Яна не раскрывае формы рэальнага існавання, прыроду і структуру гэтага працэса. Гэта магчыма на іншых ступенях (узроўнях) канкрэтызацыі.

Бібліяграфічная дзейнасць, як і любая іншая, ўключае дзве сферы – практыку і пазнанне. Практычная дзейнасць мае асэнсаваны характар, ёй уласцівы ідэальныя кампаненты (веды, эмоцыі, пачуцці, увага, воля, мэты), накіраваныя на выканенне практычных дзеянняў. Яна з’яўляецца асновай для пазнання і скіравана не толькі на пераўтварэнне рэчаіснасці, а і на пазнанне.

У бібліяграфічнай пазнавальнай дзейнасці можна выдзеліць дзве падсістэмы: навукова-пазнавальную, у межах якой выпрацоўваюцца новыя веды і вучэбна-пазнавальную, у межах якой рэпрадуцыруюцца падрыхтаваныя. Яны абедзве цесна звязаны з бібліяграфічнай практыкай: першая падпарадкавана мэце ўдасканалення бібліяграфічнай практыкі, другая – з прафесійнай падрыхтоўкай суб’екта бібліяграфічнай дзейнасці. Бібліяграфічная практыка з’яўляецца крыніцай развіцця тэарэтычных бібліяграфічных ведаў. Навука выпрацоўвае ідэальныя планы новых кірункаў дзейнасці.

Вучэбна-пазнальная бібліяграфічная дзейнасць арганічна ўключае ў сябе элементы навуковай дзейнасці (вытворчасці новых ведаў) і элементы практыкі (удзел у бібліяграфічных працэсах).

На практычную дзейнасць аказвае ўздзеянне і навукова-пазнавальная, і вучэбна-пазнавальная сферы. Вучэбна-пазнавальная з’яўляецца пасрэднікам паміж навукай і практыкай, таму што ў межах яе здзяйсняецца асваенне новых ведаў, якія потым будуць укараняцца ў практыку, дзякуючы дзейнасці суб’екта (бібліёграфа), які імі валодае. Адначасова практычная дзейнасць уключаецца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбна-пазнавальную праз непасрэдны практычны вопыт і апасрэдаваны (матэрыялы ў артыкулах, вучэбных, метадычных публікацыях).

*Схема 2. Структура бібліяграфічнай дзейнасці (прапанавана М.Г.Вохрышавай)*




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Прынцыпы і заканамернасці бібліяграфічнай дзейнасці*

Згодна сучасным філасофскім уяўленням, пад прынцыпамі разумеюцца кіруючыя ідэі , асноўныя правілы якой-небудзь дзейнасці, зыходныя палажэнні якой-небудзь тэорыі, навукі і да т.п. На пэўным этапе развіцця любой грамадскай з'явы яны становяцца кіруючымі і вызначаюць спецыфіку яе ўвасаблення.

У працэсе развіцця бібліяграфічнай дзейнасці таксама фарміруюцца і выкарыстоўваюцца пэўныя прынцыпы – асноўныя зыходныя палажэнні ці пастулаты бібліяграфічнай практыкі і пазнання. Яны вызначаюць "адносіны суб'ектаў бібліяграфічнай дзейнасці да рэчаіснасці, нормы іх прафесійных паводзін, якія выяўляюцца як у іх перакананнях, так і ў канкрэтных дзеяннях па генерыраванні і распаўсюджванні бібліяграфічнай інфармацыі"[53]. Прынцыпы

[53] Фокеев, В.А. Библиография: теоретико-методологические основания: учебное пособие для системы дополнительного библиотечно-информационного образования / В. А. Фокеев. – СПб., 2006. – С.220.

заснаваны на асноўных законах і заканамернасцях, характэрных у нашым выпадку для бібліяграфіі як грамадскай з’явы. Але яны ўстанаўліваюцца людзьмі і фармулююцца суб’ектыўна. У розныя гістарычныя перыяды іх пералік, паслядоўнасць, часам і змястоўнае напаўненне вызначалася па-рознаму (напрыклад, прынцыпы камуністычнай партыйнасці, дэмакратычнасці, гуманізма, дзяржаўнага характару; партыйнасці, навуковасці, народнасці, дзейнасці, камунікатыўнасці, сістэмнасці; партыйнасці, аб’ектыўнасці, навуковасці, дэмакратызму; і інш.)[54].

Надзвычай складаная і не бясспрэчная структура прынцыпаў прапанавана ў апошняй рэдакцыі падручніка А.П. Коршунава. Прапанаваны агульныя і прыватныя, фармальныя (колькасныя) і якасна-змястоўныя, унутраныя (уласныя) і знешнія (запазычаныя) групы прынцыпаў. Да агульных адгносяцца прынцыпы: *адмежавання бібліяграфічных з’яў ад небібліяграфічных*, *дакументальнага мыслення, «библиографического всезнайства”.* Да прыватных (фармальныя) – *прынцыпы паўнаты, дакладнасці.* Падкрэсліваецца важнасць і складанасць якасна-змястоўных прынцыпаў бібліяграфічнай дзейнасці, спрэчнасць прынцыпа партыйнасці бібліяграфіі, які быў пануючым у савецкі перыяд развіцця бібліяграфіі. У якасці асноўнага якасна-змястоўнага прынцыпа вызначаецца прынцып якаснай выбіральнасці (качественной избирательности). Неасноўныя (іншыя) прынцыпы, якімі кіруецца бібліяграфія як грамадская з’ява і яе асобныя часткі, не раскрываюцца. Да ўнутраных прынцыпаў аўтары адносяць фармальныя, а да знешніх – якасна-змястоўныя[55].

В.А. Факееў прапаноўвае разглядаць сістэму прынцыпаў бібліяграфіі (бібліяграфічнай дзейнасці) і звязвае яе з функцыянальнай структурай бібліяграфіі як грамадскай з’явы. Адпаведна вядучыя прынцыпы вызначае на базе пазнавальнай, камунікатыўнай, каштоўнасна-арыентуючай і

[54] Там жа С.220, 221.

[55] *Коршунов, О.П.* Библиографоведение : основы теории и методологии : учебник для студентов высших учебных заведений / О. П. Коршунов, Т. Ф. Лиховид, Т. А. Новоженова. – М., 2009. – С. 135–141.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыякультурнай функцый: прынцып інфраструктурнай камунікатыўнасці; навуковасці; сістэмнасці; дакладнасці і адназначнасці абазначэння бібліяграфічнага аб’екта; цэннаснай арыентацыі бібліяграфіі; сацыякультурнага характара бібліяграфіі; дзейнасны прынцып; прынцып універсальнасці; паўнаты генерыруемай і распаўсюджваемай БІ; бібліяграфічнай спецыялізацыі і каапераціі; аб’ектыўнасці бібліяграфіі; сацыяльнай, канкрэтна-гістарычнай і тэхналагічнай абумоўленасці бібліяграфіі; гуманізму; усеагульнай даступнасці БІ, дэмакратызма, народнасці, адкрытасці; галаграфічны прынцып[56]. Гэта даволі поўны пералік прынцыпаў, якія ўласцівы для сучаснага ўзроўню развіцця бібліяграфічнай дзейнасці. Іх пералік можна крыху спрасціць і размежаваць на прынцыпы, якія маюць агульны (метадалагічны) характар і рэгуюць развіццё бібліяграфіі як грамадскай з’явы ў цэлым і прыватныя (тэхналагічныя), якімі кіруюцца пры выкананні асноўных працэсаў, якія абумоўліваюць асаблівасці стварэння бібліяграфічнай прадукцыі, распаўсюджвання і выкарыстання бібліяграфічнай інфармацыі.

Да першай групы можна аднесці прынцыпы навуковасці, сацыяльнай абумоўленасці, мабільнасці, дэмакратызму, арганізацыі і самаарганізацыі; сістэмнасці; інтэгратыўнасці і дыферынцыраванасці; цэнтралізацыі і дэцэнтралізацыі; прынцып адназначнасці абазначэння бібліяграфіруемага аб’екта.

Прынцып *навуковасці* бібліяграфіі праяўляецца праз пазнанне сродкамі бібліяграфіі асобных дакументаў (тэкстаў), іх фрагментаў і сукупнасцей; вывучэнні патрэбнасцей карыстальнікаў у фіксаванай інфармацыі, а таксама праз адлюстранне ў крыніцах бібліяграфічнай інфармацыі ісцінных навуковых ведаў; выкарыстанне навуковых дасягненняў пры фарміраванні сістэмы бібліяграфічнай дзейнасці ў цэлым і развіцці навукі аб бібліяграфічнай дзейнасці – бібліяграфазнаўства.

---

[56] Фокеев, В.А. Библиография: теоретико-методологические основания: учебное пособие для системы дополнительного библиотечно-информационного образования / В. А. Фокеев. – СПб., 2006. – С.221–239.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліяграфічная дзейнасць мае цесную ўзаемасувязь з развіццём грамадства ў цэлым і асобных, у асноўным дамінуючых, сацыяльных груп. Іх сацыяльны заказ абумоўлівае фармальныя, змястоўныя і каштоўнасныя характарыстыкі бібліяграфічнай прадукцыі, асаблівасці задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў, уздзеянне на іх фарміраванне. Развіццё бібліяграфічнай дзейнасці залежыць ад дынамікі грамадскага жыцця, яго тэхналагічнага, матэрыяльна-тэхнічнага, эканамічнага і культурнага ўзроўню і таму заўсёды рэалізуецца прынцып яе *сацыяльнай абумоўленасці,* а таксама *мабільнасці і варыятыўнасці.* Апошнія забяспечваюць дынамізм бібліяграфічных змен і пастаяннай запатрабаванасці бібліяграфічнай дзейнасці як кірунка грамадскай практыкі, змяненні (часам скасаванні і пераўтварэнні) асобных бібліяграфічных з'яў. Мабільнасць бібліяграфічнай дзейнасці праяўляецца праз з'яўленне новых відаў і формаў бібліяграфічнай прадукцыі, формаў і метадаў бібліяграфічнага абслугоўвання ў адказ на патрэбы навукі, адукацыі, вытворчасці (напрыклад, станаўленне у пачатку XIX ст. і актыўнае развіццё на працягу вялікага адрэзку часу крыніц бягучай бібліяграфіі ў адказ на інтэнсіўнае фарміраванне навуковых ведаў, потым выдзяленне як асобнага навукова-дапаможнага кірунку і да т.п.). Варыятыўнаць надзвычай важна як пры складанні бібліяграфічнай прадукцыі, так і пад час бібліяграфічнага абслугоўвання, якія здзяйсняюцца не толькі на падставе канкрэтных, усталяваных методык і падыходаў, а з улікам групавых ці індывідуальных характарыстык карыстальніка, мэтаў яго звяртання да крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі, узроўню бібліяграфічнай культуры і інш.

*Дэмакратызм* бібліяграфічнай дзейнасці праяўляецца праз адлюстраванне бібліяграфічнымі сродкамі дакументнага патоку, створанага рознымі самымі шырокімі коламі грамадства, скіраванасць яе на забеспячэнне ўсіх груп грамадства бібліяграфічнай інфармацыяй, даступнасць розных бібліяграфічных дапаможнікаў, адкрытасць інфармацыйна-пошукавых сістэм, адсутнасць любых формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да карыстальнікаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спрыянне тым самым рэалізацыі правоў чалавека на свабоду доступу да інфармацыі.

Прынцыпы *арганізацыі і самаарганізацыі* бібліяграфічнай дзейнасці звязаны з уплывам на яе з боку розных органаў кіравання (дзяржаўнага, грамадскага, прафесійнага) і ўласным упарадкаваннем. На ўзроўні дзяржавы ці асобнага сацыяльнага інстытута, магчыма грамадскага аб’яднання, прымаюцца арганізацыйныя рашэнні, якія могуць абумоўліваць як стратэгію бібліяграфічнай дзейнасці ў цэлым, так і асобных яе кірункаў (стварэнне бібліяграфічных цэнтраў і замацаванне бібліяграфічных функцый за інфармацыйнымі цэнтрамі, бібліятэкамі, архівамі; стварэнне бібліяграфічных аддзелаў і замацаванне бібліяграфічных функцый за комплекснымі аддзеламі ў розных грамадскіх інстытутах сістэмы сацыяльных (дакументных) камунікацый). Напрыклад, у Беларусі на ўзроўні заканадаўчых актаў за бібліятэкамі замацавана “ажыццяўленне апрацоўкі дакументаў, стварэнне даведачна-бібліяграфічнага апарату, у тым ліку баз даных і іншых інфармацыйных рэсурсаў; забеспячэнне бібліятэчнага, інфармацыйнага і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк з улікам іх патрэбнасцей”[57]; за архівамі – стварэнне электронных інфармацыйных рэсурсаў на базе архіўнай інфармацыі і прадастаўлення доступу да іх, стварэнне даведнікаў аб складзе і змесце дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонда Рэспублікі Беларусь[58].

Разам з тым, бібліяграфічная дзейнасць як любая сістэма здольна ўпарадкаваць і змяняць (карэктыраваць ці адаптаваць) сваю структуру *(самаарганізоўвацца)* пад уплывам шэрагу знешніх і ўнутраных фактараў (сінергіі). Такія змены адбываюцца пастаянна і іх немагчыма ўсе прадугледзіць на пачатку прыняцця арганізацыйных рашэнняў і замацаваць на дзяржаўным ці галіновым узроўні. Арганізацыйныя рашэнні маюць, як правіла, абагульняючы

[57] Закон Рэспублікі Беларусь “Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь”. Арт. 14.
[58] Закон Республики Беларусь “О Национальном архивном фонде и архивах в Республике Беларусь”. Ст.27.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характар, а на ўзроўні самаарганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў цэлым ці асобных яе кампанентаў, у прыватнасці, здзяйсняецца канкрэтызацыя гэтых рашэнняў у адпаведнасці з умовамі працы, складам дакументных фондаў і патрэбнасцямі пэўных карыстальніцкіх груп і да т.п.

Прынцып *адназначнасці абазначэння бібліяграфіруемага аб'екта* ляжыць у аснове стварэння любых пошукавых ці ўлікова-рэгістрацыйных сістэм, скіраваных на адлюстраванне дакумента ці любой яго структурнай лагічна выдзеленай адзінкі. Ён праяўляецца праз фарміраванне і функцыянаванне сукупнасці характарыстык бібліяграфіруемага аб'екта, якая забяспечвае не толькі яго найменне, але і ідэнтыфікацыю і залежыць ад задач, якія ставяцца перад бібліяграфічнай прадукцыяй і якія адпаведна ўплываюць на структуру бібліяграфічнага запісу. Прычым адназначнасць абазначэння можа праяўляецца ў дачыненні да дакумента як ідэальнай (зборнай) адзінкі дакументнага патоку, так і да канкрэтнага экзэмпляра з улікам яго асобных характарыстык (напрыклад, ідэнтыфікацыйных нумароў, наяўнасці аўтографаў і інш.). Першае праяўленне ўласціва крыніцам бібліяграфічнай інфармацыі, якія не звязаны з канкрэтным фондам, а даюць уяўленне аб дакументным патоку ў цэлым ці асобнай яго частцы, якая створана ў пэўны адрэзак часу, на пэўнай мове, па пэўнай тэме і можа знаходзіцца ў фондзе любога грамадскага інстытута сістэмы дакументных камунікацый ці прыватным кнігазборы. Другое – бібліяграфічным каталогам (у розным іх праяўленнях: электронным, картачным, друкаваным, рукапісным; зводным), а таксама формам індывідуальнага ўліку дакументаў (напрыклад, інвентарным кнігам). Інтэгратыўнасці.

Рэалізацыя прынцыпу *сістэмнасці* характэрна як для практычнай дзейнасці, так і вельмі шырока прымяняецца ў навуковай сферы. Бібліяграфічная дзейнасць у сучасным бібліяграфазнаўстве разглядаецца як сістэма, у якую ўключаюцца два асноўныя цесна звязаныя паміж сабой кампаненты: практыка і пазнанне. Яны ў сваю чаргу складаюцца з сукупнасці элементаў, якія звязаны паміж сабой і са знешнім асяроддзем, утвараюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэласнасць. Рэалізацыя прынцыпу сістэмнасці вельмі выразна прасочваецца праз стварэнне сістэмы бібліяграфічных дапаможнікаў у цэлым і сістэм, вызначаных па фармальных, змястоўных і каштоўнасных прыметах; стварэнне пошукавых сістэм пэўнага сацыяльнага інстытута – фондатрымальніка; упарадкаванне бібліяграфічных запісаў у сістэматычных каталогах, картатэках і іншых крыніцах бібліяграфічнай інфармацыі; прадстаўленне пошукавых вобразаў дакументаў праз прымяненне розных класіфікацыйных схем; стварэнне сістэмы дапаможных паказальнікаў да крыніц першаснай і другаснай інфармацыі і інш. Кожны элемент пры гэты займае сваё ўласнае месца ў сістэме, выконвае ўласцівую толькі яму ролю, але падпарадкаваны пры гэтым агульнай мэце, якая вызначаецца для сістэмы ў цэлым.

Прынцып *інтэгратыўнасці* ўласцівы як бібліяграфіі ў цэлым (як грамадскай з'яве), што абумоўлена яе інфраструктурным характарам, уключанасцю на другаснадакументным узроўні ў дзейнасць бібліятэк, архіваў, кнігагандлёвых устаноў, выдавецтваў і інш. Акрамя гэтага элементы бібліяграфічнай дзейнасці, а найбольш выразна – ствараемыя бібліяграфічныя запісы, бібліяграфічныя дапаможнікі і бібліяграфічныя веды шырока выкарыстоўваюцца ў іншых сферах навукі і практыкі. Бібліяграфія пранікае ў розныя галіны ведаў, часам, нават, цяжка правесці размежаванне паміж бібліяграфічнымі і небібліяграфічнымі ведамі, дакументнай прадукцыяй. З некаторымі навукамі яна ўтварае камплікатыўныя навуковыя дысцыпліны, напрыклад, гістарычная бібліяграфія, якая адначасова з'яўляецца разнавіднасцю галіновай бібліяграфічнай сістэмы і спецыяльнай гістарычнай дысцыплінай. Менавіта рэалізацыя прынцыпа інтэгратыўнасці гістарычнай бібліяграфіі як галіновай сістэмы абумоўлівае ўключэнне ў яе вялікай падсістэмы – бібліяграфіі гістарычных крыніц, у межах якой аб'ектамі бібліяграфічнай дзейнасці выступаюць дакументы (тэксты) як адзінкі гісторыка-культурнага працэсу. Інтэгратыўнасць бібліяграфіі праяўляецца і ў межах правядзення міждысцыплінарных навуковых даследаванняў, праз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміраванне сумеснымі наганнямі розных бібліяграфічных устаноў і службаў зводных каталогаў, баз даных аўтарытэтных/нарматыўных запісаў, а таксама праз інтэграцыю іншых пошукавых сістэм у інфармацыйныя рэсурсы пэўнай установы і наадварот, уласных інфармацыйных рэсурсаў у пошукавыя сістэмы іншых устаноў-генератараў.

Прынцып інтэгратыўнасці дапаўняецца супрацілеглым па характары прынцыпам *бібліяграфічнай спецыялізацыі* ці *дыферынцыраванасці* які праяўляецца праз стварэнне спецыялізаваных бібліяграфічных устаноў, служб, аддзелаў, сектароў ці замацавання спецыялізаваных (напрыклад, па галіновай ці відавой прыметах) функцый за асобнымі супрацоўнікамі. Гэта дазваляе на высокім прафесійным узроўні ствараць і распаўсюджваць бібліяграфічную інфармацыю, фарміраваць аптымальны пералік інфармацыйна-пошукавых сістэм адпаведна профілю ўстановы-фондатрымальніка ці ствараць аналітыка-бібліяграфічныя матэрыялы.

Прынцыпы *цэнтралізацыі і дэцэнтралізацыі* рэалізуюцца на ўзроўні стварэння бібліяграфічных аб’яднанняў (напрыклад, сеткі навукова-аналітычных устаноў, цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм), у межах якіх адной установай (цэнтрам) здзяйсняюцца адміністрацыйныя, метадычныя і некаторыя (аднатыпныя) вытворчыя працэсы, а шэраг устаноў ніжэйшага ўзроўню (філіялы) з’яўляюцца аб’ектамі яе ўздзеяння, выкарыстоўваюць вынікі працы цэнтраў. Напрыклад, у шэрагу краін свету цэнтралізаваны працэсы першаснай апрацоўкі дакументнага патоку (каталагізацыі) і дэцэнтралізаваны (размеркаваны) намаганні па бібліяграфічным абслугоўванні ў розных інфармацыйных установах, пры самаабслугоўванні і інш. Гэта дазваляе ўніфікаваць аднатыпныя працэсы, на высокім якасным узроўні ствараць бібліяграфічныя запісы, эканоміць пры гэтым фінансавыя сродкі і рабіць вельмі спрыяльным доступ да інфармацыі – ствараць шмат кропак доступу да яе.

Акрамя таго выдзяляюцца прынцыпы, звязаныя з асобнымі бібліяграфічнымі працэсамі. Напрыклад, да бібліяграфічнага пошуку –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынцыпы «паўнаты» «дакладнасці», «рэлевантнасці», «перцінентнасці», да бібліяграфавання – аднаразовасць апрацоўкі дакументнага патока і шматкратнасць выкарыстання атрыманай інфармацыі (максімальная аптымізацыя працэсаў генерыравання інфармацыйнай прадукцыі для пазбаўлення паралелізму і скарачэння затрат), галаграфічны прынцып (у сучасных умовах любая БІ можа быць атрымана ў любы час з любога камп'ютарызаванага месца[59]. карпаратыўнасці

Прынцыпы маюць канкрэтна-гістарычны характар, дзейнічаюць ў пэўным грамадстве і відазменьваюцца пад уздзеяннем розных фактараў. Але захоўваецца сутнасная аснова, т.ш яна залежыць ад сутнасці самой бібліяграфіі і яе галоўных спецыфічных задач, якія застаюцца нязменнымі ў розныя гістарычныя эпохі. Прынцыпы бібліяграфічной дзейнасці ўзаемазвязаны з заканамернасцямі, якія раскрываюць той ці іншы бок сутнасці даследуемых з'яў.

***Заканамернасці развіцця бібліяграфічнай дзейнасці (бібліяграфіі)***

Заканамернасці гэта паслядоўнае (на працягу значнага перыяда часу) і ўстойлівае праяўленне дзейнасці пэўнага закона. Бібліяграфія ўключана ў грамадскае жыццё наогул, пранікае прычым вельмі глыбока ў розныя сферы навуковай, адукацыйнай грамадскай практыкі, яе некаторыя галіновыя кірункі і таму ў межах яе спецыфічна праяўляюцца законы і заканамернасці рознага ўзроўню. Таму можна пагадзіцца з пазіцыяй М.Р. Вохрышавай, якая лічыць што на бібліяграфію аказваюць уплыў:

– агульныя законы і заканамернасці грамадскага развіцця;

– законы і заканамернасці развіцця навук, перш за ўсё, сумежных;

– заканамернасці фарміравання патрэб асобы і грамадства ў інфармацыі і ведах;

– заканамернасці развіцця самой бібліяграфічнай дзейнасці (бібліяграфіі).

---

[59] [59] Фокеев, В.А. Библиография: теоретико-методологические основания: учебное пособие для системы дополнительного библиотечно-информационного образования / В. А. Фокеев. – СПб., 2006. – С.228.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уласна бібліяграфічныя заканамернасці праяўляюцца ў часе як устойлівые сувязі паміж асобнымі з'явамі бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. З пералікам, які прыводзіць М.Р.Вохрышава, можна ў цэлым пагадзіцца, скарэктаваўшы як фармулёўку некаторых з іх, так і асобныя тлумачэнні. Заканамернасцямі развіцця самой бібліяграфічнай дзейнасці, такім чынам, можна лічыць:

*Адпаведнасць бібліяграфіі (бібліяграфічнай дзейнасці) эканамічным і сацыяльна-культурным умовам грамадства і асаблівасцям яго тэхналагічнага развіцця.* Гэта праяўляецца праз выбар прыярытэтных кірункаў развіцця, якія не бываюць выпадковымі. Бібліяграфія выконвае задачы, якія ставяцца грамадствам на пэўным этапе яго развіцця (папулярызацыя ведаў, дапамога навукава-тэхнічнаму прагрэсу і інш.) і ўключаецца як сфера дзейнасці ў сістэму эканамічных адносін. Яна пачынала развівацца са з'яўленнем дакумента як крыніцы фіксаванай інфармацыі. Ускладненне яе адбывалася ў залежнасці ад узроўню тэхналагічнага развіцця краін (з развіццём кнігадрукавання сталі ствараца друкаваныя формы бібліяграфічных рэсурсаў, са з'яўленнем аўдыё-, відэадакументаў, кампакт-дыскаў, CD-ROM і т.д. – адпаведныя бібліяграфічныя крыніцы і інш.).

*За час свайго развіцця бібліяграфія назапашвае багаты вопыт, захоўвае яго, не адмаўляецца як ад дасягнутага, так і ад новага, якое можа пашырыць яе магчымасці.* На працягу ўсяго перыяду развіцця інфармацыйных камунікацый (вусная мова, пісьменства, кнігадрукаванне, тэле-, радыёвяшчанне, камп’ютарныя тэхналогіі) захавалася сутнаснасць бібліяграфіі, асноўныя кірункі і формы развіцця і, разам з тым, адбывалася іх удасканаленне і пашырэнне. Так, бібліяграфічны запіс захаваў на працягу стагоддзяў сваю сутнасць і асноўнае прызначэнне, а прадстаўленне яго на электронных носьбітах значна пашырыла магчымасці структурыравання і пошуку інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Змена асобных кірункаў развіцця і прыярытэтнасці асобных участкаў дзейнасці ў розныя гістарычныя перыяды.* Напрыклад, рэкамендацыйная бібліяграфія ў краінах былога СССР займала прыярытэтныя пазіцыі з 20-х гадоў XX ст. і страціла іх да канца XX стагоддзя.

*Наяўнасць глыбокіх сістэмных сувязей з грамадскімі інстытутамі сістэмы дакументных камунікацый.* Гэта абумоўлена блізкасцю рашаемых задач і здзяйсняемых тэхналагічных працэсаў, перасячэннем праблематыкі навуковых даследаванняў і інш.

Рэалізыя асноўнага прызначэння бібліяграфіі для грамадства праз максімальна поўнае адлюстраванне ўсіх дакументных рэсурсаў і дыферэнцыраванае адлюстраванне дакументаў з улікам патрэбнасцей розных катэгорый карыстальнікаў.

**Вывады.** Бібліяграфічная дзейнасць – разнавіднасць грамадскай дзейнасці, скіраванай на ўпарадкаванне існуючай ў грамадстве інфармацыі спецыфічнымі сродкамі і даследаванне гэтага працэса. Паняцці «бібліяграфія» і «бібліяграфічная дзейнасць» супадаюць толькі на самым высокім узроўні абагульнення. Бібліяграфічная дзейнасць – складаная сістэма ў якую ўключаюцца дзве асноўныя часткі: бібліяграфічная практычная дзейнасць і бібліяграфічная пазнавальная дзейнасць. Асаблівасці яе развіцця канкрэтна-гістарычна абумоўлены.

## 2.2. Бібліяграфічная практычная дзейнасць: паняцце і структура

### *Узнікненне і асаблівасці развіцця бібліяграфічнай практычнай дзейнасці*

Пад практыкай разумеюць спецыфічна чалавечную, асэнсаваную, мэтазгодную і мэтанакіраваную пачуццёва-прадметную дзейнасць. Яна з'яўляецца асновай пазнання. Бібліяграфічная практыка (бібліяграфічная практычная дзейнасць) – гэта спецыфічны, інфрастуктурны від чалавечай практыкі, распаўсюджаны ў шэрагу іншых відаў дзейнасці, скіраваны на стварэнне і распаўсюджванне БІ і задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карыстальнікаў бібліяграфічнымі сродкамі. Яна ўваходзіць у сістэму бібліяграфічная дзейнасць, з'яўляецца яе асноўнай часткай і асновай для бібліяграфічнага пазнання.

А.П.Коршунаў лічыць зыходным пунктам любой бібліяграфічнай дзейнасці дзеянні чалавека, які адчужае звесткі аб дакуменце ад самаго дакумента, фіксуе і ўпарадкуе іх у мэтах садзейнічання рэалізацыі адпаведнасцей паміж дакументамі і спажыўцамі. Бібліяграфічная практычная дзейнасць зарадзілася ў межах бібліятэчнай справы і на працягу доўгага часу развівалася ў яе недрах і зводзілася ў асноўным да вытворчасці розных формаў бібліяграфічнай інфармацыі.

Разам з тым, пры такім падыходзе па-за межамі застаюцца афінныя і разнастайныя латэнтныя формы бібліяграфічнай інфармацыі, якія з'яўляюцца неад'емнымі элементамі дакумента, а праца па іх стварэнні – неад'емнай часткай працы над дакументамі. Да таго ж нельга недаацэньваць развіцця бібліяграфічнай практыкі ў межах архіўнай справы, дзе ўзнікала і, адпаведна, рэалізоўвалася неабходнасць упарадкавання дакументаў, па-другое, захоўваліся юрыдычныя дакументы з пералікамі кніг, якія ўключаліся ў маёмасць, перадаваліся ад аднаго ўладальніка другому. Таму зыходным пунктам любой бібліяграфічнай дзейнасці можна лічыць дзеянні чалавека, які стварае дакумент і спадарожна займаецца стварэннем ідэнтыфікацыйных элементаў для гэтага дакумента, упарадкуе веды, створаныя папярэднікамі і прадстаўляе іх праз цытаты, каментарыі, спасылкі.

У працэсе развіцця бібліяграфічнай практычнай дзейнасці ўскладняліся яе кірункі, арганізацыйныя формы, метадычныя падыходы, шырыўся спетр і аб'ём ствараемай прадукцыі, ускладняліся задачы, якія ставіла перад ёй грамадства. У выніку адбылася дыферэнцыяцыя бібліяграфічнай практыкі, выразна вызначылася дзейнасць па стварэнні бібліяграфічнай прадукцыі і давядзенні бібліяграфічнай інфармацыі да карыстальнікаў. Гэтыя два працэсы і іх састаўляючыя актыўна развіваюцца на сучасным этапе. Для сучаснай

бібліяграфічнай практычнай дзейнасці характэрна: пастаяннае ўскладненне, пашырэнне маштабаў яе пранікнення ў іншыя сферы грамадскага жыцця, якаснае ўдасканаленне асобных працэсаў, тэхналогіі, методыкі, пашырэнне спектру ствараемай прадукцыі.

***Рысы, уласцівыя бібліяграфічнай практыцы***

Бібліяграфічнай практыцы ўласцівы наступныя рысы:

– прадметнасць,
– сацыяльная абумоўленасць,
– мэтазгоднасць,
– суб'ектнасць[60].

Прадметнасць бібліяграфічнай практыкі выражаецца ў наяўнасці спецыфічнага прадмета, на які скіравана дзейнасць; у змяненні гэтага прадмета пад уздзеяннем розных фактараў; у стварэнні грамадска-значымага прадукта – бібліяграфічных дапаможнікаў; у прымяненні спецыяльных сродкаў дзейнасці.

Бібліяграфічная практыка сацыяльна абумоўлена. Яна мае грамадскі характар і яе змест вызначаецца характарам грамадскіх патрэбнасцей, рэальнымі абставінамі і ўмовамі, наяўнымі матэрыяльнымі срокамі. Бібліяграфічнай практыцы (улічваючы яе прадметны характар і сацыяльную абумоўленасць) уласціва накіраванасць, якая вызначаецца яе прадметам, знешнімі і унутранымі фактарамі – рэгулятарамі дзейнасці.

Мэтазгоднасць бібліяграфічнай практычнай дзейнасці – гэта рух да канчатковага выніка. Практычныя дзеянні рэгулююцца ідэальнымі, асэнсаванымі мэтамі, якія ставяцца суб'ектамі на шляху да выніка. Яна абумоўлена знешнімі фактарамі (звязаны з пэўнымі канкрэтна-гістарычнымі ўмовамі і законамі сацыяльнай сістэмы) і ўнутранымі фактарамі

[60] *Вохрышева, М.Г.* Теория библиографии: учеб. пособие / М.Г.Вохрышева. – Самара., 2004. – С. **367 с.

(адлюстроўваюць ступень адпаведнасці якасцей прадмета, сродкаў, метадаў, якія выкарыстоўваюцца для атрымання выніка).

Суб’ектнасць бібліяграфічнай практыкі праяўляецца праз удзел:

– стваральнікаў бібліяграфічнай інфармацыі (суб’ектаў, якія на прафесійным ці аматарскім узроўнях ствараюць / пераўтвараюць БІ);

– распаўсюджвальнікаў бібліяграфічнай інфармацыі (суб’ектаў, якія на прафесійным ці аматарскім узроўнях перадаюць БІ, уступаюць ва ўзаемадзеянне з карыстальнікамі БІ);

– карыстальнікаў бібліяграфічнай інфармацыі (суб’ектаў, якія ўступаюць ва ўзаемадзеянне з распаўсюджвальнікамі БІ);

– аўтараў дакументаў, якія адлюстроўваюцца пры стварэнні персанальна-арыентаваных звестак у даведніках, каталогах, базах даных;

– даследчыкаў-бібліяграфазнаўцаў, якія даследуюць бібліяграфічную практыку і ствараюць на аснове гэтага навуковыя веды;

– выкладчыкаў і навучэнцаў, якія задзейснены ў аналізе і вывучэнні практычнай дзейнасці, асваенні практычных уменняў і выпрацоўцы навыкаў.

***Тэарэтычныя падыходы да разгляду бібліяграфічнай практычнай дзейнасці***

У розныя гады эквівалентам тэрміна “бібліяграфічная практычная дзейнасць” выступалі “бібліяграфічная праца”, “бібліяграфічная справа”, “бібліяграфічная дзейнасць”, “бібліяграфія”. Гэтыя тэрміны адрозніваюцца паміж сабой па аб’ёме паняцця, якія яны абазначаюць. Іх ужыванне можна суаднесці з развіццём розных падыходаў да разгляду сутнасці бібліяграфічнай практычнай дзейнасці:

– *працэсуальны падыход* – імкненне вызначыць асобныя працэсы (адзін – абмежавальна-працэсуальны падыход; комплекс працэсаў – пералічальна-працэсуальны падыход) і праз іх разглядаць бібліяграфічную практычную дзейнасць. У 20–30-я гг. ХХ ст. задачы бібліяграфічнай практыкі зводзіліся да стварэння бібліяграфічных дапаможнікаў. Папулярным быў тэрмін

“практычная бібліяграфія”, які ўказваў на практычную скіраванасць бібліяграфічных матэрыялаў. Я.П.Грабеншчыкоў на І Усебібліяграфічным з’ездзе адзначаў, што “практычная бібліяграфія” – гэта сума і сукупнасць усіх выкананых да сённяшняга дня прац па бібліяграфіі”. У 30-я гг. ХХ ст. сфарміраваўся погляд на бібліяграфію яык прыкладную навукова-дапаможную дысцыпліну, задачы якой зводзіліся да практыкі па апісанні кніг (Л.Н.Трапоўскі, Я.І.Шамурын і інш.). Як бачна бібліяграфічная практычная дзейнасць зводзілася да аднаго працэса – бібліяграфаванне ці разглядаліся толькі вынікі гэтага працэса. У 50–60-я гг. ХХ ст. пад бібліяграфічнай практычнай дзейнасцю разумелі “бібліяграфічную работу” – сукупнасць працэсаў стварэння бібліяграфічных дапаможнікаў і давядзення іх да чытачоў. Сама сістэма дапаможнікаў выводзілася за межы бібліяграфічнай работы. І.Р.Моргенштерн разглядаў бібліяграфічную дзейнасць толькі ў практычным аспекце і разумеў яе як комплекс працэсаў, якія здзяйсняюцца ў мэтах перадачы чытачам інфармацыі аб творах друку. Такі падыход быў абумоўлены актыўным развіццём розных кірункаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, у прыватнасці розных формаў бягучага інфармавання чытачоў, даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання. У сучасных працах ён дае наступнае азначэнне тэрміна “бібліяграфічная работа” – сукупнасць працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці, здзяйсняемых яе суб’ектам ці сістэмай інфармацыйных устаноў[61], адзначае, што “бібліяграфічная работа” не з’яўляецца аналагам тэрміна “бібліяграфічная дзейнасць”, яны суадносяцца як частка-цэлае.

У 60-я гг. ХХ ст. быў выказаны *асобасны* погляд на бібліяграфічную практычную дзейнасць (працы І.І. Рашацінскага, В.А.Нікалаева). Сутнасць бібліяграфічнай работы бачылі ва ўзаемадзеянні бібліёграфа і чытача. Бібліяграфічная практыка – мэтанакіраваны працэс інфармацыі аб творах друку і іх прапаганды паміж чытачоў. Бібліёграф у межах гэтага працэса аказвае

[61] Моргенштерн И.Г. Информационный и книжный мир. Библиография: (избранное). – СПб.: Профессия, 2007. – С. 102–103.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапамогу чытачам, якія шукаюць яе для выкарыстання ў тых ці іншых мэтах. Упершыню ў межах бібліяграфічнай практыкі стаў разглядацца суб'ект.

У 60-я гг. XX ст. існаваў таксама *комплексны* падыход да разгляду бібліяграфічнай практыкі (працы М.А. Брыскмана, Дз.Ю.Цяплова), у межах якога феномен бібліяграфія разглядаўся як недзялімы, як навуковая дысцыпліна, якая ўключае элементы практыкі, якая ў сваю чаргу звязана толькі са сферай матэрыяльнай вытворчасці.

З 70-х гг. XX ст. стаў развівацца *дзейнасны* падыход (працы Э.К. Беспалавай, А.І.Барсука, Е.Н.Фаміна і інш.), у межах якога бібліяграфія разглядалася як дзейнасць. Е.Н.Фамін разглядаў бібліяграфічную практычную дзейнасць як бібліяграфічную справу ці ўласна бібліяграфію – дзейнасць па стварэнні і распаўсюджванні бібліяграфічнай інфармацыі. А.І.Барсук: бібліяграфія – галіна навукова-практычнай дзейнасці па падрыхтоўцы і давядзенні да карыстальнікаў бібліяграфічнай інфармацыі. Гэта ж было замацавана і ў ГОСТ 7.0–77 "Библиография: термины и определения". Разам з тым быў прапанаваны і тэрмін "бібліяграфічная работа", які ахопліваў працэсы па стварэнні і давядзенні бібліяграфічнай інфармацыі, і па сутнасці ўраўноўваўся з тэрмінам "бібліяграфічная дзейнасць". З наступных тэрміналагічных стандартаў (ГОСТ 7.0-84 "Библиографическая деятельность. Термины и определения", ГОСТ 7.0-99. СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография: Термины и определения) гэты тэрмін быў выключаны.

У межах *сістэмна-дзейнаснага* падыхода бібліяграфічную практычную дзейнасць пачалі разглядаць як важнейшы элемент сістэмы бібліяграфічная дзейнасць (бібліяграфія). Найбольш выразна гэта парадстаўлена ў канцэпцыях А.П.Коршунава, М.Г. Вохрышавай (больш падрабязна гл. 2.1).

***Асноўныя кірункі структурыравання бібліяграфічнай практычнай дзейнасці***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структурыраванне бібліяграфічнай дзейнасці з’яўляецца адной з важнейшых, складаных і да канца не вырашаных праблем бібліяграфазнаўства. Вырашэнне яе спрыяе паглыбленню ведаў аб бібліяграфічнай дзейнасці, робіць іх упарадкаванымі і цэласнымі, што важна не толькі для даследчай дзейнасці, але і для выкладання бібліяграфічных дысцыплін, аптымізацыі розных кірункаў практычнай дзейнасці.

У спецыяльнай літаратуры ў асноўным прапануюцца падыходы да структурыраванні бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Іх мноства, але адсутнічае адзінства, што звязана, найперш, са шматпланавасцю самаго аб’екта, недастатковай распрацаванасцю тэарэтычных палажэнняў. Аналіз даследаванняў сведчыць аб тым, што:

– зроблена шэраг абагульненняў, якія могуць стаць асновай наступных даследаванняў,

– адсутнічае адзіны падыход да выдзялення відаў бібліяграфіі (бібліяграфічнай дзейнасці), што звязана са шматпланавасцю самой з’явы і з разыходжаннямі ў тлумачэнні такіх паняццяў як “бібліяграфія”, “від бібліяграфіі”;

– не да канца вырашана праблема вызначэння падстаў для структурыравання бібліяграфічнай дзейнасці.

Філасофскі падыход да структурыравання бібліяграфічнай дзейнасці патрабуе разглядаць структуру як на базе прынцыпаў сістэмнага метада, так і на аснове дзейнасных характарыстык, якія даюць магчымасць правесці відавую класіфікацыю па комплексу прымет. Такі падыход дазваляе выдзяляць унутраную і знешнюю структуры.

Аналіз бібліяграфічнай практычнай дзейнасці як сістэмы, яе ўнутранай структуры магчымы праз выяўленне ўзаемасувязей яе асноўных кампанентаў: суб’екта (таго, хто здзяйсняе дзейнасць); мэтаў (ідэальных вобразаў дзейнасці); аб’ектаў (прадметаў, на якія скіраваны намаганні суб’екта); працэсаў як мэтанакіраванай актыўнасці суб’екта; сродкаў, пры дапамозе якіх дасягаецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пастаўленая мэта; рэзультата (як выніка дасягнення ці недасягнення мэты). Гэта дазваляе высветліць дынаміку дзейнасці, убачыць узаемасувязі паміж асобнымі кампанентамі.

Разам з тым, бібліяграфічная практычная дзейнасць у рэчаіснасці прадстаўлена шэрагам канкрэтных кірункаў, сфер, якія ўяўляюць сабой арганічнае адзінства і якія можна выдзеліць у асобныя катэгорыі па розных прыметах, гэта значыць дыферэнцыраваць па знешніх праяўленнях (напрыклад, грамадскае прызначэнне бібліяграфіі як з'явы, якая рэалізуецца ў соцыуме, сукупнасць ствараемай і распаўсюджваемай прадукцыі і інш.) .

Знешняя і ўнутраная структуры знаходзяцца ў адзінстве і не могуць разглядацца адасоблена. У межах любога віда бібліяграфічнай дзейнасці існуюць кампаненты: суб'ект, аб'ект, працэсы, сродкі, мэты, рэзультаты, якія ў сукупнасці складаюць яго якасную вызначанасць. У сваю чаргу выдзяленне відаў абумоўлена дыферэнцыяцыяй сутнасных элементаў сістэмы бібліяграфічнай дзейнасці і яно робіцца «па суб'екту», «па рэзультатах» і т.д.

**Вывады.** Бібліяграфічная практыка (бібліяграфічная практычная дзейнасць) –спецыфічны, інфрастуктурны від чалавечай практыкі, накіраваны на задавальненне патрэбнасцей у дакументах бібліяграфічнымі сродкамі. Яна ўваходзіць у сістэму бібліяграфічная дзейнасць, з'яўляецца яе асноўнай часткай і асновай для бібліяграфічнага пазнання. Ёй уласцівы прадметнасць, сацыяльная абумоўленасць, мэтазгоднасць, суб'ектнасць. Можна выдзеліць унутраную і знешнюю структуры бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Унутраны ўтвараюць кампаненты: суб'ект, аб'ект, працэсы, сродкі, мэты, рэзультаты. Знешні – віды, выдзеленыя па пэўнай прымеце.

## 2.3. Унутраная (кампанентная) структура бібліяграфічнай практычнай дзейнасці

Унутраная ці кампанентная структура бібліяграфічнай дзейнасці прадугледжвае тэарэтычнае вычляненне яе асобных кампанентаў ці частак, якія існуюць у рэчаіснасці і ўтвараюць непарыўнае адзінства. Гэту структуру можна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдзеліць як для бібліяграфічнай дзейнасці ў цэлым, так і для бібліяграфічнай практыкі. Прычым пералік кампанентаў будзе аднолькавым: суб'екты (асобы, установы, якія ставяць мэты, выбіраюць аб'екты, заняты ў асноўных працэсах, выкарыстоўваюць сродкі і дасягаюць вынікаў); мэты (ідэальныя вобразы дзейнасці); аб'екты (прадметы, на якія скіраваны намаганні суб'екта); працэсы (паслядоўныя змены стану дзейнасці суб'екта); сродкі (прыёмы, спосабы дасягнення, ажыццяўлення мэты); рэзультаты (вынікі дасягнення мэты). Змястоўнае напаўненне будзе адрозніваецца і залежаць ад не толькі ад галіновага кірунку дзейнасці (бібліятэчная справа, архіўная справа, кніжны гандаль і да т.п.), але і ад відавога (вучэбная, навуковая, практычная віды дзейнасці). Ніжэй будзе прапанавана кампанентная структура бібліяграфічнай практычнай дзейнасці як асноўнай складаючай бібліяграфічнай дзейнасці ў цэлым.

### *Суб'ект бібліяграфічнай дзейнасці як яе асноўны сістэмаўтваральны кампанент*

У філасофіі суб'ект – чалавек, які пазнае свет ці дзейнічае, процістаіць свету як аб'екту пазнання. Суб'ектам бібліяграфічнай дзейнасці можна назваць чалавека (сукупнасць людзей), якія пазнаюць і ствараюць бібліяграфічныя з'явы як аб'екты рэчаіснасці.

Суб'ект у сістэме бібліяграфічнай практычнай дзейнасці выконвае наступныя функцыі: кіруючую, аксіялагічную (ацэначную), камунікатыўную[62].

Кіруючая функцыя рэалізуецца на розных этапах бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. На этапе прагназавання (праектавання) дзейнасці суб'ект у думках пераўтварае аб'ект, стварае мадэль выніка, вызначае мэты, фармулюе задачы. На этапе прадметнай дзейнасці выпрацоўвае спосабы дзеяння, канкрэтныя методыкі. На этапе асэнсавання вынікаў суб'ект вывучае

---

[62] [62] *Вохрышева, М.Г.* Теория библиографии: учеб. пособие / М.Г.Вохрышева. – Самара., 2004. – С. **367 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зваротную сувязь з карыстальнікам, рэгулюе дзейнасць у адпаведнасці з зададзенымі мэтамі.

Аксіялагічная ці ацэначная функцыя рэалізуецца праз ацэнку суб'ектам дакументаў, іх якасных і колькасных, фармальных і змястоўных характарыстык, ацэнку ствараемай і распаўсюджваемай бібліяграфічнай прадукцыі; ацэнку бібліяграфічнай дзейнасці ў цэлым і асноўных складаючых, яе эфектыўнасці і якасці.

Камунікатыўная функцыя суб'екта рэалізуецца на ўзроўні суб'ектна-суб'ектных адносін: бібліёграф – карыстальнік, бібліёграф – бібліёграф, карыстальнік – карыстальнік. Адносіны *бібліёграф – бібліёграф* уплываюць на канчатковы вынік дзейнасці. Адносіны *бібліёграф – карыстальнік* рэалізуюцца патэнцыяльна пры падрыхтоўцы бібліяграфічнай прадукцыі і непасрэдна – пад час бібліяграфічнага абслугоўвання. Адносіны *карыстальнік – карыстальнік* рэалізуюцца пад час бібліяграфічных зносін як сродак узаемадзеяння людзей з мэтай абмену бібліяграфічнай інфармацыяй.

Да суб'ектаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці А.П.Коршунаў адносіць:

– бібліёграфаў-прафесіяналаў;
– бібліяграфічныя калектывы (бібліяграфічныя аддзелы, сектары, установы, сеткі бібліяграфічных службаў;
– навукоўцаў, пісьменнікаў, усіх, хто бібліяграфічнай дзейнасцю займаецца часова, спадарожна са сваёй асноўнай працай;
– карыстальнікаў БІ.

У гэтым пераліку можна выдзеліць два ўзроўні – прафесійны і непрафесійны. На прафесійным узроўні бібліяграфічнай практычнай дзейнасцю займаюцца разнастайныя бібліяграфічныя калектывы (бібліяграфічныя аддзелы, сектары, устанаўы, сеткі бібліяграфічных службаў і бібліёграфы-прафесіяналы, якія могуць працаваць у названых калектывах ці іншых, спадарожна звязаных з бібліяграфічнай практычнай дзейнасцю. На гэтым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узроўні выдзяляюцца індывідуальныя і калектыўныя суб'екты. Ім уласцівы агульныя рысы і адрозненні:

1. індывідуальныя і калектыўныя суб'екты з'яўляюцца носьбітамі свядомай, мэтанакіраванай дзейнасці;

2. бібліёграфы-прафесіяналы, як асоба заўсёды ўключаны ў пэўны калектыў і выражае яго інтарэсы;

3. кожны бібліёграф валодае сваім стылем дзейнасці, узроўнем падрыхтоўкі, аб’ёмам ведаў, здольнасцямі;

4. калектыў выступае як прадстаўнік пэўнай бібліяграфічнай сістэмы, у яго межах аб'ядноўваюцца намаганні індывідуальных суб'ектаў.

На непрафесійным узроўні бібліяграфічнай практычнай дзейнасці можа займацца любы чалавек у выпадку, калі ён:

1. з'яўляецца складальнікам бібліяграфічных дапаможнікаў;

2. актыўна ўдзельнічае ў мерапрыемствах, звязаных з рапаўсюджваннем БІ;

3. самастойна здзяйсняе бібліяграфічны пошук;

4. уступае ва ўзаемадзеянне з бібліёграфам пры бібліяграфічным пошуку і выкарыстаннем БІ.

Гэты пералік дае ўяўленне наколькі распаўсюджана бібліяграфічная практычная дзейнасць у грамадстве. Нават, калі ўзяць толькі такі сегмент бібліяграфічнай практычнай дзейнасці як стварэнне бібліяграфічнай прадукцыі. Па некаторых галіновых кірунках (напрыклад, гісторыя) удзел навукоўцаў, выкладчыкаў, аспірантаў, гісторыкаў-аматараў значна большы, чым прафесійных бібліёграфаў.

Але нават такі падыход да разгляду суб'ектаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці не поўнасцю ілюструе распаўсюджанасць гэтай дзейнасці ў грамадстве. Па сутнасці названы толькі суб’екты, занятыя ў стварэнні і давядзенні постэдзіцыйнай (адасобленай) ад першаснага дакумента інфармацыі. У межах ідэадакументаграфічнага падыходу (Н.А. Сляднева) разглядаецца

яшчэ і прагнозная, латэнтная і афінная БІ. Пры такім падыходзе ў якасці суб'екта выступае аўтар любога тэксту як творца прагнознай, латэнтнай і афіннай БІ, выдавец як стваральнік афіннай і, магчыма, латэнтнай БІ.

Не гледзячы на такую распаўсюджанасць бібліяграфічнай практычнай дзейнасці ў грамадстве, усё ж асноўным суб'ектам з'яўляецца бібліёграф-прафесіянал. Гэта спецыяліст, які валодае неабходнымі прафесійнымі ведамі, уменнямі і навыкамі; у грамадскім размеркаванні працы выконвае спецыфічна бібліяграфічныя функцыі (г.зн. пэўныя абавязкі ў бібліятэках, кнігагандлёвых установах, выдавецтвах і іншых сацыяльных інстытутах); на прафесійны узроўні ўдзельнічае ў стварэнні і распаўсюджванні БІ.

Бібліёграфу для якаснага выканання сваіх прафесіянальных абавязкаў неабходна валодаць прафесійнымі ведамі, уменнямі, навыкамі, якія набываюцца пад час вучобы ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых профільных вучэбных установах, у практычнай дзейнасці, павышэнні кваліфікацыі, самаадукацыі. Акрамя таго, бібліёграф павінен валодаць асабістымі якасцямі, якія будуць спрыяць паспяховасці дзейнасці, прафесійнай рэалізацыі на пэўных участках працы. Яму вельмі важна прытрымлівацца пэўных этычных нормаў[63].

### *Мэта як кампанент бібліяграфічнай практычнай дзейнасці*

*Мэта* – ідэальны структурны кампанент бібліяграфічнай дзейнасці, практычнай у тым ліку. Мэта з'яўляецца пабуджальным матывам дзейнасці, мадэллю пажаданага выніка. Мэты ўстанаўліваюцца суб'ектамі. Яны абумоўлены шэрагам унутраных і знешніх, суб'ектыўных і аб'ектыўных фактараў. Наскольні складаная і разнастайная сама бібліяграфічная дзейнасць і яе сувязі са знешнім асяроддзем, настолькі складаныя і разнастайныя мэты, якія ставяцца суб'ектамі. Таму аптымальнай бачыцца іерархічная структура мэтаў

[63] Прафесійныя веды, уменні і навыкі, псіхалагічныя якасці бібліёграфа – гл. па крыніцах: Коршунов, О.П. Библиографоведение: в 2 ч. – М., 2001. – Ч. 1. Разд. II–III. – С. 29–35; Коршунов, О.П. Библиографоведение. – М., 1990. – С. 76–81; Моргенштерн, И.Г. Информационный и книжный мир. Библиография: (избранное). – СПб.: Профессия, 2007. – С.234–247), Моргенштерн И.Г. Библиограф в инфармационном обществе // Библиография. – 1992. – №5–6. – С.3–10)



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, прапанаваная ў працах М.Г.Вохрышавай[64]. Выдзяляюцца наступныя групы мэтаў:

1. Агульная (асноўная) мэта і прыватныя мэты. Агульная мэта вызначае развіццё бібліяграфічнай практычнай дзейнасці ў цэлым, прыватныя – асобныя кірункі дзейнасці.

Агульнай мэтай бібліяграфічнай практычнай дзейнасці з'яўляецца задавальненне патрэбнасцей чалавека ў фіксаванай інфармацыі (неабходных яму дакументах – М.Г.Вохрышава). На думку А.П.Коршунава, агульная мэта бібліяграфічнай практычнай дзейнасці – садзейнічанне задавальненню інфармацыйных патрэбнасцей членаў грамадства. Другая трактоўка асноўнай мэты бібліяграфічнай практычнай дзейнасці не супярэчыць першай, яна мае больш абагульнены ўзровень.

Агульная мэта канкрэтызуецца на ўзроўні прыватных мэтаў. У якасці прыватных мэтаў могуць разглядацца пажаданыя мадэлі самых розных выпадкаў практычнай дзейнасці – падрыхтоўка бібліяграфічнай прадукцыі, давядзенне бібліяграфічнай інфармацыі да карыстальніка, здзяйсненне бібліяграфічнага пошука, бібліяграфічнае самаабслугоўванне. Гэтыя мэты таксама можна канкрэтызаваць і разглядаць на больш дробным узроўні.

2. Знешнія і ўнутраныя бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Знешнія мэты ставяцца ў адносінах да іншых сфер дзейнасці (напрыклад, выхаваўчай дзейнасці, самаадукацыі, папулярызацыі ведаў, гістарычнай навукі і да т. п.). Унутраныя мэты ставяцца ў адносінах да самой бібліяграфічнай дзейнасці (напрыклад, удасканаленне метадаў бібліяграфавання, бібліяграфічнага абслугоўвання, бібліяграфічнага абслугоўвання асобных груп карыстальнікаў, сфер навуковай, вучэбнай, вытворсай дзейнасці, структуры кіравання дзейнасцю і інш.).

---

[64] *Вохрышева, М.Г.* Теория библиографии: учеб. пособие / М.Г.Вохрышева. – Самара., 2004. – С. **367 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Бліжэйшыя і канчатковыя мэты бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Канчатковыя мэты прагназуюць канчатковыя вынікі дзейнасці. Бліжэйшыя ставяцца для дасягнення прамежкавых вынікаў дзейнасці.

Напрыклад, канчатковай мэтай працэса бібліяграфавання з'яўляецца стварэнне бібліяграфічных дапаможнікаў. Дасягненне гэтай мэты магчыма шляхам выканання шэрагу дзеянняў, у адпаведнасці з якімі можна ставіць і бліжэйшыя мэты: фармулёўка і абгрунтаванне тэмы дапаможніка, выяўленне літаратуры, стварэнне бібліяграфічных запісаў, групоўка матэрыялу, стварэнне навукова-метадычнага апарата і інш.

4. Нарматыўныя і варыятыўныя мэты бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Нарматыўныя мэты ставяцца ў адпаведнасці з асноўнымі нормамі, правіламі дзейнасці (напрыклад, на большасць аперацый працэса бібліяграфавання ўстаноўлены нормы часу і з улікам іх здзяйсняецца планаванне, гэта значыць ставяцца нарматыўныя мэты). Але пад уплывам канкрэтных умоў дзейнасці, з улікам асаблівасцей функцыянавання пэўнага тыпу бібліятэк, узроўню падрыхтоўкі спецыялістаў нарматыўныя мэты неабходна канкрэтызаваць, вар'іраваць і ставіць адпаведна – варыятыўныя.

***Аб'ект як адзін з кампанентаў бібліяграфічнай дзейнасці***

Пад аб'ектам разумеюць сферу аб'ектыўнай рэчаіснасці, на якую скіраваны намаганні суб'екта. Склад аб'ектаў бібліяграфічнай дзейнасці залежыць ад поглядаў на метасістэму, у межах якой гэта дзейнасць разглядаецца. Па-рознаму вызначаючы метасістэму, навукоўцы па-рознаму вызначаюць і аб'ект бібліяграфічнай дзейнасці. А.П. Коршунаў лічыць, што ў якасці аб'екта бібліяграфічнай дзейнасці выступае ў найбольш агульным сэнсе сістэма дакументальных камунікацый, прадстаўленая двума яе асноўнымі элементамі – дакументамі і спажыўцамі. Разам з тым, ён сцвярджае, што "… прынцыпіяльна няверна наогул абмяжоўваць аб'ект бібліяграфавання якой-небудзь гістарычна-пераходнай, любыя сродкі доўгатэрміновага фіксавання інфармацыі, … якія вынаходзіць ці будзе вынаходзіць чалавецтва, таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўключаюцца і будуць уключацца ў аб'ект бібліяграфіі". Іншымі словамі, чым складаней будзе рэчаіснасць, формы фіксавання інфармацыі, тым складаней будзе метасістэма існавання бібліяграфічнай дзейнасці і, адпаведна, аб'ект бібліяграфічнай дзейнасці.

Дакумент, на думку А.П.Коршунава, з'яўляецца непасрэдным аб'ектам працэса бібліяграфавання і апасрэдаваным аб'ектам пры бібліяграфічным абслугоўванні. У межах кнігазнаўчай канцэпцыі гэты аб'ект звужаецца да "твору друку", "кнігі", "літаратуры". У межах ідэадакументаграфічнай канцэпцыі бібліяграфіі як грамадскай з'явы (Н.А.Сляднева) ён значна пашыраецца да інфааб'ектаў: сэнсаў, фактаў, тэкстаў, аўтараў, дакументаў. У межах когнітаграфічнай канцэпцыі – да тэкстаў, ведаў. Такое пашырэнне аб'екта бібліяграфічнай дзейнасці магчыма, таму што пры дапамозе бібліяграфічнай інфармацыі магчыма аперыраванне любымі дакументамі (тэкстамі) на ўзроўні сэнсаў, фактаў, ідэй. Але ўпарадкаванне вызначанай такім чынам сукупнасці аб'ектаў надзвычай складана для бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Таму найбольш зручным уяўляецца разгляд у якасці аднаго з аб'ектаў бібліяграфічнай дзейнасці – дакумент (частку дакумента, сукупнасць дакументаў). Дакументы, як аб'екты бібліяграфавання, разглядаюцца з улікам трох асноўных прымет: змест, форма, мэтавае прызначэнне.

Змястоўныя характарыстыкі дакументаў кладуцца ў аснову іерархічных, фасетных класіфікацый і інфармацыйна-пошукавых моў. Іерархічныя класіфікацыі маюць структуру "дрэва ведаў": сукупнасць паслядоўна падзяляецца на часткі. Найбольш распаўсюджаны ў сусветнай практыцы УДК (універсальная дзесятковая класіфікацыя)[65], МКВ (міжнародная класіфікацыя вынаходніцтваў), на постсавецкай прасторы – ББК (бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя).

[65] Прыклады прыведзены ў Дадатку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фасетныя класіфікацыі ўяўляюць сабой сукупнасць фасетаў, размеркаваных у пэўнай паслядоўнасці. Фасет – гэта група тэрмінаў, звязаных агульнасцю якой-небудзь прыметы (падставы дзялення).

Інфармацыйна-пошукавыя мовы – упарадкаваная сукупнасць тэрмінаў, паняццяў, прадметных рубрык, якія адлюстроўваюць змест бібліяграфіруемых аб'ектаў і выкарыстоўваюцца для паглыблення тэматычнага пошуку.

У бібліяграфічнай дзейнасці ўлічваецца шэраг фармальных прымет дакументаў: знакавая прырода інфармацыі (тэкставыя, нотныя, картаграфічныя, лічбавыя дакументы, дакументы выяўленчага мастацтва); матэрыяльная канструкцыя (кніжнае, часопіснае, газетнае выданне, буклет, плакат, паштоўка, камплектнае выданне, кніжка-цацка), аб'ём (кніга, брашура, лістоўка), перыядычнасць (неперыядычныя, перыядычныя, падоўжаныя, серыйныя), структуры (серыя, аднатомнае выданне, шматтомнае выданне, збор твораў, выбраныя творы) фармат, ступень аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі, характар інфармацыі і інш.

Упарадкаванне дакументаў па мэтавым прызначэнні менш распрацавана. У СТБ 7.60-93 "Выданні. Асноўныя віды" вызначана 12 відаў дакументаў (афіцыйныя, навуковыя, навукова-папулярныя, вытворча-практычныя, нарматыўна вытворча-практычныя, вучэбныя, масава-палітычныя, даведачныя, для вольнага часу, рэкламныя, літаратурна-мастацкія, рэлігійныя). У ГОСТ 7.60-90 "Издания. Основные виды. Тэрмины и определения" – 11 відаў (няма рэлігійных).

Распрацоўка розных падыходаў да ўпарадкавання масіваў дакументаў надзвычай важна для бібліяграфічнай дзейнасці. Гэты працэс доўжыўся стагоддзі і будзе працягвацца разам з працэсам развіцця дакументных камунікацый, формаў фіксацыі інфармацыі. Шматаспектнае прадстаўленне дакументаў з пункту гледжання зместу, формы, мэтавага прызначэння дазваляе аптымізаваць інфармацыйна-пошукавыя сістэмы, на высокім узроўні ствараць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

другасную інфармацыю, спрыяць задавальненню інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў.

Карыстальнікі бібліяграфічнай інфармацыі выступаюць у якасці непасрэднага (індывідуальнага) аб’екта пры бібліяграфічным абслугоўванні і патэнцыяльнага (апасрэдаванага, тыповага) пры стварэнні бібліяграфічнай прадукцыі. У спецыяльнай літаратуры ўжываюцца тэрміны “карыстальнік”, “спажывец”, радзей “чытач”. Тэрмін “чытач” у многіх выпадках з’яўляецца дастатковым, калі мець на ўвазе, што аб’ектамі бібліяграфавання з’яўляюцца кнігі, творы друку – аб’екты чытання. Тэрміны “спажыўцы”, “карыстальнікі” запазычаны з інфарматыкі. Яны ахопліваюць спосабы ўспрыняцця інфармацыі, звязаныя не толькі з чытаннем, а і з успрыманнем гукавай, візуальнай і інш. інфармацыі. У слоўніку (*Библиотечное* дело: Терминологический словарь / Рос. гос. б-ка. – 3-е изд., перераб. и доп. – М., 1997) ужываюцца тэрміны «спажывец інфармацыі – асоба, калектыў ці арганізацыя, якія карыстаюцца рознымі крыніцамі інфармацыі ў любых мэтах (навуковых, вытворчых, творчых)» і «карыстальнік бібліятэкі – асоба ці арганізацыя, якія звяртаецца да паслуг бібліятэкі». У ГОСТ 7.0-99 тэрмін «спажывец» адсутнічае наогул, сустракаюцца тэрміны «карыстальнік інфармацыйнай сістэмы і карыстальнік інфармацыйнай установы». У моўных тлумачальных слоўніках (Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. – Мінск, 1996) тэрмін «карыстальнік» адсутнічае, а пад тэрмінам «спажывец» разумеецца «асоба ці арганізацыя, якая спажывае прадукты чыёй-небудзь вытворчасці». Калі гаварыць аб аб'екце бібліяграфічнай дзейнасці, то найбольш удалым бачыцца тэрмін карыстальнік, таму што ў ім больш выражаны элемент актыўнасці чалавека, які не проста спажывае бібліяграфічную інфармацыю як прадукт чужой працы, а ўдзельнічае ў яе пераўтварэнні, праяўляе актыўнасць пры яе карэктыроўцы, займаецца бібліяграфічным самаабслугоўваннем.

Бібліёграф як асноўны суб'ект бібліяграфічнай дзейнасці, павінен улічваць інфармацыйна-дакументальныя патрэбнасці, інтарэсы і запыты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карыстальніка як аб'екта бібліяграфічнай дзейнасці. Гэтыя патрэбнасці існуюць аб'ектыўна, незалежна ад асэнсавання іх карыстальнікамі Рэальна яны выражаюцца праз інтарэсы – актыўную фарму існавання патрэбнасцей. Інтарэсы ў сваю чаргу суб'ектыўна фармулююцца ў запытах.

Запыты, якія паступаюць да бібліёграфа ці любую бібліяграфічную пошукавую сістэму пры бібліяграфічным самаабслугоўванні не поўнасцю адпавядаюць інтарэсам і патрэбнасцям карыстальнікаў. Гэта толькі спецыфічная форма іх праяўлення, усведамлення карыстальнікам сваіх патрэбнасцей і інтарэсаў, а таксама і вынік яго ўменняў фармуляваць запыт.

Разам з тым, у бібліяграфічнай практыцы і навуцы прасцей за ўсё вывучаць запыты, таму што яны рэальна сфармуляваны. Але поўнасцю арыентавацца толькі на запыты карыстальнікаў нельга. Стварэнне бібліяграфічнай інфармацыі павінна здзяйсняцца ў апераджальным рэжыме і спрыяць не толькі задавальненню інфармацыйных запытаў карыстальнікаў, але і іх інтарэсаў і патрэбнасцей. Таму бібліёграф, як асноўны суб'ект бібліяграфічнай дзейнасці, павінен вывучаць інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў і ў адпаведнасці з імі ставіць мэты, прагназаваць сваю дзейнасць. Гэта можна зрабіць, абапіраючыся на навукова-абгрунтаваную класіфікацыю карыстальнікаў як аб’ектаў бібліяграфічнай дзейнасці. Існуюць розныя падыходы да класіфікацыі карыстальнікаў. Вядучае месца надаецца сацыяльна-эканамічным фактарам: род прафесійна-працоўнай дзейнасці, узровень адукацыі, сямейнае становішча, узрост, пол і інш.

Радзей надаецца ўвага псіхалагічным фактарам, такім як актыўнасць і пасіўнасць, матывы і намеры, асобныя рысы характару, псіхалагічная сумяшчальнасць карыстальніка і бібліёграфа і інш[66].

Такім чынам, дакументы і карыстальнікі з'яўляюцца асноўнымі аб'ектамі бібліяграфічнай дзейнасці. Гэта надзвычай складаныя сістэмы, вывучэнне якіх

---

[66] *Коршунов, О.П.* Библиографоведение. Общий курс: учеб. для вузов / О.П.Коршунов. – М., 1990. –. С. ***.

надзвычай важна для паспяховага функцыянавання як бібліяграфічнай практыкі, так і бібліяграфіі як грамадскай з'явы.

***Працэсы бібліяграфічнай дзейнасці***. Працэс – гэта ход развіцця пэўнай з’явы, паслядоўная змена стану развіцця чаго-небудзь. Найчасцей бібліяграфічную практыку разглядаюць праз характарыстыку працэсаў. У 1980-я гг. зацвердзіўся падыход, згодна якому вызначаюцца два асноўныя працэсы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці: бібліяграфаванне і бібліяграфічнае абслугоўванне. Гэты было замацавана ў тэрміналагічных стандартах (ГОСТ 7.0-84 “Библиографическая деятельность. Термины и определения”.; ГОСТ 7.0-99 Инфармационно-библиотечная деятельность, библиография: Тэрмины и определения” СТБ ГОСТ 7.0-2004 Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць. Бібліяграфія: Тэрміны і азначэнні”), у якіх даецца азначэнне тэрміна бібліяграфічнае абслугоўванне, тэрмін бібліяграфаванне адсутнічае, але рэгламентаваны яго асобныя састаўныя часткі: перапрацоўка аналітыка-сінтэтычная, бібліяграфічны пошук, ідэнтыфікацыя). Такога пункту гледжання прытрымліваецца А.П.Коршунаў. Ён лічыць, што бібліяграфічнай практыцы ўласцівы два часткова сумяшчальныя працэсы: бібліяграфаванне і бібліяграфічнае абслугоўванне.

*Бібліяграфаванне* – гэта працэс вытворчасці ці падрыхтоўкі БІ, якая дакументальна фіксуецца ў форме асобных бібліяграфічных запісаў і іх аб’яднанага мноства – бібліяграфічных дапаможнікаў. Часам у якасці сінонімаў для абазначэння гэтага працэса выкарыстоўваюцца – “бібліяграфічнае згортванне інфармацыі”, “вытворчая бібліяграфічная дзейнасць” “складанне бібліяграфічных дапаможнікаў. Але сутнасць працэса дакладней адлюстроўвае тэрмін “бібліяграфаванне”і адпаведна ён з’яўляецца найбольш удалым.

Бібліяграфанне дакументаў складаецца з двух асноўных этапаў:

1. першасная бібліяграфічная апрацоўка дакументаў, гэта значыць адлюстраванне дакументнага масіва ці патока шляхам яго першапачатковай апрацоўкі і стварэння бібліяграфічных запісаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. мэтанакіраваная перапрацоўка зыходнай БІ, яе ацэнка ў адпаведнасці з інфармацыйнымі патрэбнасцямі асобных груп карыстальнікаў і канкрэтнымі інфармацыйнымі запытамі.

Кожны з працэсаў з'яўляецца складанай бібліяграфічнай з’явай, мае сваю структуру – больш дробныя працэсы і нават аперацыі, вызначаецца якаснымі характарыстыкамі.

Першасная бібліяграфічная апрацоўка дакументаў у бібліятэках называецца каталагізацыяй і ўключае паэкзэмплярную, у асобых выпадках пакамплектную рэгістрацыю дакументаў, стварэнне бібліяграфічнага апісання, сэнсавую апрацоўку дакументаў і адпаведна прастаўленне на кожны дакумент (камплект дакументаў) класіфікацыйных індэксаў, прадметных рубрык (дэскрыптараў, ключавых слоў), стварэнне аўтарытэтных/нарматыўных запісаў. Яе вынікам з’яўляецца бібліяграфічны запіс, які можа папаўняць электронны каталог, базы даных, зводны электронны каталог, пасля раздрукоўкі – картачныя каталогі. Ён павінен выкарыстоўвацца і пры падрыхтоўцы бібліяграфічных дапаможнікаў адпаведна інфармацыйных патрэбнасцей асобных груп карыстальнікаў, канкрэтных інфармацыйных запытаў карыстальнікаў. Пры гэтым неабходны мэтанакіраваны адбор і перапрацоўка зыходнай БІ, яе ацэнка. У падрыхтоўцы такіх бібліяграфічных дапаможнікаў можна вылучыць асноўныя этапы:

– выбар і вывучэнне тэмы;

– складанне плана (магчыма праспекта, заяўкі, праграмы, тэхнічнага задання і інш.);

– выбар крыніц для прагляду і вызначэння паслядоўнасці звяртання да іх;

– выяўленне і адбор дакументаў;

– падрыхтоўка (стварэнне і/ці падбор і дапрацоўка) бібліяграфічных запісаў і стварэнне рабочай картатэкі дакументаў (рабочага першапачатковага масіву);

– канчатковы адбор бібліяграфічных запісаў, іх групоўка;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– складанне дапаможных паказальнікаў, дадаткаў, уступнага артыкула (артыкулаў);
– рэдагаванне бібліяграфічных дапаможнікаў, іх афармленне.

Вышэй названыя этапы характэрны для стварэнння любой бібліяграфічнай прадукцыі. Але яны выдзелены вельмі абагульнена. Бібліяграфічная прадукцыя надзвычай разнастайная па формах, жанрах і відах і, зразумела, яе спецыфіка адбіваецца на асаблівасцях рэалізацыі таго ці іншага этапа. Напрыклад, стварэнне бібліяграфічных паказальнікаў і бібліяграфічных спісаў у межах аднаго галіновага кірунку адрозніваецца па тэрміне працы над імі, па выразнасці і працазатратах на кожны этап, па глыбіні адлюстравання дакументнага патоку, структуры, наяўнасці дапаможных паказальнікаў і інш. На падрыхтоўку бібліяграфічнай прадукцыі ўплываюць зместавыя характарыстыкі дакументнага патоку, які ў ёй адлюстраваны, мэтавае і чытацкае прызначэнне дакументаў. Ад гэтага залежаць выбар крыніц для прагляду, вызначэнне паслядоўнасці звяртання да іх, асаблівасці адбору дакументаў, структура бібліяграфічных запісаў, іх упарадкаванне, склад дапаможных паказальнікаў.

*Бібліяграфічнае абслугоўванне* – гэта працэс давядзення БІ да карыстальнікаў. У межах яго можна таксама выдзеліць два асноўныя этапы:

1. ацэнка зыходнай (любой, створанай раней) БІ і мэтанакіраваная яе перапрацоўка ў адпаведнасці з інфармацыйнымі патрэбнасцямі асобных груп карыстальнікаў ці асобных карыстальнікаў, якія звяртаюцца ў бібліяграфічную службу з канкрэтнымі разавымі ці доўгатэрміновымі інфармацыйнымі запытамі.

2. прадастаўленне БІ карыстальнікам – перадача атрыманай пасля перапрацоўкі БІ асобе (асобам), якім яна неабходна.

Як бачна, працэсы бібліяграфаванне і бібліяграфічнае абслугоўванне маюць адну агульную частку – мэтанакіраваная перапрацоўка зыходнай БІ, яе ацэнка ў адпаведнасці з інфармацыйнымі патрэбнасцямі асобных груп

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карыстальнікаў, канкрэтных інфармацыйных запытаў карыстальнікаў. Гэта частка працэсаў бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання і робіць іх часткова сумяшчальнымі, а на практыцы, асабліва, калі перадаюцца невялікія аб'ёмы БІ, іх цяжка размежаваць.

Бібліяграфічнае абслугоўванне залежыць ад спецыфікі грамадскага інстытута сістэмы дакументных камунікацый, у межах якога яно рэалізуецца, ад асаблівасцей дакументнага патоку, складу карыстальнікаў, мэтаў, з якімі яны звяртаюцца ў бібліяграфічныя службы, формаў, метадаў работы, традыцый і да т.п. Яго паспяховасць (задаволенасць з боку карыстальнікаў) залежыць ад варыятыўнасці прымянення формаў і метадаў, інтэграванасці з іншымі сферамі дзейнасці, карпаратыўнасці і галаграфічнасці.

Трэба адзначыць, што на практыцы бібліяграфічнае абслугоўванне непарыўна звязана з давядзеннем да карыстальнікаў фактаграфічнай і поўна тэкставай інфармацыі. Таму асноўнымі рэжымамі бібліяграфічнага абслугоўвання з'яўляюцца даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне і бібліяграфічнае інфармаванне. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне гэта абслугоўванне бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыяй карыстальнікаў па іх разавых запытах, з якімі яны звяртаюцца ў бібліяграфічныя службы ці да вынікаў бібліяграфічнай дзейнасці гэтых служб (бібліяграфічных дапаможнікаў як вынікаў бібліяграфавання), аналітыка-інфармацыйнай дзейнасці іншых грамадскіх інстытутаў.

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне можа здзяйсняецца на базе любога грамадскага інстытута сістэмы дакументных камунікацый з выкарыстаннем як крыніц другаснай (бібліяграфічнай, фактаграфічнай) інфармацыі, так і крыніц першаснай інфармацыі. Вынікамі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання з'яўляюцца станоўчыя і адмоўныя адказы на разавыя запыты. Гэта могуць быць бібліяграфічныя і фактаграфічныя даведкі, метадычныя кансультацыі і адмовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фактаграфічная даведка – гэта адказ на запыт, які змяшчае фактычныя звесткі: лічбы, даты, тэрміны, тлумачэнні тэрмінаў, геаграфічныя аб'екты, колькасныя і якасныя характарыстыкі аб'ектаў і інш. Яна ўтрымлівае, як правіла, вельмі лаканічную і структураваную інфармацыю. Крыніцамі яе пошуку найчасцей выступаюць слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі, хронікі падзей, а таксама фактаграфічныя (аб'ектаграфічныя ў тым ліку) базы даных (напрыклад, базы даных аўтарытэтных запісаў).

Бібліяграфічныя даведкі ўтрымліваюць інфармацыю аб дакументах (тэкстах) ці любых іх лагічна выдзеленых адзінках. У залежнасці ад іх характару яны падзяляюцца на 3 віды: тэматычныя, адрасныя і даведкі, якія ўдакладняюць бібліяграфічныя даныя (удакладняльныя).

Тэматычная бібліяграфічная даведка змяшчае БІ па пэўнай тэме (змястоўна рэлевантную тэматычнаму запыту). Адрасная бібліяграфічная даведка ўдакладняе наяўнасць і месцазнаходжанне дакумента ў канкрэтным дакументным фондзе. Даведка, якая ўдакладняе бібліяграфічныя даныя, звязана з выяўленнем асобных асобных элементаў бібліяграфічнага апісання дакументаў (дакладнай назвы, псеўданіма аўтараў, аўтараў, складальнікаў, рэдактараў, месца выдання і даты і інш.), якія невядомы карыстальніку, якіх не дастае для заказу дакумента, для прадстаўлення ў спісе літаратуры, у падрадковых заўвагах і інш. Метадычная кансультацыя – адказ на разавы запыт, які змяшчае парады па выкарыстанні інфармацыі, паказвае шляхі яе атрымання з розных дакументаў, пошукавых сістэм (адсылка да крыніц інфармацыі, рэкамендацыя звярнуцца ў іншую бібліятэку, архіў, кнігагандлёвую ўстанову і інш.).

Бібліяграфічнае інфармаванне – сістэматычнае забеспячэнне БІ абанентаў ў адпаведнасці з іх доўгатэрміновымі запытамі ці па ініцытыве бібліяграфічных служб у адпаведнасці з профілем пэўнай установы, арганізацыі. У ГОСТ 7.0-99 азначэнне гэтага тэрміну даецца абмежавана, з улікам толькі доўгатэрміновых запытаў. Такое азначэнне не поўнасцю адлюстроўвае рэчаіснасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найчасцей бібліяграфічнае інфармаванне здзяйсняецца па ініцыятыве бібліяграфічнай службы, у апошнія часы з шырокім выкарыстаннем электронных сродкаў, якія дазваляюць аўтаматычна здзяйсняць адбор і адпраўку на адрас карыстальніка інфармацыі, атрымліваць хутка зваротную інфармацыю, аператыўна дасылаць поўныя тэксты (неабходныя фрагменты тэкстаў). На падставе крытэрыя ахопа карыстальнікаў выдзяляюць два асноўныя рэжымы бібліяграфічнага інфармавання: недыферэнцыраванае (часам яго называюць масавым) і дыферэнцыраванае. Абодва рэжымы ажыццяўляюцца ў разнастайных формах.

Недыферэнцыраванае (масавае) бібліяграфічнае інфармаванне – інфармаванне шырокага кола асоб і калектываў, зацікаўленых у сістэматычным атрыманні звестак аб новых дакументах. Ажыццяўляецца ў формах інфармацыйных бюлетэняў, бібліяграфічных аглядаў і інш.

Дыферэнцыраванае бібліяграфічнае інфармаванне – гэта сістэматычнае забеспячэнне БІ абанентаў ў адпаведнасці з іх доўгатэрміновымі індывідуальнымі і групавымі інфармацыйнымі запытамі. Ажыццяўляецца ў формах індывідуальнага інфармавання, выбіральнага распаўсюджання інфармацыі (ВРІ), дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўніцтва, тэматычнае абслугоўванне кіраўніцтва.

Бібліяграфічнае абслугоўванне надзвычай складаны працэс. Для яго развіцця на сучасным этапе характэрна:

– аптымальнае спалучэнне і выкарыстанне электронных і картачных пошукавых сістэм;

– развіццё віртуальных сэрвісаў (тыпу «Адкрытая інфармацыя», віртуальная даведачная служба «Спытай бібліятэкара», Віртуальны цэнтр прававой інфармацыі, Віртуальная чытальная зала);

– арыентаванасць пошукавых сістэм, якія ствараюцца, на высокі ўзровень бібліяграфічнага самаабслугоўвання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выкарыстанне бібліятэкай, якая яго здзяйсняе не толькі бібліяграфічных рэсурсаў уласнай генерыцыі, а і пошукавых сістэм іншых бібліятэк, інфармацыйных цэнтраў (напрыклад, у бібліятэках Беларусі Зводнага каталога бібліятэк Расіі, Сусветнага каталога OCLC і інш.);

– выкарыстанне лакальных і інтэграваных пошукавых механізмаў і сэрвісаў, якія прапаноўваюцца ў розных базах даных, імкненне прадставіць у іх інфармацыйныя рэсурсы ўласнай генерацыі.

Асновай працэсаў бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання (бібліяграфічнага самаабслугоўвання ў тым ліку) з’яўляецца бібліяграфічны пошук. Некаторыя даследчыкі разглядаюць гэты працэс асобна, побач з бібліяграфаваннем і бібліяграфічным абслугоўваннем. Аднак, гэтыя працэсы нельга паставіць у адзін лагічны рад. Бібліяграфічны пошук з’яўляецца неад’емнай часткай і бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання, ён скразны і таму разглядаць яго трэба асобна.

*Бібліяграфічны пошук* - гэта разнавіднасць інфармацыйнага пошуку, які вядзецца на аснове бібліяграфічных звестак (даных). Гэта працэс знаходжання неабходнай БІ па фармальных і /ці змястоўных прыметах дакументаў. Асаблівасць бібліяграфічнага пошуку ў тым, што да карыстальніка даводзяцца не самі дакументы, а толькі бібліяграфічная інфармацыя – звесткі аб дакументах (тэкстах), іх лагічна выдзеленых частках ці сукупнасцях.

Прыватным паняццем бібліяграфічнага пошука з'яўляецца “бібліяграфічнае выяўленне” – знаходжанне дакументаў як аб’ектаў бібліяграфавання ў мэтах іх наступнай бібліяграфічнай апрацоўкі.

Тэхналагічныя асаблівасці і якасны ўзровень бібліяграфічнага пошуку характарызуюцца праз наступныя паняцці: перцінентнасць бібліяграфічнага пошуку, рэлевантнасць бібліяграфічнага пошуку, пошукавая прымета, пошукавы вобраз дакумента, пошукавае прадпісанне, паўната і дакладнасць бібліяграфічнага пошуку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перцінентнасць бібліяграфічнага пошуку – адпаведнасць атрыманай у працэсе бібліяграфічнага пошуку БІ сапраўднай патрэбнасці карыстальніка.

Рэлевантнасць бібліяграфічнага пошуку – гэта адпаведнасць знойдзеных запісаў на дакументы патрабаванню, якое выражана ў запыце карыстальніка. Можа быць зместавай (знойдзеная БІ адпавядае запыту) і фармальнай (зафіксаваны ў крыніцы БІ пошукавы вобраз дакумента адпавядае пошукаваму прадпісанню).

Схематычна можна суадносіны паняццяў перцінентнасць бібліяграфічнага пошуку, рэлевантнасць бібліяграфічнага пошуку можна паказаць наступным чынам:




Пошукавая прымета – гэта змястоўныя ці фармальныя крытэрыі дакумента, па якіх магчыма здзейсніць пошук і якому павінна адпавядаць знойдзеная БІ.

Пошукавае прадпісанне – змест запыта, выражаны на інфармацыйна-пошукавай мове (індэксамі УДК) ці наборам фармальных прымет дакумента (аўтар, назва і інш.), шыфрамі захавання дакумента ў фондзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пошукавы вобраз уяўляе сабой сукупнасць пошукавых прымет, неабходных для бібліяграфічнага пошуку і ідэнтыфікацыі дакумента ў адпаведнасці з запытам карыстальніка.

Паўната бібліяграфічнага пошуку – гэта колькасныя адносіны знойдзеных рэлевантных бібліяграфічных запісаў да агульнай колькасці адпаведных запісаў у масіве бібліяграфічных запісаў, па якому вядзецца пошук.

Дакладнасць бібліяграфічнага пошуку – паказчык, які выражае адносіны колькасці рэлевантных бібліяграфічных запісаў да агульнай колькасці запісаў, знойдзеных у адказ на запыт карыстальніка.

Пры здзяйсненні бібліяграфічнага пошуку можна выдзеліць некалькі этапаў:

– фармулёўка запыта;

– удакладненне запыта (канкрэтызацыя агульнай мэты пошуку, магчымых тэматычных, храналагічных, моўных, відавых (жанравых), якасных абмежаванняў, вызначэнне ступені паўнаты і формы прадстаўлення інфармацыі);

– вызначэнне шляхоў здзяйснення пошуку, выбар метадаў, крыніц інфармацыі;

– стварэнне алгарытму пошуку (рабочай праграмы пошуку);

– рэалізацыя пошуку;

– афармленне вынікаў пошуку.

Асноўныя бібліяграфічныя працэсы, у сваю чаргу, ахопліваюць мноства прыватных бібліяграфічных працэсаў, якія вывучаюцца ў галіновых і тэхналагічных бібліяграфічных дысцыплінах. Адначасова ў прафесійны ўжытак увайшлі паняцці, якія адлюстроўваюць інтэгратыўнасць бібліяграфічных працэсаў у складаных інфармацыйна-бібліяграфічных сітуацыях, калі патрабуецца інтэнсіўнае стварэнне і давядзенне БІ. Так, паняцце “бібліяграфічнае забеспячэнне” можа ахопліваць як падрыхтоўку бібліяграфічных дапаможнікаў для задавальнення патрэбнасцей розных сфер

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадскай практыкі, так і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне, бібліяграфічнае інфармаванне.

Тэрмін “бібліяграфічнае забеспячэнне” можа выкарыстоўвацца ў вузкім сэнсе як бібліяграфічнае інфармаванне асобных груп карыстальнікаў, занятых вырашэннем канкрэтных навукова-вытворчых задач. Ён можа ў пэўным сэнсе замяняцца тэрмінам “бібліяграфічнае суправаджэнне”.

Бібліяграфічныя зносіны – гэты тэрмін азначае працэс ўзаемадзеяння людзей з мэтай абмену БІ. Гэта дапаможны бібліяграфічны працэс, без якога не ажыццяўляюцца асноўныя бібліяграфічныя працэсы.

У сучаснай бібліяграфічнай практыцы адбываецца актывізацыя бібліяграфічнага самаабслугоўвання. Гэта самастойная падрыхтоўка і выкарыстанне БІ без звяртання да прафесіянальных бібліяграфічных структур. Высокая ступень задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў праз бібліяграфічнае самаабслугоўванне магчыма пры ўмове існавання якасных інфармацыйна-пошукавых сістэм, актыўнасці карыстальнікаў і высокага ўзроўню іх інфармацыйнай культуры.

М.Г.Вохрышава ў адпаведнасці з іерархіяй мэтаў выдзяляе іерархію працэсаў. Яна лічыць, што агульнай мэце (задавальненне патрэбнасцей у дакументах) адпавядае дзейнасць у цэлым, якая можа разглядацца як цэласны працэс. Прыватным мэтам адпавядаюць парацэсы вытворчасці БІ і спажывання.

Вытворчасці ці бібліяграфаванне разумеецца як працэс стварэння і пераўтварэння бібліяграфічнай інфармацыі. Бібліяграфаванне можа разглядацца на розных узроўнях:

1. на ўзроўні падрыхтоўкі аднаго паведамлення аб дакументах;
2. на ўзроўні стварэння адной інфармацыйна-пошукавай сістэмы;
3. на ўзроўні стварэння комплекса бібліяграфічных крыніц.

Сутнасцю працэса спажывання БІ з’яўляецца давядзенне яе да карыстальніка і яе выкарыстанне. Давядзенне БІ ці бібліяграфічнае абслугоўванне – працэс, здзяйсняемы бібліёграфам. Выкарыстанне – гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасць карыстальніка па азнаямленню з БІ і прымяненню ў сваёй практыцы. Выкарыстанне БІ многія навукоўцы выводзяць за межы бібліяграфічнай практыкі. М.Г. Вохрышава лічыць, што на ўзроўні гэтага працэса выяўляецца эфектыўнасць функцыянавання сістэмы.

А.П. Коршунаў выдзяляе 3 этапы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці: вытворчасць, давядзенне і выкарыстанне БІ. Пры гэтым адзначае, што выкарыстанне БІ уласціва на ўсіх трох этапах і ўяўляе сабой катэгорыю, якую ў абстракцыі можна выдзеліць і разглядаць асобна, але яе нельга паставіць у адзін рад з бібліяграфаваннем і бібліяграфічным абслугоўваннем.

Ёсць і іншыя падыходы да разгляду бібліяграфічных працэсаў. Напрыклад, Сямёнава Г.Р. выдзяляе тры асноўныя працэсы бібліяграфічнай дзейнасці:

– улікова-рэгістрацыйны (працэс стварэння крыніц агульнай бібліяграфіі),

– бібліяграфічнае забеспячэнне (працэс стварэння сродкаў бібліяграфічнага абслугоўвання пэўнага мэтавага і чытацкага прызначэння,

– бібліяграфічнае абслугоўванне (працэс задавальнення патрэбнасцей у звестках аб дакументах з дапамогай сродкаў бібліяграфічнай дзейнасці).

Такі падыход не мае прынцыповага адрознення ад вышэй разгледжанага, таму што першыя два працэсы, вызначаемыя Г.Г.Сямёнавай, з'яўляюцца састаўнымі часткамі працэса бібліяграфавання.

Такім чынам, аналіз публікацый паказвае:

– тэорыя бібліяграфічных працэсаў недастаткова распрацавана,

– у бібліяграфазнаўстве называюць наступныя працэсы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці: бібліяграфаванне, бібліяграфічнае абслугоўванне, бібліяграфічны пошук, бібліяграфічныя зносіны і бібліяграфічнае выкарыстанне, але найчасцей выдзяляюць два асноўныя працэсы – бібліяграфаванне і бібліяграфічнае абслугоўванне, бібліяграфічны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пошук разглядаюць як скразны бібліяграфічны працэс, а бібліяграфічныя зносіны як дадатковы;

– адсутнічае тэрміналагічнае адзінства ў назвах, якія адносяцца да працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці (бібліяграфічнае забеспячэнне, бібліяграфічнае абслугоўванне, інфармацыйнае забеспячэнне, інфармацыйна-бібліяграфічнае забеспячэнне, інфармацыйнае абслугоўванне, інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне).

### *Сродкі бібліяграфічнай дзейнасці*

Для дасягнення пастаўленых мэтаў суб'ект бібліяграфічнай дзейнасці выкарыстоўвае (выпрацоўвае) пэўныя сродкі. Можна пагадзіцца з пазіцыяй А.П.Коршунава, які да сродкаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці адносіць:

– метады практычнай дзейнасці,

– каналы вытворчасці і давядзення бібліяграфічнай інфармацыі да карыстальнікаў,

– тэхнічныя і праграмныя сродкі.

Метады бібліяграфічнай практычнай дзейнасці ў адпаведнасці з асноўнымі бібліяграфічнымі працэсамі падзяляюцца на метады бібліяграфавання і метады бібліяграфічнага абслугоўвання.

Метады бібліяграфавання прадстаўлены дзвумя групамі: аналітычныя (аналізуючыя) і сінтэтычныя (сінтэзуючыя).

Да аналітычных метадаў адносяцца:

– агульны бібліяграфічны аналіз дакументаў (для высвятлення тэматыкі, фармальных і змястоўных асаблівасцей, мэтавага і чытацкага прызначэння і др.),

– бібліяграфічнае апісанне дакументаў,

– анатаванне ці рэферыраванне,

– індэксаванне ці прадметызацыя.

Да сінтэтычных метадаў адносяцца:

– выяўленне дакументаў як аб'ектаў бібліяграфавання,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– адбор дакументаў па зададзеных крытэрыях,

– групоўка бібліяграфічных запісаў ў бібліяграфічных дапаможніках.

Такое дзяленне з'яўляецца ўмоўным, таму што бібліяграфічны аналіз і сінтэз узаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены.

Метады бібліяграфічнага абслугоўвання А.П.Коршунаў падзяляе на агульныя і прыватныя. Агульныя суадносіць з асноўнымі грамадскімі функцыямі бібліяграфіі і лічыць, што спосабам рэалізацыі пошукавай функцыі з'яўляецца метад ідэнтыфікацыі дакументаў, камунікатыўнай – метад апавяшчэння аб дакументах, ацэначнай – метад рэкамендацыі дакументаў.

Прыватныя метады бібліяграфічнага абслугоўвання выкарыстоўваюцца на асобных канкрэтных участках дзейнасці па абслугоўванню карыстальнікаў бібліяграфічнай інфармацыяй (напрыклад, метады аператыўнага пошуку інфармацыі на запыты карыстальнікаў, метады правядзення бібліяграфічных аглядаў, гутарак і інш.). Як было сказана вышэй, бібліяграфічны пошук з'яўляецца скразным працэсам. Ён здзяйсняецца як пры бібліяграфаванні дакументаў, так і пры давядзенні БІ да карыстальнікаў. Таму метады, якія выкарыстоўваюцца ў гэтых працэсах, характэрны і пры здзяйсненні бібліяграфічнага пошуку, некаторыя з іх на асобных этапах пошуку (напрыклад, ідэнтыфікацыі дакументаў), некаторыя пры афармленні яго вынікаў (агульны бібліяграфічны аналіз дакументаў, метад бібліяграфічнага апісання). Разам з тым, можна выдзеліць метады, якія абумоўлены назапашаным значным гістарычным вопытам рэалізацыі. У бібліяграфазнаўстве адасобілася і актыўна развіваецца спецыяльная навуковая дысцыпліна – бібліяграфічная эўрыстыка, у межах якой распрацоўваецца гісторыя, тэорыя і методыка інфармацыйнага пошуку. У межах бібліяграфічнай эўрыстыкі абгрунтавана шэраг метадаў пошуку інфармацыі, якія выкарыстоўваюцца ў межах традыцыйных (картачных, друкаваных) тэхналогій і кампютэрных: суцэльны, выбарачны, інтуітыўны, рэцэптурны, індуктыўны, дэдуктыўны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метад бібліяграфічных спасылак, метад выкарыстання гіпертэкставых спасылак, метад прымянення спецыялізаваных праграм (спайдэраў) і інш.

Суцэльны метад пошуку БІ прадугледжвае прагляд (выкарыстанне як крыніцы інфармацыі) ўсіх бібліяграфічных дапаможнікаў і іншых крыніц першаснай і другаснай інфармацыі для выяўлення неабходнага матэрыялу, напрыклад, па пэўнай тэме. Такі метад магчыма прымяняць толькі на аснове невялікіх асобна ўзятых дакументных фондах. Ён даволі цяжкі для рэалізацыі і працазатратны.

Выбарачны метад прадугледжвае працу толькі з часткай крыніц, у межах якіх утрымліваецца найбольш рэлевантная інфармацыя. Прыватным выпадкам выбарачнага метаду можна лічыць інтуітыўны метад, прымяненне якога прадугледжвае таксама выбарачнае звяртанне да крыніц інфармацыі, але выбар іх заснаваны на практычным вопыце суб’екта бібліяграфічнай дзейнасці па выкарыстанні пушукавых сістэм, “бібліяграфічным адчуванні” пошукавага вобразу запыта, пошукавага вобразу дакумента і крыніц інфармацыі ў цэлым.

Прымяненне рэцэптурнага метода (часам яго называюць тыпалагічным, магчыма назваць таксама алгарытмічным) дазваляе для аптымізацыі бібліяграфічнага пошуку выпрацоўваць алгарытмы дзеянняў (“рэцэпты”), вызначаць паслядоўнасць звяртання да крыніц інфармацыі.

Індуктыўны і дэдуктыўны метады выкарыстоўваюцца ў выпадках калі пад час пошуку неабходна зыходзіць ад адзінкавых меркаванняў да агульных заканамернасцей, правілаў, абагульненняў ці наадварот агульныя падыходы распаўсюджваюцца на асобныя з’явы, прыватныя выпадкі.

Метад пошуку па бібліяграфічных спасылках заснаваны на выкарыстанні латэнтнай БІ, якая прадстаўлена ўнутры самаго першаснага тэксту, у падрадковых заўвагах і каментарыях, па-за тэкстам. Важнасць прымянення гэтага метада і самой латэнтнай БІ нельга недаацэньваць. Яна мадэліруе веды аўтара аб дакументах, сугучных па праблематыцы яго твору. Гэта мадэль запатрабаванага аўтарам фрагмента ДМ. Яна існуе ў непарыўнай сувязі з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэкстам, і, адпаведна, асаблівасці мадэліравання ведаў у тэксце абумоўліваюць яе структуру. Аўтар карыстаецца шэрагам крыніц, спасылаецца на іх, дае крытычны аналіз і праз бібліяграфічныя спасылкі вызначае месца свайго твора ў сістэме навуковых сацыяльных ведаў. Фармальны аналіз сукупнасці такіх бібліяграфічных запісаў (паток цытуемых дакументаў) дазваляе ствараць “карты навукі” і праслежваць яе развіццё за вялікі адрэзак часу.

У лічбавым асяроддзі шырока выкарыстоўваюцца метады выкарыстання пошукавых машын і гіпертэкставых спасылак. Першы заснаваны на ўжыванні ключавых слоў, якія перадаюцца пошукавым серверам у якасці арыенціраў пошуку. Гіпертэкставыя спасылкі дазваляюць звязаць паміж сабой самыя розныя інфармацыйныя рэсурсы і адпаведна пошук інфармацыі здзяйсняецца праз паслядоўны (магчыма выбарачны) прагляд асобных старонак пры дапамозе браўзера. Пошук з выкарыстаннем спецыяльных сродкаў прадугледжвае прымяненне спецыялізаваных праграмм – спайдэраў, якія шукаюць адпаведную запыту інфармацыя, праглядаючы ў аўтаматычным рэжыме Web-старонкі.

*Каналамі вытворчасці і давядзення БІ* да карыстальнікаў з’яўляюцца:

– бібліяграфічная прадукцыя,

– сродкі масавай інфармацыі (друк, радыё, тэлебачанне, Інтэрнэт).

Бібліяграфічная прадукцыя – гэта канчатковы вынік працэса першаснай апрацоўкі дакументнага патока, вынік і сродак працэса перапрацоўкі зыходнай БІ і асноўны сродак давядзення БІ да карыстальніка. Яе складаюць розныя бібліяграфічныя дапаможнікі: асобна створаныя, унутрыкніжныя, унутрычасопісныя, унутрыгазетныя, прытэкставыя (прыкніжныя, прыартыкульныя), розныя па матэрыяльнай канструкцыі, матэрыяльнаму носьбіту, форме, мэтавым прызначэнні (папярэднія тэмы).

Да сродкаў бібліяграфічнай дзейнасці адносяцца таксама разнастайныя тэхнічныя прыстасаванні, якія выкарыстоўваюцца ў бібліяграфічнай практыцы пры бібліяграфаванні дакументаў, бібліяграфічным абслугоўванні, правядзенні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічнага пошуку. Для бібліяграфічнай дзейнасці характэрна такая заканамернасць развіцця як адпаведнасць тэхнічнаму і тэхналагічнаму узроўню умовам грамадства і асаблівасцям яго развіцця. Гэта праяўляецца праз выбар прыярытэтных кірункаў развіцця, якія не бываюць выпадковымі. Бібліяграфія выконвае задачы, якія ставяцца грамадствам на пэўным этапе яго развіцця (папулярызацыя ведаў, дапамога навукава-тэхнічнаму прагрэсу і інш.) і ўключаецца ў сістэму іншых відаў дзейнасці. Яна пачынала развівацца са з'яўленнем дакумента як крыніцы фіксаванай інфармацыі з выкарыстаннем самых простых тэхнічных сродкаў. Ускладненне яе адбывалася ў залежнасці ад узроўню тэхналагічнага развіцця краін (з развіццём кнігадрукавання сталі ствараццa друкаваныя формы бібліяграфічных рэсурсаў, са з'яўленнем аўдыё-, відэадакументаў, кампакт-дыскаў, CD-ROM і т.д. – адпаведныя бібліяграфічныя крыніцы і інш.).

Сучасны этап развіцця бібліяграфічнай дзейнасці характарызуецца актыўным укараненнем тэхнічных сродкаў. Асноўныя працэсы бібліяграфічнай дзейнасці звязаны са зборам, абменам, назапашваннем, перадачай, накапленнем, захаваннем, выкарыстаннем інфармацыі, а гэта здзяйсняецца на базе тэхнічных сродкаў інфарматызацыі. Камп’ютары, сканеры, відэапраектары, мульцімедыяпраектары, лічбавыя відэакамеры і фотаапараты, насценныя дысплеі, электронныя дошкі, планшэты, праекцыйныя экраны дазваляюць не толькі шырока папулярызаваць вынікі бібліяграфічнай дзейнасці і даводзіць БІ да карыстальніка, але і аптымізаваць працэсы бібліяграфавання, рэалізоўваць розныя карпаратыўныя праекты. Акрамя того, выкарыстоўваюцца разнастайныя дадатковыя механізмы, без якіх цяжка стварыць камфортныя ўмовы працы бібліёграфаў пры стварэнні ці перадачы адпаведнай інфармацыі. Напрыклад, для мацавання разнастайных праектараў выкарыстоўваюцца стацыянарныя, перанасныя, перасоўныя падстаўкі, штангі, падвескі, пад’ёмнікі і інш. Для ўзнаўлення і тыражыравання бібліяграфічнай прадукцыі выкарыстоўваецца паліграфічная тэхніка і тэхналогіі, для апрацоўкі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захоўвання – сцелажы і шафы для картак, для яе перамяшчэння і захоўвання – сродкі транспарціроўкі (цялежкі), сігналізацыя і да т. п.

З пачатку 1990-х гадоў у айчыннай бібліяграфічнай практыцы пачалі выкарыстоўвацца разнастайныя камп'ютарныя праграмныя сродкі. У першую чаргу іх пачалі ўкараняць у працэсы каталагізацыі, з іх дапамогай здзяйснялася вядзенне электронных каталогаў і баз даных. На сучасным этапе практычна ўсе бібліяграфічныя працэсы дзяйсняюцца пры дапамозе праграмны сродкаў. Праграмныя сродкі падзяляюцца на сістэмныя (аперацыйныя сістэмы, праграмы-“абалонкі”, мовы праграміравання), інструментальныя (праграмы для распрацоўкі канкрэтных карыстальніцкіх праграм (напрыклад сістэм упраўлення базамі даных), праграм для навучання і інш.) і прыкладныя (тэкставыя, таблічныя, графічныя рэдактары і інш.). Для сучаснага этапа ўласціва тэндэнцыі выкарыстання сумяшчальных праграмных сродкаў і існавання праграм-канвертараў, якія дазваляюць аднакратна апрацоўваць дакументны паток, рабіць інтэграваны пошук і інш.

### *Рэзультаты (вынікі) бібліяграфічнай дзейнасці*

*Рэзультат* – заключны кампанент унутранай структуры бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Гэта рэалізаваная мэта дзейнасці. На працягу значнага перыяду асэнсавання бібліяграфіі як грамадскай з'явы асноўным вынікам бібліяграфічнай практыкі лічыліся бібліяграфічныя дапаможнікі (іх сукупнасць ураўноўвалі і з самой бібліяграфіяй). З другой паловы XX ст. бібліяграфію сталі разглядаць як від дзейнасці, пазней сукупнасць відаў дзейнасці (сістэму) і адпаведна рэзультаты, якіх можна дасягнуць у выніку іх рэалізацыі, суадносіць ці з асобнымі працэсамі ці з дзейнасцю ў цэлым. Апошні падыход найбольш пашыраны ў сучасным бібліяграфазнаўстве. Напрыклад, А.П.Коршунаў канчатковым рэзультатам бібліяграфічнай дзейнасці лічыць рэальнае задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей чалавека. Найбольш агульным вынікам працэса бібліяграфавання – сістэму бібліяграфічных дапаможнікаў, працэса бібліяграфічнага абслугоўвання – давядзенне да карыстальнікаў станоўчых ці адмоўных адказаў на іх разавыя запыты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сукупнасць бібліяграфічных дапаможнікаў надзвычай разнастайная па сваім складзе. А.П.Коршунаў прапанаваў блочна-фасетную схему іх класіфікацыі і падзяліў гэтыю сукупнасць на чатыры асноўныя блокі: па грамадскім прызначэнні, па асаблівасцях зместу, формы і мэтавага прызначэння дакументаў як аб’ектаў бібліяграфавання, па спецыфічных аспектах метадаў бібліяграфавання, уласнай фарме дапаможнікаў. У межах кожнага з блокаў выдзелены асобныя віды дапаможнікаў. Такім чынам, упарадкавана каля 140 разнавіднасцей бібліяграфічных дапаможнікаў, прычым практычна ўсе класіфікацыйныя рады адкрыты.

М.Г.Вохрышава таксама суадносіць рэзультаты бібліяграфічнай дзейнасці з асноўнымі бібліяграфічнымі працэсамі. Яна вызначае 3 асноўныя працэсы – бібліяграфаванне, бібліяграфічнае абслугоўванне і бібліяграфічнае выкарыстанне і адпаведна і мадэль вынікаў, прычым не толькі асноўных, а і дадатковых. У якасці асноўнага выніка першага працэса (бібліяграфаванне – рэалізацыя суадносін “дакумент– БІ”) разглядаецца бібліяграфічная інфармацыя (бібліяграфічны дапаможнік), а дадатковымі – выяўленне новых тэм; выяўленне дадатковага матэрыялу; пашырэнне кругагляда бібліёграфа. Асноўным вынікам бібліяграфічнага абслугоўвання (рэалізацыя суадносін “БІ – карыстальнік”) вызначана задавальненне патрэбнасцей у бібліяграфічнай інфармацыі, а дадатковымі – авалоданне карыстальнікам спосабамі бібліяграфічнай дзейнасці; атрыманне дадатковай інфармацыі; удасканаленне метадаў бібліяграфічнай дзейнасці; фарміраванне новых бібліяграфічных патрэбнасцей. Трэці працэс звязаны з выкарыстаннем БІ і рэалізацыяй суадносін "Д – карыстальнік”. Яго асноўным вынікам з’яўляецца задавальненне патрэбнасцей у дакументах, а дадатковымі – атрыманне праз зваротную сувязь звестак аб карыснасці БІ; адкрыццё карыстальнікам новых магчымасцей выкарыстання атрыманай інфармацыі; удасканаленне методыкі дзейнасці; фарміраванне новых бібліяграфічных патрэбнасцей. Гэта вельмі цікавыя і слушныя падыходы з пункту гледжання раскрыцця складанасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічных працэсаў і шматграннасці прагназуемых і дадатковых вынікаў. Асабліва гэта тычыцца прапаноў М.Г.Вохрышавай. Але, на наш погляд, можна некалькі ўдакладніць і асноўны рэзультат бібліяграфічнай дзейнасці і дадатковыя, акцэнтуючы ўвагу пры гэтым на цеснай узаемасувязі бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання, “пранікненні” бібліяграфічнай інфармацыі ў першасныя дакументы (тэксты) і наадварот, пашырэнне камбінаваных формаў стварэння інфармацыйных рэсурсаў і разам з тым абасабляючы (у многіх выпадках даволі ўмоўна) гэты від дзейнасці ад іншых у сферы інфармацыі. У якасці асноўнага рэзультата бібліяграфічнай дзейнасці можна вызначыць задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей карыстальніка бібліяграфічнымі сродкамі (стварэнне крыніц БІ і ўмоў для яе выкарыстання). Паказаная дэталізацыя асноўнага выніка можа працягвацца і вызначацца на ніжэйшых узроўнях (напрыклад, стварэнне асобных бібліяграфічных запісаў, стварэнне асобных бібліяграфічных дапаможнікаў, стварэнне сістэмы бібліяграфічных дапаможнікаў) і да т.п. У якасці дадатковых вынікаў можна акрэсліць пашырэнне крыніцазнаўчай базы першасных дакументаў, паскарэнне інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў у грамадстве, спрыянне захаванню сацыяльнай памяці грамадства, павышэнне інфармацыйнай культуры асобы, удасканаленне прафесійных кампетэнцый суб’екта бібліяграфічнай дзейнасці.

**Вывады.** Бібліяграфічная практычная дзейнасць мае складаную ўнутраную структуру, у якую ўключаны суб’екты і аб’екты, ставяцца ўласцівыя толькі ёй мэты, здзяйсняюцца спецыфічныя для яе працэсы, выкарыстоўваюцца і/ці ствараюцца адпаведныя сродкі, дасягаюцца вынікі, якія забяспечваюць запатрабаванасць дзейнасці грамадствам, яе актуальнасць і шматпланавасць рэалізацыі. Сацыяльная і канкрэтна-гістарычная абумоўленасць бібліяграфічнай практычнай дзейнасці ўплывае на асаблівасці праяўленняў у межах асноўных кампанентаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэарэтычныя прадстаўленні асноўных кампанентаў бібліяграфічнай дзейнасці ў цэлым і практычнай дзейнасці, як яе неад'емнай часткі, абумоўлены спецыфікай падыходаў да разгляду сутнасці бібліяграфіі як грамадскай з'явы, метасістэмы, у якую яна ўваходзіць.

## 2.4. Відавая структура (класіфікацыя) бібліяграфіі як галіны дзейнасці

### *Відавая класіфікацыя як навуковая праблема*

Відавая структура бібліяграфіі прадугледжвае выдзяленне відаў бібліяграфічнай дзейнасці адпаведна розных падстаў. У сучасным бібліяграфазнаўстве ў якасці такіх падстаў вызначаюцца грамадскае прызначэнне, арганізацыйна-вытворчая прыналежнасць, функцыянальна-мэтавае прызначэнне і інш. Прапаноўваюцца таксама падыходы, згодна якіх відавая класіфікацыя здзяйсняецца на аснове катэгорый: матэрыяльнае і ідэальнае, вытворчасць і спажыванне, знешняе і ўнутранае, цэлае і частка і некаторыя іншыя.

Трэба адзначыць, што від бібліяграфіі і відавая класіфікацыя была адной з самых палемічных праблем савецкага бібліяграфазнаўства. З канца ХХ ст. яна на падставе распрацоўкі структурна-функцыянальнага падыхода трансфарміравалася ў праблему функцыянальнага зместу (сутнасці) бібліяграфічнай дзейнасці.

Выдзяляемыя віды бібліяграфіі па назве вельмі падобны на віды бібліяграфічнай прадукцыі (напрыклад, навукова-дапаможная бібліяграфія і навукова-дапаможныя бібліяграфічныя дапаможнікі; галіновая бібліяграфія і галіновыя бібліяграфічныя дапаможнікі і да т.п.). Але гэта розныя паняцці. У першым выпадку выдзяляюцца віды бібліяграфічнай дзейнасці з улікам усіх структурных кампанентаў: суб'ектаў, аб'ектаў, працэсаў, сродкаў і вынікаў і ў гэтым выпадку тэрмін “навукова-дапаможная бібліяграфія” можна замяніць на спалучэнне “навукова-дапаможная бібліяграфічная дзейнасць”, “галіновая бібліяграфія” – на “галіновая бібліяграфічная дзейнасць” і інш. Пры вызначэнні відаў бібліяграфічнай прадукцыі (бібліяграфічных дапаможнікаў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

класіфікуюцца толькі вынікі аднаго з працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці (працэса бібліяграфавання). Віды бібліяграфічнай дзейнасці мэтазгодна вызначаць абагульнена, з улікам толькі самых істотных прымет, віды бібліяграфічнай прадукцыі вельмі дэталёва на падставе максімальнай колькасці прымет.

Праблема відаў бібліяграфіі ўзнікла ў той час, калі пад тэрмінам «бібліяграфія» разумелі як асобны бібліяграфічны дапаможнік ці іх сукупнасць, а відавая класіфікацыя як класіфікацыя бібліяграфічнай прадукцыі па розных прыметах (з укараненнем УДК для класіфікацыі дакументаў. Б.С.Баднарскі прымяніў яе для класіфікацыі бібліяграфічнай прадукцыі ў працы «Бібліяграфія рускай бібліяграфіі» 1913–1929). З 50-х гг XX ст. аб'ём паняцця «бібліяграфія» стаў разглядацца як від дзейнасці і адпаведна і віды бібліяграфіі трэба было трансфарміраваць у віды бібліяграфічнай дзейнасці і вызначаючы іх улічваць сутнасна-функцыянальныя характарыстыкі бібліяграфіі спачатку як дзейнасці па стварэнні і давядзенні бібліяграфічнай інфармацыі, пазней яшчэ і навуковай і арганізацыйнай. Гэта не адразу ўлічвалася, да таго ж часам пры распрацоўцы класіфікацыі бібліяграфіі, на думку А.П.Коршунава не вытрымліваліся наступныя лагічныя правілы:

1. Адзінства падстаў дзялення (у адным класіфікацыйным радзе віды могуць выдзяляцца толькі па адной дакладна сфармуляванай прымеце);

2. Неперакрыжаванасць дзяленняў (віды ў межах адной групы павінны выключаць адзін аднаго, ні адзін не павінен перакрыжоўваць другі, падпадаць пад другі ці яму падпарадкоўвацца);

3. Суразмернасць дзялення (выдзеленыя па адной прымеце віды бібліяграфіі павінны ахопліваць усе бібліяграфічныя з'явы);

4. Непарыўнасць дзялення (нельга пераскокваць з бліжэйшага класа ў больш аддалены).

Пры даследаванні бібліяграфіі ў гістарычным ракурсе часта разглядаюць развіццё і адпаведна віды бібліяграфічнай прадукцыі. Такі падыход не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адлюстроўвае і не дазваляе упарадкаваць усю шматграннасць бібліяграфічных з'яў. Калі разглядаць бібліяграфію як дзейнасць (гэта робіцца ў межах дзейнаснага ці сістэмна-дзейнаснага падыхода), то адпаведна і віды бібліяграфіі (бібліяграфічнай дзейнасці) трэба выдзяляць у іншым ракурсе і браць да ўвагі ўсе кампаненты бібліяграфічнай дзейнасці, а не толькі бібліяграфічную прадукцыю. Па словах А.П. Коршунава, сёння найбольш арганізацыйна ўстойлівымі і развітымі з'яўляюцца наступныя віды бібліяграфіі: дзяржаўная, рэпертуарная, каталожная, масавая, навукова-дапаможная, рэкамендацыйная, краязнаўчая, бібліяграфія бібліяграфіі і асобна бібліяграфазнаўства. Але іх нельга прыводзіць у адным лагічным радзе (парушаюцца вышэй прыведзеныя патрабаванні) і не апісваецца ўся відавая разнастайнасць.

Можна пагадзіцца з падыходам А.П.Коршунава, які ў якасці асноўных падстаў для вызначэння відаў бібліяграфічнай дзейнасці прапанаваў: арганізацыйна-ведамасную прымету, аднароднасць ствараемай і распаўсюджваемай бібліяграфічнай прадукцыі, характар дзейнасці і дабавіць у гэты пералік асяроддзе яе рэалізацыі.

***Віды бібліяграфіі па арганізацыйна-ведамаснай прымеце***

У сістэме функцыянавання фіксаванай інфармацыі ў грамадстве існуюць сацыяльныя інстытуты, у межах якіх ствараюцца, кумулююцца, распаўсюджваюцца дакументы. Гэта рэдакцыйна-выдавецкая справа, кніжны гандаль, бібліятэчная справа, архіўная справа, навукова-інфармацыйная справа, бібліяграфічная дзейнасць. Бібліяграфічная дзейнасць займае асобнае становішча, яна не мае арганізацыйнай цэласнасці, існуе ў межах іншых вышэйпералічаных інстытутаў і прадстаўляе карыстальніку не самі дакументы як крыніцы інфармацыі, а звесткі пра іх, бібліяграфічную інфармацыю. У названых інстытутах можна выдзеліць два асноўных узроўні ці контуры: непасрэдна-дакументны і дапаможны ці другасны (бібліяграфічны). Мяжа паміж гэтымі ўзроўнямі часам можа быць вельмі ўмоўнай. У сучасных умовах адбылося істотнае пашырэнне аб'ектнай сферы бібліяграфіі за кошт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знакаграфіі, дакументаграфіі, медыяграфіі, відэёаўдыёграфіі, фільмаграфіі, ідэаграфіі, сэнсаграфіі, інтэрнэтграфіі, сайтаграфііі. Яна ўвабрала ў сваю сферу ўвесь універсум крыніц ведаў (інфармацыі)[67]. Акрамя таго, пашырыліся яе магчымасці пранікнення ў тэкст, прадстаўлення яго на ўзроўні фрагмента, кванта ведаў. Адпаведна павялічылася яе навуковая састаўляючая і больш выразна стала праяўляцца яе "фактаграфічнасць". Бібліяграфічная інфармацыя з'яўляецца неад'емнай часткай большасці відаў баз даных: бібліяграфічных, рэфератыўных, поўнатэкставых, канцэптаграфічных, якія ўтрымліваюць элементы ідэнтыфікуючыя канкрэтны тэкст, фрагменты тэксту ці вынікі яго аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі, магчымы таксама ў фактаграфічных, графічных, мультымедыйных, якія змяшчаюць канкрэтныя факты, прыметы, паказчыкі, схемы, малюнкі, ілюстрацыі, відэа-, аудыяльныя матэрыялы, якія часцей за ўсё маюць бібліяграфічнае аснашчэнне, што дазваляе ідэнтыфікаваць канкрэтны тэкст, факт і суаднесці іх з канкрэтным дакументам. І адпаведна змянілася бібліяграфічная дзейнасць. Яна стала мець камбінаваны (інтэграваны) характар.

Таму дапаможны контур сацыяльных інстытутаў сістэмы дакументных камунікацый (уключаючы формы арганізацыі, суб'екты, мэты, аб'екты, працэсы, сродкі і вынікі) утварае сёння адносна самастойную частку грамадскай практыкі, якую называюць бібліяграфічная дзейнасць і якая па арганізацыйна-ведамаснай прымеце можа падзяляцца на наступныя інстытуцыянальныя віды бібліяграфіі: бібліятэчная бібліяграфія, выдавецкая бібліяграфія, кнігагандлёвая бібліяграфія, кніжнапалацкая бібліяграфія, навукова-інфармацыйная бібліяграфія, архіўная бібліяграфія, музейная бібліяграфія і магчыма іншыя, якія з'яўяцца ў адпаведнасці з фарміраваннем новых сацыяльных інстытутаў па аперыраванні фіксаванай інфармацыяй (ведамі).

---

[67] Фокеев В.А. Постпрото(нео)библиография в контексте бархатной революции библиографии, развития новых информационных технологий, постмодернизма и постнеклассики// Методологические и теоретические проблемы библиографии в контексте новых информационных технологий: [сб. статей]. – М., 2007. – С.126.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табл. 2 Віды бібліяграфіі па арганізацыйна-ведамаснай прымеце*

| ***Сацыяльны інстытут СДК*** | ***Узроўні (контуры дзейнасці)*** | | ***Від бібліяграфіі па арганізацыйна-ведамаснай прымеце (інстытуцыянальныя)*** |
|---|---|---|---|
| | ***непасрэдна-дакументны*** | ***дапаможны ці другасны (бібліяграфічны)*** | |
| 1 | 2 | 3 | *4* |
| Бібліятэчная справа | Збіранне, захаванне і распаўсюджанне дакументнай прадукцыі, прызначанай для шырокага выкарыстання ў грамадстве | Фарміраванне інфармацыйна-пошукавага апарата, стварэнне другаснай інфармацыі, адасобленай ад пэўнага фонда, давядзенне БІ да карыстальнікаў | ***Бібліятэчная бібліяграфія ці бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць*** |
| Выдавецкая справа | Стварэнне (рэакцыйная падрыхтоўка і тыражыраванне) дакументнай прадукцыі | Стварэнне разнастайных уліковых формаў створанай, плануемай да стварэння прадукцыі, бібліяграфічнае аснашчэнне выдавецкай прадукцыі, давядзенне БІ да карыстальнікаў | ***Выдавецкая бібліяграфія ці выдавецка-бібліяграфічная дзейнасць*** |
| Кнігагандлёвая справа | Продаж дакументнай прадукцыі | Стварэнне разнастайных уліковых формаў прапануемай да продажу дакументнай прадукцыі, плануемай да продажу і да т.п., давядзенне БІ да карыстальнікаў | ***Кнігагандлёвая бібліяграфія ці кнігагандлёва-бібліяграфічная дзейнасць*** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 | *4* |
|---|---|---|---|
| Дзейнасць па рэгістрацыі і ўліку дакументаў пэўнай краіны (нацыянальныя бібліятэкі, кніжныя палаты, фірмы) | Улік дакументнай прадукцыі на аснове дзяржаўнай (нацыянальнай) рэгістрацыі, захаванне архіваў друку | Стварэнне крыніц дзяржаўнай і рэпертуарнай (нацыянальнай) бібліяграфіі, давядзенне БІ да карыстальнікаў | ***Улікова-рэгістрацыйная бібліяграфія (савецкі і постсавецкі аналаг – кніжнапалацкая бібліяграфія ці улікова-рэгістрацыйная бібліяграфічная дзейнасць*** |
| навукова-інфармацыйная дзейнасць | Работа з першасным дакументам, яго аналіз, забеспячэнне спецыялістаў інфармацыяй | Стварэнне і давядзенне да спецыялістаў аналітыка-бібліяграфічных матэрыялаў | ***навукова-інфармацыйная бібліяграфія ці навукова-інфармацыйная бібліяграфічная дзейнасць*** |
| архіўная дзейнасць | Збор, захаванне, навуковае даследаванне і прадастаўленне карыстальнікам архіўных дакументаў | Фарміраванне інфармацыйна-пошукавага аппарата (навукова-дапаможнага), даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне | ***архіўная бібліяграфія ці архіўная бібліяграфічная дзейнасць*** |
| музейная дзейнасць | Збор, захаванне, навуковае даследаванне і прадастаўленне карыстальнікам музейных экспанатаў (у тым ліку дакументаў) | Апісанне дакументных экспанатаў, фарміраванне інфармацыйна-пошукавага апарата | ***музейная бібліяграфія ці музейная бібліяграфічная дзейнасць*** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Бібліятэчная бібліяграфія* (магчымы назвы: бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць, бібліяграфічная дзейнасць бібліятэк) – гэта такія ўчасткі бібліятэчнай справы (ці інфармацыйная інфраструктура бібліятэчнай справы), якія забяспечваюць стварэнне бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічных ведаў), запатрабаваных у дзейнасці бібліятэк і спрыяе фарміраванню і выкарыстанню іх фондаў.

*Выдавецкая бібліяграфія (*магчымы назвы: выдавецка-бібліяграфічная дзейнасць, бібліяграфічная дзейнасць выдавецтваў) – гэта від бібліяграфічнай дзейнасці, які рэалізуецца ў межах выдавецкай справы, забяспечвае стварэне і рух бібліяграфічнай інфармацыі ў неабходных ёй мэтах і аб'ёмах.

*Кнігагандлёвая бібліяграфія* (магчымы назвы: кнігагандлёва-бібліяграфічная дзейнасць, бібліяграфічная дзейнасць кнігагандлёвых установ) – гэта інфармацыйная інфраструктура кнігагандлёвай справы, якая забяспечвае стварэнне бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічных ведаў), запатрабаваных у дзейнасці кнігагандлёвых установ і спрыяе фарміраванню асартыменту тавараў і іх продажы.

*Улікова-рэгістрацыйная бібліяграфія* (магчымы назвы: ўлікова-рэгістрацыйная бібліяграфічная дзейнасць ці ў адпаведнасці з установай, якая гэтай дзейнасцю займаецца) – бібліяграфічная дзейнасць нацыянальных бібліятэк, кніжных палат іншых інфармацыйных установ краін па дзяржаўным (нацыянальным) уліку дакументаванай прадукцыі і прадастаўленню адпаведнай улікова-рэгістрацыйнай бібліяграфічнай інфармацыя карыстальнікам.

*Архіўная бібліяграфія* (магчымы назвы: архіўная бібліяграфічная дзейнасць, бібліяграфічная дзейнасць архіваў) – інфармацыйная інфраструктура архіўнай справы, якая забяспечвае ідэнтыфікацыю, пошук і выкарыстанне архіўных дакументаў і дакументаў, запатрабаваных у пазнавальнай архіўнай дзейнасці; бібліяграфічныя ўчасткі дзейнасці архіўных установ, звязаныя са стварэннем, захаваннем, перапрацоўкай, распаўсюджваннем і выкарыстаннем бібліяграфічнай інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Навукова-інфармацыйная бібліяграфія* (магчымы назвы: навукова-інфармацыйная бібліяграфічная дзейнасць, бібліяграфічная дзейнасць органаў навуковай інфармацыі) – гэта від бібліяграфічнай дзейнасці, які рэалізуецца ў межах органаў навуковай інфармацыі, забяспечвае стварэне і рух бібліяграфічнай інфармацыі ў неабходных ім мэтах і аб'ёмах.

*Музейная бібліяграфія* (магчыма ўжыванне назваў бібліяграфічная дзейнасць музейная бібліяграфічная дзейнасць ці бібліяграфічная дзейнасць музейных установў) – гэта від бібліяграфічнай дзейнасці, які рэалізуецца ў музейных установах, забяспечвае стварэнне і рух бібліяграфічнай інфармацыі ў неабходных ім мэтах і аб'ёмах.

***Віды бібліяграфіі па аднароднасці ствараемай і распаўсюджваемай бібліяграфічнай прадукцыі***

Бібліяграфічная прадукцыя з'яўляецца асноўным вынікам працэса бібліяграфавання, асноўным сродкам існавання і каналам распаўсюджвання бібліяграфічнай інфармацыі і таму заканамерна трэба выдзяляць віды бібліяграфіі па аднароднасці ствараемай і распаўсюджваемай бібліяграфічнай прадукцыі і ў межах гэтай падставы выдзеліць некалькі кірункаў: грамадскае прызначэнне, храналагічная прымета ці функцыянальна-мэтавае прызначэнне, форма і змест бібліяграфіруемых дакументаў.

*Віды бібліяграфіі па грамадскім прызначэнні ствараемай і распаўсюджваемай бібліяграфічнай прадукцыі*

Стварэнне бібліяграфічнай прадукцыі заўсёды сацыяльна абумоўлена і накіравана на задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей грамадства ў цэлым, пэўных сацыяльных груп, асобных карыстальнікаў. На думку А.П. Коршунава, грамадскае прызначэнне БІ абумоўлівае яе фунцыянальную структуру – пералік і паслядоўнасць выканання асноўных грамадскіх функцый: пошукавая, камунікатыўная, ацэначная, у адпаведнасці з якімі мэтазгодна выдзяляць віды бібліяграфіі па грамадскім прызначэнні: бібліяграфія камунікатыўна-пошукавага і ацэначнага прызначэння ці адпаведна агульная і

спецыяльная бібліяграфія. Асноўнае адрозненне гэтых відаў бібліяграфіі – канкрэтнае мэтавае і чытацкае прызначэнне. Агульная бібліяграфія яго не мае, яна разлічана на грамадства ў цэлым, у межах яе ствараюцца крыніцы БІ для ўліку дакументаваную прадукцыю пэўнага фонда (фондаў), выдадзеную на пэўнай тэрыторыі, мове, за пэўны перыяд часу, апавясціць грамадства аб існаванні дакументаў пэўнай формы і зместу. Спецыяльная бібліяграфія заўсёды мае канкрэтнае мэтавае і чытацкае (спажывецкае) прызначэнне, у межах яе ствараюцца крыніцы ў разліку на пэўную сферу абслугоўвання.

*Агульная бібліяграфія* – гэта галіна дзейнасці па стварэнні бібліяграфічнай прадукцыі, якая забяспечвае пошук дакументаў і інфармаванне аб іх ў незалежнасці ад іх наступнага спецыяльнага выкарыстання. Да агульнай бібліяграфіі адносіцца каталожная, дзяржаўная, рэпертуарная, масавая бібліяграфія.

*Каталожная бібліяграфія* – від бібліяграфічнай дзейнасці, ў межах якога здзясняецца адлюстраванне і давядзенне інфармацыі аб дакументах пэўнага фонда (фондаў) без уліку якасных характарыстык дакументаў праз стварэнне і выкарыстанне электронных, картачных і друкаваных каталогаў. На думку А.П. Коршунава, менавіта яна забяспечвае канчатковую рэалізацыю пошукавай функцыі бібліяграфічнай інфармацыі. Гэты від бібліяграфічнай дзейнасці можа быць рэалізаваны практычна ў любым грамадскім інстытуце, які працуе з дакументамі і ў якім існуе неабходнасць іх прадастаўлення поўнай інфармацыі аб іх карыстальнікам.

*Дзяржаўная бібліяграфія* – дзейнасць устаноў (нацыянальных бібліятэк, фірм, на тэрыторыі былога СССР – кніжных палат) па дзяржаўнай рэгістрацыі дакументаў, падрыхтоўцы на гэтай базе сістэмы універсальнай бягучай бібліяграфічнай прадукцыі (“летапісаў”, “штогоднікаў”, “бюлетэней”) і давядзенні яе да карыстальнікаў. Крыніцы дзяржаўнай бібліяграфіі ствараюцца на аснове ўліку фармальных прымет дакументаў (від дакумента: кніга, часопіс, ноты, рэцэнзіі, часопісныя артыкулы і т.д., мова, тэрыторыя, храналагічны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перыяд). У некаторых выпадках тэрмін дзяржаўная бібліяграфія можна замяняць тэрмінамі бягучая нацыянальная бібліяграфія.

*Рэпертуарная бібліяграфія* (яе другая назва – агульная рэтраспектыўная бібліяграфія) – від бібліяграфіі, у межах якой здзяйсняецца поўны ўлік дакументнай прадукцыі, створанай на тэрыторыі дзяржавы за ўвесь перыяд яе існавання, а таксама давядзенне атрыманай інфармацыі да карыстальнікаў. У межах рэпертуарнай бібліяграфіі здзяйсняецца ўлік дакументаў па фармальных прыметах (від выдання, мова, тэрыторыя, храналагічны перыяд) і ў гэтым сэнсе яна цесна звязана з дзяржаўнай (бягучай нацыянальнай) бібліяграфіяй, якая (пры ўмове існавання ў пэўны гістарычны перыяд) стварае аснову для фарміравання рэпертуарнай бібліяграфіі. Адначасова (у якасці сіноніма) рэпертуарнай бібліяграфіі часам ужываецца паняцце “нацыянальная рэтраспектыўная бібліяграфія”.

*Нацыянальная бібліяграфія* – від бібліяграфіі, які забяспечвае вытворчасць і распаўсюджванне бібліяграфічнай інфармацыі па комплексе тэрытарыяльна-дзяржаўных, нацыянальна-этнічных прымет.

Тэрмін “нацыянальная бібліяграфія” стаў ужывацца з канца ХУІІІ – пачатка ХІХ ст. У ХХ ст. былі здзейснены спробы яго тэарэтычнага асэнсавання. Але да нашага часу ён не атрымаў адназначнай трактоўкі ў навуковай літаратуры. Існуе тры асноўных падыходы: 1) нацыянальная бібліяграфія – гэта ўлік дакументаў выдадзеных на тэрыторыі пэўнай дзяржавы;

2) нацыянальная бібліяграфія – гэта ўлік дакументаў на пэўнай мове;

3) нацыянальная бібліяграфія – гэта комплексны ўлік твораў, звязаных з пэўным народам: месцам і мовай публікацый, аўтарствам і зместам.

Адпаведна сёння ў сусвеце існуюць тры асноўныя формы арганізацыі нацыянальнай бібліяграфіі:

1) ствараюцца выданні нацыянальнай бібліяграфіі, якія адлюстроўваюць творы, выдадзеныя ў межах дзяржавы ў незалежнасці ад мовы публікацыі (па тэрытарыяльна-дзяржаўнай прынцыпу) Напрыклад, у Францыі (Bibliographie nationale Francais);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) выданні нацыянальнай бібліяграфіі адлюстроўваюць творы, выдадзеныя на дзяржаўнай мове пэўнай краіны незалежна ад месца публікацыі (па моўнаму прынцыпу) Напрыклад, у ЗША з 1898 г. стаў выдавацца “Кумулятыўны паказальнік кніг” (Cumulative book index), у якім адлюстраваны кнігі на англійскай мове незалежна ад зместа, месца выдання, аўтарскай прыналежнасці. У ФРГ выдаецца “Нямецкая нацыянальная бібліяграфія” (Deutsche Nacionalbibliographie), якая ўяўляе сабой комплекс серый, дзе адлюстроўваюцца ўсе нямецкамоўныя дакументы, створаныя як у ФРГ, так і за яе межамі.

3) выданні нацыянальнай бібліяграфіі адлюстроўваюць ўсе творы, выдадзеныя ў межах дзяржавы, творы, выдадзеныя за яе межамі, але на дзяржаўнай мове, творы ўраджэнцаў гэтай краіны, якія жывуць за яе межамі, экстэрыёрыка – творы прысвечаныя краіне, але выдадзеныя за яе межамі (па комплекснаму прынцыпу). Такія падыходы да стварэння нацыянальнай бягучай бібліяграфіі характэрны, напрыклад, для Балгарыі, Беларусі.

Паняцце нацыянальная бібліяграфія ўключае бягучую нацыянальную бібліяграфію і рэтраспектыўную нацыянальную бібліяграфію (рэпертуарную). Яны маюць функцыянальнае падабенства, дапаўняюць адна адну: крыніцы бягучай нацыянальнай бібліяграфія ўлічваюць новую дакументальную прадукцыю па аднаму з вышэйпералічаных прынцыпаў, а рэлертуарныя – дакументальны масіў, створаны за ўвесь перыяд існавання грамадства.

*Масавая бібліяграфія* – гэта від бібліяграфіі ў межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка БІ таксама пераважна па фармальных прыметах, але абмежаванні фармальныя і/ці змястоўныя больш жорсткія, ставіцца мэта азнаямлення шырокага кола карыстальнікаў з найбольш грамадска значымай часткай новастворанай дакументнай прадукцыяй. Асноўным каналам распаўсюджвання масавай інфармацыі з’яўляецца перыядычны друк. У межах масавай бібліяграфіі ствараюцца разнастайныя спісы новай літаратуры, новых паступленняў, сігнальныя экзэмпляры друкаванай прадукцыі, планы-праспекты выдавецтваў, прайс-лісты, выдавецкія каталогі і інш.

Спецыяльная бібліяграфія заснавана на ацэнцы дакументаў адпаведна групавых і індывідуальных інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў. Гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

від бібліяграфічнай дзейнасці па бібліяграфічным забеспячэнні пэўнай сферы грамадскай практыкі, уключаючы стварэнне і выкарыстанне спецыяльнай бібліяграфічнай прадукцыі, а таксама выкарыстанне любых крыніц (у тым ліку крыніц агульнай бібліяграфіі ў мэтах бібліяграфічнага забеспячэння патрэбнасцей і карыстальнікаў пэўнай сферы абслугоўвання.

Сукупнасць крыніц спецыяльнай бібліяграфіі значна разнастайней чым сукупнасць крыніц агульнай бібліяграфія, т. ш. яны ствараюцца не для грамадства ў цэлым, г.з. аднаго аб'екта ўздзеяння, а для шэрагу сфер грамадства. І таму відаў крыніц спецыяльнай бібліяграфіі столькі, колькі існуе сацыяльных груп карыстальнікаў і мэтаў спажывання фіксаванай інфармацыі.

А.П.Коршунаў выдзяляе 6 найбольш буйных сфер абслугоўвання: навука, кіраванне, вытворчасць, адукацыя, самаадукацыя, выхаванне і, калі мець на ўвазе, што для кожнай з названых сфер можна ствараць бібліяграфічную прадукцыю, то разнавіднасцямі крыніц спецыяльнай бібліяграфіі можна лічыць – навукова-дапаможную, прафесійна-вытворчую, вучэбна-дапаможную, самаадукацыйную віды бібліяграфіі. Але найчасцей гэтую сукупнасць падзяляюць на дзве асноўныя групы: навукова-дапаможная бібліяграфія і рэкамендацыйная бібліяграфія (гл. дадатак).

*Навукова-дапаможная бібліяграфія* – від спецыяльнай бібліяграфіі, які забяспечвае вытворчасць і распаўсюджванне бібліяграфічнай інфармацыі для навукоўцаў і ў дапамогу навукова-даследчай дзейнасці.

Гэтым відам бібліяграфічнай дзейнасці займаюцца буйныя бібліятэкі нашай краіны (Нацыянальная бібліятэка Беларусі, рэспубліканскія навуковыя бібліятэкі), часам – вучэбныя і навуковыя ўстановы спадарожна з вучэбнай і даследчай відамі дзейнасці, цэнтры навуковай інфармацыі (напрыклад, аддзел навувай інфармацыі па грамадскіх навуках пры НАН Беларусі) і некаторыя іншыя. Пры стварэнні крыніц навукова-дапаможнай бібліяграфіі і адпаведным бібліяграфічным абслугоўванні ўлічваюцца інфармацыйныя патрэбнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукоўцаў, выкладчыкаў, прадстаўнікоў вытворчасці, асабліва тых кірункаў, у межах якіх ёсць навукова-даследчыя элементы.

Навукова-дапаможная бібліяграфія вельмі цесна звязана з прафесійна-вытворчай, вучэбна-дапаможнай. Яны не маюць арганізацыйнай афармленасці, імі займаюцца прыкладна аднолькавыя ўстановы, у іх межах ствараюцца крыніцы найчасцей поліспажывецкага прызначэння (для навукоўцаў, выкладчыкаў, кіраўнікоў вытворчасці і інш.), пры бібліяграфічным абслугоўванні выкарыстоўваюцца амаль аднолькавыя метады і таму часам паміж імі немагчыма правесці размежаванне.

Найбольш выразна навукова-дапаможная бібліяграфія адрозніваецца ад рэкамендацыйнай.

*Рэкамендацыйная бібліяграфія* – від спецыяльнай бібліяграфіі, які забяспечвае вытворчасць і распаўсюджванне бібліяграфічнай інфармацыі для шырокіх колаў карыстальнікаў ці асобных іх груп з мэтай самаадукацыі, адпачынкавай дзейнасці і папулярызацыі ведаў. Для рэкамендацыйнай бібліяграфіі характэрна прымяненне якасных крытэрыяў адбору дакументаў, папулярны стыль выкладання матэрыялу, імкненне зацікавіць карыстальнікаў у звяртанні да дакументаў. Гэтым відам дзейнасці займаюцца бібліятэкі розных узроўняў, найбольш выразна – публічныя, дзіцячыя, школьныя. Выкарыстоўваюцца розныя каналы распаўсюджвання інфармацыі (вербальныя і фіксаваныя), вельмі часта – мас-медыя. Магчыма ўжыванне ілюстрацыйнага матэрыялу, гульнёвых тэхналогій. Часам гэты від бібліяграфіі называюць папулярнай бібліяграфіяй.

***Віды бібліяграфіі па функцыянальна-мэтавай*** (храналагічнай) прымеце стварaемай і распаўсюджваемай бібліяграфічнай прадукцыі. Бібліяграфічная дзейнасць можа быць скіравана на адлюстраванне розных пластоў дакументных патокаў: новых, амаль сінхронных з выхадам дакумемтаў у свет, рэтраспектыўных (створаных у мінулыя гады) і патэнцыяльных, стварэнне якіх плануецца ў будучым. Па такіх жа падыходах можа весціся і бібліяграфічнае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абслугоўванне. Яно можа здзяйсняцца вельмі аператыўна, на рэгулярнай аснове, можа весціся ў апераджальным рэжыме ці па разавых запытах з прадастаўленнем інфармацыі аб дакументах за значны перыяд часу ў мінулым. Адпаведна па храналагічнай ці функцыянальна-мэтавай прымеце выдзяляюцца бягучая, рэтраспектыўная і перспектыўная віды бібліяграфія.

*Бягучая бібліяграфія* выконвае функцыю рэгулярнага інфарміравання аб новых дакументах і забяспечвае карыстальнікам магчымасць сачыць за новым дакументным патокам наогул ці па асобнай галіне ведаў, тэме, праблеме, сферы дзейнасці. Ёю займаюцца розныя сацыяльныя інстытуты, найчасцей бібліятэкі, кніжныя палаты, цэнтры (органы) навуковай інфармацыі. Бягучай бібліяграфіі ўласціва шэраг характарыстык, якія адрозніваюць яе ад іншых відаў бібліяграфіі гэтага класіфікацыйнага рада. Найперш, гэта аператыўнасць адлюстравання дакументнага патока і давядзення інфармацыі аб дакументах да карыстальніка. Аператыўнасць выражаецца ў імкненні да максімальнага скарачэння інфармацыйнага інтэрвала паміж выхадам дакументаў у свет і іх бібліяграфічным адлюстраванні ў крыніцах бібліяграфічнай інфармацыі, а таксама давядзенні інфармацыі да карыстальнікаў. Для бягучай бібліяграфіі характэрна таксама рэгулярнасць ці перыядычнасць адлюстравання дакументнага патока і ў адпаведным рэжыме давядзенне інфармацыі да карыстальнікаў. Да бягучай бібліяграфіі адносіцца стварэнне крыніц дзяржаўнай бібліяграфіі (напрыклад, “Кніжны летапіс” выдаецца штомесяц з 1924 г.), крыніц масавай бібліяграфіі (бюлетэнь “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку” выходзіць з 1960 г. таксама штомесяц), крыніц навукова-дапаможнай бібліяграфіі (“Эканоміка Беларусі” выдаецца па паўгоддзях), краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў (напрыклад, “Віцебская вобласць” выдаецца з 1972 года па кварталах) і да т.п. Бягучай бібліяграфіі ўласцівы таксама паўната адлюстравання інфармацыі ў зададзеных параметрах (акрэсленых межах) і дакладнасць звестак аб дакументах (іх частках, сукупнасцях). Гэтыя якасці робяць бягучую бібліяграфію незаменнай для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навуковай дзейнасці, рашэння вытворчых задач. Яна забяспечвае навукоўцаў, выкладчыкаў, прадстаўнікоў вытворчасці (народнай гаспадаркі) новай даставернай інфармацыяй на рэгулярнай аснове і спрые аптымізацыі іх дзейнасці.

*Рэтраспектыўная бібліяграфія* – від бібліяграфіі, у межах якога падагульняецца развіццё дакументных патокаў за пэўныя адрэзкі часу і забяспечваецца рэтраспектыўны пошук у накопленых дакументных масівах пад час бібліяграфічнага абслугоўвання і самаабслугоўвання.

Рэтраспектыўная бібліяграфія як від дзейнасці можа рэалізоўвацца на базе розных грамадскіх інстытутаў сістэмы дакументных камунікацый. Ствараемыя ў яе межах крыніцы (рэтраспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі ці крыніцы рэтраспектыўнай бібліяграфіі) могуць мець агульнае ці спецыяльнае прызначэнне, бываюць рознымі па змесце, метадах бібліяграфавання (глядзі падрабязней тэму 1.5). Рэтраспектыўны бібліяграфічны пошук у межах бібліяграфічнага абслугоўвання ці самаабслугоўвання можа здзяйсняцца на базе розных крыніц бібліяграфічнай інфармацыі (па змесце, грамадскім прызначэнні і іншых прыметах). У гэтым пераліку могуць быць і бібліяграфічныя дапаможнікі, якія на пэўным этапе былі бягучымі і аператыўна адлюстроўвалі новы дакументны паток. З цягам часу яны набылі рысы рэтраспектыўных і могуць разглядацца як крыніцы адпаведнага пошуку.

Перспектыўная бібліяграфія – від бібліяграфічнай дзейнасці, у межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная інфармацыя аб дакументах пакуль яшчэ не выдадзеных, а толькі падрыхтаваных да друку. Яна рэалізуецца ў асноўным на базе рэдакцыйна-выдавецкіх калектываў, якія рэкламуюць рыхтуемую да выпуску дакументную прадукцыю, а таксама на базе бібліятэк і кнігагандлёвых устаноў, якія здзяйсняюць адпаведныя заказы і інфармуюць карыстальнікаў аб будучых паступленнях у продаж, у бібліятэчныя фонды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Змест і форма бібліяграфіруемых дакументаў*** таксама можа разглядацца ў якасці падставы для вызначэння відаў бібліяграфіі. У адпаведнасці з ёй гістарычна сфарміраваліся і актыўна развіваюцца два асноўныя віды бібліяграфіі: ўніверсальная, галіновая і комплексная. Універсальная бібліяграфія – гэта бібліяграфія, якая заснавана на ўліку фармальных прымет дакументаў як аб'ектаў бібліяграфічнага адлюстравання (від дакумента, мова, месца стварэння / распаўсюджвання) і ў якой змястоўны склад бібліяграфіруемых дакументаў праяўляецца апасрэдавана праз фармальныя. Як від дзейнасці яна рэалізуецца на базе розных грамадскіх інстытутаў сістэмы дакументных камунікацый, якія ствараюць электронныя і картачныя каталогі, розныя формы індывідуальнага ўліку дакументаў, у межах якіх яны адлюстроўваюцца як матэрыяльныя адзінкі, аб’екты захавання, аб’екты выпуску.

*Галіновая бібліяграфія* абапіраецца на змястоўныя прыметы дакументаў як аб'ектаў бібліяграфічнага адлюстравання (тэматыка дакумента, прыналежнасць яго зместу да пэўнай галіны ведаў). Фармальныя прыметы дакументаў пры гэтым улічваюцца спадарожна, для абмежавання тэматычна вызначанага дакументнага патоку. Галіновая бібліяграфія – гэта такі від бібліяграфічнай дзейнасці, у межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка інфармацыя аб дакументах у межах пэўнай галіны ведаў. Да разнавіднасцей галіновай бібліяграфіі можна аднесці шматгаліновую і тэматычную бібліяграфіі (А.П.Коршунаў). Адпаведна ім можна даваць наступныя азначэнні. Шматгаліновая бібліяграфія – від бібліяграфіі, у межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка інфармацыя аб дакументах па дзвюх і некалькіх галінах ведаў. Тэматычная бібліяграфія – від бібліяграфіі, у межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка інфармацыя аб дакументах па пэўнай тэме, праблеме. Трэба адзначыць вельмі празрыстыя межы паміж галіновай бібліяграфіяй і яе вытворнымі, якія павінны суадносіцца па прынцыпе: цэлае – частка – частка часткі. Але часам немагчыма вызначыць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэту мяжу нават у дачыненні да асобных бібліяграфічных дапаможнікаў. Для дзейнасці ў цэлым гэта задача надзвычай ускладняецца. Таму, на наш погляд, дыферэнцыяцыю падобную на ўзроўні віда бібліяграфіі рабіць немэтазгодна, на ўзроўні бібліяграфічнай прадукцыі магчыма.

Асобнае месца займаюць персанальная, краязнаўчая, краіназнаўчая віды бібліяграфіі. Яны заснаваны на спалучэнні змястоўных і фармальных прымет дакументаў як аб’ектаў бібліяграфічнай дзейнасці.

*Персанальная* бібліяграфія – від бібліяграфіі, у межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная прадукцыя аб дакументах пэўнай асобы і/ці аб пэўнай асобе.

*Краязнаўчая* бібліяграфія – від бібліяграфіі, ў межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная прадукцыя аб дакументах, створаных на тэрыторыі пэўнага краю і/ці прысвечаных яму. Гэты від бібліяграфічнай дзейнасці вельмі актыўна развіваецца ў бібліятэках, музеях, радзей архівах, а таксама на аматарскім узроўні. У яго межах ствараецца шырокі спектр бягучых і рэтраспектыўных бібліяграфічных дапаможнікаў; дапаможнікаў, прысвечаных краю ў цэлым і асобнай яго частцы, асобнаму кірунку развіцця; асвойваюцца розныя бібліяграфічныя жанры: паказальнікі, спісы, агляды, бібліяграфічныя нарысы, даведнікі і да т.п. У бібліяграфічным абслугоўванні, якое здзяйсняецца ў межах гэтага віда бібліяграфічнай дзейнасці, выкарыстоўваюцца самыя разнастайныя крыніцы першаснай і другаснай інфармацыі: апублікаваныя, рукапісныя, электронныя, праводзяцца формы бібліяграфічных і камбінаваных мерапрыемстваў.

*Краіназнаўчая* бібліяграфія – від бібліяграфіі, ў межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная прадукцыя аб дакументах, створаных на тэрыторыі пэўнай краіны і/ці прысвечаных ёй. Да яе можна аднесці большасць характарыстык, пералічаных вышэй да краязнаўчай бібліяграфіі з карэктыроўкай адносін “край – краіна”. Разам з тым, неабходна адзначыць, што ў навуковай літаратуры аб’ём паняццяў краязнаўчая і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краіназнаўчая бібліяграфія разглядаюцца неадназначна. Выказваюцца меркаванні аб звужэнні аб'ёму паняццяў да ўліку толькі змястоўных аспектаў – "прысвечаныя краю (краіне)". На наш погляд, гэта немэтазгодна. Тым самым прыніжаецца значэнне краязнаўчай (краіназнаўчай) бібліяграфіі як відаў дзейнасці, у межах якіх акрамя працы з дакументамі, прысвечанымі краю (краіне), здзяйсняецца улік дакументаў, створаных на іх тэрыторыі як фактаў гісторыка-культурнага працэсу, і праца па іх папулярызацыі. Таму нельга блытаць краязнаўчую бібліяграфію – від дзейнасці і краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі – від бібліяграфічнай прадукцыі. Краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі – від бібліяграфічнай прадукцыі па змесце бібліяграфіруемых дакументаў, у якім адлюстроўваецца інфармацыя аб краі. Бібліяграфічныя дапаможнікі, ў якіх адлюстроўваецца інфармацыя аб дакументах, створаных на тэрыторыі пэўнага краю, называюцца дапаможнікамі мясцовага друку. Нельга блытаць і краіназнаўчую бібліяграфію – від дзейнасці і краіназнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі – від бібліяграфічнай прадукцыі. Краіназнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі – від бібліяграфічнай прадукцыі па змесце бібліяграфіруемых дакументаў, у якім адлюстроўваецца інфармацыя аб краіне. А бібліяграфічныя дапаможнікі, ў якіх адлюстроўваецца інфармацыя аб дакументах створаных на тэрыторыі краіны называюцца дзяржаўнымі (бягучыя), рэпертуарнымі (рэтраспектыўныя).

Краязнаўчая і краіназнаўчая віды бібліяграфіі суадносяцца таксама і з такімі тэрмінамі як краявая бібліяграфія, занальная бібліяграфія і рэгіянальная бібліяграфія. Найбольш часта ўжываецца тэрмін рэгіянальная бібліяграфія. Есць розныя меркаванні па яго аб'ёме паняцця і апраўданасці замены ім тэрміна краязнаўчая бібліяграфія. На наш погляд, можна падтрымаць меркаванне аб іх сінанімічнасці і зрабіць выснову, што рэгіянальная бібліяграфія – від бібліяграфічнай дзейнасці, ў межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная прадукцыя аб дакументах, створаных на тэрыторыі пэўнага рэгіёна і/ці прысвечаных яму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Бібліяграфія бібліяграфіі* (другая назва – бібліяграфія другой ступені, часам ужываецца тэрмін “метабібліяграфія) – від бібліяграфіі, ў межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная прадукцыя аб бібліяграфічных дакументах (крыніцах бібліяграфічнай інфармацыі). Пры гэтым да увагі могуць брацца як фармальныя, змястоўныя так і іншыя характарыстыкі бібліяграфіруемых аб’ектаў. А.П.Коршунаў лічыць спецыфічным відам бібліяграфіі. Трэба сказаць, што ўжыванне другой часткі тэрміна можна лічыць устарэлым (бібліяграфія = бібліяграфічная прадукцыя). Асобна выдзяляць яго можна толькі ў тым выпадку, калі рабіць класіфікацыю бібліяграфіі па асобных відах дакументаў і адпаведна выдзеляць: бібліяграфію афіцыйных дакументаў, бібліяграфію навуковых дакументаў і г.д.

***Іншыя падставы для выдзялення відаў бібліяграфіі.*** Прымяненне дадатковых у дачыненне да вышэйпералічаных падстаў абумоўлена складанасцю бібліяграфічнай дзейнасці, яе мабільнасцю ва ўспрыняцці новых тэхналогій і прымяненні новых формаў бібліяграфічнага абслугоўвання, а таксама яе інфраструктурным характарам, здольнасцю да ўзаемапранікнення з шэрагам сфер навукі і практыкі. З улікам асаблівасцей рэалізацыі бібліяграфічнай дзейнасці (яе характарам) можна выдзеліць такія віды як прафесійная і непрафесійная (аматарская) бібліяграфія, вытворчая і спажывецкая бібліяграфія і да т.п. Гэтыя віды можна назваць скразнымі, іх пералік абумоўлены характарам чалавечай дзейнасці наогул, бібліяграфічная спецыфіка праяўляецца праз пастаноўку мэтаў, выбар аб’ектаў, сродкаў, выкананне асобных аперацый, асаблівасці атрыманых вынікаў.

Для сучаснай бібліяграфічнай практыкі вельмі значным з’яўляецца асяроддзе рэалізацыі практычных намаганняў бібліёграфа і існавання ствараемай бібліяграфічнай прадукцыі. Адпаведна ў навуковых публікацыях робіцца дзяленне бібліяграфічная дзейнасці на два асноўных кірунку ці віды:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыйныя пошукавыя сістэмы і новыя нетрадыцыйныя (электронныя) [68]; традыцыйная бібліяграфія і электронная бібліяграфія. У слоўніку В.А.Факеева "Библиографическая наука и практика" (М., 2008) даюцца наступныя азначэнні "традиционная библиография – библиография полиграфического периода информационной культуры, опирающаяся на технологию, характерную для XVI – XXвв."[69], "электронная библиография – библиография, функционирующая в электронной среде, опирающаяся на электронно-информационные технологии и современные средства связи"[70]. На наш погляд, ужыванне тэрміна традыцыйная бібліяграфія магчыма ў спалучэнні з наватарскай бібліяграфіяй, а замена апошняй на электронную магчыма была толькі на тым этапе, калі лічбавыя тэхналогіі пачыналі ўкараняцца ў бібліяграфічную практыку. На сучасным этапе яны набылі ўжо ўласцівасці традыцыйных (у замежнай бібліяграфічнай практыцы яны прымяняюцца на працягу апошніх 50 год, у айчыннай – амаль 20), выпрацаваны фарматы прадстаўлення запісаў, усталяваліся падыходы да арганізацыі адпаведных інфармацыйна-пошукавых сістэм і да т.п. і таму прымяненне тэрміна традыцыйная бібліяграфія бачыцца неўдалым у якасці абагульняючага для адлюстравання рэалізацыі бібліяграфічнай дзейнасці з выкарыстаннем рукапісных, друкаваных і картачных тэхналогій.

Трэба адзначыць, што ў навуковай, вучэбнай літаратуры даволі актыўна разглядаюцца метадычныя, тэарэтычныя пытанні, звязаныя з электроннай формай перадачы інфармацыі наогул і бібліяграфічнай у прыватнасці. Прапануюцца трактоўкі адпаведных тэрмінаў, устанаўліваюцца іх суадносіны. Шырока ўжываюцца тэрміны "электронны дакумент", "электроннае выданне", "электронны рэсурс" і іх вытворныя (дэтэрмініраванае і недэтэрмініраванае электроннае выданне, офлайнавы і онлайнавы дакумент

[68] Вершинин, М.И. Электронный каталог: проблемы и решения: учеб.-практ. пособие / М.И. Вершинин. – СПб.: Профессия, 2007. – С.7.

[69]Фокеев, В.А. Библиографическая наука и практика : терминологический словарь / В. А. Фокеев. – СПб.: Профессия, 2008. – С. 242.

[70] Тамжа. – С. 263.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(рэсурс), здымаемы і нездымаемы электронны дакумент, электронная кніга, электронны часопіс, электронны аналаг друкаванага выдання і інш.). Але існуе шэраг супярэчлівасцей у азначэннях, не заўсёды карэктна можна вызначыць сінанімічныя рады. Прыводзяцца асобныя пералікі відаў і прапаноўваюцца класіфікацыйныя схемы адпаведнай інфармацыйнай прадукцыі[71]. Пры гэтым улічваецца спецыфіка носьбіта, прадстаўленай інфармацыі, тэматыка і інш. У практычнай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці яна шырока выкарыстоўваюцца і, часам, асаблівасці гэтага выкарыстання і ўплываюць на ужыванне таго ці іншага тэрміна. Можна заўважыць, што, часам, падыходы, якія ўсталяваліся ў дачыненні да друкаванай ці картачнай бібліяграфічнай прадукцыі, пераносяцца на электронную (напрыклад, тэрмін “электронная картатэка”). Вышэй сказанае сведчыць аб тым што у электронным асяроддзі вядзецца інтэнсіўная бібліяграфічная дзейнасць і яно абумоўлівае не толькі выкананне спецыфічных працэсаў, стварэнне і выкарыстанне якасна новых сродкаў, але і істотныя змены на ўзроўні аб’ектаў, суб’ектаў дзейнасці, устанаўліваемых мэтаў і вынікаў. Гэта выдзяляць электронную бібліяграфію ў якасці асобнага віда, , які рэалізуецца ў электронным асяроддзі і прадугледжвае стварэнне, распаўсюджванне і выкарыстанне бібліяграфічнай інфармацыі на аснове лічбавых тэхналогій.

**Вывады.** Відавая класіфікацыя – складаная навуковая праблема. Від бібліяграфіі – курунак бібліяграфічнай дзейнасці вызначаны аднолькавымі класіфікацыйнымі прыметамі. У якасці такіх прымет (падстаў) могуць быць: арганізацыйна-ведамасная прымета, аднароднасць ствараемай і

[71] Электронные документы: создание и использование в публичных библиотеках: справ. / науч. ред. Р.С.Гиляревский, Г.Ф.Гордукалова. – СПб., 2007. – С.18-130; Земсков А.И. Электронная информация и электронные ресурсы: публикации и документы, фонды и библиотеки / А.И. Земсков, Я.Л. Шрайберг. – М., 2007. – С.129-154; Столяров Ю.Н. Библиотековедение, библиографоведение и книговедение как единая научная специальность. – Орел, 2007. – С. 109–122; Зиновьева Н.Б. Основы современной библиографии. –М., 2007. – С.43–51; Справочник информационного работника / Науч. ред. Р.С.Гиляревский, В.А.Минкина. 2-е изд., перераб. и доп. – СПб., 2007. – С.104-110; Фокеев, В.А. Библиографическая наука и практика : терминологический словарь / В. А. Фокеев. – СПб., 2008. – С. 263–265; Библиотечная энциклопедия / Рос. гос. б-ка. – М., 2007. – С. 1189; Воройский, В.С. Информатика. Энциклопедический словарь-справочник: введение в современные информационные и телекоммуникационные технологии в терминах и фактах. – М., 2006. – С. 23–24,26–27 і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распаўсюджваемай бібліяграфічнай прадукцыі, характар і асяроддзе дзейнасці. Не гледзячы на выразнасць характарыстык асобных відаў бібліяграфіі, у практычнай дзейнасці яны цесна звязаны паміж сабой, ствараецца бібліяграфічная прадукцыя, якая адначасова як вынік працэса бібліяграфавання адносіцца да розных відаў бібліяграфіі (навукова-дапаможныя рэтраспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі, бягучыя тэматычныя бібліяграфічныя дапаможнікі і да т.п.)

# Р А З Д З Е Л  I I I.

# БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА – НАВУКА АБ БІБЛІЯГРАФІІ

## 3.1. Бібліяграфазнаўства як сістэма навуковых ведаў

### *Бібліяграфазнаўства як навуковая дысцыпліна*

Бібліяграфія як галіна грамадскай дзейнасці знаходзіцца сёння на дастаткова высокім узроўні развіцця і ўключае, як было паказана вышэй, практычную і пазнавальную часткі. Неад'емнай часткай апошняй (пазнавальнай) складаючай з'яўляюцца навуковая бібліяграфічная дзейнасць (дзейнасць па фарміраванні і развіцці навуковых ведаў аб бібліяграфіі) і сістэма ведаў аб бібліяграфіі. З іх і складаецца бібліяграфазнаўства – навука аб бібліяграфіі.

Згодна апошняга тэрміналагічнага стандарту "Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія" (Мінск, 2004) бібліяграфазнаўства – гэта такая "навуковая дысцыпліна, якая вывучае тэорыю, гісторыю, метадалогію, тэхналогію, методыку, арганізацыю бібліяграфіі"[72]. У межах гэтага азначэння пералічаны ўсе асноўныя сучасныя аспекты вывучэння бібліяграфіі як кірунка грамадскай практыкі чалавека. У той жа час можна скіраваць увагу не на аспекты, якія аднолькава выдзяляюцца для шэрагу навуковых дысцыплін (азначэнні могуць у такім выпадку адрозніівацца толькі ўказаннем аб'екта, які, напрыклад, як у вышэй прыведзеным азначэнні не раскрываецца), а на сутнасць

[72] *СТБ ГОСТ 7.0-2004.* СИБИД. Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія: тэрміны і азначэнні. – Мінск, 2004. – С.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'екта вывучэння і спецыфіку навукова-пазнавальнай часткі бібліяграфічнай дзейнасці. У такім выпадку пад бібліяграфазнаўствам, на наш погляд, трэба разумець навуковую дысцыпліну, якая выпрацоўвае сістэму ведаў аб бібліяграфіі як грамадскай з'яве, сутнасці бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічных ведаў), заканамернасцях іх стварэння і выкарыстання. Прадметам бібліяграфазнаўства з'яўляюцца бібліяграфічныя сувязі і адносіны ў сістэме тэкставых камунікацый, функцыі, законы, прынцыпы, змест і формы бібліяграфіі, структурныя кампаненты бібліяграфічнай дзейнасці, заканамернасці вытворчасці, пошука, распаўсюджвання, выкарыстання бібліяграфічнай інфармацыі (ведаў).

Галоўным прызначэннем навукі як сацыяльнага інстытута з'яўляецца стварэнне і распаўсюджванне навуковых ведаў, выпрацоўка сродкаў і метадаў даследавання, фарміраванне навуковага кадравага патэнцыялу. Таму адказнасць бібліяграфазнаўства як асобнага кірунка навуковай сферы па ўсіх названых пазіцыях тычыцца вельмі значнай і няпростай інфармацыйнай інфраструктуры, якой з'яўляецца бібліяграфія. Яго развіццё цесна звязана з усімі навуковымі дысцыплінамі, аб'ект увагі якіх звязаны з фіксаванымі тэкстамі, іх стварэннем, аналізам, распаўсюджваннем. Гэта кнігазнаўства, бібліятэказнаўства, інфарматыка, архівазнаўства, дакументалогія, гістарыяграфія, археаграфія і інш.

Бібліяграфазнаўства скіравана на вытворчасць новых навуковых ведаў. Як кожная навука яна ўключае шэраг асноўных элементаў. У прыватнасці, навукоўцаў, якія маюць, выкарыстоўваюць і ствараюць адпаведныя веды, валодаюць пэўнымі здольнасцямі, працуюць з улікам раздзялення працы згодна тэматыкі даследаванняў, узроўню іх складанасцей. Яны павінны пастаянна пацвярджаць сваю навуковую кваліфікацыю праз навуковыя публікацыі, грамадскае прызнанне, атрыманне навуковых званняў, ступеней.

У бібліяграфазнаўстве як і ў межах іншых навуковых дысцыплін ствараюцца навуковыя структуры (навуковыя і навукова-педагагічныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калектывы: спецыяльныя кафедры вышэйшых навучальных устаноў, у межах якіх здзяйсняецца падрыхтоўка бібліёграфаў, навукова-даследчыя аддзелы бібліятэк, інфармацыйных устаноў). У межах навукі існуюць таксама навуковыя школы, якія ўяўляюць сабой разнавіднасць навуковай структуры, якую ўзначальвае выдатны навуковец, яго ідэі становяцца пануючымі на працягу значнага перыяду часу, актыўна распрацоўваюцца паслядоўнікамі, могуць аб'ядноўвацца адной даследчыцкай праграмай, адзінымі падыходамі, навуковым стылем. Часам выказваюцца меркаванні, што ў бібліяграфазнаўстве адсутнічаюць навуковыя школы. У разуменні "класічная" навуковая школа – сапраўды, а ў якасці сучасных "дысцыплінарных", на нашу думку, можна навуковую школу А.П.Коршунава, погляды якога актыўна распрацоўваліся на бібліяграфічных кафедрах вышэйшых навучальных устаноў савецкай і постсавецкай прасторы, у Беларусі – навуковую школу В.Е.Лявончыкава.

У бібліяграфазнаўстве распрацоўваюцца і/ці выкарыстоўваюцца метады навукова-даследчай работы, ствараецца паняційны апарат (тэрмінасістэма), а таксама арганізуецца сістэма навуковай інфармацыі, якая забяспечвае навуковыя камунікатыўныя працэсы. Прымяненне пэўных навуковых метадаў[73] ў бібліяграфазнаўстве абумоўлена як прыналежнасцю яго да навуковай сферы наогул, так і яго ўласнай спецыфікай. Таму могуць выкарыстоўвацца філасофскія метады (дыялектычны, аналітычны, фенаменалагічны і іншыя), якія вызначаюць самыя агульныя параметры, рэгулятывы даследаванняў; агульнанавуковыя метады і падыходы (аксіяматычны, дэдуктыўны, індуктыўны, апісальны, эксперымент, параўнальны аналогіі, мадэліравання і іншыя), якія ў сваю чаргу падзяляюцца на эмпірычныя і тэарэтычныя; прыватнанавуковыя метады, прымяненне здзяйсняецца толькі ў межах асобнай навукі (у бібліяграфазнаўстве – бібліяметрычны і інш.). Іх правільны выбар і

[73] Навуковы метад – гэта сістэма прынцыпаў і прыёмаў, пры дапамозе якіх дасягаецца аб'ектыўнае пазнанне рэчаіснасці і ствараюцца новыя навуковыя веды.

паслядоўнае прымяненне спрыяе атрыманню тэарэтычных вынікаў высокага ўзроўню.

Тэрмінасістэма ці вербальны комплекс бібліяграфазнаўства ўяўляе сабой арганізаваную сукупнасць тэрмінаў (паняццяў і іх азначэнняў), з дапамогай якой адбываецца апісанне і ідэнтыфікацыя сутнасных аб’ектаў бібліяграфіі, яе суб’ектаў, дзеянняў, ствараемай прадукцыі. Яна ствараецца на працягу ўсяго перыяду развіцця навукі. З’яўляюцца новыя элементы ў бібліяграфічнай дзейнасці і адпаведна ім ці элементам, якія яны ўключаюць даюцца і тлумачацца новыя найменні (напрыклад, у канцы ХХ ст. – нарматыўныя / аўтарытэтныя запісы, электронныя каталогі), карэктуюцца іх сувязі і адносіны з ранейшымі (чытач – спажывец – карыстальнік, кніга – твор друку – дакумент). Могуць надавацца новыя сэнсы раней усталяваным і, на першы погляд, бясспрэчным і бездакорным тэрмінам (напрыклад, тэрміну бібліяграфія). Фарміранне тэрмінасістэмы бібліяграфазнаўства здзяйсняецца пад уплывам шэрагу навуковых дысцыплін, асабліва сумежных (бібліятэказнаўства, кнігазнаўства, інфарматыкі, тэорыі інфармацыі і сацыяльных камунікацый, дакументалогіі і інш.) і адпаведных сфер практычнай дзейнасці. Пералік тэрмінаў пастаянна карэктуецца, часам нельга правесці мяжу паміж тэрмінам з бібліяграфазнаўства і з іншай навуковай дысцыпліны. В.А.Факееў лічыць, што на сярэдзіну 2000-х гг. іх колькасць складала больш за 500[74] ныя паказчыкі пастаянна

У развіцці тэрмінасістэмы бібліяграфазнаўства, як і навукі наогул, назіраюцца як пэўныя адвольныя, так і рэгулюемыя працэсы. Могуць стыхійна стварацца і/ці ўжывацца паняцці, якіх не было раней у гэтай навуковай сферы, і якія з цягам часу могуць нармалізоўвацца і ўключацца ў слоўнікі і даведнікі ці адыходзіць у нябыт. Адбываецца таксама навуковае самакіраванне тэрмінасістэмай: у навуковых артыкулах і манаграфіях, дысертацыях, часам

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

[74] *Фокеев, В.А.* Библиография: теоретико-методологические основания: учебное пособие для системы дополнительного библиотечно-информационного образования / В. А. Фокеев. – СПб., 2006. – С. 73.

вучэбных дапаможніках параўноваюцца аб'ёмы асобных паняццяў, даюцца каментарыі, абгрунтоўваюцца новыя падыходы да іх азначэння; у энцыклапедыях, слоўніках і даведніках замацоўваюцца найбольш распаўсюджаныя і ўсталяваныя тэрміны, а сама тэрмінасістэма прадстаўлена ў найбольш канцэнтраваным выглядзе). Кіраванне здзяйсняецца і на дзяржаўным і міждзяржаўным узроўнях: найбольш значымая і ўжывальная частка тэрмінасістэмы замацоўваецца (адназначна тлумацца) ў тэрміналагічных, тэхналагічных стандартах.

У бібліяграфазнаўстве, нават на пачатковых этапах яго развіцця, калі ў межах бібліяграфічнай практычнай дзейнасці адбывалася абагульненне вопыту, выпрацоўка метадычных падыходаў да стварэння бібліяграфічнай прадукцыі і да т.п., адбывалася накапленне навуковых ведаў, якія выступаюць у якасці прадумовы, сродка і выніка бібліяграфічнай навуковай дзейнасці і спрыяюць прагназаванню дзейнаці ў цэлым і асобных яе кірунках. Асаблівасць навуковых ведаў бібліяграфазнаўства праяўляецца праз глыбокае пранікненне ў сутнасць бібліяграфіі як грамадскай з'явы і асобных яе элементаў. Ім уласціва абгрунтаванасць вывадаў, сістэмнасць, магчымасць вопытнага падцвярджэння, абстрактна-лагічныя формы, даставернасць, дынамічнасць, абнаўляемасць.

### ***Функцыі бібліяграфазнаўства***

Бібліяграфазнаўства знаходзіцца ў вельмі цеснай сувязі з бібліяграфічнай практычнай дзейнасцю, абапіраецца на яе, спрые яе развіццю і, наадварот, у значнай ступені абумоўлена асаблівасцямі і ўзроўнем развіцця бібліяграфічнай практыкі. Але разам з тым бібліяграфазнаўству ўласцівы свае спецыфічныя функцыі, законы, логіка пазнання, правядзення даследаванняў і прадстаўлення іх вынікаў, навуковыя паняцці і катэгорыі, а таксама сувязі паміж імі.

Бібліяграфазнаўства выконвае ў дачыненні да бібліяграфічнай дзейнасці шэраг функцый:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– пазнавальна-тлумачальную (у межах бібліяграфазнаўства вызначаюцца, аналізуюцца бібліяграфічныя з’явы, выяўляецца і тлумачыцца іх сутнасць, паказваюцца асаблівасці развіцця і прычынна-выніковыя сувязі);

– кумулятыўна-інфармацыйную (у яго межах адбываецца накапленне і перадача навуковай інфармацыі (ведаў);

– сінтэзуючую (бібліяграфазнаўства займаецца стварэннем (сінтэзам) новых ведаў на аснове раней створаных і даных бібліяграфічнай практычнай дзейнасці);

– культурна-светапоглядную (бібліяграфазнаўства дапамагае не толькі павялічыць і растлумачыць вядомыя ў яго межах навуковыя веды, але і ўключыць іх цэласную сістэму навуковых ведаў, разглядзець з’явы свету (з’явы культуры ў першую чаргу) у іх адзінстве і разнастайнасці, выпрацаваць свой светапогляд);

– эўрыстычную (у межах бібліяграфазнаўства адкрываюцца новыя з’явы, сувязі, заканамернасці, шляхі і кірункі развіцця бібліяграфіі ў грамадстве),

– прагнастычная (прагнозная) (бібліяграфазнаўства паказвае шляхі і перспектывы развіцця бібліяграфіі ў цэлым, асобных яе частак з мэтай прадугледжвання паслядоўнасці змены бібліяграфічных з’яў і магчымых наступстваў).

### *Структура бібліяграфазнаўства*

На сучасным этапе ўзроўні развіцця бібліяграфазнаўства ў яго межах можна выдзеліць дзве асноўныя часткі: агульнае і прыватнае бібліяграфазнаўства. Агульнае займаецца праблемамі, якія адносяцца да бібліяграфіі ў цэлым, прыватнае – да асобных выразна вылучаемых частак (галіновае бібліяграфазнаўства, бібліяграфічнае крыніцазнаўства і інш.). Такія прапановы сустракаюцца ў працах А.П.Коршунава і, на наш погляд, на іх мэтазгозна абапірацца ў паказе структуры бібліяграфазнаўства і яго ўнутраных і знешніх сувязей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М.Г.Вохрышава сцвярджае, што ў развіцці бібліяграфазнаўства, як у любой іншай навуцы, назіраецца спалучэнне дзвюх тэндэнцый: дыфферэнцыяцыі і інтэграцыі ведаў, што абумоўлівае, з аднаго боку, выдзяленне ў межах бібліяграфазнаўства прыватных дысцыплін, а з другога – іх узаемасувязь, узаемапранікненне зместу і метадаў, капмплексіраванне. У канцы XX – пачатку XXI стст. Фарміруюцца камплікатыўныя дысцыпліны, ў межах якіх даследуецца круг пытанняў звязаных са спецыфікай бібліяграфічнай дзейнасці ў спецыяльным і галіновым планах – спецыяльнае бібліяграфазнаўства і галіновае бібліяграфазнаўства.

Неабходна адзначыць, што ў дачыненні да галіновага бібліяграфазнаўства (тэарэтыка-метадалагічная база галіновай бібліяграфіі) выказваюцца розныя меркаванні. Згодна адных, што галіновае бібліяграфазнаўства з’яўляецца раней нераспрацаванай часткай агульнага бібліяграфазнаўства і звязана з ім як частка – цэлае. Згодна другіх, гэта самастойны кірунак бібліяграфічных даследаванняў, звязаных з агульным па прынцыпе дапаўняльнасці. Сапраўды, галіновая бібліяграфія і галіновае бібліяграфазнаўства як яе навуковая дысцыпліна цесна звязаны не толькі з бібліяграфіяй як грамадскай з’явай і бібліяграфазнаўствам, але і з абслугоўваемымі сферамі грамадскай практыкі і адпаведнымі навукамі. Асабліва гэта тычыцца гісторыі і філалогіі, у межах якіх такая сувязь выявілася ў стварэнні спецыяльных гістарычнай і філалагічнай навуковых дысцыплін: гістарычная бібліяграфія і літаратурная бібліяграфія. Зразумела, што гэта выключныя бібліяграфічныя комплексы, якія ўключаюць не толькі змястоўна скіраваную частку вынікаў бібліяграфічнай дзейнасці, а і бібліяграфічнае адлюстраванне і адпаведна асэнсаванне дакумента як часткі гісторыка-культурнага ці літаратурнага працэсу і адпаведна большасць ці істотную частку крыніц рэпертуарнай бібліяграфіі. Тым не менш, нават гэта не дае падстаў выдзяляць галіновае бібліяграфазнаўства ў асобны самастойны кірунак. Гэта частка бібліяграфазнаўства, якая выдзелена па змястоўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прымеце, для якой характэрна прымяненне аднолькавых асноўных катэгорый, прынцыпаў, сутнасных структурных кампаненнтаў.

М.Г.Вохрышава выдзяляе ў межах бібліяграфазнаўства такія буйныя камплікатыўныя дысцыпліны як адрасатнае бібліяграфазнаўства (вывучэнне бібліяграфічных патрэбнасцей і спосабаў іх задавальнення) і дакументнае бібліяграфазнаўства (вывучэнне спосабаў бібліяграфічнай перапрацоўкі дакументаў, іх асобных відаў, тэхналогію стварэння і давядзення да карыстальнікаў бібліяграфічнай інфармацыі).

У сістэму камплікатыўных дысцыплін арганічна ўпісваецца (В.А.Факееў) рэгіянальнае бібліяграфазнаўства, якое аб'ядноўвае ўсе кірункі бібліяграфічных даследаванняў па тэрытарыяльнай прымеце (ад асобных населенных пунктаў да кантынентаў, у т.л. і самыя распрацаваныя часткі краіназнаўчае, краязнаўчае бібліяграфазнаўства). Ёсць іншыя прапановы, якія скіраваны на дэталізацыю аб'ектаў бібліяграфазнаўства, сувязь яго з іншымі сферамі навуковай дзейнасці і ўтварэнне адпаведных дысцыплін ці раздзелаў (напрыклад, каталогазнаўства). На наш погляд, гэта немэтазгодна і гэтым нельга замяняць аб'ектную дыферэнцыяцыю бібліяграфазнаўства, на аснове якой могуць фарміравацца камплікатыўныя дысцыпліны, але ў большасці сваёй ствараюцца асобныя тэматычныя кірункі даследаванняў.

Аб'ектам бібліяграфазнаўства можа выступаць як бібліяграфія ў цэлым, так і любая яе састаўная частка (напрыклад, віды бібліяграфіі, бібліяграфічныя працэсы, віды бібліяграфічнай прадукцыі і інш.), а таксама асобныя бібліяграфічныя з'явы.

Практычна любы з аб'ектаў бібліяграфазнаўства можна разглядаць у розных аспектах ці іх сукупнасці. А.І.Барсуком і А.П.Коршунавым была прапанавана аспектная дыферэнцыяцыя бібліяграфазнаўства, згодна якой вылучалася 4 адносна самастойныя навуковыя дысцыпліны: тэорыя бібліяграфіі, гісторыя бібліяграфіі, методыка бібліяграфіі, арганізацыя бібліяграфіі (гл. падрабязней Коршунов, О.П. Библиографоведение: Общий

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

курс: Учебник. – М., 2001. – С.117–123). У канцы 1970-х гг. О.В.Янонісам[75] было выказана меркаванне аб мэтазгоднасці лічыць пятым раздзелам бібліяграфазнаўства метадалогію. Э.К.Беспалава падтрымлівае такі падыход і лічыць, што не гледзячы на ўскладненне такім чынам структуры бібліяграфазнаўства, гэта неабходна ў сувязі з вядучым значэннем метадалогіі для ўсіх раздзелаў навуковых ведаў[76]. У пералік аспектаў бібліяграфазнаўства неабходна дадаць і тэхналогію, развіццё і значнасць якой на сучасным этапе з'яўляюцца вельмі інтэнсіўнымі і ўплывовымі. Адпаведна гэтым аспектам у межах бібліяграфазнаўства можна выдзеліць метадалогію, тэорыю, гісторыю, методыку, тэхналогію і арганізацыю бібліяграфіі.

Метадалогія бібліяграфіі – раздзел бібліяграфазнаўства, у межах якога даследуецца сістэма парадыгм, канцэпцый, падыходаў, законаў, прынцыпаў вывучэння бібліяграфіі як грамадскай з'явы, метадаў навуковай бібліяграфічнай дзейнасці.

Тэорыя бібліяграфіі – сістэма навуковых ведаў аб сутнасці, законах, заканамернасцях, уласцівасцях, структуры і іншых катэгорыях бібліяграфіі як грамадскай з'явы.

Гісторыя бібліяграфіі – раздзел бібліяграфазнаўства, у межах якога даследуецца ўзнікненне бібліяграфіі і яе развіццё на розных гістарычных этапах.

Методыка бібліяграфіі – сукупнасць прынцыпаў, метадаў, прыёмаў, спосабаў і правіл, з дапамогай якіх рэалізуюцца практычныя намаганні суб'екта па стварэнні, пераўтварэнні і давядзенні бібліяграфічнай інфармацыі да карыстальніка.

Тэхналогія бібліяграфіі – сукупнасць працэдур, якія рэалізуюцца у межах бібліяграфічнай практыкі і з дапамогай якіх на аснове комплекса тэхналагічных

[75] Цыт. па Беспалава Э.К. Формирование библиографической мысли в России (до 60-х гг. XIX ст.) : учеб. пособие. – СПб., 2007. – С. 33.

[76] *Беспалава, Э.К.* Формирование библиографической мысли в России (до 60-х гг. XIX ст.) : учеб. пособие. – СПб., 2007. – С. 35.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сродкаў забяспечваецца стварэнне, пераўтварэнне і давядзенне бібліяграфічнай інфармацыі да карыстальніка.

Арганізацыя бібліяграфіі – раздзел бібліяграфазнаўства, у межах якога распрацоўваецца шляхі і сродкі структурыравання (упарадкавання), планавання, аптымізацыі бібліяграфічнай дзейнасці, кіравання ёю ў цэлым і асобнымі бібліяграфічнымі працэсамі.

У працэсуальным плане бібліяграфазнаўства ў цэлым, любую камплікатыўную дысцыпліну, яе раздзел можна разглядаць як навуковую дзейнасць, асноўнымі кампанентамі якой з’яўляюцца:

– суб’ект (фізічная ці юрыдычная асоба, якая займаецца навуковай бібліяграфічнай дзейнасцю – ўпарадкаваннем створаных раней і генерыраваных новых ведаў аб вывучаемым прадмеце – бібліяграфіі ў цэлым ці любой яе частцы, з’яве);

– мэта (пажаданая мадэль вынікаў навуковай бібліяграфічнай дзейнасці – стварэнне новых навуковых ведаў аб бібліяграфіі і спрыянне тым самым яе паступальнаму развіццю і ўзвышэнню ролі як грамадскай з’явы);

– аб’ект (бібліяграфічная дзейнасць (бібліяграфія) ў цэлым, любая бібліяграфічная з’ява (кірунак дзейнасці, працэс, прадукцыя і інш.), сувязі, адносіны, якія даследуюцца ў межах бібліяграфазнаўства);

– працэсы (вытворчасць новых навуковых ведаў, захаванне і трансляцыя накопленых навуковых ведаў, актуалізацыя раней створаных навуковых ведаў аб вывучаемых прадметах – бібліяграфіі ў цэлым ці любой яе частцы; спажыванне ведаў у адпаведнасці з прафесійнымі патрэбнасцямі);

– сродкі (матэрыяльныя і ідэальныя) бібліяграфазнаўства (метады: філасофскія, агульнанавуковыя і інш.; абнародванне ідэй на навуковых канферэнцыях, семінарах і да т.п.; навуковыя апублікаваныя і неапублікаваныя працы; тэхналогіі; бібліяграфічная прадукцыя як сродак рэалізацыі навуковых ідэй і інш.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– рэзультаты навуковай бібліяграфічнай дзейнасці (сукупнасць атрыманых раней і ствараемых зараз бібліяграфазнаўчых ведаў, рэалізаваных у парадыгмах, канцэпцыях, тэорыях, ідэях, гіпотэзах і да т.п. і прадстаўленых у форме справаздач аб навукова-даследчых распрацоўках, навуковых артыкулах, манаграфіях, дысертацыях, навукова-метадычных матэрыялах, рэкамендацыях, выступленнях, а таксама ў шэрагу жанраў бібліяграфічных дапаможнікаў, навукая складаючая якіх вельмі значная, і інш.

**Вывады.** Бібліяграфазнаўства ўяўляе сабой сістэму ведаў аб бібліяграфіі і дзейнасці па яе фарміраванні і развіцці. У дачыненні да бібліяграфічнай дзейнасці выконвае пазнавальна-тлумачальную, кумулятыўна-інфармацыйную, сінтэзуючую, культурна-светапоглядную, эўрыстычную і прагнастычную функцыі. У межах бібліяграфазнаўства назіраецца дыфферэнцыяцыя і інтэграцыя ведаў і адпаведна выдзяляюцца прыватныя і капмплікатыўныя дысцыпліны і асобныя раздзелы бібліяграфазнаўства.

Асноўнымі кампанентамі бібліяграфазнаўства як дзейнасці па вытворчасці навуковых ведаў з'яўляюцца суб'екты, аб'екты, мэты, працэсы, сродкі, рэзультаты навуковай бібліяграфічнай дзейнасці.

## 3.2. Развіццё бібліяграфазнаўства на сучасным этапе

### *Парадыгма як навуковая з'ява ў бібліяграфазнаўстве*

Бібліяграфазнаўства ў сваім развіцці прайшло ад абагульнення асобных даных бібліяграфічнай практыкі да стварэння цэласных канцэпцый. Найбольш інтэнсіўна яно развівалася з сярэдзіны 1950-х гг. у Савецкім Саюзе (з пачатку 1990-х гг. – у краінах постсавецкай прасторы) на спецыяльных (бібліяграфічных) кафедрах вышэйшых навучальных устаноў, буйных бібліятэках, кніжных палатах. Вядучыя навуковыя канцэпцыі былі распрацаваны ва ўстановах, якія мелі агульнасаюзны ўзровень, а пазней – пераважна навукоўцамі з Расійскай Федэрацыі.

Беларускае бібліяграфазнаўства бярэ свой пачатак з XVIII ст., калі ў Віленскім універсітэце А.Багаткевічам быў распрацаваны і чытаўся курс

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Усеагульная бібліяграфія”, а ў канцы 1829 г. у “Дзённіку віленскім” ім быў апублікаваны адпаведны артыкул, у 1830 г. асобна – “Прамова аб усеагульнай бібліяграфіі…”. Амаль за два стагоддзі, не гледзячы на складанасці сацыяпалітычнага жыцця і неспрыяльныя ўмовы для развіцця самага моцнага звяна бібліяграфічнай дзейнасці – нацыянальнай бібліяграфіі і, адпаведна, стымула актыўнай навуковай працы – былі зроблены значныя дасягненні ў распрацоўцы тэрмінасістэмы бібліяграфазнаўства, асэнсаванні сутнасці рэгіянальнай бібліяграфіі, яе асобных рэсурсна-бібліяграфічных сістэм. Найбольш значнымі і вядомымі з беларускага бібліяграфазнаўства XX ст. з’яўляюцца працы І.Б.Сіманоўскага, М.Ц.Талкачова, В.Е.Лявончыкава, Р.М.Чыгіровай, В.А.Факеева (1970-я – пачатак 1980-х гг.), Т.М.Сакаловай, В.І.Саітавай, В.А.Касап і інш. Асноўны блок навуковых прац, створаных у беларускім бібліяграфазнаўстве ў апошняе 30-годдзе, зроблены ў русле дакументаграфічнай канцэпцыі бібліяграфіі як грамадскай з’явы.

Навукоўцы выдзяляюць некалькі асноўных этапаў развіцця расійскага бібліяграфазнаўства (гл. падрабязней Фокеев В.А. Библиография: теоретико-методологические исследования. – СПб., 2006. – С.21–23.), якія па сутнасці можна з нязначнымі карэктыроўкамі транспаліраваць на ўсходнееўрапейскае ў цэлым.

Асноўныя этапы развіцця бібліяграфазнаўства можна суадносіць са зменай парадыгм. Парадыгма – гэта фундаментальныя прынцыпы паняцці, афармленыя ў адносна самастойныя канцэпцыі, тэорыі, якія становяцца пануючымі на пэўным этапе развіцця навукі. У пачатку 1990-я гг. у межах дыскусіі на старонках часопіса “Советская библиография” было выказана некалькі поглядаў на развіццё бібліяграфазнаўства і парадыгм. Э.К. Беспалава сцвярджала, што няма падстаў для вызначэння парадыгм у бібліяграфазнаўстве, т.ш. гэта катэгорыя толькі навуковая. Змена парадыгмы азначае з’яўленне новай метадалогіі, новага навуковага светапогляду. У бібліяграфазнаўстве не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ставілася пытанне аб бібліяграфічным светапоглядзе, аб навуковаўтваральных фактарах.

Клапіюк У.Т. лічыў, што бібліяграфазнаўства ў сваім развіцці прайшло дзве парадыгмы (кнігазнаўчая і дакументаграфічная), а ў канцы XX ст. зараджаецца трэцяя – культуралагічная. Факееў В.А. сцвярджаў, што за апошнія 200 год бібліяграфазнаўства прйшло 3 парадыгмы (навукова-кнігазнаўчая ці пазнавальная, дапаможна-ідэалагічная ці каштоўнасна-арыенціровачная, інфармацыйна-дзейнасная (інфармацыйна-камунікатыўная ці дапаможна-інфармацыйная)) і ў 90-я гг. XX ст. актыўна развіваецца 4-я – культуралагічная. Змены парадыгмаў здзяйсняюцца паступова, кожная з парадыгмаў нараджаецца ў межах папярэдняй, некаторы час развіццё ідзе паралельна, потым сукупнасць поглядаў, якія фарміруюцца ў межах новай парадыгмы пачынае пераважаць, становіцца дамінуючай і паступова новая парадыгма выцясняе папярэднюю.

***Змена парадыгм у бібліяграфазнаўстве***

Навукова-кнігазнаўчая парадыгма ў бібліяграфазнаўстве пачала фарміравацца з канца XVIII, актыўна распрацоўвалася з XIX ст і існавала да пачатку XX ст. У яе межах распрацоўваліся розныя тэарэтычныя, метадычныя падыходы, фарміраваліся навуковыя школы, якія аб'ядноўвала выснова – "бібліяграфія – гэта навука, якая вывучае кнігу". Разам з тым, у шэрагу работ, створаных у гэты перыяд, выказваліся меркаванні аб ацэначных аспектах бібліяграфіі як грамадскай з'явы. У сярэдзіне XIX ст. мела месца першая дыскусія аб грамадскім прызначэнні бібліяграфіі і выказаны два розныя падыходы: асветна-педагагічны (бібліяграфія аказвае дапамогу чытачу ў выбары лепшых, на думку бібліёгра, кніг) і навукова-фармалістычная (бібліяграфія павінна быць скіравана на складанне поўных і дакладных спісаў існуючых кніг і іх сістэматызацыю). Развіццё першага падыхода, узмоцненае ў пачатку XX ст. сацыяльна-палітычнымі фактарамі, абумовіла фарміраванне і інтэнсіўнае развіццё ў сярэдзіне XX ст. (1920–1950 гг.) дапаможна-ідэалагічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ці каштоўнасна-арыенціровачнай парадыгмы, у межах якой бібліяграфія разглядалася як галіна ідэйна-выхаваўчай і навукова-дапаможнай дзейнасці. У гэты перыяд было зроблена шэраг навуковых абагульненняў, вызначылася размежаванне паміж савецкім і замежным бібліяграфазнаўствам, савецкая бібліяграфія разглядалася як бібліяграфія новага тыпу, дапаможная навуковая дысцыпліна, якая вывучае творы друку з пункту гледжання магчымасці актыўнага садзейнічання іх выкарыстанню[77].

З сярэдзіны 1950-х гг. пачалі выказвацца якасна новыя погляды на бібліяграфію як грамадскую з'яву, якія актыўна развіваліся да 1970-х і сфарміравалі інфармацыйна-дзейнасную парадыгму, росквіт якой прыходзіцца на сярэдзіну 1970-х – 2000 гг. і доўжыцца да сённяшняга часу. У яе межах вядучымі катэгорыямі стала інфармацыя (а не веды), дакумент, спажывец, камунікацыі. Бібліяграфія кваліфікавалася як галіна інфармацыйнай дзейнасці, а не навука аб кнізе. Асноўнае дасягненне ў межах гэтай парадыгмы – распрацоўка А.П.Коршунавым інфармацыйна-дакументаграфічнай (сістэмна-дзейнаснай) канцэпцыі бібліяграфіі як грамадскай з'явы. Разам з тым, у гэты перыяд сталі фарміравацца іншыя падыходы да разгляду сутнасці бібліяграфіі, з'яў якія яна ахоплівае. З'явілася шэраг манаграфій, дысертацый, у межах якіх абгрунтоўваліся асобныя канцэпцыі (манаграфія Ю.С.Зубава “Библиография и художественное развитие личности» (1979 г.), працы М.Г.Вохрышавай “Библиографическая деятельность: структура и эффективность” (1989), “Библиография в системе культуры” (1990), “Теория библиографии” (2004), Н.А.Слядневай “Библиография в системе Универсума человеческой деятельности” (1993), В.А.факеева “Природа библиографического знания” (1995), Л.В.Астахавай “Библиография как научный феномен” (1997) і інш. Яны заклалі асновы кагнітыўна-культуралагічнай ці ноо-культуралагічнай парадыгмы, якая актыўна развіваецца на сучасным этапе. Яна заснавана на поліметадалагізме, поліканцептуальнасці, абагульненні вопыту выкарыстання

[77] *Брискман М.А.* Введение в библиографию. – М., 1954. – С. 8.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

электронных тэхналогій, развіцця інфармацыйна-бібліяграфічнага сегмента электроннога асяроддзя[78].

Вядучымі тэндэнцыямі сучаснага этапа развіцця бібліяграфазнаўства з'яўляюцца:

– умацаванне гуманістычных і гуманітарных асноў бібліяграфазнаўства;

– умацаванне інтэграцыйных навуковых працэсаў;

– "поліканцэптуальнасць, талерантнасць прадстаўнікоў розных канцэптуальных школ, адмежаванне ад былой тэарэтычнай непрыязнасці"[79];

– актыўнае развіццё тэхналагічнага раздзела бібліяграфазнаўства;

– наяўнасць развітага тэарэтычнага раздзела бібліяграфазнаўства;

– імкненне асэнсаваць дасягненні навукі розных краін;

– выдзяленне круга бібліёграфаў-лідэраў і інш.

***Асноўныя сучасныя канцэпцыі бібліяграфазнаўства***

На сёняшні дзень у бібліяграфазнаўстве існуе некалькі альтэрнатыўных канцэпцый. Гэта цікавыя арыгінальныя сістэмы поглядаў на бібліяграфію (бібліяграфічную дзейнасць), яе ролю для грамадства ў межах яго сацыякультурнага, навуковага і інтэлектуальнага развіцця. Некаторыя з прыведзеных ніжэй канцэпцый актыўна развіваюцца ў навуковых публікацыях, абмяркоўваюцца на навуковых мерапрыемствах, у прафесійным друку. Яны прааналізаваны і структурыравана прадстаўлены ў працах вядомага і самага плённага бібліяграфазнаўцы сучаснасці В.А.Факеева, які з'яўляецца не толькі стваральнікам когнітаграфічнай канцэпцыі бібліяграфіі як грамадскай з'явы, а і аўтарам шэрагу вучэбных дапаможнікаў, тэрміналагічных слоўнікаў.

*Дакументаграфічная (інфармацыйна-дакументаграфічная) канцэпцыя*

---

[78] *Фокеев, В.А.* Библиография: теоретико-методологические основания: учеб. пособие. – СПб., 2006. – С.53–54.

[79] Тамжа. – С. 54.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацоўваецца А. П. Коршунавым з сярэдзіны 1970-х гг. Сустракаюцца назвы дакументаграфічная, інфармацыйна-дакументаграфічная, сістэмна-дзейнасная, сістэмна-інфармацыйная, інфармацыйна-дзейнасная канцэпцыя.

Свою назву яна атрымала па вядучых метадычных і тэарэтычных катэгорый: “інфармацыя“, “дакумент“, “дзейнасць”, “сістэмна-дзейнасны падыход“.

Метадалагічная аснова канцепцыі – навуковы метад (спосаб) тэарэтычнага ўзнаўлення бібліяграфіі: рух ад канкрэтнага да абстрактнага.

Вядучая катэгорыя – бібліяграфічная (другасная) інфармацыя, якая з’яўляецца крытэрыем адмежавання бібліяграфных з’яў ад любых іншых, а таксама сродак и прамежкавы вынік бібліяграфічнай дзейнасці.

У яе межах бібліяграфія разумеецца як галіна дакументальна-інфармацыйнай дзейнасці, звязаная з усімі магчымымі аспектамі функцыянавання бібліяграфічнай інфармацыі ў сістэме дакументальных камунікацый. Бібліяграфія – у шырокім сэнсе (як цэлае) уключае ўсе з’явы бібліяграфічнай прыроды: бібліяграфічную практыку, прадукцыю, бібліяграфічную навуку (бібліяграфазнаўства), адукацыю і арганізацыю і кіраванне дзейнасцю.

Метасістэмай функцыянавання бібліяграфіі з’яўляецца сістэма дакументальных камунікацый. Бібліяграфія выводзіцца за межы кніжнай справы і распаўсюджваецца на ўсе віды дакументаў (музейныя экспанаты, графіку, археалагічныя артэфакты, батанічныя гербарыі, якія можна разглядаць як матэрыяльныя носьбіты, на якіх зафіксавана сацыяльная інфармацыя.

Непасрэдны аб’ект бібліяграфіі – дакумент (не кніга, якая разглядаецца як прыватны выпадак дакумента), гэта значыць любая сацыяльная інфармацыя, зафіксаваная чалавекам на любым матэрыяльным носьбіце ў мэтах яе захавання, распаўсюджвання і выкарыстання. Бібліяграфію пры такім падыходзе больш правільна называць дакументаграфіяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мэта бібліяграфіі – садзейнічанне рэалізацыі адносін у сістэме «дакумент – спажывец».

Асноўныя функцыі бібліяграфіі – пошукавая, камунікатыўная, ацэначная.

*Інфармацыйна-кнігазнаўчая (кнігаграфічная) канцэпцыя* распрацоўваецца з 1970-х гг. А. І. Барсуком і Э. К. Беспалавай.

Метадалагічная аснова канцэпцыі – сістэмна-дзейнасны падыход, кнігазнаўчыя метады.

Бібліяграфія – спецыяльная галіна навукова-практычнай дзейнасці (кніжнай справы) па падрыхтоўцы, передачы і арганізацыі выкарыстання другаснай (згорнутай) інфармацыі з мэтай уздзеяння (спецыфічнымі метадамі, фармамі і сродкамі) на яе распаўсюджанне и выкарыстанне ў грамадстве.

Непасрэдны аб'ект бібліяграфіі – кніга як цэласны паліграфічны твор, які мае даведачны апарат.

Метасістэма існавання бібліяграфіі – кніжная справа.

Агульная функцыя – бібліяграфічная.

Праводзіцца размежаванне паміж бібліяграфіяй – спецыяльнай галіной кніжной справы і бібліяграфазнаўствам – навуковай, вучэбнай дысцыплінай кнігазнаўчага цыклу, якая вувучае тэарыю, гісторыю, методыку, праблемы арганізацыі бібліяграфічнай справы, заканамернасці, структуру, якасці і ўласцівасці бібліяграфічнай інфармацыі.

*Когнітаграфічная ("знаниевая") канцэпцыя* распрацоўваецца В.А. Факеевым з 1990-х гг.

Метадалагічная аснова канцэпцыі – когнітаграфічныя і культуралагічныя, сацыякультурныя, сацыякамунікацыйныя падходы сацыяінстытуцыянальныя подыходы.

Бібліяграфія разглядаецца як кампанент сацыякультурнага комплекса дакументаваных ведаў (пазнання), камунікацыі і цэннаснай арыентацыі ў інфармацыйных патоках і масівах, які рэалізуе інтэлектуальны доступ да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крыніц фіксаванай інфармацыі (дакументам, кнігам, тэкстам), трансляцыю кніжнай (інфармацыйнай) культуры.

Сутнасць бібліяграфіі заключаецца ў бібліяграфічных ведах, якія ўяўляюць сабой рэзультат асобай (бібліяграфічнай) дзейнасці, адлюстроўваюць свет тэкставых камунікацый і спрыяюць асваенню і трансляцыі кніжной культуры.

Непасрэдным аб'ектам бібліяграфіі лічыцца фіксаваны квант ведаў, сукупнасць, універсум ведаў.

У якасці метасістэмы існавання бібліяграфіі разглядаецца ноосфера, сацыякультурны комплекс дакументаваных ведаў, камунікацыі і каштоўнаснай арыентацыі.

Вызначаюцца наступныя функцыі бібліяграфіі: сутнасная (бібліяграфічная); асноўныя (пазнавальная, камунікатыўная, ценнасна-арыентуючая, сацыякультурная).

У якасці вядучых катэгорый канцэпцыі лічацца бібліяграфічныя веды і бібліяграфічная інфармацыя, веды, функцыянуючыя ў сістэме сацыяльных камунікацый, бібліяграфічная камунікацыя – ўзаемадзеянні людзей з дапамогай бібліяграфічных ведаў, працэс абмена інфармацыяй аб тэкстах, бібліяграфічная каштоўнасная арыентацыя – арыентацыя в свеце тэкстаў як каштоўнасцей культуры з мэтай іх ідэнтыфікацыі і ацэнкі для рашэння разнастайных сацыяльна-бібліяграфічных задач.

*Ідэаграфічная (інфармаграфічная) канцэпцыя* распрацоўваецца Н. А. Слядневай з пачатку 1990-х гг.

Метадалагічная аснова канцэпцыі – сістэмна-дзейнасны і інфармацыйныя подыходы.

Сутнасць бібліяграфіі як грамадскай з'явы заключаецца ў яе метадычным патэнцыяле ў адносінах да універсума чалавечай дзейнасці (УЧД). Бібліяграфічныя метады разглядаюцца як ўніверсальныя, прыстасаваныя для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аперыравання любымі «суверэннымі інфармацыйнымі аб’ектамі» – не толькі дакументамі, а і тэкстамі ці нематэрыялізаванымі сэнсамі.

Бібліяграфія разумеецца як інформаграфія – універсальны метад і сродак аперыравання інфармацыяй і яе дакументальнымі носьбітамі (інфааб’ектамі), адзіны арганізацыйна выдзелены від метаінфармацыйнай дзейнасці, звязанны са згортваннем, мадэліраваннем складанага знакавага субстрата і арганізацыяй структурыраваных масіваў для забеспячэння іншых відаў дзейнасці, якім уласціва іншая метадалогія і кагнітыўны статус.

Метасістэма бібліяграфіі – універсум чалавечай дзейнасці (УЧД), у межах якога яна з’яўляецца метадычнай галіной універсума чалавечай дзейнасці, значна шырэй дакументаграфіі.

Аб’ект бібліяграфіі (бібліяграфічнага адлюстравання) – інфармацыйны аб’ект, любы целасны суверенны інфармацыйны фрагмент, сэнсавае адзінства незалежна ад факта яго дакументнай фіксацыі.

Бібліяграфазнаўства разглядаецца як рэфлексуючая падсістэма бібліяграфічнай дзейнасці.

Перспектывы бібліяграфіі як інформаграфіі разглядаюцца ў захаванні ў інфаграмадстве яе функцый, наданні значнасці як сродку інфармацыйнага прагрэса, гуманізацыі камп’ютарызаванага грамадства ў выпадку, калі яе тэорыя і практыка будуць пераўтвораны ў адпаведнасці з новай інфармацыйнай сітуацыяй і бібліяграфічныя кампаненты будць больш актыўна ўкараняцца ў сучаснае інфаасяроддзе.

*Духоўна-вытворчая (кагнітыўна-камунікацыйная) канцэпцыя* распрацоўваецца А.В.Сакаловым з 1970–х гг.

Метадалагічная аснова канцэпцыі – тэорыя сацыяльных камунікацый, культуралагічныя, кагніталагічныя методы.

Бібліяграфія разглядаецца як духоўная, пазнавальная інфраструктура кніжнай камунікацыі. Яе задачы – пазнанне дакументаў (твораў пісьменнасці і

друку) і выпрацоўка бібліяграфічных ведаў, афармляемых ў выглядзе бібліяграфічных запісаў.

Асноўныя катэгорыі – духоўная вытворчасць, сістэма сацыяльных камунікацый, пазнавальная інфраструктура.

Вядучае паняцце (субстанцыя) бібліяграфіі – бібліяграфічныя веды, якія з'яўляюцца сродкам і вынікам бібліяграфічнай дзейнасці, прынцыпам адмежавання бібліяграфічнага ад небібліяграфічнага.

Бібліяграфію разглядае як інфраструру, якая існуе ў сістэме кніжнай камунікацыі як асобае звяно, якое задавальняе патрэбнасці ўсіх астатніх звёнаў: кнігавыдання, кніжнага гандлю, бібліятэчнай справы, бібліяфільскай цэнзуры.

Бібліяграфіі ўласцівы наступныя функцыі: сутнасныя ці фундаментальныя (цэннасна-арыентацыйная (ацэначная), камунікатыўна-пазнавальная, кумулятыўна-пошукавая), і прыкладныя (сацыяльна-ідэалагічная, забеспячэння навукова-тэхнічнага прагрэса, культурна-асветніцкая, сацыялізуючая).

*Культуралагічная канцэпцыя* распрацоўваецца М. Г. Вохрышавай з канца 1980-х гг. Актыўна развіваецца Н. Б. Зіноўевай і інш. удзельнікамі штогодных міжнародных форумаў па праблемах інфармацыйнай культуры пад навуковым кіраўніцтвам Ю. С. Зубова.

Метадалагічная аснова канцэпцыі – сістэмна-дзейнасны і інфармацыйна-культуралагічны подыходы.

Бібліяграфія разглядаецца як элемент (подсістэма) культуры (сістэмы захавання і трансляцыі ад пакалення да пакалення, ад супольнасці да супольнасці, ад індывіда індывіду челавечых ведаў і ўменняў, якія забяспечваюць развіццё цывілізацыі) як сцыфічная субкультура, звязаная з чалавечымі ведамі; галіна дзейнасці ў сферы культуры: комплекс спецыяльных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для пэўных мэтаў, у прыватнасці – для давядзення каштоўнасцей культуры да членаў грамадства.

Бібліяграфічная дзейнасць разглядаецца як галіна дзейнасці ў сферы культуры, накіраваная на задавальненне бібліяграфічнымі сродкамі грамадскіх патрэбнасцей у дакументальна-фіксаваных ведах з мэтай іх захавання, трансляцыі ад пакалення да пакалення.

Метасістэмай бібліяграфіі з'яўляецца культура. Бібліяграфічная прадукцыя ўпісваецца ў пэўны сацыякультурны кантэкст.

Бібліяграфія разглядаецца як феномен, спецыфічны слой культуры, які адказвае за упарадкаванне потока дакументаў – сацыякультурных каштоўнасцей, фарміраванне інфармацыйнай (бібліяграфічнай) культуры асобы і грамадства.

Асноўная якасць бібліяграфіі – поліморфнасць как з'явы культуры.

Найбольш існотныя прыметы бібліяграфіі:

• накіраванасць на задавальненне грамадскіх потрэб у ведах (інфармацыі) аб дакументах;

• канстатацыя фактаў існавання дакументаў, іх апісанне, інтэрпрэтацыя, устанаўленне лагічных дакументных сувязей;

• самавытворчасць у рамках бібліяграфіі спецыфічных практычных і пазнавальных средкаў для рашэння сваіх задач;

• інстытуцыйнасць, яна ўяўляе сабой сацыяльны інстытут, які арганізуе дзейнасць суб'ектаў.

Сродак і рэзультат бібліяграфіі – сістэмна-арганізаваныя бібліяграфічныя веды як фенамен культуры.

Віды бібліяграфіі: агульнабібліяграфічная, навукова-дапаможная, вытворча-дапаможная, сацыяльна-дапаможная.

*Інфармацыйна-управленчая канцэпцыя* распрацоўваецца А.А.Грачыхіным з 1980-х гг.

Метадалагічная аснова канцэпцыі – кнігазнаўчы, сістэмна-дзейнасны і іншыя метады і падыходы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліяграфія разглядаецца як галіна інфармацыйнай дзейнасці, асноўнай грамадскай функцыяй якой з'яўляецца управленне працэсам вытворчасці, распаўсюджвання і выкарыстання інфармацыі ў грамадстве. Бібліяграфія – гэта інфармацыйнае кіраванне.

У «вузка кнігазнаўчым сэнсе» бібліяграфія разумееецца як кіраванне працэсам вытворчасці, распаўсюджвання і выкарыстання кнігі (твораў, выданняў, дакументаў) у грамадстве.

Аб'ектам бібліяграфіі лічыцца кніжная справа як працэс інфармцыйных зносін.

Предметам – бібліяграфічная і бібліягрфазнаўчая інфармацыя.

Метасістэмай бібліяграфіі лічыцца кніжная справа.

Асноўная грамадская функцыя бібліяграфіі – інфармацыйнае кіраванне (сігнальнае, ацэначнае, рэкамендацыйнае).

Асноўныя прынцыпы бібліяграфіі – партыйнасць, навуковасць, народнасць, дзейнасць, камунікатыўнасць, сістэмнасць.

*Навуказнаўчая канцэпцыя* распрацоўваецца Л. В. Астахавай з другой паловы 1990-х гг. Сугучна з когнітаграфічнай канцэпцыяй В. А. Факеева. Бібліяграфічнае пазнанне прадстаўлена як кампанент уласна навуковага пазнання, які развіваецца згодна з эвалюцыяй навукі ў цэлым. Навука ўступіла ў нэакласічны этап свайго развіцця, які характарызуецца стратэгічнай скіраванасцю на чалавека і патрэбнасці чалавечай дзейнасці, а таксама новай ідэалогіяй рацыянальнасці – гуманітарным антрапамарфізмам, поліметадалагізмам навуковай свядомасці. Гэта ўзвышае статус бібліяграфічнай навукі і практыкі. Бібліяграфія з'яўляецца навуковым фенаменам, а не другасна-дапаможнай галіной разумовай працы. У пэўнай ступені сучасная бібліяграфічная думка, лічыць Л. В. Астахава, знаходзіцца на новым этапе свайго развіцця, вяртаецца да пастулата бібліёграфаў-філологаў XIX в.: «Бібліяграфія – навука».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Працэсна-кагнітыўная (кагнітыўна-трансфармацыйная) канцэпцыя* распрацоўваецца В. П. Леонавым з 1990-х гг.

В. П. Леонаў называе яе “творящей”. У якасці вядучых катэгорый выступаюць: «веды», «бібліяграфічныя веды» (не інфармацыя), «уяўленне, трансфармацыя ведаў у бібліяграфіі», «бібліяграфічны працэс», «бібліяграфічная рэканструкцыя», «прастора бібліяграфіі», «тэкст» (не дакумент).

Згодна гэтай канцэпцыі, бібліяграфічныя сродкі і метады пошука і перадачы інфармацыі могуць і павінны прымяняцца для перадачы ведаў «у інфармацыйнай упакоўцы», гэта значыць з выкарыстаннем бібліяграфічных метадаў, тэхналогіі, па правілах бібліяграфічнага згортвання з мэтай далейшага выкарыстання.

Бібліяграфічныя веды ўяўляюць сабой разнастайнасць асабістых нефармалізаваных ведаў, якія фарміруюцца пад уздзеяннем адукацыі, навыкаў, прафесійнай дзейнасці, чытання навуковых публікацый. Фарміраванне гэтых ведаў знаходзіцца ў залежнасці ад глыбіні разумення сэнса дакумента, ступені валодання бібліёграфам метаінфармацыей, накопленых вопыта і ўменняў.

Бібліяграфічныя веды аб кнізе маюць фундаментальны характар. Яны назапашаны стагоддзямі.

Даказваецца, что бібліёграф «думае тэкстамі». Бібліяграфічная трансфармацыя ведаў вызначае іх пераўтварэнне, узаемадзейнічанне паміж асабістымі ведамі бібліёграфа і карыстальніка, сэнсавы, сацыяльны па сваім характэры, працэс, які здзяйсняецца паміж індывідуумамі, інтэлектуальная задача, вырашаемая ў працэце бібліяграфічнай дзейнасці. Бібліёграф і карыстальнік бібліяграфічнай інфармацыі разглядаюцца ў адносінах сутворчасці.

В. П. Леонаў выдзяляе чатыры тыпы бібліяграфічнай трансфармацыі ведаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

• бібліяграфічная рэканструкцыя біяграфіі асобы, якая знаходзіцца ў сферы бібліяграфічнага працэсу;
• бібліяграфічная атрыбуцыя тэкстаў;
• бібліяграфічная рэканструкцыя гістарычнага асяроддзя;
• бібліяграфічная трансфармацыя біябібліяграфіі.

Асноўнай задачай пранікнення ў сутнасць бібліяграфічнай трансфармацыі ведаў з'яўляецца пошук шляхоў сэнсавага аналізу тэкстаў[80].

**Вывады.** Бібліяграфазнаўства – актыўна развіваемая навуковая дысцыпліна, у межах якой абагульняюцца практычных дадзеных і фарміруюцца новыя веды, распрацоўваюцца як асобныя паклажэнні, так і цэласныя канцэпцыі. Навдзвычай інтэнсіўна на сучасным этапе развіваецца расійскае бібліяграфазнаўства, у межах якога зроблена шэраг цікавых навуковых распрацовак.

Развіццё бібліяграфазнаўства мэтазгодна суадносіць са зменай парадыгм: навукова-кнігазнаўчая ці пазнавальная, дапаможна-ідэалагічная ці каштоўнасна-арыенціровачная, інфармацыйна-дзейнасная (інфармацыйна-камунікатыўная ці дапаможна-інфармацыйная) і культуралагічная.

Асноўным канцэпцыямі бібліяграфазнаўства на сучасным этапе з'яўляюцца: інфармацыйна-дакументаграфічная канцэпцыя, когнітаграфічная канцэпцыя, інфармацыйна-кнігазнаўчая (кнігаграфічная) канцэпцыя, культуралагічная (М. Г. Вохрышава) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[80] *Фокеев, В.А.* Библиография: теоретико-методологические основания: учеб. пособие. – СПб., 2006. – С.56–68.

# СЛОЎНІК АСНОЎНЫХ ТЭРМІНАЎ

**агульная бібліяграфія** – гэта галіна дзейнасці па стварэнні бібліяграфічнай прадукцыі, якая забяспечвае пошук дакументаў і інфармаванне аб іх ў незалежнасці ад іх наступнага спецыяльнага выкарыстання.

**агульны рэтраспектыўны бібліяграфічны дапаможнік** *гл.* ***рэпертуарны бібліяграфічны дапаможнік***

**адзіны** (тое ж аб’яднаны, камбінаваны, Index, Register) **дапаможны паказальнік** – дапаможны паказальнік, які змяшчае ў адным алфавітным радзе пералік назваў прадметаў, іх якасцей і адносін, імёнаў уласных, геаграфічных аб’ектаў з адсылкамі да парадкавага нумару запісу ці старонкі надрукавання матэрыялу.

**алфавітны каталог** – бібліяграфічны дапаможнік, у якім бібліяграфічныя запісы прадстаўлены ў картачнай форме і размеркаваны ў алфавіце імёнаў (прозвішчаў) аўтараў ці загалоўкаў дакументаў.

**анатацыя** – кароткая характарыстыка дакумента с пункту гледжання яго прызначэння, зместу, формы і іншых асаблівасцей.

**архіўная бібліяграфія** – інстытуцыянальны від бібліяграфіі, інфармацыйная інфраструктура архіўнай справы, якая забяспечвае ідэнтыфікацыю, пошук і выкарыстанне архіўных дакументаў і дакументаў, запатрабаваных у пазнавальнай архіўнай дзейнасці; бібліяграфічныя ўчасткі дзейнасці архіўных устаноў, звязаныя са стварэннем, захаваннем, перапрацоўкай, распаўсюджваннем і выкарыстаннем бібліяграфічнай інфармацыі.

**аўтарытэтны/нарматыўны запіс** – сукупнасць звестак даведачнага характару аб аб'екце, адлюстраваным у дакуменце, якая забяспечвае адназначную ідэнтыфікацыю гэтага аб'екта.

**афінная бібліяграфічная інфармацыя** – інфармацыя аб дакуменце, якая існуе ў дакуменце як неад'емная ідэнтыфікуючая частка і на аснове якой фарміруецца бібліяграфічны запіс на дакумент для ўключэння ў разнастайныя бібліяграфічныя дапаможнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**бібліёграф** – прафесія, зместам якой з'яўляецца стварэнне і давядзенне да карыстальніка бібліяграфічнай інфармацыі.

**бібліяграфаванне** – працэс стварэння (вытворчасці ці падрыхтоўкі) бібліяграфічнай інфармацыі.

**бібліяграфазнаўства** – сістэма навуковых аб бібліяграфіі і від пазнавальнай дзейнасці па фарміраванні навуковых ведаў у галіне бібліяграфіі; навуковая дысцыпліна, якая вывучае тэорыю, гісторыю, метадалогію, тэхналогію, методыку, арганізацыю бібліяграфіі.

**бібліяграфічнае абслугоўванне** – мэтанакіраванае давядзення бібліяграфічнай інфармацыі да карыстальнікаў.

**бібліяграфічнае апісанне** – частка бібліяграфічнага запісу; структураваная сукупнасць бібліяграфічных звестак аб дакуменце (частцы дакументаў, сукупнасці дакументаў), прыведзеных па пэўных правілах і прызначаных для ідэнтыфікацыі і агульнай характарыстыкі дакументаў.

**бібліяграфічнае выданне** – паліграфічна самастойна аформленае выданне, якое ўтрымліваеь бібліяграфічную інфармацыю і прызначана для яе распаўсюджвання ў грамадстве.

**бібліяграфічнае паведамленне** – сукупнасць бібліяграфічных звестак, цэласнае структурнае ўтварэнне (мінімальнае і недзялімае), якое забяспечвае ідэнтыфікацыю дакумента (яго часткі ці сукупнасці дакументаў).

**бібліяграфічная база даных** – сукупнасць бібліяграфічных запісаў, рэалізаваная ў электроннай (лічбавай) форме.

**бібліяграфічная дзейнасць** – мэтанакіраванае адлюстраванне і пераўтварэнне фіксаванай сацыяльнай інфармацыі і інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў, фарміраванне адпаведных навуковых ведаў і іх рэпрадуцыраванне.

**бібліяграфічная інфармацыя** – інфармацыя аб дакуметах (фіксаваных тэкстах), неабходная для іх ідэнтыфікацыі і выкарыстання.

**бібліяграфічная картатэка** – бібліяграфічны дапаможнік, які рэалізаваны ў картачнай форме і ўяўляе сабой сукупнасць бібліяграфічных запісаў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакументы ці іх часткі, неабавязкова прадстаўленыя ў дакументным фондзе пэўнай бібліятэкі. бу якім на картках у пэўнай паслядоўнасці (фармальнай ці змястоўнай) размяркоўваюцца

**бібліяграфічная лістоўка** — рэкламнае выданне, рэкамендацыйны (папулярна-асветніцкі, вучэбна-дапаможны, прафесійна-вытворчы) бібліяграфічны дапаможнік ў форме лістоўкі, які змяшчае невялікі пералік бібліяграфічных запісаў (бібліяграм) пэўнага зместу ў адпаведнасці з яго мэтавым і чытацкім прызначэннем.

**бібліяграфічная манаграфія** – буйны бібліяграфічны дапаможнік навукова-дапаможнага прызначэння, які створаны на падставе паглыбленага вывучэння вялікага масіву дакументаў, разглядае праблему ўсебакова і змяшчае новыя ці ўдакладненыя звесткі аб бібліяграфіруемых дакументах.

**бібліяграфічная патрэбнасць -** неабходнасць у знаходжанні, атрыманні,стварэнні і выкарыстанні бібліяграфічнай інфармацыі.

**бібліяграфічная прадукцыя** - інфармацыйная прадукцыя, якая змяшчае бібліяграфічную інфармацыю.

**бібліяграфічная практыка гл. бібліяграфічная практычная дзейнасць.**

**бібліяграфічная практычная дзейнасць -** дзейнасць па стварэнні, распаўсюджванні і выкарыстанні бібліяграфічнай інфармацыі.

**бібліяграфічная энцыклапедыя** - бібліяграфічны дапаможнік, у якім сабраны фактычныя звесткі і апісанні літаратуры па пэўнай галіне ведаў ці тэме і размеркаваны ў алфавітным, прадметна-тэматычным ці сістэматычным парадку.

**бібліяграфічны агляд** – бібліяграфічны дапаможнік (інфармацыйны твор), які ствараецца на аснове першасных дакументаў і ўяўляе сабой звязанае паведамленне аб разглядаемых у іх асноўных праблемах..

**бібліяграфічны дакумент** – любы матэрыяльны носьбіт, на якім зафіксавана БІ. бібліяграфічны дапаможнік – пэўным чынам упарадкаванае мноства бібліяграфічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

запісаў, аб'яднаных адзінствам задумы, прызначэння, формы і/ці зместам уключаемай інфармацыі.

**бібліяграфічны запіс** – фіксаваная форма бібліяграфічнага паведамлення.

**бібліяграфічны каталог** – бібліяграфічны дапаможнік у картачнай, друкаванай ці электроннай форме, які адлюстроўвае дакументныя рэсурсы (калекцыі, фонды) бібліятэк, кнігавыдавецкіх, кнігагандлёвых, архіўных, музейных устаноў, прыватных збораў ці іх аб'яднанняў, карпарацый (зводныя каталогі).

**бібліяграфічны паказальнік** – бібліяграфічны дапаможнік, які аб'ядноўвае значную колькасць бібліяграфічных запісаў, мае складаную структуру, аснашчаны дапаможным апаратам.

**бібліяграфічны пошук** – від інфармацыйнага пошуку, які прадугледжвае знаходжанне бібліяграфічнай інфармацыі.

**бібліяграфічны спіс** – бібліяграфічны дапаможнік, які аб'ядноўвае невялікую колькасць бібліяграфічных запісаў, мае простую структуру, без дапаможнага апарата.

**бібліяграфічны рэсурс** – тое ж, што і крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі, бібліяграфічны дапаможнік.

**бібліяграфічныя веды -** вынік адлюстравання дакументаў (тэкстаў).

**бібліяграфічныя звесткі** – асобныя характарыстыкі дакумента, на аснове якіх будуецца бібліяграфічны запіс.

**бібліяграфічныя зносіны** – узаемадзеяннея людзей з мэтай абмену бібліяграфічнай інфармацыяй.

**бібліяграфічная картатэка** – бібліяграфічны дапаможнік, у якім на картках у пэўнай паслядоўнасці (фармальнай ці змястоўнай) размяркоўваюцца бібліяграфічныя запісы на дакументы ці іх часткі, неабавязкова прадстаўленыя ў фондзе пэўнай бібліятэкі.

**бібліяграфічныя рэсурсы** – 1) патэнцыял бібліятэк і іншых устаноў, якія здзяйсняюць бібліяграфічную дзейнасць: сістэма інфармацыйна-бібліяграфічных выданняў, даведачна-бібліяграфічны аппарат, бібліяграфічныя кадры, матэрыяльна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхнічная база, грашовыя сродкі і інш.; 2) сукупнасць бібліяграфічнай прадукцыі (бібліяграфічных дапаможнікаў).

**бібліяграфія** – інфармацыйная інфраструктура, якая забяспечвае падрыхтоўку, распаўсюджванне і выкарыстанне бібліяграфічнай інфармацыі; сацыякультурны комплекс практыкі і пазнання, які забяспечвае функцыянаванне бібліяграфічнай інфармацыі ў грамадстве.

**бібліяграфія бібліяграфіі** – від бібліяграфіі, ў межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная прадукцыя аб бібліяграфічных дакументах (крыніцах бібліяграфічнай інфармацыі).

**бібліяграфія другой ступені гл. бібліяграфія бібліяграфіі**

**бібліятэчная бібліяграфія** – інфармацыйная інфраструктура бібліятэчнай справы, якая забяспечвае стварэнне бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічных ведаў), запатрабаваных у дзейнасці бібліятэк і спрыяе фарміраванню і выкарыстанню іх фондаў.

**біябібліяграфічны дапаможнік** – бібліяграфічны дапаможнік, які змяшчае біяграфічныя звесткі аб пэўнай асобе (пэўных асобах), а таксама бібліяграфічную інфармацыю аб іх творах і творах пра іх.

**біябібліяграфічны слоўнік** – бібліяграфічны дапаможнік, які змяшчае біяграфічныя звесткі аб пэўных асобах і бібліяграфічную інфармацыю аб іх творах і творах пра іх.

**бягучая бібліяграфія** – від бібліяграфічнай дзейнасці, у межах якога ствараецца інфармацыя аб новых дакументах і забяспечваецца яе аператыўнае давядзенне да карыстальнікаў.

**бягучы бібліяграфічны дапаможнік** – перыядычны бібліяграфічны дапаможнік, выпускі якога рэгулярна і аператыўна адлюстроўваюць ствараемыя дакументы (актуальную частку дакументных патокаў).

**вучэбна-дапаможны бібліяграфічны дапаможнік** – спецыяльны бібліяграфічны дапаможнік, прызначаны ў дапамогу адукацыйнай, самаадукацыйнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**выдавецкая бібліяграфія** – від бібліяграфічнай дзейнасці, які рэалізуецца ў межах выдавецкай справы, забяспечвае стварэне і рух бібліяграфічнай інфармацыі ў неабходных ёй мэтах і аб'ёмах.

**галіновае бібліяграфазнаўства** – сістэма навуковых ведаў па галіновай бібліяграфіі і від пазнавальнай дзейнасці па фарміраванні адпаведных навуковых ведаў.

**галіновая бібліяграфія** – від бібліяграфіі, у межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка інфармацыя аб дакументах па пэўнай галіне ведаў.

**галіновы бібліяграфічны дапаможнік** – дапаможнік, у якім адлюстравана інфармацыя аб дакументах па адной галіне ведаў.

**даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне** – кірунак бібліяграфічнага абслугоўвання, у межах якога здзяйсняецца падрыхтоўка, выкананне і давядзенне да карыстальнікаў бібліяграфічных і фактаграфічных даведак.

**даведачна-бібліяграфічны апарат** – сукупнасць крыніц бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыя, выдзеленая для забеспячэння даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання.

**дайжэст** – кароткі пераказ (фрагменты – цытаты, вытрымкі, канспекты, рэфераты) тэкстаў шэрагу дакументаў, падабраныя па пэўнай змястоўнай ці фармальнай прыметах.

**дакументныя рэсурсы** – від інфармацыйных рэсурсаў, які ўяўляе сабой сукупнасць асобных дакументаў, масіваў дакументаў.

**дапаможны паказальнік** – бібліяграфічны пошукавы апарат, створаны да бібліяграфічных і любых іншых дакументаў, які раскрывае іх структуру і змест і забяспечвае хуткае знаходжанне змешчанай ў дакументах інфармацыі.

**дзяржаўная бібліяграфія** – дзейнасць устаноў (нацыянальных бібліятэк, фірм, кніжных палат) па дзяржаўнай рэгістрацыі дакументаў, падрыхтоўцы дзяржаўных бібліяграфічных дапаможнікаў і давядзенні адпаведнай інфармацыі да карыстальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**дзяржаўны бібліяграфічны дапаможнік –** бібліяграфічны дапаможнік, які ўключае інфармацыю аб дакументнай прадукцыі пэўнай дзяржавы на аснове дзяржаўнай рэгістрацыі дакументаў.

**другасная інфармацыя –** інфармацыя, створаная ў выніку аналітычна-сінтэтычнай перапрацоўкі першаснай інфармацыі.

**другасны дакумент –** дакумент, які з'яўляецца вынікам аналітычна-сінтэтычнай перапрацоўкі аднаго ці некалькі першасных дакументаў.

**дыягенетычная бібліяграфічная інфармацыя –** самастойная бібліяграфічная інфармацыя, ствараецца на аснове ідэнтыфікацыйных даных першасных дакументаў і існуе адасоблена ад іх.

**імянны паказальнік –** дапаможны паказальнік, які змяшчае алфавітны пералік прозвішчаў з ініцыяламі ці поўнымі імёнамі і іншымі абазначэннямі ўласных імёнаў (напрыклад, псеўданімамі) з адсылкамі да парадкавага нумару запісу ці старонкі надрукавання матэрыялу пэўнай асобы, аб пэўнай асобе.

**індэкс –** азначэнне класа (паняцця) сродкамі натацыі пэўнай класіфікацыйнай сістэмы (індэкс УДК, індэкс ББК і інш.); умоўны код (спалучэнні слоў, літар, лічбаў), які азначае пэўнае паняцце і выкарыстоўваецца для запісу вынікаў класіфікавання і індэтыфікацыі аб'ектаў пошуку ў інфармацыйна-пошукавых масівах.

**інфармацыйна-пошукавая мова –** упарадкаваная сукупнасць тэрмінаў, паняццяў, прадметных рубрык, якія адлюстроўваюць змест бібліяграфіруемых аб’ектаў і выкарыстоўваюцца для паглыблення тэматычнага пошуку.

**інфармацыйныя рэсурсы –** сукупнасць даных, арганізаваная для эфектыўнага атрымання сапраўднай інфармацыі.

**карыстальнік бібліяграфічнай інфармацыі –** субъект (асобны чалавек ці калектываў), які звяртаецца да любых крыніц бібліяграфічнай інфармацыі, выкарыстоўвае іх для атрымання неабходных яму даных.

**каталожная бібліяграфія –** від бібліяграфічнай дзейнасці, у межах якога здзясняецца адлюстраванне і давядзенне інфармацыі аб дакументах пэўнага фонда (фондаў) без

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уліку якасных характарыстык дакументаў праз стварэнне і выкарыстанне электронных, картачных і друкаваных каталогаў. класіфікацыйны індэкс.

**кнігагандлёвая бібліяграфія –** інфармацыйная інфраструктура кнігагандлёвай справы, якая забяспечвае стварэнне бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічных ведаў), запатрабаваных у дзейнасці кнігагандлёвых устаноў і спрыяе фарміраванню асартыменту тавараў і іх продажы.

**кнігагандлёвы бібліяграфічны дапаможнік –** крыніца бібліяграфічнай інфармацыі, якая ствараецца і/ці выкарыстоўваецца для спрыяння збыту выданняў.

**комплексная бібліяграфія** – від бібліяграфіі, у межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка інфармацыя аб дакументах па пэўнай праблеме, якая патрабуе ўключэння інфармацыі з розных галін ведаў.

**краіназнаўчая бібліяграфія –** від бібліяграфіі, ў межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная прадукцыя аб дакументах, створаных на тэрыторыі пэўнай краіны і/ці прысвечаных ёй.

**краязнаўчая бібліяграфія –** від бібліяграфіі, ў межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная прадукцыя аб дакументах, створаных на тэрыторыі пэўнага краю і/ці прысвечаных яму *гл. таксама* ***рэгіянальная бібліяграфія.***

**краязнаўчы бібліяграфічны дапаможнік** – дапаможнік, у якім адлюстравана інфармацыя аб дакументах, прысвечаных пэўнаму краю, рэгіёну, населеннаму пункту *гл. таксама* ***рэгіянальны бібліяграфічны дапаможнік***

**крыніца агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі** *гл.* ***рэпертуарны бібліяграфічны дапаможнік***

**крыніца масавай бібліяграфіі** – разнавіднасць крыніц агульнай бібліяграфіі, якая знаёміць грамадства з найбольш сацыяльна значымай дакументаванай прадукцыяй і прызначана для масавай карыстальніцкай аўдыторыі.

**крыніца рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі** *гл.* ***рэпертуарны бібліяграфічны дапаможнік***

**латэнтная бібліяграфічная інфармацыя –** бібліяграфічная інфармацыя, якая змяшчаецца ў першасных дакументах як неад'емная частка асобнага тэксту ці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдання ў цэлым і афармляецца ў выглядзе ўнутрыкніжных (часопісных, газетных), прыкніжных (артыкульных) спісаў, паказальнікаў, аглядаў, спасылак.

**масавы бібліяграфічны дапаможнік** *гл.* ***крыніца масавай бібліяграфіі***

**машыначытаемы каталог** *гл.* **электронны каталог**

**метабібліяграфія гл. бібліяграфія бібліяграфіі**

**навукова-дапаможны бібліяграфічны дапаможнік –** спецыяльны бібліяграфічны дапаможнік, прызначаны ў дапамогу навукоўцам і навукова-даследчай дзейнасці.

**навукова-дапаможная бібліяграфія –** від спецыяльнай бібліяграфіі, які забяспечвае вытворчасць і распаўсюджванне бібліяграфічнай інфармацыі для навукоўцаў і навукова-даследчай дзейнасці.

**нацыянальная бібліяграфія –** від бібліяграфіі, які забяспечвае вытворчасць і распаўсюджванне бібліяграфічнай інфармацыі па комплексе тэрытарыяльна-дзяржаўных, нацыянальна-этнічных прымет.

**нацыянальны рэтраспектыўны бібліяграфічны дапаможнік** *гл.* ***рэпертуарны бібліяграфічны дапаможнік***

**паказальнік цытуемай літаратуры** – пералік упамянутых і/ці цытуемых дакументаў у тых ці іншых выданнях (публікацыях), які дапамагае выяўляць выкарыстаныя аўтарамі дакументы і раскрывае ўнутраныя сувязі ў межах дакументных (тэкставых) камунікацый.

**паказальнік да выдання –** бібліяграфічны пошукавы апарат, створаны да першасных дакументаў, які раскрывае іх структуру і змест і забяспечвае хуткае знаходжанне змешчанай ў дакументах інфармацыі *гл. таксама* ***дапаможны паказальнік***

**памятка чытачу** – рэкамендацыйны (навукова-асветніцкі, вучэбна-дапаможны, прафесійна-вытворчы) бібліяграфічны дапаможнік з мінімальным пералікам дакументаў па цікавай для чытача тэме пытанню.

**персанальны бібліяграфічны дапаможнік**– дапаможнік, у якім адлюстравана інфармацыя аб дакументах пэўнай асобы і/ці аб пэўнай асобе (асобах).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**перспектыўная бібліяграфія** – від бібліяграфічнай дзейнасці, у межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка інфармацыя аб дакументах, прагназуемых, запланаваных ці падрыхтаваных да выдання.

**перспектыўны бібліяграфічны дапаможнік** – дапаможнік, які адлюстроўвае дакументы пакуль яшчэ не выдадзеныя, а толькі прагназуемыя, запланаваныя ці падрыхтаваныя да друку.

**першасныя дакументы** – дакуметы, якія фіксуюць вынікі пазнання рэчаіснасці, навуковыя веды; дакуметы, якія змяшчаюць арыгінальныя творы, зводы твораў, матэрыялы і вынікі даследаванняў і распрацовак.

**план чытання** – бібліяграфічны дапаможнік, у якім дакладна рэгламентуецца склад і паслядоўнасцьчытання па пэўнаму пытанню.

**постэдзіцыйная бібліяграфічная інфармацыя** *гл.* **дыягенетычная бібліяграфічная інфармацыя**

**праблемна-комплексная бібліяграфія** *гл.* ***комплексная бібліяграфія***

**праблемна-комплексны бібліяграфічны дапаможнік** – дапаможнік, у якім сабрана інфармацыя аб дакументах з шэрагу галін ведаў па асобнай праблеме.

**прадметны каталог** – бібліяграфічны дапаможнік, у якім бібліяграфічныя запісы прадстаўлены ў картачнай форме і размеркаваны ў агульным алфавіце прадметных рубрык, за якімі канцэнтруюцца бібліяграфічныя запісы на дакументы адпаведнай тэматыкі.

**праспект** – даведачнае і/ці рэкламнае выданне, якое змяшчае сістэматызаваны пералік дакументаў (дакумента), прызначаных да выпуску, продажы ці экспаніраванню.

**прафесійна-вытворчы бібліяграфічны дапаможнік** – спецыяльны бібліяграфічны дапаможнік, створаны для спецыялістаў розных сфер дзейнасці і прызначаны для аказання дапамогі сродкамі БІ ў іх практычнай дзейнасці.

**прыартыкульны бібліяграфічны дапаможнік** – арганізаваная пэўным чынам (часцей за ўсё ў парадку цытавання, па алфавіце) сукупнасць бібліяграфічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

запісаў, створаная да тэксту артыкула і існуючая з ім у непарыўнай сувязі: у тэксце, у падрадковых заўвагах і каментарыях, па-за тэкстам (у спісе літаратуры да тэксту артыкула).

**прыкніжны бібліяграфічны дапаможнік –** арганізаваная пэўным чынам (часцей за ўсё ў парадку цытавання, па алфавіце) сукупнасць бібліяграфічных запісаў, створаная да тэксту кнігі і існуючая з ім ў непарыўнай сувязі: у тэксце, у падрадковых заўвагах і каментарыях, па-за тэкстам (у спісе літаратуры да тэксту кнігі).

**путевадзіцель па літаратуры –** бібліяграфічны дапаможнік, які змяшчае звесткі аб першасных дакументах, крыніцах бібліяграфічнай інфармацыі па тэме і метадычныя парады і рэкамендацыі па іх выкарыстанні.

У раздзеле "Па тэме/ключавых словах" у пошукавым радку набраць "биб» - прагледзець атрыманыя вынікі, выбраць адну з публікацый, н-д, выбраць "Библиометрические методы", указаць у сшытку прыведзеныя характарыстыкі на артыкул на гэтай тэме, якія з'явіліся на экране (бібліяграфічнае апісанне, анатацыя і інш.), затым націснуць "Показать полное описание" і прагледзець элементы Дублінскага ядра.

*Пытанні для субяседавання па выніках задання № 4.*
1. Якія дакументы адлюстроўваюцца ў рэпазіторыі?
2. Ці можна лічыць фармат Dublin Core Metadata Initiative (DCMI) даволі простым і зручным для апісання электронных рэсурсаў?
3. Якія адрозненні заўважылі студэнты ў апісанні DCMI ад вядомых ім стандартаў бібліяграфічнага апісання электронных дакументаў ? (міжнароднага ІФЛА, бібліяграфічнага апісання электронных рэсурсаў ГОСТ 7.82-2001).

***Асноўная літаратура***

1. ГОСТ 7.0-99. СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография: Термины и определения. – Введ. 1.06.2000. – Мінск : Белстандарт, 1999. – 23 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – С.63 – 68; Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2011. – С.61 – 65.
3. Дублинское ядро [Электронный ресурс] // https://ru.wikipedia.org/wiki.
4. Левин, Г.Л. Традиционные типы библиографической продукции в электронной среде: проблемы теории и практика российских библиотек / Г.Л.Левин // Библиосфера. – 2010. – № 1. – С. 7 – 13.

***Дадатковая літаратура***

1. Лявончыкаў, В.Е. Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў/ В.Е.Лявончыкаў, Л.А. Дзямешка, Р.І.Саматыя. – Мінск : 2000 – 222 с.
*2.* Оливер, К. Идентификация ресурсов: Функциональные требования к библиографическим записям (FRBR) и доступность ресурсов // Научные и технические библиотеки. – 2017. – № 7. – С.42-53.

*Выкананыя работы правяраюцца выкладчыкам. Праводзяцца індывідуальныя гутаркі.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма: ФУНКЦЫІ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ (БІБЛІЯГРАФІІ) (для студэнтаў 135 К групы)

*Практычная работа*

***Мэта:*** садзейнічаць атрыманню студэнтамі дакладных уяўленняў аб структуры функцый бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфіі) і іх праяўленні.

***Заданні і методыка выканання:*** з вучэбнага дапаможніка Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – 215 с. (Тое ж, 2011) неабходна выпісаць у ніжэй прапанаваную форму табліцы:

1. Назвы асноўных грамадскіх функцый бібліяграфічнай інфармацыі, вызначаных А.П. Коршунавым і сістэмы функцый, вызначаных В.А. Факеевым.
2. Азначэнні (тлумачэнні) кожнай функцыі, дадзеныя гэтымі даследчыкамі.
3. Прывесці прыклады **праяўлення** кожнай з гэтых функцый у вядомых студэнту з’явах, працэсах, рэсурсах бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк ці любых іншых устаноў сістэмы дакументных камунікацый (кнігарняў, выдавецтваў, СМІ, архіваў, Нацыянальнай кніжнай палаты і інш.). Могуць быць прыклады электроннай бібліяграфіі з Інтэрнет (выкарыстання віртуальных даведачных службаў, баз даных, вэб-каталогаў і інш.). Магчыма звярнуцца да фонда бібліяграфічнай прадукцыі ў 418 каб. і бібліятэкі БДУКМ, і на аснове выбраных друкаваных дапаможнікаў (рэсурсаў) паказаць праяўленні функцый бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфіі).

Узор табліцы

| Назва функцыі | Вызначэнне (тлумачэнне) функцыі | Праяўленне функцыі ў бібліяграфічных працэсах, аб’ектах і інш. | Праяўленне знешніх функцый у бібліяграфічным дапаможніку (рэсурсе) |
|---|---|---|---|
| Функцыі БІ, абгрунтаваныя А.П. Коршунавым | | | |
| 1. Пошукавая | | | |
| 2. | | | |
| 3. | | | |
| | | | |
| Функцыі бібліяграфіі, абгрунтаваныя В.А. Факеевым | | | |
| 1. Бібліяграфічная | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2. Пазнавальная | | | |
| 3. | | | |
| 4. | | | |

4. Апошні этап практычнай работы – выкладчык арганізуе правядзенне абмеркавання функцыяналу бібліяграфічнай інфармацыі/бібліяграфіі ў групе.

***Асноўная літаратура***

1. Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – С.63 – 68; Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2011. – С.39 –49.

***Дадатковая літаратура***

1. Коршунов, О. П. Библиографоведение : учебник / О. П. Коршунов, Н. К. Леликова, Т. Ф. Лиховид ; под общей редакцией О. П. Коршунова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. – С. 63-69.

*Выкананыя работы правяраюцца выкладчыкам. Праводзяцца індывідуальныя гутаркі.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма: МНОГААСПЕКТНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ

*Практычная работа*

*Мэта:* садзейнічанне атрыманню студэнтамі першапачатковага, але дастаткова канкрэтнага прадстаўлення аб складзе бібліяграфічнай прадукцыі як выніку і сродку бібліяграфічнай дзейнасці, выпрацоўцы навыкаў матывіраваннай класіфікацыі бібліяграфічных дапаможнікаў, якія з'яўляюцца асноўнай формай існавання бібліяграфічнай інфармацыі.

*Заданне і парадак выканання:*

Кожны студэнт атрымоўвае падборку розных бібліяграфічных дапаможнікаў (не менш 10), на аснове аналізу кожнага з іх:

- складае поўнае бібліяграфічнае апісанне дапаможніка ў цэлым, або яго часткі, якая з'яўляецца адной з формаў бібліяграфічнага дапаможніка;
- вызначае форму, тып і жанр дапаможніка і гэтыя звесткі паказвае пасля бібліяграфічнага апісання;
- па прыкладзенай ніжэй схеме фасетнай класіфікацыі вызначае відавую прынадлежнасць кожнага дапаможніка.

Напрыклад, у выніку аналізу аднаго з дапаможнікаў, запіс павінен выглядаць наступным чынам:

*Бавин, С.П. Зарубежный детектив XX века (в русских переводах): попул. библиогр. энцикл.– Москва : Кн. палата, 1991.– 206 с.*

Форма дапаможніка – бібліяграфічнае выданне, неперыядычнае.

Тып дапаможніка– бібліяграфічны паказальнік.

Жанр – бібліяграфічная энцыклапедыя.

I Б – рэкамендацыйны.

II – рэтраспектыўны.

III А -

Практычная работа пачынаецца ва аўдыторных ўмовах, а завяршаецца самастойна, здаецца на праверку выкладчыку ў азначаны тэрмін і з'яўляецца адной з умоў допуску да выніковага экзамену.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МНОГААСПЕКТНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ (БД)

*Фасета І.* – Грамадскае прызначэнне бібліяграфічных дапаможнікаў.

У гэтым фасеце, ў сваю чаргу, існуюць тры адпаведных блока бібліяграфічных дапаможнікаў, якія выдзяляюцца па канкрэтным прыметам відавых адрозніванняў:

| ***І. Грамадскае прызначэнне БД*** | ***Віды дапаможнікаў*** |
|---|---|
| А. Пашукова-камунікатыўнае (агульнае) прызначэнне | 1. Бягучыя нацыянальныя (дзяржаўныя)<br>2. Рэтраспектыўныя нацыянальныя (рэпертуарныя)<br>3. Масавыя крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі |
| Б. Канкрэтнае мэтавае і чытацкае (спецыяльнае) прызначэне | 1. Навукова-дапаможныя<br>2. Прафесійна-вытворчыя<br>3. Рэкамендацыйныя |
| ***ІІ. Функцыянальна-мэтавае прызначэнне БД*** | |
| В. Функцыянальна-мэтавае прызначэнне | 1. Бягучыя<br>2. Рэтраспектыўныя<br>3. Перспектыўныя |
| ***ІІІ. У залежнасці ад аб'ектаў бібліяграфавання*** | |
| ***Аб'екты бібліяграфавання*** | ***Віды дапаможнікаў*** |
| А. Па ахопу зместу аб'ектаў бібліяграфавання | 1. Універсальныя<br>2. Шматгаліновыя<br>3. Галіновыя<br>4. Тэматычныя<br>5. Праблемна-комплексныя<br>6. Персанальныя (біябібліяграфічныя) |
| Б. Па ахопу тэрыторыі | 1. Краязнаўчыя (рэгіянальныя)<br>2. Краіназнаўчыя<br>3. Міжнародныя |
| В. Па форме аб'ектаў бібліяграфавання:<br>а) знешняя форма аб'ектаў адлюстравання | Бібліяграфічныя дапаможнікі, якія адлюстроўваюць:<br>1. Неперыядычныя выданні<br>2. Перыядычныя выданні<br>3. Артыкулы<br>4. Ноты<br>5. Карты<br>6. Рукапісы<br>7. Гуказапісы<br>8. Электронныя рэсурсы<br>9. Іншыя (указаць якія)<br>10. Дакументы розных формаў (незалежна ад знешніх формаў) |
| б) мова | 1. Аднамоўныя |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | 2. Шматмоўныя |
| в) выдавецкая прыналежнасць | Бібліяграфічныя дапаможнікі, якія адлюстроўваюць:<br>1. Прадукцыю аднаго выдавецтва<br>2. Шмат выдавецтваў і устаноў (незалежна ад выдавецкай прыналежнасці) |
| г) аўтарская прыналежнасць | Бібліяграфічныя дапаможнікі, якія адлюстроўваюць публікацыі:<br>1. Аднаго аўтара<br>2. Пэўнай групы аўтараў<br>3. Незалежна ад аўтарскай прыналежнасці |
| д) сувязь з фондам аб'ектаў бібліяграфавання | 1. Звязаныя з пэўным фондам<br>2. Не звязаныя з пэўным фондам |
| ***IV. У залежнасці ад метадаў бібліяграфавання*** | |
| ***Метады бібліяграфавання*** | ***Віды дапаможнікаў*** |
| А. Паўната адбору дакументаў | 1. Выбарачныя<br>2. Рэгістрацыйныя |
| Б. Спосаб характарыстыкі дакументаў | 1. Сігнальныя<br>2. Анатаваныя<br>3. Рэферыраваныя |
| В. Спосаб групоўкі матэрыяла ў дапаможніку | 1. Алфавітныя, у алфавіце:<br>1.1. Аўтараў<br>1.2. Геаграфічных назваў<br>1.3. Загалоўкаў<br>1.4. Персаналій (аб ім, аб ёй)<br>1.5. Калектываў<br>1.6. Прадметныя<br>2. Храналагічныя, па гадах:<br>2.1. Дата напісання<br>2.2. Дата выдання і публікацыі<br>3. Сістэматычныя:<br>3.1. Гісторыка-храналагічныя<br>3.2. Тэматычныя |

***Асноўная літаратура***


1. ГОСТ 7.0-99. СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография: Термины и определения. – Введ. 1.06.2000. – Мінск : Белстандарт, 1999. – 23 с.
2. Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – С.63 – 68; Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2011. – С.49 –84.


***Дадатковая літаратура***


1. Лявончыкаў, В.Е. Тлумачальны слоўнік бібліятэчных бібліяграфічных тэрмінаў / В.Е.Лявончыкаў, Л.А.Дзямешка, Р.І.Саматыя. – 2-е выд. – Мінск : Вышэйшая школа, 2003. – 230 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Выкананыя работы правяраюцца выкладчыкам. Праводзяцца індывідуальныя гутаркі.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ВЫКАНАННЮ КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ (для студэнтаў ФЗН)

### Тэма: ТЫПЫ, ЖАНРЫ, ВІДЫ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ

***Мэта:*** паказаць веданне разнастайнасці ствараемых формаў, тыпаў, жанраў бібліяграфічных дапаможнікаў, уменне іх аналізаваць і адрозніваць.

***Заданне і методыка выканання:***

**1. Бібліяграфічнае апісанне аналізуемага дапаможніка.** Сачыць за правільнасцю і паслядоўнасцю размяшчэння элементаў бібліяграфічнага апісання і знакавай сістэмай.

**2. Агульны бібліяграфічны аналіз дапаможніка.** Уважліва прагледзець вокладку, тытульны ліст, змест, прачытаць прадмову (уводзіны) і выбарачна тэкст выдання.

**3. Вызначыць тып бібліяграфічнага дапаможніка:**

- бібліяграфічны паказальнік
- бібліяграфічны спіс
- бібліяграфічны агляд.

Растлумачыць, чаму дапаможнік аднесены да выбранага тыпу.

**4. Вызначыць жанр бібліяграфічнага дапаможніка:**

- бібліяграфічная манаграфія
- бібліяграфічны даведнік
- біябібліяграфічны слоўнік
- бібліяграфічная энцыклапедыя
- бібліяграфічны каляндар (каляндар знамянальных і памятных дат)
- рэфератыўны часопіс
- рэфератыўны зборнік
- праспект
- гутарка аб кнігах і інш.

Растлумачыць, чаму дапаможнік аднесены да выбранага жанру.

**5. Вызначыць від бібліяграфічнага дапаможніка і патлумацыць яго:**

*5.1. Па грамадскім прызначэнні:*

- нацыянальны бягучы (дзяржаўны)
- нацыянальны рэтраспектыўны (рэпертуарны)
- крыніца масавай бібліяграфічнай інфармацыі
- навукова-дапаможны
- рэкамендацыйны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5.2. *Па функцыянальна-мэтавым прызначэнні:*

- бягучы
- рэтраспектыўны
- перспектыўны

5.3. *Па шырыні ахопу аб'ектаў бібліяграфавання:*

- універсальны
- шматгаліновы
- галіновы
- тэматычны
- персанальны
- краіназнаўчы
- краязнаўчы.

*Аб'ём работы* – студэнт павінен прааналізаваць 2 бібліяграфічных дапаможнікі. (Падбіраюцца выкладчыкам індывідуальна для кожнага студэнта).

**_Літаратура_**


1. ГОСТ 7.0-99. СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография: Термины и определения. – Введ. 1.06.2000. – Мінск : Белстандарт, 1999. – 23 с.

*2.* Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – С.63 – 84.


Кантрольныя работы правяраюцца выкладчыкам з прадстаўленнем адзнакі "залічана" і "не залічана". Студэнты, работы якіх не залічаны, павінны атрымаць індывідуальную кансультацыю, падрыхтавацца і да экзамену выканаць кантрольную работу на станоўчую ацэнку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.3 ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА. ТЭОРЫЯ”

1. Дайце азначэнне тэрміна “бібліяграфія” згодна стандарта 7.0–99 “Информационно-библиотечная деятельность, библиография : термины и определения”_______________________________________________
2. Што такое “метасістэма бібліяграфіі”? (выберыце правільны адказ)
   а) сістэма, якая ўключае (падпарадкоўвае) бібліяграфію;
   б) сістэма, якая ўключаецца ў бібліяграфію;
   в) сістэма, якая існуе незалежна ад бібліяграфіі.

3. Назавіце метасістэму бібліяграфіі:

а) у межах дакументаграфічнай канцэпцыі бібліяграфіі як грамадскай з’явы-____________________

б) у межах ідэаграфічнай канцэпцыі бібліяграфіі як грамадскай з’явы______

4. Растлумачце, што такое інфармацыйныя бар’еры?________________
5. Якія групы інфармацыйных бар’ераў існуюць у Сістэме дакументальных камунікацый?__________________________________________
6. Ці ўдзельнічае бібліяграфія ў пераадоленні колькасных інфармацыйных бар’ераў? Калі ўдзельнічае, то якім чынам? ________________________
7. У які час бібліяграфія разумелася як навука аб кнізе? _______________
8. Ці правільна ўжыта паняцце “бібліяграфія” у наступным сказе: “Бібліяграфія – гэта асобная бібліяграфічная праца (бібліяграфічны рэсурс)”.
9. Растлумачце, як бібліяграфічная інфармацыя можа ўдзельнічаць у пераадоленні моўных інфармацыйных бар’ераў у СДК?_________________
10. У якую больш шырокую сістэму уваходзіць сістэма дакументальных камунікацый?
11. Прычынамі з’яўлення бібліяграфіі як грамадскай з’явы, на думку, Н.А. Слядневай, з’яўляюцца _____________________ фактары.
12. Якія віды бібліяграфічнай інфармацыі, лічыць Н.А. Сляднева, непарыўна звязаны з тэкстам?__________________________________________________
13. Суаднясіце групы мэт бібліяграфічнай практычнай дзейнасці:

| | |
|---|---|
| а) знешнія | 1) варыятыўныя |
| б) бліжэйшыя | 2) унутраныя |
| в) нарматыўныя | 3) прыватныя |
| г) агульныя | 4) канчатковыя |

14. Аб’ектамі бібліяграфічнай практычнай дзейнасці з’яўляюцца:
   а) дакументы
   б) тэксты
   в) сэнсы
   г) факты
   е) карыстальнікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15. Адзначце асобасныя этычныя кампетэнцыі бібліёграфа:

а) дабразычлівасць

б) тактычнасць

в) настойлівасць у пошуку пошуку інфармацыі

г) абавязковасць тлумачэння прычын адмовы карыстальніку

д) прапанова альтэрнатыўных варыянтаў задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей

е) уважлівасць

16. Бібліёграф – прафесія, зместам якой з’яўляецца стварэнне і давядзенне да ____________________________________(*закончыце азначэнне*).

17. Да суб’ектаў бібліяграфічнай дзейнасці адносяцца:

18. а) карыстальнікі бібліяграфічнай інфармацыі

б)

в)

г)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.4 Графік самастойнай работы студэнтаў па дысцыпліне “Бібліяграфазнаўства. Тэорыя”

| Накірунак, тэма, заданне | Форма прадстаўле-ння | Кол-ць гадзін | Час прадстаў-лення | Форма кантроля |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| 1. Бібліяграфія ў інфармацыйнай інфраструктуры грамадства | канспект | 8 | верасень | праверка канспектаў, субяседа-ванне |
| 2. Бібліяграфічная інфармацыя і бібліяграфічныя веды | канспект | 8 | верасень | праверка канспектаў, субяседа-ванне |
| 3. Формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі | колы Эйлера, пісьмовая праца | 10 | кастрычнік | праверка работ, субяседа-ванне |
| 4. Віды бібліяграфічных дапаможнікаў | канспект | 4 | кастрычнік | праверка канспектаў |
| 5. Бібліяграфічная практыка і пазнанне | рэферат | 14 | кастрычнік | праверка, субяседа-ванне |
| 6. Кампанентная структура бібліяграфічнай практычнай дзейнасці | электронная прэзентацыя, тэст | 14 | кастрычнік | дэманст-рацыя прэзента-цый, праверка тэстаў |
| 7. Бібліяграфічныя працэсы і метады | тэст | 8 | лістапад | праверка тэстаў |
| 8. Відавая структура бібліяграфіі | канспект | 12 | лістапад | праверка канспектаў, субяседа-ванне |
| 9. Бібліяграфазнаўства як сістэма навуковых ведаў | тэст | 4 | лістапад | праверка тэстаў |
| 10. Тэрмінасістэма бібліяграфазнаўства | красворд, слоўнік | 6 | лістапад | праверка работ, субяседа-ванне |
| 11. Развіццё бібліяграфазнаўства на сучасным этапе | пісьмовая работа | 12 | снежань | праверка пісьмовых работ |
| 12. Падрыхтоўка да семінараў | канспект | 10 | снежань | апытанне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4.5 МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ ДА САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

## Тэма: **Бібліяграфія ў інфармацыйнай інфраструктуры грамадства**

***Мэта:*** вывучыць асаблівасці апісання бібліяграфіі на падставе прынцыпа дапаўняльнасці ў выглядзе "бібліяграфічнага квадрата", прапанаванага В.А.Факеевым.

***Заданне:***

I. Пазнаёміцца з літаратурай па тэме.

II. Адказаць на наступныя пытанні:

1. З якіх аспектаў (элементаў) утвараецца "бібліяграфічны квадрат"?
2. Характарыстыка кожнага з аспектаў (элементаў) "бібліяграфічнага квадрата".
3. Значэнне прынцыпа дапаўняльнасці для тэарэтычнага асэнсавання бібліяграфіі.
4. Ці дапамагае "бібліяграфічны квадрат" уявіць цэласнасць бібліяграфіі?

***Літаратура***


1. Фокеев, В.А. Библиография: теоретико-методологические основания / В.А.Фокеев. – Санкт-Петербург, 2006. – С.125 – 127.
2. Фокеев, В.А. Постпрото(нео)библиография: экспликация понятия / В.А.Фокеев // Мир библиографии. – 2004. - № 6. – С.2 – 7.
3. Фокеев, В.А. Библиографическая наука и практика: терминологический словарь / В.А.Фокеев. – Санкт-Петербург, 2008. – С.40 – 41.


## Тэма: Бібліяграфічная інфармацыя і бібліяграфічныя веды

***Мэта:*** асэнсаваць асаблівасці асноўных паняццяў бібліяграфіі – "бібліяграфічная інфармацыя" і "бібліяграфічныя веыд".

***Заданне:***

I. Пазнаёміцца з літаратурай па тэме.

II. Адказаць на наступныя пытанні:

1. Калі ўзнік тэрмін "бібліяграфічная інфармацыя", як яго разумелі ў 1950 – 1960-я гг.?
2. У чым заключаецца галоўная адметнасць бібліяграфічнай інфармацыі па меркаванні А.П.Коршунава? (падручнік, с.26).
3. Дайце азначэнне паняцця "бібліяграфічная інфармацыя" паводле ГОСТ 7.0.-99 «Информационно-библиотечная деятельность. Библиография».
4. Хто з бібліяграфазнаўцаў лічыць, што бібліяграфічная інфармацыя мае фактаграфічную прыроду і з'яўляецца разнавіднасцю фактаграфічнай інфармацыі?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Ахарактарызуйце ролю аўтара ў стварэнні прагнознай, афіннай, латэнтнай бібліяграфічнай інфармацыі згодна ўяўленням Н.А. Слядневай.

6. Што такое “бібліяграфічныя веды”?

7. Што такое “бібліяграма”?

8. Патлумачце ўдасцівасці бібліяграфічнай інфармацыі: дваіснасць і стандартнасць.

9. Патлумачце ўдасцівасці бібліяграфічнай інфармацыі: другаснасць і першаснасць, ідэнтыфікацыя дакумента.

10. Патлумачце ўдасцівасці бібліяграфічнай інфармацыі: комплексны інфармацыйны змест, мадэліраванне першасных дакументных патокаў і масіваў.

### *Літаратура*

1. Кузьмініч, Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – С.27 – 39; Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2011. – С.26 – 37.

2. ГОСТ 7.0-99. СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография: Термины и определения. – Введ. 1.06.2000. – Мінск : Белстандарт, 1999. – 23 с.

3. Вохрышева, М.Г. Библиография в системе медиакоммуникации / М.Г. Вохрышева // Библиография. – 2016. - № 1. – С.17-24.

4. Давыдова, И.А. Библиография: знание, информация, фактография / И.А.Давыдова, Н.А.Сляднева // Библиография. – 1993. – № 4. – С.17–30.

5. Коршунов, О.П. Информация: фикция или реальность? / О.П.Коршунов // Библиография. – 1996. – № 4. – С.30 – 34.

6. Леонов, В.П. Библиографическая трансформация знания / В.П.Леонов // Библиография. – 2005. – № 1. –С.68 – 77.

7. Соколов, А.В. Библиографическая информация как разновидность фактографической информации / А.В.Соколов // Советская библиография. – 1983. – № 6. – С.42–47.

8. Соколов, А.В. Задачи русского библиографоведения в XXI веке / А.В.Соколов // Мир библиографии. – 2005. – № 5. – С.7. – 15.

9. Фокеев, В.А. Библиография: теоретико-методологические основания / В.А.Фокеев. – Санкт-Петербург. : Профессия, 2006. – С. 119 – 178, 283 – 292.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма: Формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі

***Мэта:*** прааналізуюць суадносіны паміж аб’ёмамі паняццяў адносна бібліяграфічнай прадукцыі (рэсурсаў); вучыцца вызначаць жанры бібліяграфічных дапаможнікаў.

***Заданне:***

I. Пазнаёміцца з літаратурай па тэме.

II. Вызначыць 6 жанраў бібліяграфічных дапаможнікаў з фонду 418 каб., ці з бібліятэчных сайтаў (працяг практычнай работы № 1).

III. Прааналізаваць суадносіны паміж аб’ёмамі паняццяў і адлюстраваць іх з дапамогай колаў Эйлера.

II. Прааналізаваць суадносіны паміж аб’ёмамі паняццяў і адлюстраваць іх з дапамогай колаў Эйлера.

*Варыянт 1.*
прадметны каталог
бібліяграфічны дапаможнік
бібліяграфічнае выданне
бібліяграфічны каталог
бібліяграфічны спіс

*Варыянт 2.*
алфавітны каталог
сістэматычная картатэка артыкулаў
бібліяграфічны дакумент
бібліяграфічны паказальнік
бібліяграфічнае выданне

*Варыянт 3.*
бібліяграфічны дакумент
бібліяграфічнае выданне
бібліяграфічны паказальнік
друкаваныя каталогі (каталогі ў форме кніжнага выдання)
неперыядычнае бібліяграфічнае выданне

*Варыянт 4.*
сістэматычны каталог
бібліяграфічны дапаможнік
неперыядычнае бібліяграфічнае выданне
тэматычная картатэка
прыкніжны спіс літаратуры

*Варыянт 5.*
бібліяграфічны дапаможнік
бібліяграфічная картатэка
прыартыкульны спіс літаратуры
дапаможны паказальнік
геаграфічны дапаможны паказальнік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Варыянт 6.*
унутрычасопісны бібліяграфічны спіс
прыкніжны спіс літаратуры
бібліяграфічная база даных
алфавітны каталог
бібліяграфічны дакумент

*Варыянт 7.*
бібліяграфічны дакумент
бібліяграфічны дапаможнік
бібліяграфічнае выданне
алфавітны каталог
бібліяграфічны спіс

*Варыянт 8.*
бібліяграфічны агляд
унутрыгазетны бібліяграфічны спіс
прыартыкульны бібліяграфічны спіс
бібліяграфічны дапаможнік
біябібліяграфічны слоўнік

*Варыянт 9.*
несамастойныя выдавецкія формы бібліяграфічных дапаможнікаў
унутрычасопісны спіс літаратуры
электронны каталог
унутрычасопісны бібліяграфічны спіс
бібліяграфічны дапаможнік

*Варыянт 10.*
бібліяграфічны дапаможнік
біябібліяграфічны слоўнік
бібліяграфічная энцыклапедыя
электронны каталог
рэфератыўны часопіс

*Варыянт 11.*
сістэматычная картатэка артыкулаў
бібліяграфічны дакумент
бібліяграфічны паказальнік
бібліяграфічнае выданне
перыядычнае бібліяграфічнае выданне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Варыянт 12.*
сістэматычная картатэка артыкулаў
алфавітны каталог
бібліяграфічны дакумент
бібліяграфічны паказальнік
бібліяграфічнае выданне

*Варыянт 13.*
бібліяграфічны дакумент
бібліяграфічны паказальнік
бібліяграфічнае выданне
бібліяграфічны даведнік
бібліяграфічная манаграфія

*Варыянт 14.*
перыядычнае бібліяграфічнае выданне
несамастойныя выдавецкія формы бібліяграфічных дапаможнікаў
бібліяграфічны дапаможнік
сістэматычны каталог
сістэматычная картатэка артыкулаў

*Варыянт 15.*
бібліяграфічны дакумент
праспект
спіс літаратуры
краязнаўчая картатэка
бібліяграфічны паказальнік

*Варыянт 16.*
паказальнік да выдання
дапаможны паказальнік
краязнаўчы каталог
алфавітны каталог
бібліяграфічная манаграфія

***Літаратура***

1. Кузьмініч, Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – С.49 – 84; Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2011. – С.51 – 86.
2. ГОСТ 7.0-99. СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография: Термины и определения. – Введ. 1.06.2000. – Мінск : Белстандарт, 1999. – 23 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма: Віды бібліяграфічных дапаможнікаў

***Мэта:*** замацаваць веданне студэнтамі відавых асаблівасцей бібліяграфічных дапаможнікаў.

***Заданні:*** I. Пазнаёміцца з літаратурай па тэме.

II. Даць азначэнні бібліяграфічных дапаможнікаў.

**Дайце азначэнне наступных відаў бібліяграфічных дапаможнікаў:**

*Варыянт 1.*

1. Дзяржаўны бібліяграфічны дапаможнік –
2. Папулярны бібліяграфічны дапаможнік –
3. Краязнаўчы бібліяграфічны дапаможнік –

*Варыянт 2.*

1. Спецыяльны бібліяграфічны дапаможнік –
2. Галіновы бібліяграфічны дапаможнік –
3. Сігнальны бібліяграфічны дапаможнік –

*Варыянт 3.*

1. Навукова-дапаможны бібліяграфічны дапаможнік –
2. Універсальны бібліяграфічны дапаможнік –
3. Рэгіянальны бібліяграфічны дапаможнік –

*Варыянт 4.*

1. Рэкамендацыйны бібліяграфічны дапаможнік –
2. Тэматычны бібліяграфічны дапаможнік –
3. Персанальны бібліяграфічны дапаможнік –

*Варыянт 5.*

1. Прафесіянальна-вытворчы бібліяграфічны дапаможнік –
2. Краіназнаўчы бібліяграфічны дапаможнік –

3 Біябібліяграфічны дапаможнік –

*Варыянт 6.*

1. Паказальнік (спіс, агляд) мясцовага друку –
2. Выдавецкі бібліяграфічны дапаможнік –
3. Рэгістрацыйны бібліяграфічны дапаможнік –

*Варыянт 7.*

1. Кнігагандлёвы бібліяграфічны дапаможнік –
2. Выбарачны бібліяграфічны дапаможнік –
3. Бягучы бібліяграфічны дапаможнік –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Варыянт 8.*
1. Рэтраспектыўны бібліяграфічны дапаможнік –
2. Анатаваны бібліяграфічны дапаможнік –
3. Кумулятыўны бібліяграфічны дапаможнік –

*Варыянт 9.*
1. Перспектыўны бібліяграфічны дапаможнік –
2. Алфавітны бібліяграфічны дапаможнік –
3. Унутрыкніжны бібліяграфічны дапаможнік –

*Варыянт 10.*
1. Храналагічны бібліяграфічны дапаможнік –
2. Унутрычасопісны бібліяграфічны дапаможнік –
3. Прыартыкульны бібліяграфічны дапаможнік –

*Варыянт 11.*
1. Сістэматычны бібліяграфічны дапаможнік –
2. Міжнародны бібліяграфічны дапаможнік –
3. Прыкніжны бібліяграфічны дапаможнік –

*Варыянт 12.*
1. Нацыянальны рэтраспектыўны (рэпертуарны) бібліяграфічны дапаможнік –
2. Сігнальны бібліяграфічны дапаможнік –
3. Нацыянальны бягучы бібліяграфічны дапаможнік –

***Літаратура***


1. ГОСТ 7.0-99. СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография: Термины и определения. – Введ. 1.06.2000. – Мінск : Белстандарт, 1999. – 23 с.
2. Беспалова, Э.К. Основные направления классификации библиографических пособий и формирования понятия вид “библиографии” / Э.К.Беспалова // Советская библиография. – 1973. – № 4. – С.36 – 51.


**Тэма: Бібліяграфічная практыка і пазнанне**

***Мэта:*** паглыбіць уяўленні аб бібліяграфічнай дзейнасці ў сістэме відаў чалавечай дзейнасці.

***Заданні:*** I. Выявіць літаратуру па тэме па бягучым паказальніку Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі “Библиотечное дело и библиография”, “Интегрум”, “Eastview” і інш.; пазнаёміцца з публікацыямі.

II. Падрыхтаваць рэферат па выбранай тэме:

***Тэмы***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Тэарэтычнае абгрунтаванне дзейнаснага (сістэмна-дзейнаснага) падыхода да вывучэння бібліяграфіі ў 1970 – 1990-я гг. у расійскім бібліяграфазнаўстве.

2. Погляды М.Г.Вохрышавай і В.А.Факеева на паняцце "бібліяграфічная дзейнасць".

3. Прадметнасць і мэтазгоднасць як рысы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

4. Сацыяльная абумоўленасць як рыса бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

5. Суб'ектнасць як рыса бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

6. Віды эфектыўнасці бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

7. Крытэрыі эфектыўнасці бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

8. Працэсуальная і выніковая эфектыўнасць бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

***Літаратура***

1. Кузьмініч, Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – С.85 – 156; Кузьмініч, Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 81 – 149.
2. Вохрышева, М.Г. Библиографическая деятельность: структура и эфективность / М.Г.Вохрышева. – Москва : Книжная палата, 1989. – 200 с.
3. Вохрышева, М.Г. Теория библиографии / М.Г.Вохрышева. – Самара, 2004. – С. 49-66.
4. Фокеев, В.А. Библиографическая наука и практика: терминологический словарь / В.А.Фокеев. – Санкт-Петербург : Профессия, 2008. – 272 с.
5. Фокеев, В.А. Библиография: теоретико-методологические основания / В.А.Фокеев. – Санкт-Петербург, 2006. – С.179 – 186, 293 – 300.

**Тэма: Кампанентная структура бібліяграфічнай практычнай дзейнасці**

***Мэта:*** паглыбіць уяўленні студэнтаў аб бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

***Заданні:*** I. Пазнаёміцца з літаратурай па тэме.

II. Падрыхтаваць электронную прэзентацыю па выбранай **тэме:**

1. Дакументальныя аб'екты бібліяграфічнай дзейнасці.
2. Бібліёграф-прафесіянал – асноўны суб'ект бібліяграфічнай дзейнасці.
3. Выдатныя бібліяграфазнаўцы сучаснасці (А.П.Коршунаў, Э.К.Бяспалава, М.Г.Вохрышава, В.П.Леонаў, А.В.Сакалоў, В.А.Факееў, Л.В.Астахава і іншыя па выбару студэнтаў).
4. Карыстальнікі як аб'екты і суб'екты бібліяграфічнай дзейнасці.
5. Мэты бібліяграфічнай дзейнасці.
6. Бібліяграфаванне дакументаў як працэс бібліяграфічнай дзейнасці.
7. Бібліяграфічнае абслугоўванне як працэс бібліяграфічнай дзейнасці.
8. Бібліяграфічны пошук як як працэс бібліяграфічнай дзейнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Сродкі бібліяграфічнай дзейнасці.
10. Класіфікацыя электронных баз даных.
11.Электронныя бібліяграфічныя дапаможнікі (рэсурсы) вядучых архіваў Беларусі (Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і іншых па выбару студэнтаў).
12. Электронныя бібліяграфічныя дапаможнікі (рэсурсы) вядучых бібліятэк (па выбару студэнтаў).

***Літаратура***


1. Кузьмініч, Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – С.109 – 136; Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2011. – С.111 – 137.
2. Вохрышева, М.Г. Теория библиографии / М.Г.Вохрышева. – Самара, 2004. – С.67-99.
3. Коршунов, О. П. Библиографоведение : учебник / О. П. Коршунов, Н. К. Леликова, Т. Ф. Лиховид ; под общей редакцией О. П. Коршунова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. – С.88-130.
4. Леонов, В.П. Библиография как профессия / В.П.Леонов. – Москва : Наука, 2005. — С.44-47.
5. Профессиональная среда библиографа // Справочник библиографа. – 4-е изд., испр. и доп. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. – С.713-720.
6. Фокеев, В.А. Библиографическая наука и практика: терминологический словарь / В.А.Фокеев. – Санкт-Петербург : Профессия, 2008. – 272 с.
7. Фокеев, В.А. Библиография: теоретико-методологические основания / В.А.Фокеев. – Санкт-Петербург, 2006. – С.254 – 282.


**Тэма: Бібліяграфічныя працэсы і метады**

***Мэта:*** паглыбіць веды аб асаблівасцях асноўных бібліяграфічных працэсаў і метадаў.

***Заданне:*** І. Пазнаёміцца з літаратурай па тэме.

ІІ. Падрыхтавацца да тэсціравання.

1. *Што адносіцца да сродкаў бібліяграфічнай дзейнасці:*

а) метады практычнай бібліяграфічнай дзейнасці
б) тэхнічныя і праграмныя сродкі
в) каналы вытворчасці і давядзекння бібліяграфічнай інфармацыі да карыстальнікаў
г) тэорыі і канцэнцыі, створаныя бібліяграфазнаўцамі

2. *Дапоўніце азначэнне прапушчанымі словамі:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліяграфічнае абслугоўванне – гэта працэс _____________ бібліяграфічнай інфармацыі да __________________ .

*3. Якія метады адносяцца да аналітычных:*

а) выяўленне дакументаў як аб’ектаў бібліяграфавання
б) групоўка бібліяграфічных запісаў у бібліграфічным дапаможніку
в) бібліяграфічнае апісанне дакументаў
г) адбор дакументаў па зададзеных крытэрыях
д) індэксаванне, прадметызацыя дакументаў
е) анатаванне , рэферыраванне дакументаў
ё) агульны бібліяграфічны аналіз дакументаў

4. Якія метады адносяцца да сінтэтычных:
а) выяўленне дакументаў як аб’ектаў бібліяграфавання
б) групоўка бібліяграфічных запісаў у бібліграфічным дапаможніку
в) бібліяграфічнае апісанне дакументаў
г) адбор дакументаў па зададзеных крытэрыях
д) індэксаванне, прадметызацыя дакументаў
е) анатаванне , рэферыраванне дакументаў
ё) агульны бібліяграфічны аналіз дакументаў

5. Якія метады адносяцца да аналітычных:
а) выяўленне дакументаў як аб’ектаў бібліяграфавання
б) групоўка бібліяграфічных запісаў у бібліграфічным дапаможніку
в) бібліяграфічнае апісанне дакументаў
г) адбор дакументаў па зададзеных крытэрыях
д) індэксаванне, прадметызацыя дакументаў
е) анатаванне , рэферыраванне дакументаў
ё) агульны бібліяграфічны аналіз дакументаў

6. Закончыце азначэнне: Бібліяграфаванне – гэта працэс падрыхтоўкі бібліяграфічнай інфармацыі, якая ___________________________________..

23. Назавіце асноўныя працэсы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці:
а) бібліяграфаванне
б)
в)

24.Назавіце асноўныя этапы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці:
а) вытворчасць бібліяграфічнай інфармацыі
б)
в)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

25. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне – гэта абслугоўванне______________________________ (*завяршыце азначэнне*)

26. Суаднясіце змест даведак і іх азначэнні:

а) фактаграфічная даведка — 1) змяшчае лічбы, даты, тлумачэнні тэрмінаў і інш.

б) бібліяграфічная даведка — 2) утрымлівае інфармацыю аб дакументах (тэкстах) ці любых лагічна выдзеленых іх адзінках

в) адрасная бібліяграфічная даведка — 3) звесткі аб дакуменце названы карыстальнікам памылкова ці не ўказаны

г) удакладняючая бібліяграфічная даведка — 4) указана месца знаходжання дакумента ў канкрэтным фондзе

***Літаратура***


1. Кузьмініч, Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – С.118 – 128; Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2011. – С.120 – 130.
2. Вохрышева, М.Г. Теория библиографии / М.Г.Вохрышева. – Самара, 2004. – С.82-88.
3. Коршунов, О. П. Библиографоведение : учебник / О. П. Коршунов, Н. К. Леликова, Т. Ф. Лиховид ; под общей редакцией О. П. Коршунова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. – С.113-119.
4. Фокеев, В.А. Библиографическая наука и практика: терминологический словарь / В.А.Фокеев. – Санкт-Петербург : Профессия, 2008. – 272 с.


**Тэма: Відавая структура бібліяграфіі**

***Мэта:*** паглыбіць веды аб асаблівасцях нацыянальнай бібліяграфіі.

***Заданне:*** І. Пазнаёміцца з літаратурай па тэме.

ІІ. Падрыхтаваць пісьмовыя адказы па прапанаваных пытаннях:

1. Тэрміналагічныя пытанні нацыянальнай бібліяграфіі, прыметы яе выдзялення.

2. Суадносіны паняццяў “нацыянальная бібліяграфія” і “дзяржаўная бібліяграфія”.

3. Цэнтры стварэння і распаўсюджання прадукцыі нацыянальнай бібліяграфіі.

4. Буйнейшыя даследчыкі (індывідуальныя і калектыўныя праблем нацыянальнай бібліяграфіі), асноўныя навуковыя працы па праблемах тэорыі і рэалізацыі нацыянальнай бібліяграфіі на сучасным этапе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літаратура*

1. Вопросы библиографоведения. Вып. 17. Библиографический учет и доступ в XXI веке. – Москва : Пашков дом, 2009. – 404 с.
2. Зарайская, В.П. Национальная ретроспективная система пособий / В.П.Зарайская // Мир библиографии. – 2000. – № 3. – С.9 – 12.
3. Иванова, Е.В. Национальная библиография Беларуси в международном контексте/ Е.В. Иванова // Библиография. – 2005. – № 4. С. 17 – 26.
4. Пэрент, И. Национальная библиография в цифровую эпоху / И. Пэрент // Библиография. – 2008. – №3. – С. 147–151.
5. Сухоруков, К.М. Национальная библиография в трактовке ИФЛА и РКП / К.М.Сухоруков // Библиография. – 2007. – № 1. – С. 11–18.


## Тэма: Бібліяграфазнаўства як сістэма навуковых ведаў

***Мэта:*** паглыбіць веды аб структуры бібліяграфазнаўства.

***Заданне:*** I. Пазнаёміцца з літаратурай па тэме.

II. Адказаць на пытанні тэста.

**I. Дайце азначэнне:**

*Заданне 1.* Бібліяграфазнаўства – гэта … .

**II. Завяршыце пералік:**

*Заданне 2.* Аспектная дыферэнцыяцыя бібліяграфазнаўства ўключае наступныя адносна самастойныя навуковыя дысцыпліны (раздзелы): тэорыя бібліяграфіі, гісторыя бібліяграфіі, …. .

*Заданне 3.* Да роднасных для бібліяграфазнаўства абласцей ведаў адносяцца: бібліятэказнаўства, … .

*Заданне 4.* Бібліяграфазнаўства ўключае: навукоўцаў з іх ведамі, здольнасцямі, кваліфікацыяй, раздзяленнем працы; навуковыя структуры (кафедры і інш.), … .

**III. Адзначце правільны адказ/ы:**

*Заданне 5*. Якія асаблівасці бібліяграфазнаўства як навукі?

A. Адносная маладосць
B. Невялікае кола вучоных
C. Адсутнасць спецыяльных навукова-даследчых інстытутаў
D. Міждысцыплінарнасць
E. Дынамізм

*Заданне 6*. Суб’ект бібліяграфазнаўства:

A. Бібліёграф, складальнік бібліяграфічных паказальнікаў
B. Бібліёграф – каталагізатар
C. Бібліяграфазнавец, выкладчык

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

D. Бібліяграфазнавец, даследчык

*Заданне 7.* Метадалогію як самастойны раздзел бібліяграфазнаўства першым прапанаваў выдзеліць:

A. Коршунаў А.П.
B. Факееў В.А.
C. Сляднева Н.А.
D. Яноніс О.В.

*Заданне 8.* Узаемадзеянне з сацыялогіяй узбагачае бібліяграфазнаўства:

A. Метадамі анкетавання, экспертных ацэнак, апытання карыстальнікаў
B. Катэгорыямі аб'ект і суб'ект бібліяграфіі, функцыі, сістэма і структура
C. Метадамі вывучэння эканамічнай эфектыўнасці працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці

*Заданне 9.* Функцыі бібліяграфазнаўства:

A. інфармацыйная
B. тлумачальная
C. эўрыстычная
D. прагнастычная (прагнозная)
E. сінтэзуючая
F. пошукавая
G. камунікатыўная

**IV. Суаднясіце:**

*Заданне 10.* Сучасныя тэарэтычныя канцэпцыі бібліяграфазнаўства з іх вядомымі прадстаўнікамі:

| | |
|---|---|
| 1. Інфармацыйна-дакументаграфічная (сістэмна-дзейнасная) канцэпцыя | а) Факееў В.А. |
| 2. Інфармацыйна-кнігазнаўчая канцэпцыя | б). В. П. Леонаў |
| 3. Духаўна-вытворчая (кагнітыўна-камунікацыйная) канцэпцыя | в) Сляднева Н.А. |
| 4. Ідэаграфічная (інфармаграфічная) канцэпцыя | г) Сакалоў А.В. |
| 5. Культуралагічная канцэпцыя | д) Астахава Л.В. |
| 6. Інфармацыйна-управленчая канцэпцыя | е) Вохрышава М.Г., Зіноўева Н.Б. |
| 7. Когнітаграфічная канцэпцыя | ё) Барсук А.І., Беспалава Э.К. |
| 8. Навуказнаўчая канцэпцыя | ж) Грачыхін А.А. |
| 9. Працэсна-кагнітыўная | з) Коршунаў А.П. |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| (кагнітыўна-трансфармацыйная) канцэпцыя | |

*Заданне 11.* Суаднясіце дысцыпліны бібліяграфазнаўства з асобнымі галоўнымі задачамі, якія стаяць перад імі:

| | |
|---|---|
| 1. Тэорыя бібліяграфіі | а) распрацоўка рацыянальных схем арганізацыі бібліяграфічных службаў у розных інфармацыйных цэнтрах і бібліятэках |
| 2. Гісторыя бібліяграфіі | б). распрацоўка прыёмаў і правіл розных працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці |
| 3. Арганізацыя бібліяграфіі | в) распрацоўка канкрэтных прыёмаў, паслядоўнасці аперацый, алгарытмаў, стратэгій, неабходных для аптымальнага выканання бібліяграфічных працэсаў. |
| 4. Методыка бібліяграфіі | г) вывучэнне сістэмы метадаў агульнанавуковага і прыватнанавуковага характара, якія выкарыстоўваюцца ў бібліяграфазнаўстве |
| 5.Тэхналогія бібліяграфіі | д) вывучэнне сутнасці бібліяграфіі як грамадскай зявы, заканамернасцей функцыянавання бібліяграфіі, прынцыпаў функцый, задач, тэрміналогіі, структураванне бібліяграфічнай дзейнасці |
| 6. Метадалогія бібліяграфіі | е) узнікненне бібліяграфіі і яе развіццё да нашага часу |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**_Літаратура_**

1. Кузьмініч, Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – С. 157– 178; Кузьмініч,Т.В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т.В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 150 – 170.
2. Вохрышева, М.Г. Теория библиографии / М.Г.Вохрышева. – Самара, 2004. – С. 183 – 200.
3. Захарчук, Т.В. Научные школы в библиографоведении: особенности формирования // НТИ. Сер. 1. ВИНИТИ РАН. – 2011. - №.1. – С. 19 – 25.

4. Макеева, О.В. Научные школы в области библиотековедения, библиографоведения и книговедения: к изучению вопроса / О.В. Макеева // Библиотековедение. – 2014. – № 3. – С. 23–29.

## Тэма: Тэрмінасістэма бібліяграфазнаўства

***Мэта:*** вывучыць і прааналізаваць тэрмінасістэму бібліяграфазнаўства на сучасным этапе.

***Заданні:*** І. Пазнаёміцца з літаратурай па тэме.

ІІ. Выявіць і прааналізаваць тэрміны на падставе рэкамендаваных крыніц, скласці красворд, які ахоплівае не менш 10 паняццяў.

ІІІ. Асобным спісам перакласці тэрміны, выкарыстаныя ў красвордзе на рускую і англійскую мовы.

***Літаратура***

1. Библиотековедение, библиографоведение и информатика: терминологический путеводитель / [сост. : И. Ю. Акифьева и др. ; науч. ред. М. Г. Вохрышева]. – Москва : Либерея —Бибинформ, 2007. – 101 с.

2. Библиотечная энциклопедия / Рос. гос. б-ка. – Москва : Пашков дом, 2007. – 1299 с.

3. ГОСТ 7.0-99. СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография: Термины и определения. – Введ. 1.06.2000. – Мінск : Белстандарт, 1999. – 23 с.

4. Губанова, Г.А. Терминосистема библиографии: современное состояние / Г.А.Губанова, И.Г.Моргенштерн // Библиография. – 2002. – № 1. – С.13 – 16.

5. Коршунов, О. П. Библиографоведение : учебник / О. П. Коршунов, Н. К. Леликова, Т. Ф. Лиховид ; под общей редакцией О. П. Коршунова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. – С.180-280.

6. Лявончыкаў, В.Е. Тлумачальны слоўнік бібліятэчных бібліяграфічных тэрмінаў / В.Е.Лявончыкаў, Л.А.Дзямешка, Р.І.Саматыя. – 2-е выд. – Мінск : Вышэйшая школа, 2003. – 230 с.

7. Российское библиографоведение: итоги и перспективы : сб. науч. ст. – МОСКВА : ФАИР-ПРЕСС, 2006. – 688 с.

8. Соколов А. В. Библиографоведение: Terra incognita. Диалог о библиографической науке : науч.-практ. пособие / А. В. Соколов, В. А. Фокеев. – Москва : Литера, 2010. – 206 с.

9. Справочник библиографа / науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – 2-е изд. – Санкт-Петербург : Профессия, 2002. – 560 с.

10. Терминологический словарь по библиотечному делу и сежным отраслям знания / сост. З.Г.Высоцкая, В.А.Врубель, А.Б.Маслов, Л.К.Розеншальд ; под ред. З.Г.Высокой ; БЕН РАН. –Москва, 1998. – 268 с.

11. Фокеев, В.А. Библиографическая наука и практика: терминологический словарь / В.А.Фокеев. – Санкт-Петербург, 2008. – 270 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. Фокеев, В.А. Библиография: теоретико-методологические основания : учебное пособие для системы дополнительного библиотечно-информационного образования / В. А. Фокеев. – Санкт-Петербург : Профессия, 2006. – 350 с.

## Тэма: Развіццё бібліяграфазнаўства на сучасным этапе

***Мэта:*** вывучыць напрамкі ўзамадзеяння бібліяграфічнай навукі і практыкі з сацыяльна-камунікатыўнымі і гуманітарнымі дысцыплінамі, асабліва з сумежнымі галінамі.

***Заданне:***

I. Пазнаёміцца з літаратурай па тэме.

II. Падрыхтаваць разгорнутыя пісьмовыя адказы, арыентуючыся на наступныя пытанні, уключыць ілюстрацыйныя матэрыялы (схемы).

### Пытанні

1. Як суадносяцца бібліяграфічная і навукова-інфармацыйная дзейнасць, бібліяграфазнаўства і інфарматыка?
2. Як суадносяцца бібліяграфічная і бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства?
3. Як суадносяцца бібліяграфічная дзейнасць і кніжная справа, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства?
4. Ці з'яўляецца бібліяграфазнаўства часткай кнігазнаўства, дакументалогіі?
5. Патлумачце ўзаемадзеянне бібліяграфіі, бібліяграфазнаўства з гуманітарнымі навукамі (гісторыяй, культуралогіяй і інш.).
6. Як ўзбагачаецца бібліяграфазнаўства ў працэсе ўзаемадзеяння з філасофіяй, сацыялогіяй, псіхалогіяй?
7. У якім выказванні А.П.Коршунава праяўляецца незалежнасць бібліяграфіі ад бібліятэчнай справы, навукова-інфармацыйнай дзейнасці:

а. “бібліятэчная справа і навукова-інфармацыйнай дзейнасць – гэта тыя каналы, праз якія бібліяграфія практычна рэалізуе свае грамадскія функцыі”.

б. бібліяграфія з'яўляецца ўласным структурным узроўнем (контурам) [бібліятэчнай справы і навукова-інфармацыйнай дзейнасці], на якім бібліятэкі ці навукова-інфармацыйны орган забяспечваюць сваіх спажыўцоў сродкамі бібліяграфічнай арыентацыі ў дакументальных крыніцах ведаў”.

### *Літаратура*


1. Вохрышева, М.Г. Теория библиографии : учеб. пособие / М.Г. Вохрышева. – Самара, 2004. – С.137-200.
2. Коршунов, О. П. Библиографоведение : учебник / О. П. Коршунов, Н. К. Леликова, Т. Ф. Лиховид ; под общей редакцией О. П. Коршунова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. – С.195-203.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Коршунов, О. П. Проблемы общей теории библиографии : (Монография) / О. П. Коршунов. – Москва : Книга, 1975. – С. 152-176.
4. Галкина, Н.Ю. Взаимодействие философского и специального в библиографоведении / Н.Ю.Галкина // Библиография. – 2005. – № 4. – С.2 – 10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.6 Пытанні да экзамену для студэнтаў ФІДК і ФЗН

**Пералік тэарэтычных пытанняў** да экзамена па дысцыпліне
“Бібліяграфазнаўства. Тэорыя”
для студэнтаў 2-га курса ФІДК і ФЗН

1. Аб’ект як кампанент бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.
2. Асноўныя грамадскія функцыі бібліяграфіі як грамадскай з’явы (падыход А.П.Коршунава).
3. Бібліёграф-прафесіянал як асноўны суб’ект бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.
4. Бібліяграфаванне як працэс бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.
5. Бібліяграфазнаўства як навуковая дысцыплін; яго функцыі.
6. Бібліяграфічнае абслугоўванне як працэс бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.
7. Бібліяграфічная інфармацыя як асноўнае паняцце тэорыі бібліяграфіі.
8. Бібліяграфічная практычная дзейнасць: паняцце і структура.
9. Характарыстыка паняццяў “бібліяграфічны дапаможнік”, “бібліяграфічны рэсурс”, “бібліяграфічны прадукт”. Тыпы бібліяграфічных дапаможнікаў.
10. Бібліяграфічны метад.
11. Бібліяграфічны пошук як скразны працэс бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.
12. Бібліяграфічныя веды як асноўнае паняцце тэорыі бібліяграфіі.
13. Бібліяграфія ў інфармацыйнай інфраструктуры грамадства.
14. В.А.Факееў аб функцыянальнай структуры бібліяграфіі.
15. Віды бібліяграфіі па грамадскім прызначэнні.
16. Віды бібліяграфіі па форме і зместу бібліяграфіруемых дакументаў.
17. Віды бібліяграфіі па функцыянальна-мэтавай прымеце.
18. Віды бібліяграфічнай прадукцыі па грамадскім прызначэнні.
19. Віды бібліяграфічнай прадукцыі па змесце бібліяграфіруемых дакументаў.
20. Віды бібліяграфічнай прадукцыі па метадах бібліяграфавання.
21. Віды бібліяграфічнай прадукцыі па функцыянальна-мэтавай прымеце.
22. Вынікі бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.
23. Дакументаграфічная канцэпцыя бібліяграфіі.
24. Друкаваныя (самастойныя, несамастойныя) формы існавання бібліяграфічнай прадукцыі.
